17.7.1924 г. ўтвораны Жлобінскі і Стрэшынскі раёны, 20.8.1924 г. падзелены на сельсаветы (першы на 14 — Бабоўскі, Бухарынскі, Казіміраўскі, Кароткавіцкі, Лукскі, Малевіцкі, Пірэвіцкі, Радушскі, Сенажаткаўскі, Скепнянскі, Салонаўскі, Старарудняскі, Чацвярнянскі, Шапілаўскі; другі на 7— Верхне-Албянскі (Вышне-Албянскі), Дабрагошчанскі, Кабанаўскі, Мормальскі, Папаратнянскі, Стрэшынскі, Шыхаўскі. У канцы 1924 г. ў Стрэшынскім раёне ўтвораны Новамаркавіцкі сельсавет.

Стрэшынскі раён 4.8.1927 г. скасаваны, яго тэрыторыя далучана да Жлобінскага раёна (з 26.7.1930 г. ўваходзіў у 4-ы занальна-эканамічны Гомельска-Магілёўска-Крычаўскі або Усходні падраён). З 20.2.1938 г. ў складзе Гомельскай вобласці.

Паўторна Стрэшынскі раён на базе ранейшых сельсаветаў быў утвораны 28.6.1939 г., са Жлобінскага раёна яму дадаткова перададзены Кароткавіцкі і Скепнянскі сельсаветы. 17.12.1956 г. Стрэшынскі раён скасаваны, тэрыторыя перададзена Жлобінскаму раёну.

Гаспадарчае будаўніцтва

1921 год паставіў цяжкія і складаныя для вырашэння задачы. Неабходна было аднавіць разбураную гаспадарку, прыступіць да будаўніцтва новага грамадства. У першую чаргу трэба было прыпыніць падзенне сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці, пагаршэнне ўмоў жыцця працоўных. Справы пачалі выпраўляцца толькі дзякуючы самаадданай працы людзей. Рамантаваліся і выходзілі на лінію паравозы і вагоны, павялічваўся грузаабарот, адраджаліся невялікія саматужныя прадпрыемствы, раслі колькасць засяваемай зямлі і ўраджаі, павялічвалася вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі. Аднак жылося

Члены Жлобінскага гарадскога Савета. 1926 г.

яшчэ і голадна, і холадна. Тым не менш насельніцтва Жлобіна знаходзіла магчымасць аказваць дапамогу іншым, хто папаў у бяду.

У 1921 г. Паволжа спасцігла страшэнная засуха. УЦВК звярнуўся з Дэкрэтам па збору сродкаў у дапамогу галадаючым. Сход работнікаў культуры і асветы, як сведчыць даку-

Састаў Жлобінскага райпрафбюро. 1920-я гады.

З.Е.Сафонаў, сакратар парткома Лукаўскай воласці.

мент, што захоўваецца ў Жлобінскім філіяле дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці, прыняў рэзалюцыю-зварот аб неабходнасці правядзення ў жыццё згаданага Дэкрэту. Працаўнікі Жлобіншчыны падтрымалі прапанову, здавалі хлеб, асабістыя рэчы ў фонд дапамогі галадаючым. Сабраны 1 млн. руб., аб чым 3.11.1921 г. паведаміла газета «Палеская праўда».

Паскоранае развіццё народнай гаспадаркі Жлобіна і раёна пачалося з 1924 г., калі паселішча на правым беразе Дняпра атрымала статус раённага цэнтра. Асабліва станоўчыя вынікі развіцця Жлобіншчыны вызначыліся ў 1930-я гады. Другая пяцігодка (1933—37) пачалася з руху наватараў вытворчасці. У галіне сельскай гаспадаркі другі пяцігадовы план прадугледжваў завяршэнне калектывізацыі і ссялення хутароў. У раёне будаваліся новыя грамадскія жывёлагадоўчыя фермы і брыгадныя двары, узводзіліся прамысловыя прадпрыемствы па перапрацоўцы мясцовай сыравіны. Да канца пяцігодкі дзейнічалі хлебазавод, крухмала-патачны завод, спіртзавод і іншыя арцелі і прадпрыемствы. Сялянскія дзеці рэгулярна наведвалі школы і дашкольныя ўстановы. У горадзе і вёсках працавалі вячэрнія кружкі і школы лікбезу.

Аднак новае жыццё давалася нялёгка. Калектывізацыя, ссяленне з хутароў, абагульненне асабістай маёмасці не праходзіла бясследна. Не зажывала сардэчная рана ўласніка, не заціхаў боль страты маёмасці, нажытай многімі пакаленнямі родзічаў. Яна адчувалася на кожным кроку паўсядзённага жыцця, і сталыя сяляне чакалі, не верылі, лічылі, што калгасы — з'ява часовая, ненадзейная, праходзячая.

Трэцяя пяцігодка (1938—42) характэрна далейшым ростам грамадскай вытворчасці. Значна ўмацоўвалася машынна-тэхнічная ба-

Актыў Жлобінскага райкома Чырвонага крыжа.

Бюро партячэйкі чыгуначнага вузла ў Жлобіне. 1926 г.

за. У раёне былі створаны Жлобінская і Хальчанская МТС. У іх было 85 трактароў, неабходная колькасць плугоў і баронаў. Да канца 1940 г. пасяўныя плошчы раёна пашырыліся на 16% у параўнанні з дарэвалюцыйным часам, на 25% павялічылася і пагалоўе жывёлы.

Аднаўлялася і ўмацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база Жлобінскага чыгуначнага вузла. Павялічваліся колькасныя і якасныя паказчыкі, асвойвалася новая тэхніка, пераглядалася сістэма ўпраўлення перавозак і г.д. Як і паўсюдна, працоўны энтузіязм выклікаў колькасны рост ударнікаў, ударных і гаразліковых брыгад; небывалым патокам ішлі рацыяналізатарскія прапановы. Толькі ў перыяд III Усесаюзнага конкурсу, аб'яўленага ў гонар 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, рабочыя дэпо ўнеслі 127 прапаноў па паляпшэнню вытворчасці.

Усё гэта знаходзіла шлях да ўсіх працаўнікоў вузла, і немалую ролю ў гэтым, побач з іншымі формамі і метадамі работы, адыгрывала шматтыражная газета «Ударнік» — орган Жлобінскага аддзялення, якая выходзіла раз на тыдзень, расказвала аб жыцці вузла, справах станцыйнікаў, пуцейцаў, сувязістаў, лакаматыўшчыкаў і інш., заклікала іх да новых працоўных здабыткаў.

У ліпені 1933 г. на сетцы чыгунак арганізуюцца вагонныя службы і вагонныя ўчасткі з адпаведнымі рамонтнымі прадпрыемствамі.

Састаў Жлобінскага РК КП(б)Б 3-га склікання. 1926 г.

Жлобінскі гарадскі жаночы аддзел. 1926.

Ранейшы вагонны ўчастак у Жлобіне, які, дарэчы, падпарадкоўваўся непасрэдна аддзяленню дарогі, быў невялікім і тэхнічна слаба аснашчаным прадпрыемствам. Ён не мог выконваць узросшы аб'ём работ, таму частку рамонтных работ вагоннікі выконвалі ў будынку паравознага дэпо Жлобін-Паўночны аж да 1936 г. У 1938 г. дадаткова на станцыі Жлобін-Паўночны быў адкрыты пункт тэхнічнага агляду вагонаў.

І ўсё ж чыгуначны вузел заставаўся «старым», які не адпавядаў узросшым патрабаванням, утрыманню і рамонту больш магутных паравозаў і грузападымальных вагонаў; патрабавалася пашырыць і падоўжыць прыстанцыйныя пуці і інш.

Каб вырашыць новыя задачы па пераасназшчэнню вузла, вызначылі для яго новую пляцоўку (справа і ўздоўж чыгуначнай лініі на Магілёў), правялі пошукава-праектныя работы, склалі каштарысы, выдзялілі першыя асігнаванні на 1941 г. Але ажыццяўленню намечанага перашкодзіла развязаная гітлераўскай Германіяй вайна. *А.А.Лявоненка.*

Эканамічная характарыстыка Жлобінскага раёна за 1931—1932 гг.

У склад раёна ўваходзяць 22 сельсаветы... Агульная тэрыторыя раёна 164 000 га, у т.л. зямель сельскагаспадарчага прызначэння 83,2%, лясоў — 16,8% ... Усяго насельніцтва 79 714 чал., з іх беларусаў 94,51%, яўрэяў — 1,21, палякаў — 2,21, рускіх — 1,09, літоўцаў — 0,07, латышоў — 0,01, інш. — 0,1%.

Паводле тытульнага спіса ў раёне ў 1931 г. было 38 прадпрыемстваў, рабочых — 658 (электрастанцый — 3, цагельных заводаў — 3, цагельных арцеляў— 4, арцеляў па здабычы торфу — 4, броварaў — 1, крухмальны завод — 1, лесазавод — 1, арцеляў па апрацоўцы прута — 2, шавецкіх — 2, кравецкіх — 3, нафтавых млыноў — 9, паравых — 2, птушкарасаднік — 1, адкормачна-ўбойны камбінат — 1, арцель па выпечцы хлеба — 1).

У 1932 г. ў раёне было 8 дзяржаўных і 26 кааператыўных, а ўсяго 34 прамысловыя прадпрыемствы. З іх знаходзілася ў падпарадкаванні наркамснаба — 3, наркамзема — 3, калгасаў — 9, іншых кааператыўных — 3, іншых дзяржаўных — 1, прамкааперацыі — 14. Персанал усіх гэтых прадпрыемстваў на 1.12.1932 г. складаў 1141 чал., у т.л. рабочых — 1024 чал., служачых — 108, акрамя таго працуючых па хатах — 2. Сярэдняя колькасць рабочых за першае паўгоддзе 1932 г. складала 900 чал. Сума асноўных фондаў была 1 343 041 руб. Калі валавая прадукцыя ў аптова-адпускных цэнах адпаведнага года за 1931 год — 3 115 029 руб., то за першае паўгоддзе 1932 г. яна складала 1 489 568 руб. 7 прадпрыемстваў мелі рухавікі.

Найбольш буйнымі прадпрыемствамі раёна ў 1932 г. з'яўляліся: сталярная майстэрня ў г. Жлобін з лікам рабочых у сярэднім за паўгоддзе 1932 г. — 145 і валавой прадукцы-



Будынак чыгуначнага клуба «Кастрычнік».1928 г.

яй за гэты час у цэнах 1926—1927 гг. — 68 000 руб. (рамонт вокнаў і дзвярэй); тарфяная арцель «Уперад» у в. Лукі з лікам рабочых у сярэднім за паўгоддзе — 53 і валавой прадукцыяй — 15 200 руб.; тарфяная арцель «Журавіны» ў в. Кругавец з лікам рабочых — 50; кавальская арцель «Чырвоны металіст» у г. Жлобін з лікам рабочых — 39 і валавой прадукцыяй — 152 320 руб.; цагельная арцель «Чырвоная цэгла» ў г. Жлобін з лікам рабочых — 56 і валавой прадукцыяй — 15 300 руб.; цагельная арцель «13-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі» ў мяст. Стрэшын з лікам рабочых — 59 і валавой прадукцыяй — 38 000 руб.; будаўнічы двор № 1 у г. Жлобін з лікам рабочых — 84 і валавой прадукцыяй — 2460 руб.; абутковая арцель «Чырвоны кастрычнік» у г. Жлобін з лікам рабочых — 37 і валавой прадукцыяй — 53 520 руб.; кравецкая арцель «Аб'яднаная праца» ў г. Жлобін з лікам рабочых — 56 і валавой прадукцыяй — 103 501 руб.; арцель «Круталоз» у мяст. Стрэшын з лікам рабочых — 50 і валавой прадукцыяй — 54 980 руб.; жывёлабойня ў г. Жлобін з лікам рабочых — 7 і валавой прадукцыяй 181 970 руб.; яйка-птушыны камбінат у г. Жлобін з лікам рабочых — 57 і валавой прадукцыяй — 179 840 руб.; крухмальны завод у Чырвоным Беразе з лікам рабочых — 41 і валавой прадукцыяй — 176 400 руб.; бровар у саўгасе «Пірэвічы» з лікам рабочых — 15 і валавой прадукцыяй — 152 460 руб.; лесазавод у в. Салтанаўка з лікам рабочых — 22 і валавой прадукцыяй — 71 440 руб.

У раёне выяўлены наступныя карысныя выкапні: суглінкі — у г. Жлобін і вёсках Затон, Шыхаў, Замосце, Акруг, Папаратнае і Абольцы; пяскі розныя — у мяст. Стрэшын і пас. Загрэбенне; гравій — у в. Рудня і пас. Горкі; гліны — у вёсках Малевічы, Праскурні, мяст. Стрэшын, Жлобін, Баршчоўка, Плесавіцкая Слабодка, мяст. Вадзіцкі, в. Затон, Шыйкава, Ніжняя Алба, Новыя Маркавічы, Забродзе, Мормаль, хутар Гардзялёў, в. Жырхаўка, уроч. Ельнік, Гардылёўка; маргель — у в. Зароўская; жалезнякі — у мяст. Стрэшын, вёсках Баранаўка, Скепня, Рудня, хутарах Брокі, Магільнае і апрача таго па раёне ёсць значныя запасы торфу. Усяго па раёне налічваецца 11 448 га балот.

Сельская гаспадарка раёна спецыялізуецца ў жывёлагадоўча-бульбяным напрамку. Ёсць 7 саўгасаў: «Хальч» са свінагадоўчым напрамкам гаспадаркі, з плошчай сенапахаці — 732,2 га, агульнай колькасцю пагалоўя буйной рагатай жывёлы — 74, свіней — 888 і коней — 54; саўгас імя Гая са свінагадоўчым напрамкам гаспадаркі і пагалоўем буйной рагатай жывёлы — 26, свіней — 133 і коней — 42; «Мормаль» з лугаводчым напрамкам гаспадаркі; саўгас у г. Жлобін налічвае 1350 га сенапахаці, мае свінагадоўчы напрамак гаспадаркі з пагалоўем свіней — 1308 шт.; «Чырвоны Бераг» пры вёсцы з той жа назвай з малочна-жывёлагадоўчым напрамкам гаспадаркі і з пагалоўем буйной рагатай жывёлы — 175; «Каменка» з малочна-жывёлагадоўчым напрамкам і з пагалоўем буйной рагатай жывёлы — 169; «Пірэвічы» з малоч-

на-жывёлагадоўчым напрамкам і з пагалоўем буйной рагатай жывёлы — 377.

У раёне налічваецца 12 137 гаспадарак, з іх на 1.1.1933 г. калектывізавана 3590, што складае 29,6%. Усяго ў раёне 110 калгасаў, якія аб'ядноўваюць 28 305 гаспадарак, 19 га сенапахаці. У калгасах працуюць наступныя фермы: свінагадоўчыя — 43 з агульнай колькасцю галоў на 20.12.1932 г. — 1435; малочна-таварныя — 19 з пагалоўем на 10.10.1932 г. — 2484; па вырошчванні маладняку (цялят) — 30 з пагалоўем на 10.12.1932 г. — 1023 і каняводчыя — 2 з пагалоўем — 59. У раёне ёсць МТС з трактарным паркам у 17 адзінак. МТС абслугоўвае 50 калгасаў.

У калгасах раёна ёсць наступная колькасць складаных сельскагаспадарчых машын: сенакасілак — 33, конных грабляў — 63, жняярак-самаскідак — 84, снопавязалак — 6, бульбакапалак — 10, сеялак радковых — 95, трактароў — 7, складаных малатарняў — 8 і ў МТС складаных малатарняў — 10, ільноцерабілак — 6, сеялак — 24, радковых — 4.

Пасяўная плошча раёна ў 1932 г. складала 60 698 га, у т.л. збожжавых культур — 68,2%, бульбы — 20,8%, тэхнічных культур — 5%, сеяных траў — 4,6%.

Загатоўкі 1932 г. на 1.2.1933 г. далі наступныя лічбы ў тонах: ільновалакна — 147, пянькі — 8, ільнасемя — 184, канапель — 12, саломы — 750.

План веснавой сяўбы па раёне на 1933 г. (у га)

Назва сектараў	Яравы клін	Збожжавыя культуры	Тэхнічныя культуры		Бульба
			агульная плошча	у т.л. ільну	
Саўгасны	2358	1132	10	10	3271
Калгасны	13000	6630	1250	900	3500
Адна-асобны	25742	13638	2190	1740	8473

У раёне на 1.1.1933 г. існавала 68 чатырохгадовых школ, у іх настаўнікаў — 101 і вучняў — 5344.

Працэнт пісьменнасці па раёне — 87.

Партарганізацыя — 52 ячэйкі, 915 камуністаў, з іх членаў партыі — 663 і кандыдатаў — 252. Камсамольская арганізацыя на 1.4.1932 г. — 74 ячэйкі з лікам 1086 чал.

Арганізаваны палітаддзелы: пры Жлобінскай МТС; пры саўгасе «Хальч».

У раёне выходзяць газеты «Шлях сацыялізму» і чыгуначная «Ударнік».

Друкуецца па кн.: Усе раёны БССР. Мн., 1933. С. 290.

Заўвага: эканамічная характарыстыка раёна дадзена без уліку Кіраўскага і Шчадрынскага сельсаветаў, якія знаходзіліся ў той час: першы — у складзе Рагачоўскага, другі — Парыцкага раёнаў.

За газетным радком

У былым панскім маёнтку «Бяльчо» створана камуна «Надзея». Яе ўзначаліў член партыі з 1905 г. Дзяніс Несцеравіч Шынкевіч.

Камуніст, 1967, 7 лютага.

* * *

Культурна-асветны аддзел Камісарыята земляробства ССРБ (Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь — Рэд.) з 1 верасня г. г. адкрывае ў маёнтку «Чырвоны Бераг» ніжэйшае Бабруйскае сельскагаспадарчае вучылішча (ст. Чырвоны Бераг Лібава-Роменскай чыгункі). Пры заяве жадаючыя паступіць у вучылішча павінны прыкласці пасведчанне аб адукацыі (не ніжэй 1-й ступені працоўнай школы).

Заняткі пачнуцца ў першай палове кастрычніка месяца.

Звязда, 1920, 15 верасня.

* * *

Паступова Шчадрын з купецкага ператвараецца ў працоўнае мястэчка. У 1929 г. яго жыхары выказалі жаданне аб'яднацца ў адну гаспадарку для далейшага ўдасканальвання вядзення земляробства і назвалі калгас «Сацыялістычны шлях». Яго старшынёй быў выбраны А.Альшанскі. У састаў праўлення ўвайшлі паважаныя ў мястэчку людзі, руплівыя і ведаючыя хлебаробскую справу гаспадары.

Восенню таго ж года калгас набыў першы трактар, які перадалі для эксплуатацыі найбольш дасведчаным у тэхніцы Пятру Альшэўскаму і Нікадзіму Сіваку. Менавіта з іх пачаўся «род» механізатараў мясцовага калгаса імя К.Я.Варашылава.

Камуніст, 1967, 7 лютага.

* * *

...Зараз пры калгасах і сельсавецкіх дамах сацкультуры Жлобіншчыны працуе больш 100 розных гурткоў самадзейнасці, у якіх прымаюць удзел больш трох тысяч маладых і старых калгаснікаў.

Чырвоная змена, 1936, 21 верасня.

* * *

Сёння даецца старт другому этапу культэстафеты. Маршруты культэстафеты накіраваны на канчатковую ліквідацыю прарываў у справе выканання планаў па ўсенавучу і ліквідацыі непісьменнасці. Жлобін. Дэкада штурму прарываў у галіне ўсенавуча і ліквідацыі непісьменнасці дала па раёне наступныя вынікі. Наведванне дзецьмі школ павялічылася з 97,3% да 98,2%. Ахоп школай пераросткаў узняўся з 85% да 89,5%, ахоп ліквпунктамі — з 50% да 65%. Амаль усе школы раёна забяспечаны апалам. Толькі Бабоўскі сельсавет забяспечыў школы апалам часткова, бо ніяк не здолеў арганізаваць вывазку дроў. За час правядзення дэкады штурму значна палепшылася справа палітэхнізацыі школ. Многія школы прымацаваны да прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў. Недахоп у тым, што не па ўсіх школах арганізаваны рабочыя пакоі. 20% дзяцей атрымліваюць гарачыя заўтракі.

Звязда, 1931, 6 красавіка.
Падрыхтавала да друку В.В.Сафонава.

* * *

У 1933 г. ў мястэчку Шчадрын арганізоўваецца МТС. Пачалося з падрыхтоўкі кадраў, набыцця і ўстаноўкі абсталявання. Потым паступілі трактары. Вясной наступнага года машыны павялі Пятро Семянец, Максім Хорт, Пятро Казак, Міхась Казак і інш.

Ішлі гады, удасканальвалася сістэма машынна-трактарных станцый, расла тэхнічная ўзброенасць. Напярэдадні вайны на палях зоны Шчадрынскай МТС працавалі 44 трактары. Станцыю ўзначальваў Дарафей Рыгоравіч Пішчала. Зампалітам у яго быў Гендаль Альшанскі.

Камуніст, 1967, 7 лютага.

* * *

1937 год — год выбараў у Вярхоўны Савет СССР, якія праводзіліся па новай Канстытуцыі, што атрымала назву сталінскай. Ход перадвыбарнай кампаніі шырока асвятляўся ў прэсе. У ліку першых кандыдатаў у дэпутаты паўсюдна былі вылучаны члены палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з Генеральным сакратаром І.В.Сталіным.

У той жа час кіраўніцтва ЦК КП(б)Б атрымлівала паведамленні пра выказванні зусім іншага характару, якія адзначаліся ў сельскіх раёнах Беларусі амаль паўсюдна. Вось толькі адна выпіска са спецзводак.

«Жлобінскі раён. У калгасе «Чырвоная ніва» Мінянкоў вёў контррэвалюцыйную агітацыю за вылучэнне кандыдатуры Рыкава. У калгасе «Чырвоны трактарыст» аднаасобнік Буранкоў заявіў: «Чаму вылучаюць Сталіна і Молатава і не вылучаюць Галадзеда?» Севасцьянчык Фёдар (Кабанаўскі сельсавет) агітаваў калгаснікаў, каб яны не галасавалі за тав. Сталіна.

Мінянкоў, Буранкоў і Севасцьянчык арыштаваны».

Іншадумства праследавалася. Іншадумцам месца ў грамадстве не было...

Звязда, 1996, 15 кастрычніка.

Спіс калгасаў па стану на 1.1.1941 г.

(у дужках даецца год стварэння)

Горад Жлобін — «Чырвоны Жлобін» (1930). У пачатку 1950-х гадоў аб'яднаўся з калгасам імя Куйбышава (в. Лугавая Вільня, Майскі сельсавет). З 1960 г. ў складзе саўгаса «Луцкі».

Акцябрскі сельсавет: в. Акцябр — імя Кагановіча (1929), імя Жданава, «Акцябр»; пас. Горкі — імя Жданава (1931); в. Грабск — «Зара» (1931); в. Затон — «Дняпроўскі» (1929); в. Праскурні — «12 год Кастрычніка» (1929), «50 год БССР».

Верхне-Албянскі сельсавет: в. Верхняя Алба — «Новае жыццё» (1929), «Перамога»; в. Ніжняя Алба — «Чырвоная ніва» (1930), «Праўда»; пас. Садовы — імя Сталіна (1929); в. Шыхаў — «Камсамол» (1930).

Дабрагошчанскі сельсавет, в. Абольцы — «Чырвоны араты» (1933), імя Жданава; пас. Бор — «Чырвоны Бор» (1933); в. Васілевічы — імя Горкага (1931); в. Дабрагошча — «Прагрэс» (1929); в. Дарагінь — «Чырвоная перамога» (1932); в. Забродзе —



Трактар «фардзон», на якім працавалі ў 1920-я гады першыя калгаснікі Жлобінскага раёна. Устаноўлены на тэрыторыі «Сельгастэхнікі».

«Чырвоны пуцілавец»; в. Мормаль — «Чырвоны Акцябр» (1933); вёска Падхваёва, Пірэвічы — «Новае жыццё» (1932); в. Сельнае — імя Чапаева (1929), «Смычка» (на хутарах) (1929), потым аб'ядналіся; в. Старына — «Герой працы» (1929); в. Яшчыцы — «Астравок» (1929).

Кабанаўскі сельсавет: в. Адрубы — «Чырвоная Бярэзіна» (1930); в. Вялікі Лес — «Чырвоная зара» (1929), імя Будзённага, «Светлы шлях»; в. Кабанаўка — імя Варашылава (1930), «Камуніст»; в. Ляды — «Камінтэрн» (1929).

Кароткавіцкі сельсавет: в. Антонаўка — «Чырвоны красавік» (1931); пас. Вадзіцкі — «Багатыр» (1933), в. Галы — «Чырвонаармеец» (1933), у канцы 1930-х гадоў аб'ядналіся ў калгас «Чырвонаармеец»; в. Гармавічы — «Чырвоны прамень» (1931); в. Дуброва — «Чырвоная Дуброва» (1933); в. Забалоцце — «Чырвонае Забалоцце» (1934); в. Кароткавічы — «11 год Кастрычніка» (1929), імя Калініна, «Радзіма»; в. Плесавіцкая Слабодка» — імя Энгельса (1929), в. Плесавічы — «17 год Кастрычніка» (1929).

Кіраўскі сельсавет: в. Гурская — «Шлях сацыялізму» (1929); в. Кірава — імя Свярдлова (1929); в. Селівонаўка — «Чырвоны гай» (заходняя частка вёскі) і «Гудок» (1931) у 1936 г. аб'ядналіся; в. Шапарня — «За Радзіму» (1930).

Луцкі сельсавет: в. Беліца — «Чырвоная Беліца»; пас. Вярбічаў — імя Дзяржынскага (1934); пас. Гуляй Поле — «Чырвоная зорка» (1935); в. Зялёны Краж — імя Тэльмана (1930); в. Кабанаўка — імя Крупскай (1930); пас. Красная Звязда — «Шлях сацыялізму»; пас. Красны Рог — «Чырвоны трактарыст» (1935); в. Лебядзёўка — «Перамога 2-й пяцігодкі» (1935); пас. Леніна — «Чырвоны шлях» (1935); пас. Лісі Лог — «Наша

Хлеб — дзяржаве.

Радзіма»; в. Лукі — «Чырвоныя Лукі», у канцы 1930-х гадоў аб'яднаўся з калгасам імя Дзяржынскага; пас. Надзежда — імя Крупскай; в. Новы Мазалаў — імя Войкава (1927); в. Новыя Лукі — «Верны шлях» (1935); в. Рэкта — «Чырвоны лётчык» (1929); в. Тапіла — «Радзіма».

Майскі сельсавет: в. Антонаўка — «Ленінец» (1933); в. Асінаўка — «2-я пяцігодка» (1930); в. Бабоўка — «Зара» (1930), імя Панамарэнкі; в. Даліна — «Даліна» (1930); в. Дзяніскавічы 1-я — «Прывітанне (1931), в. Дзяніскавічы 2-я — імя Саветаў (1934); в. Лугавая Вірня — «Лугавая кветка» (1929), імя Куйбышава; в. Майскае — «Рассвет» (1924); пас. Малыя Казловічы — «Будаўнік» (1943); в. Цупер — «Чырвоны Кастрычнік» (1934); в. Чорная Вірня — «Праўда» (1931).

Малевіцкі сельсавет: пас. Заваднае — імя Дзімітрова (1930); в. Казіміравa — імя Варашылава (1930); в. Карма — «Чырвоны гарадок» (1930); в. Малевіцкая Рудня — імя Калініна (1930); в. Малевічы — «Чырвоны партызан» (1930); в. Навінкі — «Чырвоны рубеж» (1930).

Навамаркавіцкі сельсавет: в. Жырхаўка — «Новая Жырхаўка» (1931); в. Закараў — імя Кірава; в. Новавінаградаў — «Сокалаў», «Вінаградаўскі» (1932), «Новы Вінаградаў»; в. Новыя Маркавічы — «12 год Кастрычніка» (1929), імя Панамарэнкі, «XX партз'езд, «Бярэзіна»; в. Прыбудак — «Усход» (1930), «Звязда»; в. Таўстыкі — «Прагрэс» (1933).

Папаратнянскі сельсавет: в. Гелін— «Новы мір», імя Хрушчова; в. Касакоўка — «Шлях Леніна» (1932); в. «Новая Карма» — «Чырвоны баец» (1930); в. Папаратнае — «Ударнік» (1930), імя Леніна, «Іскра»; пас. Першамайск — «Першамайскі» (1932).

Пірэвіцкі сельсавет: пас. Гуцішча — «Пралетарый» (1930); пас. Колас — «Колас» (1931); в. Кругавец — імя Будзённага (1929); «Запаветы Ільіча»; пас. Малінаўка — «Пераможац» (1931); пас. Мікольскі — «16 год РСЧА»; пас. Першамайскі — «Першамайскі»; в. Пірэвічы — імя Леніна (1929); в. Рудзенка — «Чырвоная Рудзенка» (1929); в. Скепня 1-я — імя Молатава (1931), в. Скепня 2-я — імя Энгельса (1930); пас. Сухі Востраў — імя Кагановіча (1931); в. Шчытнае — «Чырвонае Шчытнае» (1931).

Салонскі сельсавет: в. Аляксандроў — «1 Мая» (1930); в. Вялікія Рагі, в. Малыя Рагі — «Яскравы шлях» (1930); в. Істопкі — «Серп і молат» (1930); в. Казёл — «Чырвоны жнівень» (1930); в. Нівы — «Чырвоная Ніва» (1930); в. Саланое, в. Салонская Карма — «На варце» (1930), імя Малянкова, імя Леніна.

Стараруднянскі сельсавет: вёскі Баранаўка, Завад, Глушыца — «VII з'езд Саветаў» (1931); в. Калыбаўка — «Камінтэрн» (1931); в. Старая Рудня — імя Кірава (1929; першы старшыня С.Р.Войстрыкаў); в. Чацвярня — імя Сталіна (1931), «Савецкая Беларусь».

Стрэшынскі пасялковы Савет: в. Грымячы Мох — «Чырвоная гара» (1933); в. Зломнае — «Пралетарый»; в. Новая Каменка — «Бальшавік»; в. Радуцін — «Чырвоны Радуцін» (1931); г.п. Стрэшын — 1-е Мая (1931), «Прабойны» (1932). Гл. таксама артыкул «Аб'ядноўваліся дзеля лепшай долі».

Чырвонабярэжскі сельсавет: в. Баршчоўка — «VII з'езд Саветаў»; в. Гарбачоўка — імя Чэлюскіна (1932); в. Змяёўка — «Чырвоная Беларусь» (1929), імя Калініна; хут. Кадзішча — «Чырвоны барэц»; в. Казіміраўская Слабодка — імя Горкага; в. Кругі — «Дружба»; в. Марусенька — імя Фрунзе (1929); в. Радуша — «Чырвоная Радуша» (1929), «Вольная праца»; в. Святое — «Чырвоны бор»; в. Чарцёж — імя Чкалава; в. Чырвоная Слабада — «Чырвоны камунар»; в. Чырвонабярэжская Слабодка — «Чырвоны камунар»; в. Чырвоны Бераг — «XVII партз'езд».

Шчадрынскі сельсавет: в. Аляксандраўка — «Слава»; в. Брусава — «Чырвоны араты»; в. Дабравольшча — імя Сталіна; в. Дворышча — імя Леніна (1929); в. Замен-Рыння — «Яскравы прамень»; в. Зарэчча — імя Кірава; в. Кіцін — «Чырвоная зорка» (1929); в. Людгардаўка — «Чырвоная Слабодка»; в. Малінаўка — імя Дзяржынскага; в. Навозы — «Ударнік»; в. Новая Мар'еўка — «За Радзіму»; в. Пякалічы — «Чырвоная змена», імя Калініна; в. Салоцін — «Чырвоная Ала»; в. Селішча — «Пераможац»; в. Скарына — імя Кутузава; в. Скарынава Слабодка — імя Ліцвінава; в. Сцяпы — «Новае жыццё» (1929), імя Шверніка, «Прагрэс»; в. Сяліба — «Пераможац»; в. Усполішчы — «Новы быт» (1931); в. Шчадрын — «Сацыялістычны шлях» (1929), імя Варашылава. Гл. таксама артыкул «З гісторыі калгаса «Прагрэс».

Спіс складзены на падставе матэрыялаў Занальнага Дзяржаўнага архіва ў г. Жлобін і ўспамінаў старажылаў.

Як стваралася сялянская арцель

27.1.1926 г. на агульным сходзе заснавальнікаў масласыраварнай арцелі ў в. Кругавец прысутнічала 25 яе членаў. Сход прыняў рашэнне стварыць масласыраварную арцель «Кругавец» (па назве вёскі). Для падпісання статута, заявы ў адрас Бабруйскага зямельнага аддзела аб яго рэгістрацыі былі выбраны ўпаўнаважаныя: Анісім Данілавіч Карпенка, Цімох Піліпавіч Купрэеў, Пракоп Іванавіч Кірыленка, Гаўрыла Навумавіч, Іван Савельевіч і Фёдар Ільіч Самусенкі, а таксама Сямён Трафімавіч Шапавалаў. Членамі праўлення сталі: Цімох Купрэеў, Макар Громаў, Мікалай Балянкоў, Пракоп Кірыленка і Васіль Самусенка, кандыдатамі — Бася Калман і Майсей Ганкін. У склад рэўкамісіі ўвайшлі Анісім Карпенка, Пётр Самусенка, Герасім Усянкоў, кандыдатам — Мікалай Крупенка.

Раён дзейнасці — вёскі Кругавец, Пірэвічы, пасёлкі Верны, Дзедаў Курган і Нікольскі. Паявы ўзнос члены таварыства вызначылі ў 3 руб., уступны — 50 кап. На тым жа сходзе было прынята рашэнне аб уступленні арцелі пайшчыкам у Бабруйскі акруговы сельгассаюз.

16.2.1926 г. пасля афармлення дакументаў упаўнаважаныя арцелі звярнуліся з заявай у акруговы земаддзел. Яны пісалі: «Прыкладаючы пры гэтым Статут Кругавецкай масласыраварнай арцелі «Кругавец» у 3 экземплярах і пасведчанне раённага выканаўчага камітэта аб тым, што заснавальнікі не пазбаўлены права выбіраць у Саветы, просім Статут унесці ў належны рэестр кааператыўных таварыстваў. На падачу гэтай заявы і даручэнне зарэгістраваць Статут упаўнаважваем Купрэева Цімоха Піліпавіча, які мае месца жыхарства ў саўгасе «Пірэвічы», па адрасу якога пакуль і просім накіроўваць паперы для нас».

Хутка статут масласыраварнай арцелі «Кругавец» быў зарэгістраваны.

В.А.Бычкова.

Кааператыўныя таварыствы ў в. Лісі Лог (Луцкі сельсавет)

У маі 1927 г. жыхары в. Лісі Лог стварылі кааператыўнае таварыства па жывёлагадоўлі, потым узнікла думка арганізаваць машыннае кааператыўнае таварыства. Яно, згодна статута, павінна было садзейнічаць паляпшэнню гаспадарак сваіх членаў, павышэнню іх прадукцыйнасці і даходнасці ў выніку прымянення машын.

11.9.1927 быў прыняты Статут таварыства, пазней зарэгістраваны Бабруйскім акруговым зямельным аддзелам. Вышэйшым органам таварыства з'яўляўся агульны сход, які выбіраў праўленне і рэвізійную камісію. Сваю вытворчую дзейнасць таварыства пачынала на падставе ўнесенага яго членамі пая. Справаздачны год абмяжоўваўся першым кастрычнікам папярэдняга і будучага гадоў.

Дакументы сведчаць

СА СТАТУТА КААПЕРАТЫЎНАГА ТАВАРЫСТВА ПА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

На основании действующих узаконений по сему уставу учреждается товарищество под названием «Передовик» с районом деятельности пос. Лисий Лог Лукского с/с Жлоб(инского) района Бобр(уйского) окр(уга).

Товарищество имеет целью улучшать хозяйство членов и повышать его производительность и доходность посредством развития племенного животноводства.

Членами товарищества могут быть лица обоего пола, достигшие 18-летнего возраста, занимающиеся сельским хозяйством или связанными с ним промыслами. Прием производится общим собранием членов товарищества, которое может поручить прием правлению.

Член товарищества несет совокупную со всеми прочими членами имущественную ответственность по обязательствам товарищества, т.е. в случае недостаточности капиталов и имущества товарищества на покрытие его обязательств отвечает своим имуществом дополнитель-

но к своим паям в товариществе, но не выше суммы, равной десятикратному размеру обязательных паевых взносов.

Пай определяется в размере трех рублей. Паевой взнос при вступлении в товарищество уплачивается полностью или может быть рассрочен, причем размер и сроки взносов определяются общим собранием.

Вступительный экзамен определяется в размере 25 коп. с каждого члена товарищества и ни при каких условиях не подлежит возвращению внесшему его члену.

Делами Товарищества управляют: общее собрание членов товарищества и правление.

О времени и месте созыва общих собраний, а также о предметах, подлежащих их обсуждению, правление должно сообщить не позднее как за неделю до собрания членам Товарищества и, кроме того, на видных местах вывесить объявления не позже, как за три дня до собрания.

Отчетный год считается с 1 июня 1927 (г.) по 1 июня 1928 г.

Учредители животноводческого т(оварищест)ва «Передовик» пос. Лисий Лог Лукского с/с Жлобинского района Б(обруйского) окр(уга).

1. БЕЖЕЛЕВ Афанасий Ипатов(ич)
2. ЗЕНЬКОВ Наум Петрович
3. КАРПОВ Павел Тимохов(ич)
4. ОСИПОВ Григорий Антонов(ич)
5. ФОМИН Ефим Анисимов(ич)
6. ЗЕНЬКОВ Макар Петрович

Собственноручные подписи Бежелева и др. Лук(ского) с/с Жл(обинского) района свидетельствуют 20.5.27 г.

Председатель
подписи неразборчивы
Секретарь

З гісторыі калгаса «Прагрэс»

На тэрыторыі цяперашняга калгаса размешчаны шэсць вёсак: Сцяпы, Салоцін, Селішчы, Усполішчы, Новая Мар'еўка і Зарэчча. Да Вялікай Айчыннай вайны ў кожнай вёсцы быў асобны калгас.

СЦЯПЫ. На базе бядняцкіх гаспадарак і таварыства «Хлебароб» быў арганізаваны калгас «Новае жыццё». Узначаліў яго Д.Зыкун, галоўным бухгалтарам стаў Г.Анішчанка. Першымі ўступілі ў калгас Ф.Балында, Я.Вараб'ёва, Н.Дрык, І.Дрындаль, Д.Зыкун, Ф.Кохна, П.Мітраховіч, М.Мураль, П.Мураль, С.Патапчык, А.Сіманенка, Б.Сіманенка, С.Сіманенка, Т.Сіманенка, Х.Сіманенка, Г.Сцяпанаў, С.Сцяпанаў, І.Харанека. Поўная калектывізацыя ў гэтай вёсцы была завершана ў 1933 г.

САЛОЦІН. У 1929 г. тут быў створаны калгас «Чырвоная Ала». Арганізатарамі яго з'яўляліся С.Асташоў, М.Асташоў, А.Багданаў, П.Гурскі, Ф.Дзяткоў, С.Іваноў, І.Сысоеў, П.Філіпаў. Старшынёй калгаса быў выбраны Дубовік.

НОВАЯ МАР'ЕЎКА. Жыхары гэтай вёскі стварылі калгас «За Радзіму».

ЗАРЭЧЧА. Першымі арганізатарамі калгаса «Абуджэнне» ў вёсцы ў 1930 г. сталі Р.Асташоў, М.Бузаў, Г.Вараб'ёва, А.Вараб'ёў, В.Вараб'ёў, І.Якаўлеў і іншыя.

СЕЛІШЧЫ. У гэтай вёсцы калгас быў створаны ў 1930 г. Ён атрымаў назву «Пераможац». Першымі калгаснікамі сталі Д.Банікоўскі, Б.Грыненка, В.Касцянок, П.Мянькоўскі, А.Сіманенка, В.Сіманенка, І.Сіманенка, Б.Харанека, Д.Харанека, Ф.Харанека. Узначаліў калектыўную гаспадарку М.Л.Сіманенка.

УСПОЛІШЧЫ. Тут калгас быў арганізаваны ў 1931 г. і называўся «Новы быт».

Пасля Вялікай Айчыннай вайны калгасы аднавілі сваю дзейнасць. У красавіку 1950 г. адбылося першае іх узбуйненне. Хлебаробы калгаса «Новае жыццё», «Чырвоная Ала» і «Пераможац» аб'ядналіся ў калгас імя Шверніка. Вёскі Усполішчы, Новая Мар'еўка і Зарэчча ўвайшлі ў калгас імя Кірава.

У чэрвені 1953 г. адбылося аб'яднанне калгасаў імя Шверніка і імя Кірава. Да 1963 г. агульная гаспадарка называлася калгасам імя Кірава, пасля на агульным сходзе хлебаробы далі ёй назву «Прагрэс».

М.Р.Міхальцоў.

Аб'ядноўваліся дзеля лепшай долі

Да пачатку калектывізацыі ў мяст. Стрэшын было больш за 270 аднаасобных гаспадарак.

Па-рознаму сустрэлі сяляне вестку аб пачатку калектывізацыі. Дваццаціпяцітысячнік Іосіф Яндульскі гаварыў аб перавагах калектыўнага вядзення гаспадаркі, заклікаў аб'ядноўвацца. Вясной 1931 г. арганізавалася агульная гаспадарка «1-е Мая». Першымі ў калгас уступілі 35 сем'яў, сярод якіх былі Пахом Рогаў, Ганна Рогава, Ульяна Сакаўчук, Сяргей Бадзілоўскі, Адам Шэметаў, Піліп Дзеружэнка і іншыя сяляне. У распараджэнні калгаснікаў знаходзіліся хлеў, ёўня, 18 коней, 35 кароў, 2 свінаматкі. Першым старшынёй калгаса стаў І.Яндульскі, брыгадзірамі працавалі Пахом Рогаў і Андрыян Кулакоўскі.

Матэрыяльна-тэхнічная база калгаса з цягам часу паступова ўмацоўвалася: былі пабудаваны 3 канюшні, кароўнік, свінарнік, амбары, павеці, склады. На фермах налічвалася ўжо 85 коней, 242 галавы буйной рагатай жывёлы, 120 авечак, 80 свіней, пасека. Гаспадарка забяспечвала сябе фуражом, насеннем, датэрмінова выконвала планавыя пастаўкі дзяржаве.

Да 1935 калектывізацыя ў Стрэшыне ў асноўным была завершана: створаны калгасы «1-е Мая» (аб'яднаў 160 сялянскіх гаспадарак), імя XVII партз'езда (у пасёлку Ліпы і Новы Свет), «Прабойны» (аб'яднаў 32 уласныя гаспадаркі). Невялікія калектыўныя гаспадаркі арганізаваны ў пас. Грымячы Мох і в. Радуцін. У 1950-я гады ўсе яны ўвайшлі ў склад калгаса «1-е Мая».

Сярод калгаснікаў былі і ўдарнікі, і пераможцы спаборніцтва. Хлебаробы з гонарам называлі прозвішчы Ганны Рогавай, Ганны Панамаровай, Сяргея Ступянёва, Пахома Рогава і іншых, хто паказваў прыклад ў працы.

П.С.Бадзілоўскі.

Славіўся «Рассвет» людзьмі і багаццем

Я не бачыў, якім быў калгас «Рассвет» у пачатку 1920-х гадоў. Таму пішу на падставе ўспамінаў свайго бацькі, іншых удзельнікаў і відавочцаў яго зараджэння і станаўлення. Хутка пасля стварэння «Рассвета» ў в. Шапілава (цяпер в. Майскае) узнік яшчэ адзін калгас «Пераможца». Потым гэтыя гаспадаркі аб'ядналіся ў адзін калгас.

...У Майскім і навакольных вёсках умацоўвалася, набіралася сілы Савецкая ўлада. Вярнуліся з франтоў грамадзянскай вайны мясцовыя жыхары Ц.А.Серадоў, П.Я.Пугачоў, П.Г.Гаспадарэнка, У.А.Машніцкі, Я.Ц.Кавалёў, М.Я.Пугачоў, І.Ц.Кавалёў, І.А.Драчоў, А.В.Прыцаў, П.А.Філіянаў і іншыя. Прыехаў у родныя мясціны і былы ўдзельнік рэвалюцыйных падзей 1905—06 гг. уральскі рабочы Трыфан Мінавіч Пугачоў. Вяскоўцы ўсё часцей гаварылі пра тое, што мірыцца з межамі і працаваць кожнаму паасобку далей нельга. І вось неяк пагадзіліся на тым, каб аб'яднацца ў таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Чулі, што такія арганізацыі ўжо дзейнічаюць у Беларусі.

Спачатку ў адным канцы Майскага, потым у другім сяляне-беднякі аб'ядналіся ў таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі: «Колас» і «Колакал». Менавіта ім было суджана пачынаць сённяшні «Рассвет». Яшчэ не было тады ў вёсцы хаты-чытальні (яна адкрылася ў 1924 г.), таму сяляне збіраліся купкамі ў каго-небудзь з суседзяў, найбольш адукаваных ці добрых гаспадароў. Моладзь пацягнулася да мясцовага настаўніка Лаўрына Блешанкова, каб атрымаць адказы на пытанні, якія ставіла жыццё, знайсці сваё месца ў ім.

Неяк на «агеньчык» завітаў Трыфан Пугачоў, у далейшым ён стаў сталым наведвальнікам такіх сходак. Па яго ініцыятыве ў вёсцы была створана камсамольская арганізацыя, якая вяла за сабой моладзь. Першымі падалі заявы аб прыняцці ў камсамол 12 маладых сялян. Сярод іх Міхась Філіянаў, Мікалай Купцоў і інш. Захар Ерамеевіч Сафонаў — з ліку першых камсамольцаў — у 1928 г. быў старшынёй мясцовага сельвыканкома і адначасова ўзначальваў камсамольскую арганізацыю.

Абмалот хлеба ў калгасе «Рассвет». 1940 г.

Летам 1924 г. вяскоўцы зноў сабраліся на сход, каб вырашыць пытанне аб стварэнні калгаса. Гэту прапанову выказаў Трыфан Пугачоў. Яго падтрымалі Ціхан Серадоў і Піліп Пугачоў. Назвалі калгас «Рассветам». Першым старшынёй быў абраны камуніст Трыфан Мінавіч Пугачоў, і першыя 27 сем'яў пачалі пракладваць новую дарогу. Цяжка было ім. Не драмалі і тыя, каму такія парадкі не падабаліся. Таму ў першыя гады існавання калгаса згарэлі яго пабудовы, знішчана абагуленая жывёла. У агні гінуў сабраны хлеб.

Аднак гэта не спалохала калгаснікаў. Яны аднавілі знішчанае, адрадзілі ферму на 50 галоў буйной рагатай жывёлы. Гаспадарка набыла за кошт дзяржаўнага крэдыту першы трактар «фардзон». Калгас паступова мацнеў і багацеў, развіваў падсобныя промыслы. З'явіліся крухмальны і масласыраварны заводы. Калгаснікі таксама куплялі розны сельскагаспадарчы інвентар. Адкрыліся дзіцячыя яслі, загадваць імі даручылі Таццяне Мацвееўне Сафонавай. Паступова пацягнуліся ў калгас і хутаране. У 1929 г. «Рассвет» аб'ядноўваў ужо 150 сем'яў. На зароблены сродкі калгаснікі пачалі расшыраць жывёлагадоўчыя фермы, будаваць кватэры, набываць тэхніку. Неўзабаве адбылося наваселле і ў пабудаваным Майскім Доме культуры.

У калгасе атрымлівалі ўстойлівыя ўраджаі, праца хлебаробаў і жывёлаводаў аплачвалася як натурай (зерне, бульба, сена, яблыкі, мёд, ільняное і канаплянае масла і інш.), так і грашыма. Развівалася калгасная вы-

Т.М.Сафонава, загадчыца дзіцячага сада ў в. Майскае.

Уборка ўраджаю ў калгасе «Рассвет». 1940 г.

творчасць. Да «Рассвета» пачалі далучацца нават матэрыяльна забяспечаныя аднаасобнікі. Да канца 1938 г. ўсе яны ўступілі ў калгас.

Слава пра калгас паляцела далёка за плёсы Дняпра. У 1931 г. калгас нечакана наведалі госці: і не блізкія, а з-за мяжы. Першы, каму пашчасціла іх сустрэць, быў Савелій Нічыпаравіч Машніцкі. Ён якраз ішоў у поле. За ваколіцай убачыў легкавую аўтамашыну, над кабінай якой развяваўся чырвоны сцяг... Гэта былі рабочыя з Германіі, якія шмат чулі аб справах калгаса. Яны везлі памятны сцяг, які перадалі рабочыя з Лейпцыга. На ім ззялі словы, вышытыя золатам: «Руку — таварышу, кулак — ворагу!». Машніцкі падаў руку нямецкаму рабочаму і адчуў моцны поціск. Машніцкага пасадзілі ў машыну. Пад разгорнутым чырвоным сцягам ён і прыехаў з нямецкімі сябрамі ў Майскае.

Гэта была сардэчная, незабываемая сустрэча, пра яе доўга ўспаміналі ў Майскім і гаварылі: «Вось глядзіце, адны немцы, у ваенных мундзірах, разагналі камбеды ў 1918, другія, у рабочых блузах, горача віншавалі былых камбедаўцаў. Не адна, значыць, Германія. Адна з ружжом, другая з адкрытай душой!». Паміж рассветаўцамі і лейпцыгскімі рабочымі завязалася перапіска.

Вось адно з пісем лейпцыгскіх рабочых: «Дарагія таварышы! Прайшоў год, як мы мелі шчасце наведаць Савецкі Саюз і захапляцца поспехамі вашай калектыўнай гаспадаркі. Мы ўпэўнены, што вы і наперад будзеце высока несці славу свайго калгаса і што ў гэтым годзе атрымаеце нямала перамог... Няхай жыве Савецкі Саюз!». Перапіска існавала да 1933 года.

Сапраўднай гаспадыняй сярод высокіх хлябоў, блакітнага разліву льну адчувала сябе Таццяна Мацвееўна Зубава. У працу хлебароба яна ўкладала ўсё сваё ўмельства, у пачатку 1930-х гадоў была выбрана членам ЦВК (Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта) БССР. Дачка былога батрака стала членам урада.

Вучыліся і бацькі, і дзеці. Рассветаўская школа гаспадарання каціравалася надзвычай высока. Таму мясцовыя кадры высока цаніліся. Лепшыя з гаспадарнікаў станавіліся кіраўнікамі. Ціхан Аляксандравіч Серадоў стаў дырэктарам саўгаса, Павел Антонавіч Філіянаў — дырэктарам МТС, Марк і Піліп Пугачовы, Фака Сёмчанка былі выбраны старшынямі калгасаў...

Будаўніцтва жывёлагадоўчай фермы ў калгасе «Рассвет». 1940 г.

П.Я.Пугачоў, старшыня калгаса «Рассвет».

Але не толькі радасць панавала ў сем'ях рассветаўцаў. Здараліся і змрочныя дні, калі з іх радоў вырывалі лепшых людзей. Ад рук гітлераўскіх захопнікаў загінулі Ф.М.Сёмчанка, Д.З.Купцоў, П.С.Саладоўнікаў, Я.П.Гірыловіч, П.Я.Пугачоў і інш. Але не здолеў вораг скарыць рассветаўцаў. Найбольш маладзейшыя і мацнейшыя пайшлі ў партызаны, а тыя, што засталіся на месцы, усяляк ім дапамагалі. Мужна змагаліся ў партызанскіх атрадах Аляксандр Бобрыкаў, Іван Казлоў, Іван Сакуноў, Міхаіл і Мікалай Купцовы, Лаўрэнцій Паўлаў, Ніна Архіпцова, Павел Семянчукоў, Іван Ціхановіч і іншыя.

Па-рознаму склаўся лёс першых арганізатараў «Рассвета» — Т.М.Пугачова, П.А.Філіянава, Л.А.Станіслававa, Е.Т.Кавалёва і інш. Але ўсе яны жылі сціпла, атрымлівалі на працадні аднолькава з усімі калгаснікамі і ніколі не цураліся людзей, умелі з імі дзяліць радасць і гора. Справу, якую яны пачыналі ў Майскім, працягнулі іх дзеці і ўнукі. У 1967 г. калгас «Рассвет» быў узнагароджаны ордэнам Леніна. *І.П.Пугачоў.*

Друкуецца паводле артыкула І.Пугачова «Так пачынаўся «Рассвет» (газета «Камуніст ад 7 лістапада 1990 г.) і брашуры Д.А.Залатарова «Гаспадары арцелі» (Мн., 1968. С. 16—18).

Па новай дарозе

Гарохаўе, Замлынне, Гразішча, Зарадкаўе, Гарожа, Каменьчыкі... Многа было ў свой час розных хутароў вакол вёсак Святое (з 1939 в. Кірава), Селівонаўка, Шапарня, Піцераўка. Бедна жылі тут людзі.

Сялянскае жыццё пачало мяняцца пасля 1917 г. У вёсцы Майскае, напрыклад, была арганізавана камуна, дзе агульная праца прыносіла поспех усім. Калі ў канцы 1920-х гадоў пайшла гаворка пра калектывізацыю, многія сяляне падтрымалі яе. Першымі звязалі свой лёс з арцельнай гаспадаркай Рыгор Сямешкін, Міхаіл Карунчыкаў, Архіп Муравейнікаў, Захар Захарошка, Іларыён Карунчыкаў, Фёдар Кірычэнка і іншыя жыхары в. Святое. На першым часе ў калгас уступілі 82 гаспадаркі. Старшынёй калгаса быў выбраны Міхаіл Сямёнавіч Шырко, якога ў ліку 25-і тысяч камуністаў партыя накіравала ў вёску дапамагчы сялянам будаваць новае жыццё. Гаспадарцы далі назву — калгас імя Свярдлова. Калгас меў 1057 га зямлі, у тым ліку 626 га ворнай і 317 га сенажацей, 35 коней і 30 кароў.

Аб'ядноўваліся ў калгасы і сяляне навакольных вёсак. Калектыўную гаспадарку ў в. Селівонаўка ўзначаліў Якаў Макаравіч Рубанаў. Разам з ім у калгас «Чырвоны гай» уступілі Змітро Макараў, Іван Кунцэвіч, Рыгор Рубанаў і інш.

Маладыя вяскоўцы Міхаіл і Андрэй Яромавы, Андрэй Васільцоў, Пятро Міронаў, Аўсей Казлоў, Леанід Гірыловіч, Ганна Дуброўская, Іван Шуранкоў і іншыя вялі агітацыйную і прапагандысцкую работу сярод сялян, дружна выступалі супраць кулакоў і іх падпявалаў, рыхтавалі і ставілі спектаклі. Менавіта яны першыя асвойвалі новую справу і тэхніку. Леанід Гірыловіч «асядлаў» «фардзон», араў зямлю, потым асвоіў прафесію шафёра. У калгасе імя Свярдлова працавалі шафёрамі Уладзімір Іванчыкаў, у «Чырвоным гаі» — Платон Багамазаў. На ўсё жыццё застаўся верным шафёрскай справе Аўсей Казлоў. Сталі механізатарамі Міхаіл Рымараў, Ціхан Грышкоў, Андрэй Васільцоў, а таксама два яго родныя браты Рыгор і Марцін, іншыя вясковыя хлопцы.

Пацягнуліся да тэхнікі і дзяўчаты. Якраз у той час па ўсёй краіне прагучаў кліч вядомай трактарысткі Пашы Ангелінай: «Дзяўчаты — на трактар!». Першымі накіраваліся на курсы Фядора Мільячэнка і Хрысціна Круцялёва, потым сталі механізатарамі Агафія Скрыннікава, Домна Балянкова, Ганна Якаўлева, Ганна Кулічкова, Марыя Міранцова.

Была ліквідавана непісьменнасць. Дзеці калгаснікаў змаглі вучыцца ў новай прасторнай сямігодцы, якую пабудавалі ўсім сялом. Малодшыя наведвалі сад. Людзі пацягнуліся да асветы і культуры. Яны ахвотна наведвалі свой клуб, дзе глядзелі спектаклі вясковых аматараў сцэны, слухалі лекцыі і даклады пра ўнутранае і міжнароднае становішча, дасягненні навукі і тэхнікі. З'явілася свая стацыянарная кінаўстаноўка. Бібліятэка папаўнялася сотнямі кніг. Калгаснікі выпісвалі шмат газет і часопісаў.

Шырылася кола перадавікоў вытворчасці. Сярод іх была Пелагея Іванаўна Круцялёва. Працавала яна цялятніцай, глядзела за сваімі гадаванцамі, нібы за малымі дзецьмі. Яе самаадданая праца была заўважана і дастойна ацэнена: у канцы 1930-х гадоў на грудзях Пелагеі Іванаўны заззяў ордэн «Знак Пашаны». Такім жа ордэнам быў узнагароджаны старшыня калгаса «Чырвоны гай» Яўстрат Іванавіч Цэлікаў — за атрыманне ў гаспадарцы высокіх ураджаяў ільну.

Прыклады гаспадарлівасці, сумесных адносін да агульнай справы паказвалі Павел Данілавіч Новікаў, Якаў Дзям'янавіч Кірычэнка, Якаў Антонавіч Дземідзенка, Фёдар Ігнатавіч Грышкоў, дзесяткі іншых былых аднаасобнікаў. Новыя клопаты леглі на плечы вяскоўцаў, калі пачалася вайна. У час вайны акупанты разграбілі ўсё, што не паспелі калгаснікі эвакуіраваць у тыл ці надзейна схаваць на месцы. Вызваленне прыйшло 4 снежня 1943 г., а вясной 1944 г. сотні гектараў былі заняты яравымі збожжавымі, бульбай, іншымі сельскагаспадарчымі культурамі.

У 1950 г. рашэннем агульных сходаў хлебаробаў суседнія калгасы аб'ядналіся ў адну гаспадарку.

П.Я.Кірычэнка.

З гісторыі Чырвонабярэжскага сельгастэхнікума

Вялікі інтарэс грамадскасці, асабліва сялян, выклікаў артыкул у газеце «Звязда» ад 15.9.1920 г. наконт адкрыцця ў Чырвоным Беразе сельскагаспадарчага вучылішча. Многія маладыя людзі выказалі жаданне авалодаць навукай земляробства, зрабіць яго высокаінтэнсіўнай галіной...

Хутка пачала стварацца матэрыяльна-тэхнічная база навучальнай установы. Вучылішчу было перададзена 395 дзесяцін ворнай зямлі, 40 — сенажацяў, 300 — лясной дачы. Рабочыя, што заставаліся ў маёнтку, мелі 4 каровы, 3 кані. Малалікасць рабочай сілы не дазваляла апрацоўваць усю зямлю. Таму выкарыстоўваліся толькі 48 дзесяцін ворыва і для нарыхтоўкі кармоў 5 дзесяцін сенажацяў. Астатнюю зямлю апрацоўвалі сяляне бліжэйшых вёсак. Былы панскі дом, дзе меркавалася праводзіць заняткі, быў разбураны.

У такіх абставінах пачыналася невядомая для многіх справа. У разгар арганізацыйных мерапрыемстваў пачалася польская акупацыя. Неўзабаве з Азарыч і Бабруйска ў Чырвоны Бераг былі пераведзены навучэнцы ніжэйшых сельскагаспадарчых школ, прывезены 4 парты, 6 жалезных ложкаў і маслабойка. Пазней Р.А.Мальчэўскаму, загадчыку сельгасшколы, перадалі 51 пабудову панскага маёнтка, мэблю, у тым ліку раяль, а таксама сельскагаспадарчы інвентар, рухавік і 1 пуд 10 фунтаў насення канюшыны.

Тэрмін навучання ўстанаўліваўся 3 гады па трох класах. Выкладчыкі павінны былі мець вышэйшую або сярэднюю адукацыю. Апрача агульнаадукацыйных дысцыплін выкладаліся спецыяльныя, а таксама заалогія, законазнаўства, кааперацыя. У цёплы перыяд праводзіліся абавязковыя практычныя заняткі. З трох штатных выкладчыкаў былі толькі два: дырэктар, ён жа аграном, Рыгор Адамавіч Мальчэўскі і мовазнавец Іван Фядосавіч Федасееў.

Не хапала паперы, алоўкаў, падручнікаў, а трэба было яшчэ рамантаваць будынкі, арганізоўваць харчаванне навучэнцаў, забяспечваць іх адзеннем і абуткам. Вызначаны паёк навучэнцы і служачыя атрымлівалі несвоечасова. Цяжкасці ўскладняліся абясцэньваннем грошай. Выкладчык атрымліваў 28 тысяч рублёў у месяц, прыбіральшчыца — 7316. Але на гэтыя грошы нельга было нічога купіць. Напрыклад, гусь каштавала 90 тысяч рублёў. Таму заработную плату выдавалі па прадуктовым рацыёне.

Перыяд НЭПа, у які ўступіла ўся краіна, закрануў і вучылішча. Вялікую матэрыяльную дапамогу яму аказала здача ў арэнду млына. У 1921 г. ў вучылішчы было ўжо 7 выкладчыкаў і 82 навучэнцы (дырэктар Сідар Сцяпанавіч Марозаў). 28 ліпеня таго ж года вучылішча было пераўтворана ў сельскагаспадарчую школу 1-й ступені, якая рыхтавала аграномаў для практычнай дзейнасці. Сярэдняй адукацыі школа не давала.

У канцы года адбыўся першы выпуск 12 навучэнцаў. Усе яны былі накіраваны ў воласці і працавалі аграномамі ўсё сваё жыццё. У валасцях ствараліся аграўчасткі, якія абслугоўвалі сялянскія гаспадаркі, давалі парады па аграноміі і жывёлагадоўлі, садоўніцтве, забяспечвалі сартавым насеннем, прапагандавалі перадавыя метады гаспадарання. Сяляне маглі ўзяць напракат сельгасінвентар.

У 1922 г. ў Чырвоным Беразе створаны сельскагаспадарчы тэхнікум, дзе навучэнцы атрымлівалі сярэднюю спецыяльную адукацыю з прысваенням кваліфікацыі агранома. Матэрыяльная база тэхнікума палепшылася, павялічыўся штат работнікаў. Узрос і інтарэс моладзі да набыцця сельскагаспадарчай спецыяльнасці. У верасні 1922 г. ў тэхнікум было пададзена 216 заяў. На 1.10.1922 г. колькасць навучэнцаў складала 104, з іх 92 юнакі і 12 дзяўчат. 82,7 % — дзеці сялян, пераважна беднякоў. Плату за навучанне сяляне ўносілі хлебам.

Жыццё навучэнцаў у тэхнікуме было нялёгкім. Працоўны дзень працягваўся з 8 да 22 гадзін, вучыліся нават пасля вячэры. Многія навучэнцы пісалі заявы дырэктару тэхнікума з просьбай адпусціць іх у адпачынак з-за ўпадку сіл, а то і з мэтай падзарабіць на адзенне і абутак.

Адна з выпускніц тэхнікума 1924 г. ўспамінала, што гады вучобы былі вельмі цяжкі-

мі. У пакоях жылі па 8—10 чалавек. Галоўнымі прадуктамі харчавання былі агародніна і зацірка. Вучэбная літаратура адсутнічала. З тэхнікі ў наяўнасці былі трактар «фардзон», сеялка, конны плуг, драўляная барана. Але адстаючых і другагоднікаў не было. Навучэнцы не сумавалі, арганізоўвалі вечары адпачынку, танцы пад балалайку і гітару, ставілі спектаклі.

Строга кантралявалася ў тэхнікуме работа адміністрацыі. Усе вучэбныя, гаспадарчыя і бытавыя пытанні дырэктар павінен быў вырашаць на савеце, дзе прысутнічалі і навучэнцы. Неяк дырэктар Я.Н.Палфераў-Распонін парушыў гэтыя правілы, праігнараваў патрабаванні навучэнцаў, за што быў вызвалены ад пасады пасля скаргі і байкоту вучобы навучэнцамі.

У 1924—25 гг. тэхнікум не праводзіў набору, папаўняўся толькі навучэнцамі з расфарміраванага Слуцкага сельгастэхнікума, адкуль прыбыло 62 чалавекі. Навучальная ўстанова выпусціла 41 спецыяліста.

У студзені 1927 г. адбылося пасяджэнне педагагічнага савета. Дзевяці выкладчыкам трэба было вызначыць ухіл вучэбнай установы. Думкі раздзяліліся. Адны прапаноўвалі захаваць аграномічны ўхіл, іншыя выказваліся за сельскагаспадарчую школу. Было прынята рашэнне ўвесці навучанне па раскладзе аграпедтэхнікума, які праіснаваў да 1929 г. Пачалі рыхтаваць настаўнікаў для школ сялянскай моладзі. Для праходжання практыкі ў Чырвоным Беразе была адкрыта школа сельскай моладзі, якая пазней стала сярэдняй школай.

У розны час на базе тэхнікума існавала прафтэхшкола, вывучаліся броварства і крухмальства.

У сакавіку 1929 г. пры тэхнікуме дзейнічалі курсы камсамольскага актыву. Мэтай курсаў было даць яму неабходныя арганізацыйныя і аграномічныя веды. Па заканчэнні вучобы курсанты запоўнілі анкеты, у якіх ярка былі выражаны думкі сельскай моладзі 1920-х гадоў. Так, курсант Цімох Казлоў (Малевіцкая камсамольская ячэйка) пісаў: «Закладу парнік, палепшу гарод і сарты раслінаснасці, абрэжу сад, зраблю яму для жыжкі, буду праводзіць з насельніцтвам гутаркі супраць папоўскіх забабонаў, як хутчэй пераходзіць на мнагаполле і калектыўную арганізацыю малочнага таварыства, весці меліярацыю і інш.».

Кардзіяк Іван Аляксеевіч — выпускнік 1922 г. — не здрадзіў раз і назаўсёды выбранай прафесіі земляроба. Набыўшы веды ў сельгасшколе, ён усё жыццё ўдасканальваў іх непасрэдна на практыцы.

Купрэева Ганна Несцераўна скончыла тэхнікум у 1924 г. Атрыманыя веды паслужылі ёй добрым падмуркам для далейшай вучобы і навуковай дзейнасці. Старшы навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута плодаагародніцтва і бульбы ўнесла нямала карыснага ў распрацоўку новых гатункаў і тэхналогію іх вырошчвання.

Дубоўскі Адам Апанасавіч скончыў тэхнікум у 1926 г., працаваў на Палессі. Праз многія гады ён пісаў: «Я ўсёй душой палюбіў сельскую гаспадарку і 40 год свайго жыцця аддаў любімай справе. Мне заўсёды было прыемна ўсведамляць карысць працы сваёй для грамадства».

З 1933 г. і да Вялікай Айчыннай вайны тэхнікум рыхтаваў аграномаў і тэхнікаў-механікаў. Усяго за даваенны перыяд падрыхтавана 950 спецыялістаў, у чэрвені 1941 г. — 16 аграномаў і 5 механікаў. У 1944 г. з усяго трэцяга курса аграномаў на вучобу вярнуліся толькі 8 чалавек, з аўтамеханікаў — ніхто.

У час Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі тэхнікума дзейнічалі 2 падпольныя групы, якія пасля зліліся з партызанскімі атрадамі. Актыўным падпольшчыкам быў Нікадзім Мацвеевіч Раманенка, сакратар камсамольскай арганізацыі.

У 1947 г. ў тэхнікуме ўжо налічвалася 327 навучэнцаў. Яны сваімі сіламі рабілі наглядныя дапаможнікі, абсталяванне для класаў, рамонт, працавалі на палях. З тайніка дасталі бібліятэку, схаваную ад акупантаў яе даваенным работнікам Бабарыкінай, што дазволіла мець літаратуру, падручнікі.

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Антысемітызм гітлераўцы зрабілі асноўным пунктам сваёй прапаганды, якая была накіравана на насельніцтва Беларусі. Акупацыя падавалася як збаўленне ад «яўрэйскага бальшавізму».

Паводле ўказання Гітлера фашысцкія верхаводы летам 1941 г. пачалі распрацоўваць план «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання». Гэта «канчатковае рашэнне» азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў. Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў выкананне гэтай праграмы, фашыстамі было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала $^1/_3$ частку яўрэяў усяго свету. (Приговор Международного Военного трибунала. Сборник «Нюрнбергский процесс». М., 1961. Т. 7. С. 401—402.)

Палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з бяспрыкладнай жорсткасцю праводзілі на ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі

Беларусі, у тым ліку і на Жлобіншчыне. Сюды ўслед за войскамі вермахта прыбылі айнзатцкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя, паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх разам з вермахтам уваходзіла і «вырашэнне яўрэйскага пытання». Усе гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падабранымі асобамі, якія былі выхаваны ў духу нацызму. Яны вызначаліся асаблівай жорсткасцю ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. Менавіта яны адразу ж аддзялялі яўрэяў ад мясцовых жыхароў, заганялі іх у гета.

Загады палявых і мясцовых камендатур па стварэнні гета выдаваліся ўсюды: у Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Гродне, Жлобіне, Лідзе, Мінску і іншых гарадах і мястэчках. У асноўным гета ствараліся закрытага тыпу. Іх тэрыторыі абносіліся калючым дротам, ахоўваліся гітлераўскімі салдатамі і паліцыяй. Яўрэям забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месца жыхарства і кватэры ў гета, карыстацца тратуарамі, грамадзянскім транспартам, паркамі і грамадскімі ўстановамі, наведваць школы.

Для яўрэяў было ўведзена абавязковае нашэнне апазнавальных знакаў, якімі былі аруглыя латы і шасціканцовыя зоркі жоўтага колеру, нарукаўныя павязкі з шасціканцовымі зоркамі.

Амаль да ліквідацыі гета яўрэі павінны былі прымусова выконваць работу на акупантаў, пры якой многія з іх паміралі з-за нечалавечых умоў жыцця і працы. У Жлобіне акупанты стварылі 2 гета, дзе яўрэйскае насельніцтва было пазбаўлена элементарных чалавечых правоў, падвяргалася пабоям і здзекванням. 12.4.1942 г. ў полі паміж Жлобінам і в. Лебядзёўка (у танкавым рове) фашысты забілі 1200 грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці, пераважна старых, жанчын і дзяцей. Іх распраналі да нацельнай бялізны і гналі да ямы, дзе 2 каты расстрэльвалі людзей з аўтаматаў. Грудных дзяцей вырывалі з рук маці і кідалі ў кучу трупаў, пасля чаго закопвалі жывымі. Праз 2 дні тут было расстраляна яшчэ 400 яўрэяў былога Стрэшынскага раёна.

На ўскраіне вёскі Шчадрын 8.3.1942 г. гестапаўцы расстралялі больш 1000 мясцовых яўрэяў, захопленых камуністаў і партызан, актывістаў і г.д.

Паводле даных мемарыяльнага комплексу «Хатынь» у чэрвені 1942 г. ў Жлобінскім раёне знішчана 1200 савецкіх грамадзян.

У.І.Лемяшонак, П.Я.Кірычэнка.

Дакументы сведчаць

АД САВЕЦКАГА ІНФАРМБЮРО
(ранішняе паведамленне ад 6 верасня)

У адным з калгасаў непадалёк ад Жлобіна германскія афіцэры падверглі жорсткім пыткам, а потым перабілі сям'ю рахункавода калгаса тав. Тышкевіча. Фашысты закалолі штыкамі Тышкевіча, яго маці, жонку, сястру і двух малалетніх дачок. З усёй сям'і ўцалеў толькі старэйшы 14-гадовы сын Саша, якога не было ў гэты час дома. Прыйшоўшы дамоў і ўбачыўшы знявечаныя трупы ўсіх сваіх родных, Саша пайшоў у Жлобін. Праз некалькі дзён германскія войскі занялі Жлобін. Саша дастаў ручную гранату і выйшаў на вуліцу. Ён цярпліва стаяў на вуліцы і паглядаў, як міма яго прайшлі танкі, бронемашыны, артылерыя і пяхотная часць. Калі паказалася штабная машына, у якой сядзела некалькі афіцэраў, Саша падбег і кінуў у машыну гранату. Узрывам былі знішчаны машына і ўсе германскія афіцэры. Азвярэўшыя фашысты ў клочча разарвалі цела героя, забітага асколкамі гранаты.

«Правда», 7.9.1941 г.

ПАВЕДАМЛЕННЕ НАДЗВЫЧАЙНАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ КАМІСІІ ПА ЎСТАНАЎЛЕННІ І ВЫЯЎЛЕННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ АБ ЗНІШЧЭННІ ГІТЛЕРАЎЦАМІ САВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ ШЛЯХАМ ЗАРАЖЭННЯ СЫПНЫМ ТЫФАМ

30 красавіка 1944 г.

Чрезвычайная государственная комиссия в своих предыдущих сообщениях опубликовала ряд документов, изобличающих гитлеровское правительство и верховное командование гер-

манской армии в массовом истреблении мирного советского населения. С особой жестокостью немецкие оккупанты и их сообщники проводили истязания, пытки и массовые убийства советских людей в концентрационных лагерях, организуемых в тылу германской армии. Не только военные, но и все другие оккупационные власти прикрывали создание этих лагерей потребностями эвакуации советского населения из прифронтовой полосы.

«Лагеря смерти» для советских людей у переднего края немецкой обороны

В настоящее время установлено, что немецко-фашистские мерзавцы, в связи с поражениями германской армии на советско-германском фронте и с изменившейся обстановкой, начали широко практиковать новые зверские способы истребления советских людей. Одним из таких способов является распространение эпидемии сыпного тифа среди советского населения и частей Красной Армии, для чего гитлеровцы, как это выяснилось, организуют у переднего края своей обороны специальные концентрационные лагеря.

19 марта 1944 г. наступающие части Красной Армии в районе мест. Озаричи Полесской обл. Белорусской ССР обнаружили на переднем крае немецкой обороны три концентрационных лагеря, в которых находилось свыше 35 тыс. детей, нетрудоспособных женщин и стариков. Эти лагеря размещались: первый — на болоте у поселка Дерть; второй — 2 км северо-западнее мест. Озаричи; третий — на болоте в 2 км западнее дер. Подосинник.

Специальная комиссия в составе Председателя Совнаркома Белорусской ССР Пономаренко П.К., депутата Верховного Совета Белорусской ССР Грековой Н.Г., действительного члена Белорусской академии наук Якуба Коласа, депутата Верховного Совета СССР Гришко Г.Е., генерал-майора интендантской службы Саковича А.Н., начальника санитарной службы армии подполковника Колодкина В.Н. с участием представителя Чрезвычайной государственной комиссии Кудрявцева Д.И. расследовала обстоятельства, связанные с созданием этих лагерей.

Лагеря представляли собой открытую площадь, обнесенную колючей проволокой. Подступы к ним были заминированы. Никаких построек, даже легкого типа, на территории лагерей не было. Заключенные размещались прямо на земле. Многие из них, потерявшие способность двигаться, без памяти лежали в грязи. Заключенным было запрещено разводить костры, собирать хворост для подстилки. За малейшую попытку нарушения этого режима гитлеровцы расстреливали советских людей.

Создавая концентрационные лагеря у переднего края обороны, немцы, во-первых, выбирали места для лагерей там, где они не надеялись удержать свои позиции; во-вторых, концентрируя большие массы советских людей в лагере, они размещали в них преимущественно детей, нетрудоспособных женщин и стариков; в-третьих, вместе с истощенным и нетрудоспособным населением, находившимся в антисанитарных условиях, они размещали в лагерях тысячи сыпнотифозных больных, специально вывезенных из различных временно оккупированных районов Белорусской ССР. Среди освобожденных из лагерей детей до 13-летнего возраста было 15 960 чел., нетрудоспособных женщин — 13 072 и стариков — 4448. Расследованием установлено, что фашистские мерзавцы сгоняли все мирное советское население в пересылочные лагеря под видом эвакуации населения из прифронтовых районов.

В гор. Жлобине немецкая комендатура объявила по радио следующее воззвание к населению: «Граждане гор. Жлобина, германское командование направляет вас в глубокий тыл, т.к. красноармейцы вас будут обстреливать из артиллерии и минометов. Желая спасти вас от большевистских зверств, мы эвакуируем вас в глубокий тыл. Берите с собой все вещи, лошадей, телеги, скот. Берите с собой котелки и ложки, т.к. по дороге вы будете обеспечены горячей пищей. Слушайтесь немецкого солдата, не скрывайтесь и не убегайте. Весь город оцеплен немецкими войсками. Всякий, пытающийся скрыться или бежать, будет застрелен. Выходите на улицу и двигайтесь, куда вам укажут немецкие солдаты».

По заранее разработанному плану немецко-фашистские власти организовывали пересылочные пункты, в которые сгоняли все мирное население. В них немцы предварительно отбирали трудоспособных мужчин, женщин и детей свыше 13-летнего возраста и отправляли на каторжные работы в Германию, остальных детей и нетрудоспособных взрослых направляли в концентрационные лагеря у переднего края обороны.

В период с 9 по 13 марта 1944 г. гитлеровцы под усиленным конвоем СС и охраной полиции сгоняли в лагеря в районе мест. Озаричи десятки тысяч советских людей из пересылочных пунктов, расположенных в районах стн. Рудобелка, Рабкор, Старушки, Красный Берег и населенных пунктов Микуль-Городок, Порослище, Медведевка.

«12 марта 1944 г. на рассвете, — сообщила учительница Е.Маз, — нас, жителей гор. Жлобина, немцы согнали за линию железной дороги, к зданию школы. Здесь они отобрали всех трудоспособных, а оставшихся стариков, детей и женщин погрузили в эшелон по 60—70 чел. в холодные, неотапливаемые вагоны. В исключительно тяжелых антисанитарных условиях, в холоде и грязи, нас довезли до стн. Рабкор и погнали в лагерь, расположенный в

3 км от станции. От холода и голода много детей замерзло и умерло в вагонах, много погибло стариков, женщин и детей по дороге в лагерь».

Лисовая А.И. из с. Малецкая Рудня сообщила: «В пути следования в лагерь группа усталых советских людей присела отдохнуть. Гестаповец, конвоировавший нас, натравил собак, которые сильно искусали Квитковскую и других».

У заключенных в лагерях советских граждан немецко-фашистские захватчики отбирали носильные вещи и сохранившиеся ценности.

Умышленное распространение немецко-фашистскими палачами эпидемии сыпного тифа среди советского населения

На основании материалов указанной выше комиссии, членом Чрезвычайной государственной комиссии академиком Трайниным И.П. и судебномедицинской экспертной комиссией было произведено дополнительное расследование, которым было установлено, что немецкие военные власти преднамеренно, с целью распространения сыпного тифа, размещали сыпнотифозных больных вместе со здоровым населением, заключенным в концентрационные лагеря у переднего края немецкой обороны. Сыпнотифозные больные свозились немцами в эти лагеря из населенных пунктов Полесской, Минской, Гомельской и других областей Белорусской ССР.

Жительница дер. Заболотье Лабезникова М.Б., содержащаяся в лагере, сообщила комиссии: «К нам в дом пришли немцы. Узнав, что я больна тифом, они в тот же день прислали двух солдат и на лошади отвезли меня в лагерь».

Шептунова О.А. из дер. Солоное рассказала: «Все население нашей деревни немцы согнали в дер. Воротынь, где было много больных сыпным тифом. Потом всех жителей дер. Воротынь вместе с больными отправили в концентрационный лагерь, находившийся в районе мест. Озаричи».

Широкий Г.С., житель гор. Жлобина, показал: «12 марта из Жлобинской больницы вывезли 200 чел. больных сыпным тифом. Все больные были посланы в лагерь».

Романенко И.О. сообщил комиссии: «Находясь в заключении в концлагере, я видел большую группу жителей гор. Жлобина, больных тифом. Они лежали на мокрой земле, в грязи. Среди них были мертвые. Несколько человек, будучи в бреду, ползали по грязи. Врачей не было. Среди больных я видел гр-н гор. Жлобина Щуклина и Гурскую. Они сообщили мне, что их, больных тифом, вывезли в лагерь из городской больницы».

Аналогичные показания дали комиссии бывшие заключенные концентрационных лагерей, советские гр-не: Жданович Д.Г., Зайцева О.А., Русинович Х.Т., Решокто Т.И., Анисимова М.Т., Дробеза И.Р., Новик Л.К., Верас П.Я., Коваленко А.Е., Бондаренко В.Ф., Довыденко М.В. и многие др.

Таким образом, преднамеренный вывоз немцами тифозных больных в лагерь с целью распространения сыпнотифозной эпидемии среди советского населения неопровержимо доказали многочисленными показаниями советских граждан, которые были принудительно отправлены немецкими властями в концентрационные лагеря на 5, 6, 8, 9-й день заболевания тифом.

Вот ряд документально установленных случаев такого рода, составляющих, однако, ничтожную часть всех зарегистрированных многочисленных фактов.

В концентрационных лагерях заболели тифом: Замжецкая М.Д. из с. Буда, Романов И. из дер. Белица, Венцов И. из с. Заполье, Белько П. из дер. Волосовичи, Пощен М.З. из дер. Порослище, Дроздова В.С. из дер. Комадовка, Ящур А.М. из дер. Иванище, Пацай М.И. из дер. Гар, Дайнеко Ф.Д. из дер. Пружинище, Козлова Т. из дер. Новоселки, Шкутов Ф.С. из дер. Годиновичи, Грыжкова А.С. из дер. Радужа, Антоник Е. из дер. Трельцы, Удот А. из дер. Закеричи и многие др.

Командование германской армии специально посылало в лагеря у переднего края обороны своих агентов, которым было вменено в обязанность следить за распространением эпидемии сыпного тифа среди населения, а также среди частей Красной Армии.

Заключение судебномедицинской экспертизы

Преднамеренное распространение эпидемии сыпного тифа среди мирного советского населения, заключенного германскими властями в концентрационные лагеря у переднего края обороны, подтверждается также данными судебномедицинской экспертизы.

Судебномедицинская экспертная комиссия в составе армейского эпидемиолога подполковника Юлаева С.М., армейского судебномедицинского эксперта майора Алексеева Н.Н. и начальника армейской патологоанатомической лаборатории майора Бутянина В.М. установила, что в целях заражения советских людей сыпным тифом:

а) германские власти поместили в концентрационных лагерях здоровых и сыпнотифозных больных советских граждан (эпиданамнезы № 158, 160, 161, 164, 178, 183 и др.);

б) для более быстрого распространения сыпного тифа в лагерях немцы практиковали перевод сыпнотифозных больных из одних лагерей в другие (данные эпиданамнеза, клиники и серологических исследований за № 2, 8, 10, 15, 16, 17 и др.);

в) в случаях, когда сыпнотифозные больные отказывались идти в лагеря, немецкие власти применяли насилие (протоколы опроса за № 269, 270, 271, 272);

г) немецкие захватчики перебрасывали сыпнотифозных больных из больниц и смешивали их со здоровым населением в лагерях. Это подтверждается эпиданамнезами за № 138, 139, 149, 166, 175, 180, 40, 49, 50 и протоколом опроса № 273;

д) заражение советского населения сыпным тифом было произведено в период 2-й половины февраля и первой половины марта.

После освобождения района мест. Озаричи Полесской обл. от немецких оккупантов, с 19 по 31 марта 1944 г., командование частей Красной Армии госпитализировало 4052 советских гражданина, из них детей в возрасте до 13 лет — 2370 чел.

На основании расследования специальной комиссии, заключения судебномедицинской экспертизы, документальных материалов, а также на основании произведенного членом Чрезвычайной государственной комиссии академиком Трайниным И.П. расследования Чрезвычайная государственная комиссия установила, что созданием концентрационных лагерей у переднего края обороны с размещением в них здоровых и сыпнотифозных больных немецкие военные власти пытались преднамеренно распространить эпидемию сыпного тифа среди советского населения и частей Красной Армии, что является грубейшим нарушением законов и обычаев ведения войны, признанных цивилизованными народами.

К ответу немецко-фашистских палачей

Чрезвычайная государственная комиссия считает виновниками всех этих преступлений гитлеровское правительство, верховное командование германской армии, а также командующего IX армией генерала танковых войск Харпе, командира 35-го армейского корпуса генерала пехоты Визе, командира 41-го танкового корпуса генерал-лейтенанта Вейдлинга,* командира 6-й пехотной дивизии генерал-лейтенанта Гроссмана, командира 31-й пехотной дивизии генерал-майора Окснера**, командира 296-й пехотной дивизии генерал-лейтенанта Кульмера, командира 110-й пехотной дивизии генерал-майора Вайсгаупта, командира 35-й пехотной дивизии генерал-лейтенанта Рихтера***, командира 34-го пехотного полка полковника фон Капфа, командира 109-го пехотного полка майора Рогилайна, начальника Абвертрупп 308 обер-лейтенанта Керста.

Все они должны понести суровую ответственность за преступления, совершенные против советского народа.

---

* В публикации ошибочно «Вейдмана».

** В публикации ошибочно «Экснера».

*** В публикации ошибочно «Рихарда».

«Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками». Сборник материалов, т. IV, стр. 136—143.

Друкуецца па кн. «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944». Мн., 1965. С. 154—161.

АКТ КАМІСІІ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ГРАМАДЗЯНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ПРА МАСАВАЕ ЗНІШЧЭННЕ ГІТЛЕРАЎЦАМІ СТАРЫХ, ЖАНЧЫН І ДЗЯЦЕЙ У КАНЦЛАГЕРАХ КАЛЯ ВЁСАК ХОЛМА І МЯДЗВЕДАЎ ДАМАНАВІЦКАГА РАЁНА ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ

18 сакавіка 1944 г.

18 марта 1944 г. мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе председателя майора Балакова П.Ф., капитана Тапеенкова М.Ф., капитана медицинской службы Терехина А.Н., прокурора капитана юстиции Комиссарова, ст. лейтенанта Краснова, представителей от гражданского населения: Остапенко Петра Савича 60 лет, уроженца гор. Жлобина, Костко Марии 37 лет, уроженки Кировской обл., Сидоренко Анны 60 лет, колхозницы, уроженки дер. Дубрава Домановичского* района Полесской обл. обследовала немецкие концлагеря, в которых было заключено советское мирное население из районов Полесской, частично Орловской, Гомельской и Смоленской обл., освобожденных войсками Красной Армии 18 марта 1944 г., и установила:

Лагерь № 1 расположен в 4 км северо-западнее дер. Холма, лагерь № 2 — в 2 км северо-западнее дер. Медведов. Оба лагеря расположены в редком лесу на болоте под открытым

небом. Площадь вокруг лагеря обнесена колючей проволокой в 4—5 рядов и заминирована. Обнаружено много мин замедленного действия.

Заселение лагерей началось гитлеровцами в первой половине марта 1944 г. Сюда под конвоем пригоняли женщин с грудными детьми, стариков и старух, подростков и детей. Это — советские люди, угнанные немцами из наших городов и сел при отступлении гитлеровской армии. В лагере № 1 содержалось до 9 тыс. чел., в лагере № 2 — до 40 тыс., среди них не менее 70 проц. стариков и детей. Как видно, все трудоспособное советское население — мужчины, женщины — отбиралось немцами и угонялось в Германию, а не способные работать направлялись в лагеря. Среди освобожденных из лагерей имеется немало таких, которые переводились из одних лагерей в другие по нескольку раз. В числе заключенных были жители Бобруйска, Жлобина, районов Полесской обл.: Октябрьского, Кировского**, Паричского и др.

В лагерях существовал самый дикий произвол и были созданы нечеловеческие условия существования. Люди не смели вырыть даже землянки; лишенные всякого продовольствия, они были обречены на вымирание. Лагерь находился под усиленной немецкой охраной. В пургу и в дождь женщины, старики и дети находились под открытым небом. Гитлеровцы запретили даже разводить костры. В лагерях имелось много случаев эпидемических заболеваний, обмораживаний. Больным никакой помощи не оказывалось. Истощенные голодом, продрогшие от холода, промокшие в болотах люди ежедневно умирали массами.

По заявлениям заключенных этих лагерей: 72-летнего старика Зайцева Луки Лаврентьевича из дер. Белица Жлобинского района и многих других в лагере № 1 ежедневно умирало до 60 чел., в лагере № 2 — до 100 чел. Обессилевшие люди были не в состоянии рыть могилы; трупы умерших по нескольку дней лежали на поверхности в расположении лагерей или сбрасывались фашистами в ров возле колючей проволоки. За 3 дня пребывания в лагерях только из одной дер. Капустино Кировского района было расстреляно немцами 6 чел. Убиты: Алешин Фадей Пименович 70 лет, Гончаров Родион Константинович 86 лет, Гудкова Прасковья Кузьминична 70 лет, Иванова Марфа Григорьевна 66 лет, Иванова Анастасия Степановна 42 лет.

Немцы убивали советских людей без всякого повода. Они расстреляли 12-летнего мальчика Мишу Гусанова из дер. Козловичи Домановичского района только за то, что он вышел за пределы лагерей за водой для семьи. 82-летнего старика Глуцкого Ивана из гор. Жлобина фашисты расстреляли за то, что он хотел развести костер, чтобы обогреть малолетних внучат. У Погодиной Апполинарии Максимовны заболели дети. Она стала требовать помощи, фашисты расстреляли ее вместе з 2 детьми.

На территории лагеря обнаружен труп 15—17-летней девушки, изнасилованной гитлеровцами. Груди девушки изрезаны, отрезан нос, изорваны щеки, изуродовано все тело. По дороге в лагерь также имеется масса трупов женщин, стариков и детей, уничтоженных немцами.

Раз в неделю фашисты привозили в лагерь 1 машину хлеба. Изголодавшиеся заключенные громадной толпой окружали машину, из которой гитлеровцы разбрасывали куски хлеба. Один раз во время раздачи хлеба машина подошла близко к заминированной площади, и на мине подорвалась Семенова с 2 детьми из гор. Бобруйска. 23-летнюю девушку из дер. Дубрава Домановичского*** района фашисты избили до полусмерти за то, что она хотела получить кусок хлеба.

На территории лагеря, а также за колючей проволокой имеется масса одиночных и групповых могил умерших от голода и убитых советских людей. Фашистские жертвы исчисляются тысячами. Во рву лагеря № 2 длиною в 100 м и шириною 1,5—2 м имеется масса трупов, сваленных гитлеровцами. По рассказам заключенных, по раскопкам могил и собранным на территории лагеря трупам видно, что за 7 дней существования лагеря и на пути следования немцы истребили не менее 9 тыс. советских людей.

Председатель комиссии майор Балаков

Члены комиссии: Тапеенков, Комиссаров, Терехин, Краснов, Остапенко, Сидоренко

Бывшие заключенные лагерей: Асташова, Мамонова, Серегин, Батурин, Столяров и др.

---

* В публикации «Озаричского», по званию районного центра.

** Ошибочно. Кировский район — Могилевской обл.

*** В публикации «Озаричского».

«Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками». Сборник материалов, т. IV. М., 1959, стр. 329—331.

Друкуецца па кн. «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944». Мн., 1965. С. 142—144.

З ПРАТАКОЛА АПЫТАННЯ І.А.РАМАНЕНКІ ЖЫХАРА г. ЖЛОБІН

Не раней 19 сакавіка 1944 г.*

11 марта 1944 г., в субботу, к нам, в гор. Жлобин, на автомашинах прибыло очень много немецких войск; они прибыли со стороны Бобруйска. Среди них были жандармские части и части СС. Они разгружались в центре города на главной улице. Войск было много. Моя жена лично видела, как прибыла партия около 15 автомашин.

В ночь с 11 на 12 марта я с семьей находился в здании комендатуры. Примерно в 3 часа ночи в комнату, где были собраны жители, зашли жандарм и переводчик. Они приказали нам приготовиться, так как все население города эвакуируется в гор. Бобруйск.

Одновременно с этим мы услышали передачу по радио. Диктор говорил, что все жители города якобы для спасения от артиллерийского и минометного обстрела Красной Армии будут направлены в глубокий тыл. Жителям предлагалось захватить с собой свои вещи и слушаться немецких солдат. Все, кто попытается убежать, будут расстреляны.

После радиопередачи всех жителей города жандармы погнали вдоль Первомайской ул., через полотно железной дороги, в район железнодорожной школы. Здание школы и большая площадь вокруг нее были оцеплены колючей проволокой, то есть создано подобие лагеря. Этот лагерь охранялся усиленным конвоем солдат войск СС и жандармов. Часам к 8 утра этот лагерь был битком набит жителями города...

Вскоре нас стали выводить из лагеря на площадь, где стояли эшелоны. У выхода из лагеря солдаты войск СС проверяли всех и отгоняли в сторону все трудоспособное население: мужчин, женщин и детей с 14-летнего возраста.

При этом солдаты безжалостно разлучали семьи. Я сам видел, как солдат отозвал в сторону одну молодую женщину, которая несла на руках 2-летнего ребенка. Он отделил эту женщину в группу трудоспособных, а ребенка, вырвав из ее рук, бросил в грязь.

Таких случаев было много. Над лагерем стоял сплошной стон и плач.

Жителей, которых пропускали на погрузочные площадки, сейчас же грузили в товарные вагоны по 50—80 чел., в каждый. Перед погрузкой солдаты отбирали у жителей лошадей, другой скот и повозки. Остальное разрешали грузить в вагоны. После погрузки немцы закрывали двери вагонов и закручивали их проволокой. Эшелоны были примерно по 60 вагонов каждый. Первый нагруженный эшелон отправился часов в 10 утра.

Меня отправили первым эшелоном. Мы прибыли на стн. Рудобелка в тот же день вечером. Там нас выгрузили из вагонов. При выгрузке жандармы приказывали все лишние вещи оставить в вагонах и взять с собой только то, что можно донести. Кто пытался взять все вещи, того солдаты избивали палками. Большая часть солдат и жандармов была пьяна. Отсюда нас пешком погнали в лагерь, расположенный примерно в 3 км от станции. По дороге конвой вел беспорядочную стрельбу, отстающих пристреливали, а в большинстве случаев избивали дубинками. В лагерь нас пригнали ночью.

---

* Датируется на основании документа № 88.

«Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками». Сборник материалов, т. IV, стр. 317, 318.

Друкуецца па кн. «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944». Мн., 1965. С. 149—150.

З ПРАТАКОЛА АПЫТАННЯ Л.Л.БЫКАВАЙ, ЖЫХАРКІ г. ЖЛОБІНА

Не раней 19 сакавіка 1944 г.*

Мне 15 лет, и я хочу всем рассказать о том, как немцы превратили меня из здоровой девушки в больную и изувеченную.

Жила я с матерью и сестрой на Церковной ул. в гор. Жлобине. С Церковной ул. немцы переселили нас на ул. Поплавскую, затем всю Поплавскую ул. выселили, а дома сожгли... С улицы на улицу, из дома в дом нас перегоняли более 6 раз. 12 марта 1944 г., в 3 часа ночи, мы услышали сильный стук в окно; на вопрос матери: «Кто стучит и что нужно?» — послышался ответ на немецком языке, и разобрать можно было только отдельные русские слова «поехал» и «эвакуировайт»... Всех согнали к немецкой комендатуре на стн. Жлобин. Больных, которые не могли самостоятельно передвигаться, грузили в машины и везли к вагонам, остальных гнали пешком. Потом всех людей, без разбора больных и здоровых, заталкивали до отказа в вагоны... Люди в вагонах лежали друг на друге, невозможно было пошевелиться, стоял сплошной стон и крик. Немцы закрыли дверь вагона и закрутили проволокой. В вагоне стояла неимоверная вонь, трудно было дышать... Так мы ехали более 12 часов. Выгрузили

нас на стн. Рудобелка и ночью по колено в грязи нас повели. На вопросы: «Куда нас ведут?» — немцы-конвоиры отвечали, что ведут в деревню для размещения в теплых квартирах и что деревня находится всего в 1 км. Но мы прошли несколько километров, и нас завели в огороженное проволокой место, которое находилось за с. Рудобелка. Это место представляет собой болото, по которому невозможно передвигаться. По дороге от станции в лагерь я видела много валявшихся трупов. Я слышала выстрелы и поняла, что людей по дороге расстреливали. Больная моя сестра совсем не могла двигаться, и немцы уже в лагере добили ее.

В этом болоте мы простояли 2 суток. Меня одолевала жажда, и я, так же как и другие, пила болотную воду, в которой стояла ногами.

Немцы привозили хлеб, но не раздавали его, а, как собакам, бросали через проволоку, и кто был в состоянии, набрасывался на хлеб.

Потом нас повезли во второй лагерь. Побыли мы там 1 ночь, и затем нас пешком погнали в лагерь около Озаричей. Лагерь этот находился в лесу и был огорожен проволокой. 2 суток мы находились под открытым небом. Шел снег, и был сильный ветер. Я своими глазами видела, как взрослые и дети умирали от голода и холода. Весь лагерь был усеян трупами людей. Я обессилела и легла на снег. Мать накрыла меня простыней, предохраняя от ветра. Мимо прошел немец; я слышала, как он засмеялся и сказал: «собачья хата».

Ноги и руки мои опухли, я настолько ослабла, что не могла двигаться, и чувствовала, что меня оставляют силы, и хотела только одного: скорее умереть. У меня уже не было больше сил выносить эти муки.

На третий день пришли бойцы Красной Армии. Я плакала от радости, я знала, что теперь я спасена. Нас освободили из лагерей и оказали нам всем и мне, в частности, помощь. Нас приютили и накормили, и сейчас я чувствую себя гораздо лучше. Меня осматривал врач и сказал, что меня отправят в госпиталь и будут лечить. Немцы меня искалечили, но я знаю, что теперь меня не оставят, окажут помощь, и я снова буду здоровой...

Подпись

---

*Датируется на основании документа № 88.

«Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками». Сборник материалов, т. IV, стр. 336, 337.

Друкуецца па кн. «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944». Мн., 1965. С. 150—152.

З ПРАТАКОЛА АПЫТАННЯ Ю.П.БАРАБАНАВАЙ, ЖЫХАРКІ г. ЖЛОБІНА

Не раней 19 сакавіка 1944 г.*

В лагерь у мест. Озаричи немцы очень много привозили больных тифом. Подъезжали на автомашинах к проволоке и сбрасывали их на снег на территорию лагеря. Я сама видела, как немцы привезли 6 машин с сыпнотифозными, в которых было более 100 чел. больных. Многие из них, находясь в бессознательном состоянии, оставались лежать на снегу, и утром следующего дня я видела, что человек 50—55 уже были мертвыми, а остальные расползлись по лагерю и умирали в последующие дни.

Многие из этих привезенных больных сыпным тифом были раздеты и разуты (женщины в платьях, старики в легких пиджаках). Особенно мне запечатлелась женщина в возрасте примерно 40 лет. На ней было лишь черное платье, ноги босые, голова не покрыта. По тому, что волосы у нее были острижены под машинку, я полагаю, что она была взята из больницы. Эта женщина двигалась, пытаясь согреться, но утром я видела ее уже мертвой.

С этими сыпнотифозными были привезены 3 девочки в возрасте 3—5 лет и тоже раздетыми были брошены на снег, где они часа через 4—5 умерли, вернее, замерзли. Родителей около них не было. Я пыталась с ними говорить, но они ничего не отвечали, а лишь плакали. Дети, как я определила, были здоровые, но спасти их не было возможности, так как ни одежды, ни жилья мы в лагере не имели.

Кроме этих, в лагерь привозили больных сыпным тифом и из ближайших сёл Полесской обл. Сыпнотифозными наводнили весь лагерь, они лежали всюду, и многие умирали.

Подпись

---

* Датируется на основании документа № 88.

«Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками». Сборник материалов, т. IV, стр. 346, 347.

Друкуецца па кн. «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944». Мн., 1965. С. 152—153.

АКТ КАМІСІІ З ПРАДСТАЎНІКОЎ ВАЙСКОВАЙ ЧАСЦІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І МЯСЦОВЫХ ЖЫХАРОЎ ПРА ЗВЕРСТВЫ І ЗДЗЕКІ НЯМЕЦКІХ ФАШЫСТАЎ НАД САВЕЦКІМІ ЛЮДЗЬМІ Ў КАНЦЛАГЕРЫ Ў МЯСТ. АЗАРЫЧЫ ДАМАНАВІЦКАГА РАЁНА ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Не раней 19 сакавіка 1944 г.*

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе представителей воинской части капитана Муратова Хикматулла Ильясовича, врача капитана медицинской службы Сидоренки Павла Матвеевича, председателя Крюковичского сельсовета Домановичского** района Евщука Федора

Васильевича, председателя колхоза Крюковичского сельсовета Домановичского** района Чвея Ивана Прокопьевича, составили настоящий акт о нижеследующем:

19 марта 1944 г. нами был обследован лагерь в 3 км северо-восточнее мест. Озаричи по правой стороне шоссейной дороги, идущей из Озаричей в Волосовичи. Нами установлено:

Лагерь по территории занимает площадь около 2 га. Расположен в редком сосновом лесу под открытым небом. Площадь лагеря огорожена проволокой в 1 ряд и в 5 линий по вертикали. По углам лагеря построены 4 наблюдательные вышки для охраны. Охрана лагеря была вооружена автоматами и станковыми пулеметами. По показаниям самих заключенных, в начале марта их насильно согнали и этапным порядком отправили на стн. Жлобин, откуда, погрузив в 3 товарных неотапливаемых эшелона, повезли в неизвестном направлении. Эшелоны прибыли на стн. Старушки, где их (заключенных) всех выгрузили и распределили по лагерям. В вышеупомянутый лагерь прибыло более 8800 чел. Среди них подавляющее большинство жителей Белоруссии — Полесской, Гомельской и Могилевской обл., а также люди, угнанные немцами из других областей еще летом и осенью 1943 г. Большинство заключенных лагеря были дети всех возрастов, остальная часть — нетрудоспособные женщины (из них много кормящих матерей), старики, старухи и больные инфекционными болезнями.

Несмотря на то, что перед эвакуацией из родных сёл и городов немецкие власти объявили жителям, что им разрешается брать с собой неограниченное количество вещей и продуктов питания, немецкие офицеры и солдаты отобрали все взятые жителями ценности, а по прибытии на место ограбили их вторично. Людей раздели и разули, отобрали имевшиеся у них продукты питания, не оставив хлеба даже для маленьких детей.

Режим лагеря был невыносим. Раздетые и голодные люди не имели права разводить костры, ходить в ближайшее болото, чтобы достать из-под мха несколько капель болотной воды. Категорически запрещалось приближаться к проволоке. За попытку приблизиться к ограждению расстреливали. Так, охрана лагеря расстреляла Жарикову Софью, жительницу дер. Смолка Чаусского района Могилевской обл., Родоман Феодосию, жительницу дер. Поречье Октябрьского района Полесской обл., и многих др. На проволоке висели противопехотные мины. При малейшем прикосновении к проволоке мины рвались, убивая и раня находящихся вблизи людей. Так, ранения от взорвавшихся мин получили Базелова Каролина, жительница дер. Белица Жлобинского района, Старовойтова Варвара, жительница дер. Замощаны Хомичского сельсовета Домановичского** района, и др.

Охрана лагеря расхаживала по территории и избивала заключенных дубинками. Так была избита молодая беременная женщина, фамилию которой не удалось установить. Не выдержав пытки, она скончалась от преждевременных родов. У многих на теле были синяки и ссадины от побоев.

В лагере был установлен режим, рассчитанный на истребление людей и голодную смерть. Раз в неделю немцы подвозили к проволоке хлеб и кусками, как собакам, бросали его в толпу изможденных людей. Маленький кусочек хлеба после систематического голодания еще больше усиливал муки заключенных. Ежедневно в лагере умирало много людей от истощения вследствие систематического недоедания и от острых инфекционных заболеваний. Умерших в большинстве случаев не хоронили, и они тут же, среди живых, распространяли трупный запах и эпидемии.

В ночь на 15 марта наступило резкое похолодание и выпал глубокий снег. Многие, не имея сил согреться путем движений, остались неподвижными и замерзли. В особенности замерзали дети, оставшиеся без родителей, и больные. Замерзли Валя Грабарь полутора лет, Старовойтова Анна, жительница Хомичского сельсовета Домановичского** района, Грабарь Анна с 3-летним мальчиком Брониславом, жительница дер. Нестановичи Новосельского сельсовета Домановичского** района, и др.

По всей вероятности, немецко-фашистские захватчики собирались расстрелять всех заключенных лагеря и для этой цели заставили самих заключенных вырыть огромный ров

6 × 3 × 2 м, куда уже было брошено 15 расстрелянных. Все подступы к лагерю были густо минированы противотанковыми и противопехотными минами. Однако немцы не успели выполнить свой злодейский замысел и оставили лагерь на произвол судьбы. Оставшиеся без охраны, узники бросились бежать во все стороны и попали на минные поля. Многие из них получили серьезные ранения, а часть погибла. Вокруг территории лагеря обнаружено 5 трупов людей, взорвавшихся на минах.

О чем и составлен настоящий акт.

Члены комиссии:

Муратов, Сидоренко, Евщук, Чвей.

Подписали от граждан: Галкина, Иванова, Семенова, Михайловская, Асташова, Мамонова, Лавецкая и др.

---

* Датируется на основании документа № 88.

** В публикации «Озаричского».

«Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками». Сборник материалов, т. IV, стр. 325—327.

Друкуецца па кн. «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии». Мн., 1965. С. 147—149.

Бязвінныя ахвяры

Пра трагедыю, якая адбылася ў Вялікую Айчынную вайну ў в. Таўстыкі, расказаў мне ў свой час былы старшыня калгаса «Звязда» Леанід Іванавіч Іваноў.

...Прыход гітлераўцаў у вёску насельніцтва сустрэла насцярожана. Сяльчане прыціхлі, сядзелі па хатах, а чужынцы тым часам пачалі грабіць усё, што было здабыта ў нялёгкай напружанай працы. Так простыя людзі спасцігалі першыя ўрокі «новага парадку», які несла на штыхах фашысцкая армія Германіі.

Забегалі першыя памагатыя акупантаў (яны потым склалі аснову мясцовага паліцэйскага гарнізона), якія з першых дзён знаходзіліся пад крылом вайсковай часці, кватараваўшай у Жырхаўцы. Менавіта састаў гэтай часці на зыходзе летняй ночы акружыў Таўстыкі, перакрыў дарогі, каб ніхто не ўцёк. Потым пачаліся арышты. Бралі не ўсіх запар, а выбарачна: відаць, нехта загадзя «вылучыў» кандыдатуры. Забіралі таксама тых, хто меў аднолькавае прозвішча з «вінаватымі».

У хаце Сямёна Дайнекі вяліся першыя допыты захопленых карнікамі людзей. Фашысты не скупіліся на абяцанні, угаворвалі выдаць актывістаў, а калі цярпення не хапала, у ход ішлі «інструменты». На прыпечку на распаленым агні падгараваліся «жалязякі», якія каты прыкладвалі да цела людзей. Па хаце разносіўся смурод ад паленага мяса і чуліся моцныя крыкі і стогны няшчасных. Аднак прадстаўнікам «новага парадку» так і не ўдалося даведацца, хто з жыхароў і дзеля чаго быў пакінуты ў вёсцы.

Хутка фашысты падагналі аўтамашыну, пагрузілі ў яе дванаццаць, на іх думку, самых небяспечных «злачынцаў» і пад узмоцненай аховай павезлі ў Стрэшын, каб адтуль перадаць вязняў у Жлобінскае гестапа.

Насупраць сядзібы былой Каменскай МТС п'яныя канваіры вырашылі лёс людзей: без суда і следства яны знішчылі іх нажамі: калолі і рэзалі. Асабліва стараліся паліцаі. Гітлераўцы рагаталі над іх нязграбнасцю, калі тыя ганяліся за ахвярамі. Ім было весела ад свядомасці сваёй сілы. Але ахвяры не прасілі літасці, нават у апошнія мінуты жыцця не схілілі галовы перад акупантамі.

У час расправы адзін з забраных, Дайнека, цяжка паранены, выкарыстаўшы момант, незаўважана адпоўз, а потым з апошніх сіл кінуўся ў хмызняк, каб выратавацца ад варожай зграі. На жаль, апошнія 10—15 метраў ён пераадолець не змог. Яго дагналі, схапілі...

Праз некаторы час немцы на аўтамашыне паехалі ў бок Жырхаўкі, а паліцэйскія накіраваліся ў в. Таўстыкі, прабіраліся праз хмызняк, каб не трапляць людзям на вочы. Але сумленне іх доўга не мучыла, бо яны працягвалі служыць акупантам. Пазней іх спасцігла народнае пакаранне, і толькі адзінкам удалося разам з фашыстамі збегчы на Захад.

А вяскоўцы падабралі загінуўшых і пахавалі ў в. Зломнае. На месцы гібели бязвінных ахвяр у памяць аб загінуўшых земляках пастаўлены помнік.

У.С.Варабей.

Ніхто не прагаварыўся

Памятаю, быў ясны, цёплы дзень 1943 года, на палетках каласілася жыта. У нашу вёску Змяёўка завітаў нямецкі салдат. Ён патрабаваў масла, яек, курэй. Людзі сабралі і перадалі нязванаму госцю частку таго, што ён прасіў. У кожнага было жаданне хутчэй выправадзіць чужынца з вёскі. Да таго ж ведалі, калі не дадуць «добраахвотна» — сам возьме, ды яшчэ біць будзе.

За калгасным дваром фашыста з нарабаванымі харчамі сустрэлі партызаны. «Госця» забілі, а вось труп не схавалі, кінулі на адкрытым месцы. І таму над намі навісла смяротная небяспека: пры выяўленні забітага прадстаўнікамі акупацыйных улад жыхароў чакала жорсткая расправа. І рашэнне прыйшло хутка: труп адвезлі за вёску Святое, кінулі ў балота, а ўсе сляды нядаўніх падзей ліквідавалі.

Назаўтра раніцай у вёску награнулі карнікі. Усіх нас сагналі да вясковага клуба. Пачаліся дапросы. Фашысты здзекаваліся з людзей, патрабавалі прызнання, куды знік нямецкі салдат, хто яго забіў. Памятаю, як жорстка білі нас, хлапчукоў. Але ні стары, ні малы не стаў здраднікам. Ніхто не пабаяўся нават магчымай у той сітуацыі смерці. Усе сцвярджалі адно: забойства не было. Карнікі, здаецца, паверылі. А можа, вырашылі, што салдат дэзерціраваў. У хуткім часе яны паехалі з вёскі. Усе яе жыхары засталіся жывымі.

Мне часта прыходзіць на памяць гэты выпадак. Напэўна, як самы яркі ўспамін аб вайне. І душа напаўняецца гонарам за маіх землякоў, больш за сотню сямей вёскі Змяёўка. Сярод іх здрадніка не знайшлося.

А.Навіцкі.

Фашысцкія зверствы

У красавіку 1943 г. гітлераўцы прывезлі ў вучэбную гаспадарку «Чырвоны Бераг» 20-гадовую настаўніцу Галіну Шынкевіч і яе 73-гадовую маці, жыхарак суседняй в. Побалава. На працягу тыдня іх кармілі салёнай рыбай і не давалі вады. На допытах катавалі, патрабавалі расказаць пра партызан. Жанчыны маўчалі. Калі фашысты нічога не дабіліся ад іх, абедзвюх расстралялі.

У верасні таго ж года паблізу чыгуначнай станцыі Чырвоны Бераг акупанты расстралялі 39 жыхароў Малевіцкага сельсавета, якія былі ўзяты як заложнікі. Гітлераўцы абвінавацілі іх у тым, што яны быццам хавалі злачынцаў, якія падарвалі нямецкі эшалон каля в. Малевічы. За час нямецкай акупацыі былі расстраляны таксама 282 чалавекі на тэрыторыі Чырвонабярэжскага сельсавета.

Апрача расстрэлаў гітлераўцы вывозілі на катаргу ў Германію моладзь, жанчын і дзяцей, заключалі іх у канцэнтрацыйныя лагеры з невыноснымі ўмовамі ўтрымання. Іх марылі голадам, білі, прымушалі непасільна працаваць. Ужо 15 ліпеня 1941 г. ў Германію былі адпраўлены 15 студэнтаў Чырвонабярэжскага сельскагаспадарчага тэхнікума.

У красавіку 1944 г. на адным з бензаскладоў у Чырвоным Беразе фашысты стварылі канцэнтрацыйны лагер, куды сагналі каля 8 тыс. чалавек працаздольнага насельніцтва са Жлобінскага, Стрэшынскага, Рагачоўскага, Парыцкага, Бабруйскага і іншых раёнаў. Гэты лагер быў абнесены калючым дротам у тры рады. Людзей трымалі пад адкрытым небам, не давалі ежы і вады. З ліку зняволеных было вывезена ў Германію каля 1000 чалавек, у тым ліку 42 чалавекі з Чырвонабярэжскага сельсавета. Астатнюю частку вязняў вызвалілі 26 чэрвеня 1944 г. воіны Чырвонай Арміі.

Незадоўга перад тым на тэрыторыі вучгаса «Чырвоны Бераг» фашысты стварылі зборны пункт, куды звозілі дзяцей ва ўзросце 8—14 гадоў са Жлобінскага, Стрэшынскага, Рагачоўскага, Добрушскага і іншых раёнаў. Іх сілай адбіралі ў бацькоў. Дзеці праходзілі медыцынскі агляд, пасля чаго іх грузілі ў вагоны на станцыі Чырвоны Бераг і поездам адпраўлялі ў Германію. Яны прызначаліся на ролю донараў. Было вывезена 1990 дзяцей, у тым ліку 15 малалетак з Чырвонабярэжскага сельсавета. Наогул, за час нямецкай акупацыі захопнікі вывезлі ў Германію 114 жыхароў Чырвонабярэжскага сельсавета. *М.Е.Грыцок.*

Друкуецца паводле акта камісіі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў, здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх памагатымі на тэрыторыі Чырвонабярэжскага сельсавета ад 20 лістапада 1944 г. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 861, воп. 1, л. 153.

Пакуль жыву — помню

Я з таго пакалення, у якога не было дзяцінства. Фашысцкія каты загналі нас за калючы дрот Азарыцкага канцлагера і трымалі там пад адкрытым небам, без вады і ежы. Найлепшым ласункам для мяне былі нейкія салодка-гаркаватыя карэньчыкі, якія мама выкопвала з купін. Калыханку абрывалі аўтаматныя чэргі, зверху на нас падаў снег, ішоў халодны дождж. Пад нагамі таксама было мокра, бо лагер зрабілі на балоце. Людзі абламалі на кустах і дрэвах амаль усе галінкі, каб хоць нешта падаслаць пад сябе.

Памятаю, як мама ратавала малодшую сястру, хворую на тыф. Нас пераганялі ў другі лагер, і хворых немцы тут жа, ля раўка, забівалі.

Я гэта бачыла сваімі вачыма.

А мама хуценька распрасцерла дзяружку, пасадзіла на яе сястру і ўвязала. Добрыя людзі дапамаглі ёй закінуць дзіця на плечы. Я падтрымлівала маму з аднаго боку (яна сама была слабая пасля тыфу), а вось хто быў з другога — не ведаю. Нейкім цудам нас прапусцілі.

А хіба можна не помніць, як фашыст разрэзаў мае валёначкі і дзіка рагатаў, калі я босая ішла па разбітай дарозе, прысыпанай снегам. Ногі тады пабіла на раны. Потым, ужо студэнткай, я саромелася хадзіць на вечары...

Не забуду я і тое, як немцы прывозілі ў лагер хлеб і з машын кідалі яго ў натоўп галодных людзей. Тыя, давячы адзін аднаго, хапалі, а немцы рагаталі і стралялі.

Памятаю, як сустрэлі мы дзяўчынку з маленькім дзіцем на руках. З двух бакоў за яе сукенку трымалася яшчэ двое... І мама не сваім нейкім голасам крыкнула: «Божа, гэта ж дзеткі нашай Полькі».

Мы даведаліся, што хворую жанчыну забілі фашысты. Вось мама ўсіх нас і «згарнула».

Труп жанчыны, замучанай фашыстамі, і яе трохгадовы сын.

Начамі мы збіваліся ў кучачку, каб сагрэцца. Мама накрывала нас дзяружкай.

Пасля вызвалення сірот забралі ў прыют, і мы іх «згубілі». Памятаю толькі, што старэйшую дзяўчынку звалі Надзея, і былі яны з вёскі Гармавічы.

А.Говар.

Буду памятаць

Нашу вёску падпалілі немцы. Мая мама, бабулька і я з брацікам Толікам уцяклі ў лес. Назаўтра, калі мы вярнуліся з лесу, вёскі ўжо не было — яна згарэла дашчэнту. Над вогнішчам слаўся ўдушлівы дым. Высокія коміны стаялі, як помнікі на могілках.

Мы ўсёй сям'ёй пайшлі ў суседнюю вёску Варатынь. Там жыла мая цётка. Але пажыць там доўга не прыйшлося. На вёску наляцелі немцы, падпалілі яе, а ўсіх жыхароў ад старога да малога пагналі невядома куды. Доўга гналі народ па незнаёмых мясцінах. Калі людзі адставалі, не маючы сіл ісці, іх падганялі гумавымі палкамі і прыкладамі. Ад хады ногі мае распухлі і пасінелі. Мама несла на руках Толіка. Яна так стамілася, што ледзь-ледзь

крочыла. Яе твар быў страшэнны — белы-белы, з незнаёмымі вачыма і ўвесь мокры, ці то ад поту, ці то ад слёз — цяжка было пазнаць. Мама доўга несла Толіка і не заўважыла, што ён мёртвы... Спачатку ён нібы заснуў на руках, а потым і памёр, бедны, мусіць, ад голаду ды ад смагі.

Два месяцы нас гналі кудысьці. Потым усіх людзей пасадзілі на нейкай станцыі ў вагоны і павезлі. Усіх мучыла смага. Некаторыя прыпадалі сухімі губамі да вільготных дошак дзвярэй вагона...

Цягнік спыніўся ў нейкім лесе. Людзей выгналі на шырокую паляну, на якой стаялі баракі. Вакол баракаў цягнуліся рады калючага дроту, і было вельмі многа вартавых. Хтосьці сказаў, што гэта канцэнтрацыйны лагер.

Маю маму спалілі, бабуля таксама памерла, і я застаўся з усёй сям'і адзін. Я не прыпомню, колькі часу знаходзіўся ў лагеры.

Аднойчы раніцаю здарылася штосьці незвычайнае. Нас не будзілі гумавымі палкамі, як заўсёды, і каля дзвярэй не было вартавога. Калі мы выйшлі з барака, на двары ўжо былі чырвонаармейцы. Многія плакалі ад радасці. Адзін салдат узяў мяне на рукі. Я падумаў: «Вось які ён дужы, такога вялікага гэтак лёгка на руках трымае».

Салдат трымаў мяне на руках, а ў самога на вачах слёзы...

Цяпер я жыву ў дзетдоме ў Бабічах.

Аркадзь Навуменка (1953 г.).

Перадрукавана з кнігі «Ніколі не забудзем». Мн., 1989.

Сваімі вачыма

Люты 1944 года. Стаяла ціхая і ясная ноч. Звечара чуліся далёкія стрэлы гармат і разрывы снарадаў. Гэта страляла наша артылерыя.

Я прачнуўся ад нейкага шуму. У хаце ўсе былі ўстрывожаны. Я выскачыў на двор, але немец вярнуў мяне назад. Я здагадаўся, што здарылася нешта нядобрае. Ля кожнай хаты стаяў нямецкі патруль і нікога не выпускаў на двор.

Калі зусім развіднела, немцы падагналі машыны і пачалі грузіць на іх людзей. Браць з сабою нічога не дазвалялі. У адну з машын загналі і нашу сям'ю. З намі было двое малых дзяцей старэйшай сястры Каці. Яна была хворая на тыф і знаходзілася ў асобнай хаце, куды немцы сабралі ўсіх тыфозных. Даведаўшыся, што людзей вывозяць, яна кінулася шукаць нас. Збегала дадому, але там нікога не знайшла. Мы ўжо былі за вёскай. Машыны якраз чагосьці спыніліся. Сястра ўбачыла і пабегла да нас. Загудзеў матор, грузавік гатовы быў вось-вось крануцца. Але ўсё-такі яна паспела дабегчы. Мы дапамаглі ёй узлезці на машыну. Сястра збялела і страціла прытомнасць.

— Каця! — закрычаў я, але яна не адказала. Апусціўшы галовы, мы моўчкі стаялі над ёй. «Як выратаваць сястру?» — думаў я. Але дапамагчы нельга. Вады ніхто не меў, а ўзяць на хаду снегу немагчыма.

На чыгуначнай станцыі грузавікі спыніліся. Я саскочыў з машыны, набраў у банку снегу, растапіў яго і даў сястры вады. Яна апрытомнела.

Нас згрузілі ў якісьці хлеў. У ім мы прасядзелі два дні. На другі дзень ноччу падышоў эшалон, і нам загадалі садзіцца ў вагоны.

Двор, дзе мы знаходзіліся, быў абгароджаны калючым дротам. Паабапал вузкіх варот стаялі нямецкія жандармы з бляхамі на грудзях. Яны прапускалі па аднаму чалавеку. Выносіць нічога не дазвалялі. Калі ў каго быў за плячыма клуначак, яго адразалі. У жанчын забіралі з рук грудных дзяцей і кідалі проста ў снег.

Нарэшце мы сяк-так пагрузіліся. У вагон загналі столькі людзей, што нават стаць не было дзе. Дзверы наглуха забілі, і ноччу нас павезлі невядома куды. Усе паціху гаварылі, што мы едзем на верную смерць.

У вагоне стаяла невыносная духата. Людзей мучыла смага, а вады не было. Асабліва цяжка прыходзілася дзецям. У нашым вагоне некалькі малышоў не вытрымалі і памерлі, мусіць, яны задыхнуліся ад цяжкага паветра. Калі цярпець стала немагчыма, мужчыны праламалі ў сцяне невялікую адтуліну. Усе былі рады, што цяпер можна падыхаць свежым паветрам.

І вось эшалон стаў. Людзі хацелі выскачыць з вагона, каб набраць вады ці снегу. Нямецкі канваір так грозна крыкнуў, што ніхто

не адважыўся гэта зрабіць. Потым нас зноў павезлі. Цягнік ішоў надта марудна, тузаўся то ўперад, то назад, часта спыняўся. На адной станцыі немцы дазволілі набраць вады. Быў канец лютага, снег расставаў, і ўтвараліся лужыны. Вада ў іх была мутная і нясмачная. Але людзі рады былі і такой.

— Хоць горла прамочым, — казалі яны.

Праз некалькі хвілін пачуўся свісток, і нас загналі ў вагоны. Зноў забілі дзверы і павезлі далей.

Цягнік спыніўся ля якогасьці балота. Людзей выгрузілі з вагонаў і пагналі ўперад. Па ўсім было відаць, што тут раней былі такія ж няшчасныя, як і мы. Паабапал дарогі валяліся розныя рэчы, чалавечыя трупы.

Ад голаду і смагі людзі так аслабелі, што ледзь рухаліся. Калі хто знясільваў і не мог ісці, таго нямецкія канваіры цкавалі сабакамі.

Прыгналі нас у спаленую вёску. Яна была абнесена калючым дротам. Па краях стаялі вышкі. На іх знаходзіліся нямецкія вартавыя, якія пільна сачылі, каб ніхто не ўцёк. Размясціліся на снезе, будынкаў ніякіх не было. Зварыць страву таксама не было дзе. Людзі курчыліся ад холаду, вохкалі і плакалі.

Сястру Кацю мучыў тыф. Яна кідалася, стагнала. Маці пайшла шукаць больш зацішнае месца. Каля аднаго хлева яна знайшла кучу гною. Мы хутчэй узяліся раскопваць яго. На дне ён быў цёплы, і з яго ішла пара. Разаслалі коўдру, палажылі сястру і яе двое маленькіх дзетак і прыкрылі зверху лахманом.

Тры тыдні пратрымалі нас пад адкрытым небам. На чацвёрты — зноў загадалі збірацца. Пехатой пагналі далей. У дарозе прыйшлося наглядаць шмат жудасных малюнкаў. Вось ідзе маладая жанчына з дзіцем, а побач з ёю бабуля. Немцы дзіця перадалі бабулі, а маці забралі. Другая маці не хацела аддаць дзіця, яго тут жа забілі. Калі знясіленая жанчына садзілася адпачыць, то фашыст забіваў яе, а дзіця кідаў на абочыну дарогі ў снег. Аднойчы мы бачылі, як вароны дзяўблі вочы ў такога, яшчэ жывога дзіцяці.

Я змарыўся і ледзь ішоў. Канваір цкаваў мяне сабакам. Сабака ірваў на мне вопратку і кусаў за ногі. Акрамя таго, мяне некалькі разоў білі палкамі. Я думаў, што выб'юся з сіл, упаду і тады мяне скінуць з дарогі на страшную смерць. Але я ўсё-такі дацёгся да прыпынку.

Нас загналі ў балота, за калючую агароджу. Тут таксама вакол валяліся розныя рэчы і забітыя людзі. Прабылі мы тут нядоўга. Адсюль нас павезлі далей на машынах. Нідзе не відаць было ні жыхароў, ні вёсак.

Нарэшце нам загадалі злазіць. Каця ўжо зусім не магла ісці. У яе быў вялікі жар. Яна гаварыла абы-што. Разам з хворымі немцы пакінулі яе з дзецьмі, а нас пагналі далей пешшу.

Дваццаць пяць кіламетраў ішлі мы галодныя і халодныя. Многія падалі і не ўставалі. Ноччу прыгналі ў лес. Мы паселі на зямлю.

— Мы-то прыйшлі, а што сталася з Кацяй? — казала мама, плачучы. Мы маўчалі — усім было шкада сястру.

Ноччу нехта падабраў і прывёз у лагер Кацю з дзеткамі. Мы вельмі ўзрадаваліся, калі ўбачылі яе. Яна ледзь трымалася на нагах — хвароба была ў разгары. Збудавалі маленькі буданчык і палажылі ў ім сястру з дзецьмі. Самі ляглі каля будана. Мы так стаміліся, што, нягледзячы на холад, хутка заснулі.

Раніцай я прачнуўся і не мог узняцца: нас прысыпаў снег. Сяк-так выбраўся. Вылезлі і астатнія.

— Збегай, сынок, пашукай сухога галля. Распалім агонь і сагрэемся, — сказала мама.

Я пусціўся ў пошукі. Іду і бачу — там ляжыць двое адубянелых людзей, там чацвёра. Як леглі адпачыць, так і не падняліся. Шмат людзей замёрзла ў гэтую сцюдзёную ноч.

Але сагрэцца нам не давялося. Немцы не дазволілі распальваць вогнішчы. Адну жанчыну, якая расклала агеньчык, немец закалоў штыком. Па другіх стралялі з аўтаматаў. У многіх не было цёплай вопраткі, стаптаўся абутак. У іх адмярзалі рукі, ногі, вушы.

Пацягнуліся дні цяжкай няволі. Нечуваныя пакуты і здзекі прыйшлося перажыць нам.

Іншы раз немцы строілі нас у шарэнгу і праз агароджу кідалі хлеб. Людзі хапалі яго. Каму ўдавалася, у таго стралялі. Часта рабілі і так. Калі людзі ўлягуцца спаць, немцы наставяць мін, а на міны накладуць хлеба. Як толькі хто падыходзіў да хлеба і хацеў узяць, міна ўзрывалася, і чалавек узлятаў угору.

Людзі мерлі як мухі. Іх выкідвалі ў канавы ці ямы.

Аднойчы пад вечар немцы забегалі каля дротавай загарадкі. У іх быў спалоханы выгляд. Потым па лагеры прайшлі нямецкія сувязісты, якія зматвалі кабель. Па ўсім было відаць, што яны збіраюцца адступаць.

Ноччу мы заснулі, а ўранні глядзім — нідзе ніводнага немца. Усе адразу кінуліся набраць дроў. Але дарога была замініравана. Некалькі чалавек узарваліся на мінах.

У поўдзень у лагер прыйшлі пяць нашых разведчыкаў. Колькі было радасці, калі мы ўбачылі сваіх воінаў-вызваліцеляў! Людзі абдымалі іх і цалавалі.

Разведчыкі агледзелі агароджу і сказалі нікому не выходзіць, таму што ўсё наўкола замініравана.

Праз некаторы час прыйшоў узвод мінёраў і разміраваў дарогі і лагер. Мінёры сказалі таксама, што павінны прыйсці машыны. Але людзі не чакалі машын і разыходзіліся, хто куды. Кожнаму хацелася хутчэй дабрацца да сваіх. Тыя, што не маглі ісці, засталіся. Такіх набралося вельмі шмат. У Азарыцкім лагеры смерці знаходзілася некалькі дзесяткаў тысяч чалавек.

Тых, хто застаўся, размеркавалі па вёсках. Нам выдалі ваенны паёк: сухары, кансервы, цукар, тлушчы. Праз некалькі дзён адправілі па сваіх раёнах, і мы зноў вярнуліся дадому — толькі не ўсе.

Міша Дзятлаў (1950 г.). Вёска Змяёўка.

Перадрукавана з кнігі «Ніколі не забудзем». Мн., 1989.

Зямны паклон на ўсё жыццё

З успамінаў Р.Л.Пінкуса, былога жыхара в. Новы Мазалаў

Да вайны наша сям'я жыла ў в. Новы Мазалаў. Побач з сялянамі-беларусамі ў калгасе працавалі мой бацька Леў Барысавіч і маці Клара Рыгораўна, і ніколі ім не было ў цяжар, што яны належалі да іншай нацыі і іншага веравызнання. У аснове паводзін людзей было чалавекалюбства. Менавіта гэту якасць у поўнай меры я адчуў на сабе ў цяжкую гадзіну.

Мне было 13 гадоў, калі ў вёску ўварваліся фашысцкія салдаты. Акупанты нічога і нікому не даравалі, бязлітасна рабавалі сялян, здзекаваліся з іх, моладзь вывозілі ў нямецкае рабства. У тыя суровыя дні асабліва цяжка было яўрэйскім сем'ям. Аднойчы іх сабралі і пагналі ў канцэнтрацыйны лагер. Там разам з бацькамі апынуўся і я. Той час успамінаць надзвычай цяжка, бо ён звязаны з суцэльнымі здзекамі нямецкіх катаў над мірнымі людзьмі, бездапаможнымі жанчынамі, старымі, дзецьмі. Гітлераўцы імкнуліся ператварыць людзей у маўклівых рабоў.

Вясной 1942 г. ў дзень масавага расстрэлу яўрэяў мне пашчасціла выратавацца і застацца жывым. Куды дзецца, куды ісці, дзе шукаць прытулак? Гэтыя пытанні для мяне, падлетка, здаваліся невырашальнымі. Але ўнутраны голас падказаў мне: шукай паратунку сярод людзей, даўно табе знаёмых. Я стаў прабірацца ў родную вёску. Дарога туды была нялёгкай. Начаваў на балоце, харчаваўся чым папала, хаваўся ў стагах сена і саломы. Глыбокай ноччу дабраўся да месца. Вёска сустрэла мяне сцішана і трывожна. Адшукаў хату калгасніка Якава Канстанцінавіча Дзёмава. Там я знайшоў прытулак і сардэчнасць. Сам гаспадар, яго жонка Фядора Макараўна, дачка Вольга, нават малыя дзеці імкнуліся дапамагчы мне, неяк аблегчыць мой лёс. Яны добра ведалі, што калі пра гэта даведаюцца акупанты або іх памагатыя — паліцаі, то дабра не чакай: гаспадарам і ўсёй іх сям'і пагражала смерць. Аднак ніхто не спалохаўся. Мяне схавалі на гарышчы свайго дома, дзяліліся са мной апошнім кавалкам хлеба. Ведалі пра «госця» некаторыя іншыя вяскоўцы і ўсяляк ахоўвалі мяне.

Я жыў нелегальна і вельмі баяўся за сябе і за тых, хто мяне прытуліў у горкую часіну. Нават тады, калі сям'я Дзёмавых хварэла на тыф, яна не забывала пра мяне, карміла і паіла, усяляк імкнулася зберагчы ад захворвання. І ўсё ж сям'я Дзёмавых была на падазрэнні. Відаць, камусьці хацелася выслужыцца перад акупантамі, і яны, а таксама паліцаі неаднаразова прыходзілі ў хату дзядзькі Якава. Але ён змог выратаваць мяне, адвесці ад сям'і суровую расправу. Усім, хто адвёў ад мяне бяду, засцярог ад «правалу» — мой зямны паклон на ўсё жыццё.

Восенню 1944 г. мае выратавальнікі з бацькоўскімі добрымі парадамі і клопатамі праводзілі мяне да ваенкамата. Сем гадоў я праслужыў у Ваенна-Марскім Флоце СССР, скончыў Ленінградскі дзяржаўны універсітэт, працаваў тапографам. Ёсць сям'я. Усім гэтым я абавязаны людзям, якія ў розны час дапамагалі мне знайсці сваё месца ў жыцці.

З Асвенцінскім нумарам пад чужым прозвішчам

З успамінаў М.Р.Зарэцкага, жыхара в. Нівы

Восенню 1943 г. пад націскам Чырвонай Арміі фашысцкія акупанты адступалі. Пры адыходзе выганялі з дамоў жыхароў, а моладзь забіралі на работы ў Германію.

Дайшла чарга і да в. Нівы. Жыхароў выселілі, частку моладзі, у тым ліку і мяне, пагналі ў в. Грабск. На наступны дзень я ўцёк, дабраўся да в. Лясань, дзе знайшоў родных.

Але ў пачатку 1944 г. быў эвакуіраваны гітлераўцамі ў Радушу, адтуль дастаўлены ў Малевіцкую Рудню, дзе размяшчалася нямецкая калонія, потым у в. Навікі. На гэты раз уцячы не ўдалося. Праз некаторы час я трапіў у Бабруйскі лагер.

Там быў сфарміраваны эшалон з 20—25 вагонаў, у які пагрузілі людзей, што знаходзіліся ў лагеры, і пад узмоцненай аховай павезлі на захад. Разам са мной ехалі Іван Патапкоў, Міхась Чыкілёў, Іван Татарынаў, Іосіф Байкачоў і іншыя. Неўзабаве мы апынуліся ў Польшчы, дзе працавалі на ліцейным заводзе. Кожнаму з нас выдалі спецыяльны жэтон і папярэдзілі, што той, хто зробіць пабег, будзе пасаджаны ў пограб з халоднай вадой.

Працавалі да знямогласці. Кармілі дрэнна, за парушэнні бязлітасна каралі. І ўсё ж мы марылі аб свабодзе. Аднойчы, калі ішлі з Чыкілёвым у начную змену, дамовіліся той жа ноччу збегчы. Разышліся ў розныя бакі, прызначыўшы месца сустрэчы. Аднак там я сустрэў толькі Іосіфа Байкачова, а Чыкілёва не было. Пайшлі на ўсход. Па дарозе спаткалі Калупаху з в. Галы і двух Ніжнікавых з в. Гармавічы. Ішлі разам, ужывалі толькі ягады, абыходзілі населеныя пункты, але пры пераходзе шасейнай дарогі аднаму з Ніжнікавых не пашанцавала: ён быў заўважаны і абстраляны, вярнуўся назад, а мы з Байкачовым рушылі далей.

Толькі голад — не цётка. Мы зайшлі ў крайнюю хату невялікай вёскі і апынуліся... у лапах паліцая, які «праявіў» пільнасць і пад пагрозай зброі даставіў нас у паліцэйскі ўчастак. Там нас білі, дапытваліся, хто мы і адкуль. Прызнавацца было нельга, і мы спасылаліся на тое, што адсталі ад поезда. Чатыры дні сядзелі ў каморцы галодныя і збітыя. Потым нас пераправілі ў канцэнтрацыйны лагер Асвенцім, дзе кожнаму на целе гарачым жалезам быў прысвоены індывідуальны нумар: Байкачову — 189749, мне — 189750. Ён зарэгістраваўся Быкавым, я — Міхайлоўскім Іванам (прозвішчы мы змянілі наўмысна), хоць гэта было рызыкоўна.

Праз месяц нас перавезлі ў канцлагер Заксенхаўзен, а пасля каранціна — у канцлагер Кюхендорф, што на тэрыторыі Германіі. Там я знаходзіўся доўга, пакуль гітлераўцы пры адступленні не вывезлі нас у Дахау. У кожным з гэтых канцлагераў загінулі тысячы вязняў толькі за тое, што яны хацелі звацца людзьмі.

З лагера нас вызвалілі амерыканскія войскі. Я настолькі аслабеў, што не мог самастойна перасоўвацца, таму быў змешчаны ў шпіталь. Пасля выздараўлення служыў у Савецкай Арміі. Калі закончыўся тэрмін службы, вярнуўся на Радзіму.

Іх спалілі жывымі

З успамінаў В.А.Говар, жыхаркі в. Усход

Савецкія войскі падышлі да левага берага Дняпра восенню 1943 года. Акупанты ў гэты час умацоўвалі свае пазіцыі на правым беразе, зганялі мясцовых жыхароў рыць акопы і адначасова па начах вывозілі моладзь у Германію.

Партызаны брыгады «Жалязняк» ужо злучыліся з арміяй для рашучага ўдару, чакаць якога давялося каля паўгода. Мой муж, камандзір узвода разведкі партызанскай брыгады «Жалязняк», таксама перайшоў у распараджэнне вайсковага камандавання. Я засталася ў в. Усход, у доме сваіх бацькоў. Людзі з навакольных вёсак прабіраліся праз лясы далей ад лініі фронту, у бок р. Бярэзіна. Ала — апошні населены пункт у гэтым напрамку. У гэтай невялікай вёсачцы сабралася вельмі многа бежанцаў. Мая маці, Матрона Сямёнаўна, была супраць таго, каб і нам ісці

ў Алу. Тым самым, дзякуючы сваёй настойлівасці ці інтуіцыі, яна выратавала нашу сям'ю.

Бацька, Акім Фядосьевіч, які быў партызанскім сувязным, добра ведаў усё наваколле. Ён правёў нас праз балота на маленькі сухі астравок, дзе мы выкапалі зямлянку і змайстравалі маленькую печку з комінам. Начавалі ў цёплай зямлянцы, а днём адыходзілі далей у лес і хаваліся ў хмызняках, не разводзячы агню. Непадалёку ад нас у зімовым лесе жылі такія ж бежанцы. Да Алы было каля двух—трох кіламетраў.

За той час усе мы перахварэлі на тыф. Асабліва цяжка пераносілі хваробу малыя дзеці. Мая трохмесячная дачушка Галачка не вынесла выпрабаванняў.

Раніцай 14 студзеня 1944 года з боку Алы прагрымелі выстралы, забрахалі сабакі, загаласілі людзі. Мы прыціхлі, адчуўшы дыханне смерці. Неўзабаве пацягнула чорным дымам. Потым усё сціхла. Ноччу нашы бацькі прабраліся ў Алу, каб даведацца, што там здарылася. Але там не было ні людзей, ні вёскі, засталіся адны чорныя коміны, галавешкі ды попел. Мой бацька натыкнуўся на прагарэлае падполле з прыпечанай бульбай. Яна і выратавала лясных бежанцаў ад галоднай смерці. Мы жылі ў лесе да сакавіка, да прыходу вызваліцеляў. Колькасць загінуўшых жыхароў Алы склала 1758 чалавек, з іх 28 — нашы блізкія і родныя.

Цудам выратавалася з агню наша суседка па в. Усход Вольга Белая (50 гадоў) са сваім дзесяцігадовым сынам Віцем. Яе абпалены твар і ў мірны час быў для ўсіх нас жывым і жахлівым напамінкам аб трагедыі...

Памяць стукае ў сэрца

З успамінаў А.Н.Навуменкі, былой жыхаркі в. Ала

У кастрычніку 1943 г. з набліжэннем фронту да нашых мясцін немцы загадалі ўсім пакінуць в. Кароткавічы. Разам з жыхарамі суседніх вёсак мы размясціліся ў лесе, у зямлянках. Да нас прыбілася і нямала партызан.

У лесе ў голадзе, холадзе і ў пастаянным страху нам давялося быць амаль да самых Каляд. Немцы адступалі. З імі ў бок Бабруйска вырашыла адыходзіць і частка мірнага насельніцтва. Але нямала нас засталося чакаць наступаючую Чырвоную Армію. Немцы ж не хацелі дапусціць гэтага. Хутка ўсіх людзей пагналі ў в. Ала (цяперашні Светлагорскі раён), дзе ўжо было шмат жыхароў многіх іншых вёсак.

А.Н.Навуменка.

Спачатку немцы і паліцаі адабралі здаровых мужчын (каля 50 чалавек) і каля в. Іскра з кулямётаў расстралялі, прымусіўшы іх загадзя выкапаць для сябе яму. Праз некалькі дзён дайшла чарга і да астатніх. 14 студзеня 1944 г. каля сямі гадзін раніцы ў вёску ўварваліся немцы і паліцаі і пачалі выганяць усіх з хат. Некаторыя нават не паспелі апрануцца, былі босыя (а мароз у той дзень быў моцны). Потым усіх нас пры дапамозе вялікіх і злых сабак з выкрыкамі «Русь — банда!» загналі ў хлявы. І пачалося...

Людзей групамі па 15—20 чалавек выводзілі з хлявоў і заганялі ў хаты, якія падпальвалі. Тых, хто хацеў выскачыць з полымя, знішчалі кулямётамі. Хутка полымя ахапіла і саламяную страху нашага хлява. Ад разрыву гранат, кінутых у нас, я ўпала. Напэўна, мне ўсё-такі ўдалося выбрацца з хлява, бо, калі прыйшла ў сябе, зразумела, што ляжу на снезе з абпаленай спіной. Асабліва была пашкоджана агнём правая нага. Але цярпела, баялася, што ўбачаць немцы, якія яшчэ хадзілі з сабакамі вакол і дабівалі жывых. Адзін сабака нават падышоў да мяне, але, на шчасце, не крануў.

Калі сцямнела, я асмелілася падняцца. Вялікі страх зноў ахапіў мяне, навокал нікога не было. Здавалася, што на гэтым свеце жы-

вой засталася я адна. Хацелася ўбачыць хаця б нейкую жывую птушачку, каб спытацца ў яе, куды мне ісці. Так я тапталася па снезе цэлую ноч, пакуль раніцай не заўважыла наперадзе паміж дрэвамі нечыя постаці. Думала, што гэта немцы. Вырашыла, няхай страляюць лепш у спіну, і адвярнулася. Але гэта былі мой стрыечны брат Хвядос і сусед Тарас, якія вельмі здзівіліся, убачыўшы мяне.

Потым высветлілася, што ў той жудасны дзень загінулі восем чалавек з маёй радні, у тым ліку маці, сёстры, пляменнікі. Сама я ледзь выжыла ад атрыманых апёкаў. Выратавала народная медыцына. І сёння мая зямлячка Хвядора Ісаенка, якая разам са мной перажыла ўсе тыя жахі, як убачыць мяне, дык не верыць, што я жывая.

У тыле ворага

Падпольны рух

3 — 7.7.1941 г. Гомельскі абком КП(б)Б даў указанне партыйным і камсамольскім арганізацыям пачаць падрыхтоўку да пераходу на нелегальнае становішча ў выпадку захопу вобласці гітлераўскімі войскамі. Такія ўказанні атрымалі Жлобінскі, Стрэшынскі і іншыя райкомы партыі. На месцы пачалася рэалізацыя вызначаных мерапрыемстваў.

Але здарылася так, што асноўныя сілы Жлобінскага знішчальнага батальёна, якія ў выпадку акупацыі раёна павінны былі перайсці да партызанскай барацьбы, на чале з камандзірам У.А.Міронавым пайшлі на ўсход, перасеклі лінію фронту і ўліліся ў дзеючую армію. Астатнія байцы батальёна вярнуліся ў Жлобін і іншыя населеныя пункты, не спынілі барацьбу з ворагам, сталі ініцыятарамі разгортвання падпольнай работы, апорай партызанскага руху.

14.8.1941 г. Жлобін зноў быў акупіраваны ворагам. З апошнімі байцамі Чырвонай Арміі адышла на ўсход і частка чыгуначнікаў. Тыя, хто застаўся на месцы, нягледзячы на частковую мабілізацыю акупантамі для работы на чыгунцы, не скарыліся акупантам, не сталі іх актыўнымі памагатымі. Патрыятычныя групы, якія ўзнікалі, не толькі шкодзілі ворагу, але і ўзнімалі маральны дух людзей. Першую групу, якая ўзнікла на вузле ў кастрычніку 1941 г., узначаліў электраманцёр вагоннага дэпо беспартыйны патрыёт Ціт Пятровіч Мінянкоў. У групу ўвайшлі камсамольцы Пётр Цярэнцьевіч Малашкоў і Мікалай Сямёнавіч Пугачоў. Група мела свой радыёпрыёмнік. Яго сабраў і ўстанавіў у доме Шаўцова былы ваеннаслужачы Іван Максімавіч Казлоў, які папаў у акружэнне і застаўся ў горадзе. Праз некаторы час Малашкоў і Пугачоў сустрэліся з былым сакратаром камсамольскай арганізацыі вузла Паўлам Скварчэўскім (пасля гібелі Міхаіла Юрскага ў кастрычніку 1942 г. ён быў зацверджаны сакратаром падпольнага райкома ЛКСМБ) і атрымалі ад яго заданне збіраць зброю, боепрыпасы, усяляк шкодзіць ворагу. Падпольшчыкі прыцягнулі да выканання пастаўленай задачы Мікалая і Міхаіла Кізеевых, сыноў Мінянкова Васіля і Міхаіла, братоў Івана і Мікалая Пякурыных. Членамі групы і іх сябрамі было сабрана на палях летніх баёў каля Жлобіна і потым перададзена партызанскаму атраду «Смерць фашызму» каля 200 мін, 50 вінтовак, адзін станковы і 4 ручныя кулямёты, дзве 3-хдзюймовыя гарматы, шмат патронаў.

У пачатку 1942 г. ў састаў групы ўвайшлі былыя акружэнцы Андрэй Андрэевіч Міхееў, Георгій Мацвеевіч Косцеў, а потым Марыя Цімафееўна Пінчук і Аляксей Іванавіч Трыфанаў.

Пасля ўстанаўлення сувязі з групай «Ігараўцаў» і камандаваннем партызанскага атрада «Смерць фашызму», сустрэчы Мінянкова з першым сакратаром падпольнага райкома КП(б)Б І.А.Крышнёвым у верасні 1942 г. патрыятычная дзейнасць пашырылася. Су-

Дз.В.Ніжнікаў.

вязнымі з атрадамі сталі Дзмітрый Ніжнікаў і Даніла Якуш, Тамара Іосіфаўна Раміська. Былі зроблены «паштовая скрыні». Патрыёты-падпольшчыкі атрымлівалі тол і магнітныя міны, лістоўкі і газеты. Спецыяльныя лістоўкі пісаліся для гітлераўскіх служкаў — мадз'яраў з ахоўнага батальёна і паліцэйскіх і тайна распаўсюджваліся ў казармах.

9.8.1941 г. Мінянкоў, Міхееў, Пугачоў, Трыфанаў узарвалі склад матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, дзе згарэла некалькі бочак бензіну і газы, 28 бочак масла. Працаўніком вузла Косцевым была выведзена са строю паравая машына. Члены падпольнай групы перапраўлялі да партызан былых ваеннаслужачых, якія ўцяклі з фашысцкіх канцлагераў, тых, хто хацеў са зброяй у руках змагацца з ворагам. Але папярэдне іх правяралі на баявых заданнях. Так, Мікалай Нічыпаравіч Сачыўка ўзарваў паравы кацёл для прамыўкі паравозаў, Сцяпан Аўсяннікаў падпаліў нямецкі спецпоезд, Аляксандр Церашкоў, Павел Пліско і Андрэй Федасеенка вывелі са строю водаправод па вул. Таварнай, па якім паступала вада ў паравознае дэпо. Працуючы прамывальшчыкам дымагарных труб, І.М.Пякурын тройчы закладваў у топку паравозаў (пры іх рамонце) міну. Пры распальванні топкі тая ўзрывалася, і лакаматыў надоўга выходзіў са строю. Але бяда падсцерагла героя. У маі 1943 г., будучы ўжо партызанам, у в. Лясань ён папаў у арганізаваную гітлераўцамі блакаду. Пры спробе вырвацца быў цяжка паранены, захоплены ў палон і пасля жорсткіх катаванняў расстраляны карнікамі.

З красавіка 1942 г. на вузле дзейнічала створаная па ініцыятыве разведчыкаў воінскай часці № 38629 («Ігараўцы») патрыятычная група, якой кіраваў аглядчык вагонаў камсамолец Дзмітрый Васільевіч Ніжнікаў. Спачатку ў яе ўваходзілі Даніла Лявонцьевіч Якуш і Мікалай Іванавіч Марушкевіч. Праз месяц да іх далучыўся Рыгор Сцяпанавіч Пашкоўскі. Іх задачай з'яўляліся збор і перадача звестак аб руху варожых эшалонаў праз станцыю Жлобін. Яны былі аглядчыкамі вагонаў у розных зменах і з дапамогай вагоннага майстра цэха Вілі Вейса арганізавалі кругласутачны нагляд за рухам эшалонаў акупантаў. (Дзякуючы Дз.В.Ніжнікаву захаваліся арыгіналы запісаў уліку дыверсій, знаходзяцца ў Жлобінскім гісторыка-краязнаўчым музеі.) Здабытая інфармацыя перадавалася савецкім разведчыкам праз сувязнога Івана Аляксандравіча Навуменку — жыхара в. Гармавічы, які прыязджаў у Жлобін на сувязь з кіраўніком групы праз кожныя 5 сутак. З красавіка 1943 г. падпольшчыкі трымалі сувязь з дэсантнікамі праз Ц.П.Мінянкова і адначасова праводзілі дыверсіі, распаўсюджвалі лістоўкі па заданні падпольнага райкома партыі.

Член групы Д.Л.Якуш з дапамогай магнітнай міны ўзарваў эшалон, у выніку чаго згарэла 6 паўвагонаў з бочкамі, у якіх знаходзіўся бензін. М.І.Марушкевіч мінай запаволенага дзеяння ўзарваў гармату, што знаходзілася на платформе. Члены групы своечасова інфармавалі камандаванне партызанскага атрада «Смерць фашызму» аб размяшчэнні варожага гарнізона і прыбыцці выпускнікоў Бабруйскай разведшколы. Група дзейнічала да кастрычніка 1943 г.

У першым паўгоддзі 1943 г. падпольшчыкі Ф.Елісееў, В.Косінцаў, Е.Загорскі, Я.Гараўцоў, В.Раміська, С.Рабых, М.Когаль, А.Федасеенка вывелі са строю 15 паравозаў. Выкарыстоўвалі для гэтага атрыманыя ад партызан магнітныя міны. Выраблялі іх і самі: бралі толавую шашку, устаўлялі ў яе дэтанатар, а потым аблівалі бітумам так, каб надаць ёй форму кавалка каменнага вугалю, і падкідвалі ў тэндар паравоза. А далей разам з вугалем яна незаўважна пападала ў паравозную топку. У канцы ліпеня і пачатку жніўня з дапамогай падпольшчыкаў партызаны ўзарвалі вадакачкі на станцыі Салтанаўка, на рацэ Дабысна і ў в. Вялікія Рагі.

У пачатку жніўня 1943 г. ў дэпо паступіў новы паравоз пад нумарам 2514 серыі 58. Такіх паравозаў дагэтуль тут не было. Як і ўсякая навінка, ён прыцягваў увагу працуючых. Групамі і па аднаму тыя падыходзілі да лакаматыва, аглядвалі яго, абменьваліся думкамі. Нямецкія наглядчыкі прывыкалі да гэтага. Калі шэфу дэпо далажылі аб павышаным інтарэсе да паравоза, ён самаўпэўнена прагаварыў: «Няхай глядзяць і пераконваюцца ў нашым тэхнічным пераўзыходзе над рускімі».

Шэф і не падазраваў, што да паравоза «асаблівы інтарэс» праяўляюць падпольшчыкі. 7 жніўня сярод сабраўшыхся каля паравоза аказаўся Фёдар Елісееў. Ён разам з іншымі хадзіў вакол лакаматыва, нахіляўся, прысядаў, кратаў рукамі колы, іншыя часткі, гладзіў бліскучую паверхню катла. Калі ўсе разышліся, праз 3 гадзіны над топкай паравоза прагрымеў узрыў. (Наогул за час акупацыі

падпольшчыкамі выведзена са строю 53 паравозы.)

У сярэдзіне жніўня 1943 г. дыверсійная група Аляксандра Верамейчыка ўзарвала вадакачку і трайнік цэнтральнага водаправода. Вузел застаўся без вады, і, каб заправіць паравозы, фашысты прымушалі чыгуначнікаў і насельніцтва горада вёдрамі насіць ваду з Дняпра.

У канцы жніўня каля в. Лясань адбылася чарговая сустрэча сакратара райкома камсамола Веры Махнач з падпольшчыкамі Жлобіна. Камандзір дыверсійнай групы Дзмітрый Храмцоў, які знаходзіўся тут, перадаў Пятру Малашкову магнітную міну. Раніцай 27 жніўня той, праходзячы па тэрыторыі дэпо, выкарыстаў момант: незаўважна паклаў міну пад цыліндр паравоза № 3705. У сярэдзіне дня міна спрацавала. Узрывам быў выведзены са строю паравоз, у дэпо пачаўся пажар. Але тушыць яго аказалася нечым — адсутнічала вада. Некалькі гадзін ішла барацьба з агнём. За гэты час згарэла частка даху, яшчэ 5 паравозаў і некалькі станкоў. Пётр Малашкоў неадкладна пакінуў горад.

У дыверсіях прымалі ўдзел таксама Віталь Равянкоў, Уладзімір Косінцаў, Павел Пліско, Яўген Загорскі, Рыгор Карпаў, Рыгор і Мікалай Марушкевічы, Андрэй Федасеенка, Уладзімір Сачыўка і іншыя.

Летам 1943 г. з-за лініі фронту ў раён Жлобіна прыбыла група А.М.Рабцэвіча, якую таксама цікавіла чыгунка. Цаной вялікіх намаганняў ёй удалося хутка ўстанавіць сувязь з падпольшчыкамі станцый Жлобін і Чырвоны Бераг. У выніку ўжо 12.6.1943 г. падпольшчык Г.Навуменка па заданні кіраўніка спецгрупы прымацаваў магнітную міну пад эшалонам з гаручым. Па пуці міна ўзарвалася. Рух паяздоў быў спынены на 9 гадзін. Праз 4 дні мужны падпольшчык такім жа чынам вывеў са строю яшчэ адзін састаў з гаручым. У верасні электраманцёр станцыі Жлобін Аркадзь Шандро, рабочы аварыйнай групы Іван Малыневіч, саставіцель паяздоў Ф.К.Куляшоў з дапамогай магнітных мін узарвалі 3 эшалоны з гаручым і боепрыпасамі. Як адзначаў сакратар Гомельскага падпольнага абкома партыі І.П.Кожар у дакладной запісцы ЦК КП(б)Б 3 жніўня 1943 года, «дыверсійнымі групамі рабочых-чыгуначнікаў спушчана пад адхон 7 чыгуначных эшалонаў праціўніка, пашкоджана 2 паравозы ў дэпо Жлобін і г.д.», а агітацыйная работа патрыётаў садзейнічала таму, што многія чыгуначнікі вузла пайшлі ў партызаны, пакідалі «свае» пасты паліцэйскія. Павялічыўся аб'ём інфармацыі пра рух паяздоў. Пачасціліся дыверсійныя акты. Падпольшчыкі падпалілі 4 цыстэрны з гаручым, у дэпо ўзарвалі механічны цэх, знішчылі пад'ёмны кран.

Вораг быў вымушаны прызнаць рост дызерцірства сярод «рускіх» чыгуначнікаў, у т.л. на Жлобінскім вузле, і дыверсій. 16.9.1943 г. імперская дырэкцыя шляхоў зносін «Мінск» у сваім сакрэтным данясенні ў галоўнае ўпраўленне шляхоў зносін «Усход» адзначала, што паміж станцыямі Хальч і Салтанаўка спынены рух на 12 гадзін. У данясенні ад 19.9.1943 г. ўказвалася: «У Жлобіне цяжка. Загрувашчаны ўчасткі з-за ўзмоцненага дзеяння партызан. У напрамку Гомель ёсць затрымкі на працягу 10 гадзін. У 14 гадзін 45 мінут поезд № 3316/4197615 на лініі Жлобін—Гомель паміж станцыямі Хальч і Салтанаўка на 263,3 км наскочыў на міну. Шлях да фронту яшчэ з папярэдняга тыдня закрыты. У 19 гадзін 50 мінут поезд з вагонамі для ваеннаслужачых на лініі Жлобін—Асіповічы каля станцыі Чырвоны Бераг на 370-м км наскочыў на міну, і 3 вагоны з паравозам спусціліся пад адхон. Паравоз моцна пашкоджаны. Шлях да фронту закрыты да 23 гадзін 35 мінут».

Былыя байцы Жлобінскага знішчальнага батальёна, жыхары з вёсак Майскае, Чорная Вірня, суседніх населеных пунктаў — Д.М.Бобрыкаў, З.Т.Бобрыкаў, П.С.Саладоўнікаў, Д.З.Купцоў, П.Я.Пугачоў, Ф.М.Сёмчанка ўключыліся ў барацьбу супраць фашысцкага рэжыму адразу пасля захопу тэрыторыі сельсавета акупантамі ў 2-й палавіне жніўня 1941 г. Яны ліквідавалі размешчаныя ў Майскім і Чорнай Вірні пункты па нарыхтоўцы малака, масла, яек, зрабілі спробу напасці на начальніка паліцыі Турчановіча, здзяйснялі дыверсіі. У кастрычніку 1941 г. вораг рассеяў «майскую» групу, схапіў большасць яе ўдзельнікаў. Іх даставілі ў Жлобінскае гестапа, потым у Рагачоў. Там 11.2.1942 г. разам з іншымі былі расстраляны Піліп Якаўлевіч Пугачоў — першы старшыня калгаса «Рассвет», потым дырэктар Жлобінскай МТС, Фака Міхайлавіч Сёмчанка — старшыня калгаса «Рассвет», Дзям'ян Захаравіч Купцоў — дырэктар Чорнавірнянскай школы, Павел Сафронавіч Саладоўнікаў — старшыня калгаса «Праўда» (в. Чорная Вірня).

Былі арыштаваны К.Ліскоў, Н.Зубаў, З.Т.Бобрыкаў (цяжка паранены), Д.М.Боб-

рыкаў, у якога акупанты расстралялі ўсіх родзічаў. Апошнім двум удалося збегчы. Дзмітрый Маркавіч Бобрыкаў удзельнічаў у партызанскім руху на Палессі. Каля р. Ржаўка, дзе патрыёты прынялі бой, навязаны карнікамі, загінуў Кулікоў, які адстрэльваўся да апошняга патрона.

Восенню 1941 года ў Жлобіне пачала фарміравацца група Гарбатава. Былы кадравы ваенны камандзір, папаўшы ў акружэнне, не змог прабіцца за лінію фронту, ён знайшоў прытулак у горадзе, шукаў паплечнікаў для барацьбы з ворагам. Група канчаткова склалася ў студзені 1942 года і разгарнула работу па распаўсюджванні лістовак, аказанні дапамогі параненым чырвонаармейцам. У састаў групы, апрача мясцовых патрыётаў, увайшлі жыхары вёскі Лукі — Ул.Б.Бычкоў, Ю.П.Мельнікава, Л.Л.Міронава, Е.П.Сушкевіч, І.С.Бычкоў, В.Т.Мельнікаў, І.Л.Міронаў. Бліжэйшым памочнікам кіраўніка групы з'яўляўся У.Б.Бычкоў, яго асабіста ведала таксама Юлія Мельнікава. Жыў ён тады на вуліцы Гогалеўскай. І хоць прадпрымаліся, здавалася, усе меры перасцярогі, але пазбегнуць правалу не ўдалося. Паводле некаторых дадзеных, кіраўнік групы быў выдадзены гітлераўцам. Разам з У.Б.Бычковым у верасні 1942 года ён быў арыштаваны і расстраляны. Іх паплечнікі, у асноўным жыхары в. Лукі, працягвалі барацьбу.

Аднадумцы Івана Мікалаевіча Шаўцова з Малевіцкага сельсавета, Апанаса Іванавіча Карунчыка (в. Святое), Аляксандра Іванавіча Савасцьянчыка (в. Антонаўка Кароткавіцкага сельсавета), Мітрафана Дзмітрыевіча Антуськова (в. Кабанаўка былога Стрэшынскага раёна), Мікіты Андрэевіча Дражына (в. Бабоўка; пры выкананні баявога задання быў схоплены фашыстамі і пакараны) пачалі групавацца, да іх паступова далучаліся іншыя, сетка патрыятычнага руху шырылася. Мормальскую камсамольскую групу ўзначаліў Іван Апанасавіч Лебедзеў.

Доўгі час актыўна дзейнічала падпольная група ў в. Шчадрын. У яе склад уваходзіла частка людзей з былога мясцовага народнага апалчэння, якім кіраваў да прыходу акупантаў старшыня сельсавета Сурмач. Узначаліць дзейнасць групы даверылі былому загадчыку нафтабазы Шчадрынскай МТС Стасю Дзяменцьевічу Трызну. Але спасцігла няўдача. У лістападзе 1942 г. яго схапілі гестапаўцы, доўга катавалі і, не дабіўшыся жадаемых вынікаў, расстралялі. Падпольную групу ўзначаліла камсамолка Любоў Міхайлаўна Жураўлёва, якая была намеснікам С.Д.Трызны і адказвала за арганізацыю і правядзенне камсамольскай работы сярод патрыётаў.

Кіцінская падпольная група сабрала і перадала партызанскаму атраду «Смерць фашызму» 100 вінтовак, 4 аўтаматы, 30 скрынь патронаў, больш 200 гранат. Фёдар Дзямідавіч Харанека адшукаў радыёпрыёмнік, што ўзбагаціла работу групы. Патрыёты перадалі народным мсціўцам 10 падвод мукі, зерня, печанага хлеба. Частка патрыётаў папоўніла партызанскія рады.

У верасні 1941 г. ўзнікла група камсамольцаў, якую ўзначаліла Алёна Паўлаўна Цямінская. Да падпольнай работы былі прыцягнуты Т.Н.Тарасава, В.І.Літвіноўскі, В.Ф.Звездзін, М.К.Звездзіна (Лапіцкая). У далейшым члены групы выйшлі на П.І.Рогаву і П.Т.Сукач — сувязных падпольнага абкома камсамола і партызанскага атрада імя Варашылава. Атрымлівалі ад іх зводкі Саўінфармбюро, перапісвалі змест лістовак і распаўсюджвалі навіны сярод жыхароў горада. Па заданні падпольнага абкома ЛКСМБ Т.Н.Тарасава і А.П.Цямінская ўладкаваліся працаваць у майстэрню, дзе рамантавалася зброя. Ім удавалася выносіць адтуль зброю і дэталі, змазачнае масла. Алёна Паўлаўна асабіста перадала партызанам 2 вінтоўкі, 2 пісталеты, радыёпрыёмнік, арганізавала ўцёкі ўрачоў з лагера ваеннапалонных, а ў верасні 1943 г. пайшла ў партызанскі атрад № 117 брыгады «Жалязняк». Яе сяброўка стала партызанкай на месяц раней.

З верасня 1941 г. па верасень 1943 г. ў Жлобіне дзейнічала падпольная група Ганны Васілеўны Канаплянікавай. У яе ўваходзілі К.П.Нікалаева, З.П.Нікалаева, К.В.Шаптуноў, А.Л.Амельчанка. Зімой 1941 г. група ўстанавіла сувязь з групай М.І.Елісеева. Патрыёты перапісвалі зводкі Саўінфармбюро, забяспечвалі партызан адзеннем, збіралі зброю і медыкаменты. У Жлобіне падпольшчыкі спачатку атрымлівалі лекі праз урача П.М.Фігурнова, а калі ён пайшоў у партызаны, сувязь працягвала яго ж калега К.Аўсянікава. Дзяўчаты-камсамолкі з пасёлка Ветка-Вір Валя Кавалёва і Саша Захарэўская шмат разоў, рызыкуючы жыццём, пераносілі ўсё гэта ў партызанскі атрад імя Фрунзе 10-й Журавіцкай брыгады.

У складзе знішчальнага батальёна было нямала юных патрыётаў — учарашніх школьнікаў, якія на працягу ліпеня—жніўня 1941 г.

шмат разоў хадзілі ў тыл нямецкіх войскаў і прыносілі камандаванню 63-га стралковага корпуса каштоўныя звесткі. Дзякуючы ім у в. Саланое агнём артылерыі быў знішчаны штаб буйнога нямецкага злучэння.

Групу юных разведчыкаў сфарміравалі па просьбе камандавання корпуса. І хоць добраахвотнікаў было многа, але, як сведчыў былы загадчык ваеннага аддзела райкома партыі Г.В.Злынаў, які ведаў многіх з даваеннага часу, у групу залічылі Міхася Елісеева, Толю Валько, Сашу Грышко, Бору Самчанку, Наташу Нікіткову, Івана Ісаенку і некаторых іншых. Яны пранікалі ўсюды, куды не маглі папасці дарослыя вопытныя разведчыкі. Пад выглядам жабракоў, «пастушкоў», якія шукаюць «згубленую» карову, яны прабіраліся ў размяшчэнне нямецкіх воінскіх часцей, многае бачылі.

Пасля акупацыі раёна юныя байцы батальёна М.Амбражэй, Я.Асіпчук, А.Валько, А.Грышко, К.Верамейчык, Е.Гараўцоў, А.Губараў і іншыя ўпотай выкрывалі фашысцкую хлусню аб гібелі Чырвонай Арміі, узяцці Масквы і г.д. Міхаіл Іванавіч Елісееў, які стварыў сваю групу ў кастрычніку 1941 г., пасля пісаў: «Спачатку ў групе акрамя яго былі Аркадзь Нікалаеў, Пятро і Іван Ісаенкі (апошні загінуў у 1943), Іван Пякурын і Фёдар Елісееў. Потым групу ператварылі ў арганізацыю, прыцягнулі да падпольнай работы іншых. Аднойчы ім паведамілі: каля хаты Зямлянскіх знаходзіцца многа скрынь з патронамі. Але немцы ахоўвалі іх. Было вырашана пад выглядам вечарынкі прытупіць пільнасць вартавых, пранікнуць на склад. Нямецкія ахоўнікі зацікавіліся, як гуляе моладзь, і заглянулі «на агеньчык». Хлопцы ў гэты час узялі скрыні з патронамі, 12 вінтовак, адзін ручны кулямёт, некалькі пісталетаў, ракетніцы з ракетамі, мінамётныя міны. Кулямёт з трыма дыскамі Міхась пакінуў сабе і з ім потым прыйшоў у партызанскі атрад».

У тым жа месяцы кіраўнік групы праз Зіну Нікалаеву пазнаёміўся з сёстрамі Ткачовымі, якія жылі на вуліцы МТС. У іх доме правялі нараду арганізацыі, пачалі выпуск лістовак. Пісалі іх ад рукі і вешалі на відных месцах. Расклейвалі лістоўкі сёстры Ткачовы, Аркадзь і Зіна Нікалаевы (загінула на фронце), Іван Пякурын.

Пазней М.І.Елісееў сустрэў Яўгена Асіпчука, з якім заканчваў дзевяць класаў. Той быў радыёаматарам і меў уласны прыёмнік. У канцы лістапада 1942 г. Міхася і Фёдара Елісеевых акупанты прызначылі ахоўваць школу (размова ідзе пра СШ № 20 на Рабочай вуліцы, якая знішчана ў час вайны), дзе жылі немцы. Аднойчы ноччу хлопцы пакінулі пост. Партызан яны не знайшлі і вымушаны былі вярнуцца назад. Гітлераўцы заўважылі іх адсутнасць і пачалі расследаванне. Байка аб нападзе партызан на вартавых, адабранні зброі, выбух гранаты (каб адвесці падазрэнне, падпольшчыкі кінулі яе ў акно школы) некалькі пахіснулі падазрэнне ворага. Але лупцоўка не мінавала хлопцаў.

З дапамогай падпольшчыкаў у пачатку 1942 г. была створана невялікая група з былых ваеннапалонных. Патрыятычна настроеным урачам, пасля вызвалення іх з лагера, дапамагалі ўладкавацца на работу ў розныя грамадзянскія лячэбныя ўстановы. Яны аказвалі медыцынскую дапамогу насельніцтву, ваеннапалонным, выдавалі фіктыўныя даведкі аб хваробе жыхарам горада і раёна, калі ім пагражала адпраўка ў Германію. Урачы групы, куды ўваходзілі В.Н.Лабанаў, П.М.Фігурноў, Л.Т.Назараў, А.Н.Абнаўленскі, мелі сувязі з падпольшчыкамі і сувязнымі партызан, праз іх перадавалі медыкаменты і перавязачныя матэрыялы. З іх дапамогай удавалася адпраўляць да партызан ваеннапалонных, якія, дзякуючы медыкам, ачунялі і маглі стаць у строй.

У гэтай групе асаблівай актыўнасцю вызначаўся В.Н.Лабанаў. 18.8.1941 г. ў баях пад Жлобінам, на левабярэжжы Дняпра, ён трапіў у палон. Як урачу, яму захавалі жыццё і нават пакінулі на рабоце ў сельскай бальніцы. Тут кантроль з боку акупацыйных улад не быў вельмі строгім, таму ўдавалася часова хаваць у «шпіталі» цывільных і ваеннапалонных, што ўцякалі з лагераў, а потым выпускаць іх на свабоду з адпаведнымі дакументамі. У сакавіку 1943 г., калі над членамі групы навісла пагроза, Лабанаў вывеў іх у партызанскую зону.

У сакавіку 1942 г. ў горадзе ўзнікла падпольная група І.І.Цыркунова. У яе склад увайшлі П.П.Галалобаў, І.П.Галалобаў, П.І.Іванькоў. Яна дзейнічала да мая 1943 г., падтрымлівала сувязь з групамі Ц.П.Мінянкова і Т.І.Рэміська, калі Цыркуноў пасля доўгіх спроб уладкаваўся працаваць на чыгуначны вузел.

У барацьбе з акупантамі праявілі сябе таксама сакратар падпольнага райкома камсамола Вера Махнач, В.Сяліцкі, Е.Дашкевіч,

В.З.Фамянок.

Л.С.Корабава.

Т.Лабуш, А.Пімяноўская, Рыгор і Міхаіл Марушкевічы.

Падпольныя групы дзейнічалі ў Чырвонабярэжскім, Радушскім і іншых сельсаветах. У в. Папаратнае такой групай кіравала сакратар сельсавета В.З.Фамянок. Ф.Б.Кіраў узначальваў падпольную патрыятычную групу ў в. Эрштэрмай (цяпер Адраджэнне). У в. Даліна з моманту акупацыі пачала складвацца група былога старшыні мясцовага калгаса камуніста А.Д.Казлова, які быў пакінуты для арганізацыі падпольнай работы.

Летам 1941 г. пачала фарміравацца падпольная група ў Старой Рудні. У яе ўвайшлі былы старшыня мясцовага сельсавета камуніст Міхаіл Герасімавіч Маршын (потым партызан, член Жлобінскага падпольнага райкома партыі, старшыня калгаса імя Кірава, Герой Сацыялістычнай Працы), камсамолец Аляксандр Капусцін, які займаўся падборам людзей. Антаніна Войстрыкава, Вера Капусціна, Міхась Таўсцялёў, Юра Хільевіч, Сяргей Каласоўскі, некаторыя іншыя склалі ядро групы, з якой цесна ўзаемадзейнічалі Аляксей Кароткі, Іван Маеўскі, Міхась Старавойтаў, Уладзімір Старасотнікаў, іншыя вясковыя патрыёты. Група канчаткова сфарміравалася ў чэрвені 1942 г., асноўная яе частка пазней пайшла да партызан.

У в. Шапарня падпольную групу стварыў лейтэнант Чырвонай Арміі У.Б.Паўлаў, які з-за кантузіі не змог перайсці лінію фронту і быў вымушаны вярнуцца дамоў. Група стала ядром партызанскага атрада пад яго камандаваннем.

Групы, як правіла, дзейнічалі разрознена і ворагу іншы раз удавалася выявіць «злачынцаў». Такі лёс спасціг членаў падпольнай групы М.П.Калеснічэнкі. Былы камандзір Чырвонай Арміі аказаўся на акупіраванай тэрыторыі, уладкаваўся працаваць у друкарню, стаў ініцыятарам стварэння падпольнай групы. З яго ведама работнікі друкарні С.Горбач, Ямпольскі з дачкой, а таксама работнікі гарадскіх прадпрыемстваў З.Булкін (гадзіннікавы майстар), С.Гарэлік, Г.Гарошка, К.Нікіткоў, Н.Д.Парфёнава і іншыя выраблялі і распаўсюджвалі лістоўкі. У сярэдзіне красавіка 1942 г. групу раскрылі. Кіраўнік групы М.П.Калеснічэнка быў павешаны, С.Горбач, Г.Гарэлік, Ямпольскі з дачкой і З.Булкін расстраляны.

Фашыстам удалося напасці на след некаторых іншых падпольшчыкаў. Але на допытах яны маўчалі. Сувязную Л.С.Корабаву (мела двое дзяцей), якая ўдзельнічала ў падрыве гарадской электрастанцыі, спрабавалі ўгаварыць, каб яна выдала месца дыслакацыі партызанскага атрада. Але яна не здрадзіла свайму сумленню, мужна прыняла смерць.

Са снежня 1941 г. ў горадзе дзейнічала падпольная група, якой кіраваў камуніст інвалід Р.П.Баранаў. У групу ўваходзілі С.С.Асавіцкі, М.С.Котаў, В.Н.Аўсяннікаў, Н.В.Печурыхін, М.М.Чарнагаловы, В.Б.Татарэнка, А.Н.Каробкін і інш. Калі над групай навісла небяспека, яна паспрабавала выйсці за межы раёна, дзе дзейнічалі партызаны, але не змагла прабрацца праз паліцэйскі заслон в. Верхняя Алба і вымушана вярнуцца ў горад. Не спыняючы падпольнай работы, члены групы актыўна рыхтаваліся пайсці ў партызаны. Але за 2 дні да здзяйснення задуманага, у лістападзе 1942 г., група была разгромлена. Кіраўніка і іншых членаў групы ноччу расстралялі на могілках, што па вуліцы Карла Маркса. Цудам пазбеглі пакарання Аўсяннікаў, Асавіцкі, Котаў і Чарнагаловы. Але яны ў поўнай меры зведалі катаржныя работы ў Германіі. У канцы вайны патрыёты выратаваліся з няволі. Мяфодзій Мяфодзьевіч Чарнагаловы пасля службы ў арміі працаваў на прадпрыемстве электрычных сетак. Жыццёвы шлях іншых завёў у Крывы Рог і на Урал. Няволя падарвала здароўе Котава...

Ніякія здзекі не прымусілі Івана Цыркунова выдаць тайну падпольшчыкаў. Гітлераўцы па-зверску замучылі камсамольца, зняважылі яго цела, потым вазілі труп па вуліцах горада.

Зверствы акупантаў не палохалі патрыётаў. На месцы загінуўшых байцоў станавіліся новыя, і барацьба працягвалася.

Сувязнымі-разведчыцамі спецгрупы «Арол» сталі Лідзія Лук'янаўна Міронава (пасля за-

мужжа — Байдакова) і Юлія Паўлаўна Мельнікава. Цэнтр групы размяшчаўся ў Азяранскіх лясах на Рагачоўшчыне, куды разведгрупа з радыёстанцыяй была закінута камандаваннем Заходняга фронту. Асаблівую ўвагу група ўдзяляла Жлобінскаму чыгуначнаму вузлу. Цэнтр патрабаваў самых дакладных даных аб ім. І такія даныя паступалі рэгулярна. «Два разы на тыдзень», — успамінала потым Лідзія Лук'янаўна, — прыходзілася ісці з Лук у Жлобін, адтуль — у далёкую дарогу да Азяран. Шэсцьдзесят кіламетраў туды і назад». Пад звесткамі, у мэтах канспірацыі, подпісаў не было. І толькі потым з'явіліся літары: М. Ю. М. Л. Камандаванне спецгрупы ведала, адкуль звесткі і хто іх «аўтары».

З удзелам былога работніка раённага зямельнага аддзела Паўла Макаравіча Шчукіна, падпольшчыкамі была складзена дакладная карта варожых умацаванняў у Жлобіне. Ваенна-стратэгічная абстаноўка вылучыла перад гітлераўскім камандаваннем задачу шляхам стварэння магутных умацаванняў уздоўж Дняпра затрымаць наступ савецкіх войск, перагарадзіць ім шлях на захад. Праз некалькі дзён пасля перадачы радыёграмы аб гэтым у Цэнтр савецкая авіяцыя зрабіла налёт на чыгуначны вузел.

Туды ж каштоўныя звесткі перадавалі М.Цімашэнка з вёскі Салтанаўка, В.Старасценка, К.Ткачоў, В.Капусцін з вёскі Старая Рудня. Уладзімір Капусцін і Канстанцін Ткачоў працавалі на мясцовым чыгуначным раз'ездзе, у розных зменах, што спрыяла сувязі з партызанамі. Вялікую мужнасць трэба было мець гэтым патрыётам, каб зносіць знявагу аднавяскоўцаў, якія лічылі іх нямецкімі халуямі і здраднікамі. Усяляк трэба было асцерагацца і гітлераўцаў, якія пастаянна сачылі за паводзінамі «рускіх» рабочых. Капусцін і Ткачоў не маглі свабодна перамяшчацца і не пакідалі вёску. Ім зручней было, падрыхтаваўшы звесткі па кожнай змене паасобку, перадаць іх партызанскім сувязным. Толькі дзякуючы вытрымцы і ўмелым дзеянням, патрыёты на працягу года перадавалі важныя звесткі.

У кастрычніку 1941 г. пачала дзейнічаць камсамольская група ў вёсцы Пірэвічы. Яе арганізатарамі і кіраўнікамі былі Заічкоў Рыгор Міхайлавіч і Кавалёў Канстанцін Сяргеевіч. Настаўнік мясцовай сярэдняй школы І.Ю.Даўгяла прадаставіў сваю кватэру, дзе часта збіраліся патрыятычна настроеныя грамадзяне, сам прымаў актыўны ўдзел у падпольнай рабоце. На першым часе ядро арганізацыі складалася з дзесяці чалавек. Гэта былі мужныя і надзейныя людзі. Група мела свой радыёпрыёмнік, рэгулярна слухала перадачы з Вялікай зямлі, распаўсюджвала лістоўкі з паведамленнямі Саўінфармбюро і газеты, якія савецкія самалёты раскідвалі ў тыле нямецкіх войск. Вусная і рукапісная прапаганда і агітацыя ў той час, зімой 1941—42 г., была надзвычай важнай для насельніцтва, дапамагала яму не верыць хлуслівым звесткам фашыстаў. Пірэвіцкая арганізацыя сабрала, хавала, а потым перадала партызанам нямала зброі, якая засталася пасля адыходу часцей 63-га стралковага корпуса. Асабліва шмат зрабіў у гэтым напрамку Ілья Шылакоў з пасёлка Любоў.

Сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі ў вёсцы Скепня (яе ядро складалі 7 чал.) з'яўлялася настаўніца Халецкая Марыя Кірылаўна. Члены групы праводзілі сярод насельніцтва вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу. Газета «Вести с Советской Родины», а таксама «Ленінскі шлях» і «Гомельская праўда», якія выдаваліся партызанамі, дзякуючы членам арганізацыі, бывалі частымі «гасцямі» ў хатах сяльчан.

Камсамольская арганізацыя Стрэшынскага раёна сабрала і перадала партызанам 4400 вінтовачных патронаў, 20 гранат з запаламі, 3 вінтоўкі, ракетніцу і 10 ракет.

У в. Селівонаўка сувязным партызан быў Іосіф Цімашкоў. Праз яго рукі прайшло нямала каштоўных звестак, якія ён атрымліваў ад іншых патрыётаў і перадаваў камандаванню народных мсціўцаў. Адначасова ён вёў работу сярод мужчын для папаўнення партызанскіх радоў. Надзейных адпраўляў у лес па аднаму і групамі. Так было і вясной 1943 г., калі да яго завіталі аднавяскоўцы Рымаравы: Іван, Максім і Аляксей, а таксама жыхары суседняй в. Кірава — Іван Кавалёў, Сафон Кулічкоў і Ілья Сямешкін. Усе яны мелі вінтоўкі і нават ручны кулямёт. Партызанскі сувязны неадкладна адправіў хлопцаў у атрад.

Ціха і непрыкметна дзейнічала камуніст Соф'я Круцялёва з в. Кірава. Аднавяскоўцы ведалі яе як жанчыну сціплую, непрыкметную і не ведалі пра тое, што яна — партызанская сувязная. Дзякуючы ёй, жыхары пастаянна ведалі пра падзеі, што адбываліся на фронце і ў тыле ворага.

На тэрыторыі Мормальскага сельсавета дзейнічала падпольная група, якую ўзначаль-

ваў Н.М.Савельеў, у вёсцы Сельнае групай кіраваў П.С.Дзегцяроў.

А.Рудак у сваёй кнізе «Экзамен на зрелость» (Мн., 1981) расказвае аб адным эпізодзе, калі патрыёты з рызыкай для жыцця добраахвотна выконвалі даручэнні партызан. Ён піша: «Абаснаваўшы сваю базу ў раёне в. Лясань, член райкома партыі Сяргей Агеевіч Каваленка і камсамолка, а пазней сакратар падпольнага райкома ЛКСМБ, Вера Пятроўна Махнач ператварылі яе ў зручнае месца, куда незаўважна прыходзілі патрэбныя ім людзі. Тут неаднойчы сустракаліся з патрыётамі сакратар райкома партыі Іоў Апанасавіч Крышнёў, член абкома камсамола Якаў Яфрэмавіч Квачоў. Адсюль не раз прабіралася ў Жлобін адважная разведчыца Тамара Іосіфаўна Раміська.

На базе многа разоў бывалі падпольшчыкі Ціт Мінянкоў, Мікалай Марушкевіч, Міхаіл Елісееў, Аня Канаплянікава, Варвара Фамянок, Лена Цямінская, сёстры Аляксандра і Марыя Зарубавы. Яны прыносілі разведданыя, звесткі аб выніках дыверсій, паперу, медыкаменты, масла для зброі і многае іншае. Забіралі з сабой партызанскія газеты, лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, узрыўчатку і магнітныя міны.

Хадзілі на сувязь у Жлобін і юныя разведчыцы Паліна Рогава і Таня Сукач. Неяк у сакавіку 1943 г. яны паведамілі, што падпольшчыкі, якія працуюць на чыгуначным вузле, маюць магчымасць арганізаваць дыверсіі, але ў іх не было ўзрыўчаткі. З рызыкай для жыцця яны пайшлі ў Жлобін і даставілі міны падпольшчыкам.

У 1943 г. падпольныя райкомы партыі атрымалі магчымасць выпускаць газеты і лістоўкі: у іх распараджэнне з-за лініі фронту прыбылі малагабарытныя друкарскія станкі, шрыфт. Такую друкарню, адну на двух, атрымалі Жлобінскі і Стрэшынскі РК КП(б)Б. Абсталяванне без перашкод даставілі ў размяшчэнне партызанскіх атрадаў. Значны час друкарня знаходзілася ў вёсцы Таўстыкі, дзе выпускаліся падпольныя раённыя газеты: Жлобінская — «Шлях сацыялізма», Стрэшынская — «Сталінскі сцяг».

Друкарню ў Рагачоўскі раён дастаўлялі з вялікімі цяжкасцямі. Першыя з іх чакалі пры пераправе друкарскага станка з Гомельскага падпольнага абкома партыі на правабярэжжа Дняпра. Пачатая ворагам блакіроўка партызанскай зоны парушыла планы. Тады друкарня — станок і шрыфт — была схавана ў надзейных людзей вёскі Казіміра. Імі былі настаўніцы Соф'я Аляксандраўна Савіч і яе сястра Кацярына.

Даставіць друкарню ў атрад узялася Вольга Канстанцінаўна Парфёнава, падпольшчыца і сувязная рагачоўскіх партызан. З дапамогай казіміраўскіх патрыётаў на падводу паклалі шрыфт і друкарскі станок, а зверху — мяшкі з бульбай. Пасты на прасёлках абмінулі без перашкод. Удала складвалася пераправа цераз чыгунку, але на пераездзе прадстаяла праверка дакументаў і грузу. Патрыёты пусцілі ў ход усе хітрыкі.

Наступіла жніво 1943 г. Але сяляне не маглі паспяхова весці ўборку ўраджаю, бо гэтаму перашкаджалі карніцкія атрады гітлераўцаў. Невялікія па колькасці, яны раптоўна з'яўляліся ў вёсках і перш за ўсё захоплівалі тых, хто знаходзіўся ў полі. Такіх людзей каралі, а іншых кудысьці адпраўлялі. Гэта непакоіла не толькі сельскае насельніц-

Падпольшчыца Т.П.Сукач сярод партызан.

тва, але і кіраўніцтва Жлобінскага і Стрэшынскага падпольных райкомаў партыі. Было прынята рашэнне ўзяць пад ахову населеныя пункты, аказаць сялянам практычную дапамогу ва ўборцы ўраджаю. Партызаны атрада, а потым брыгады «Жалязняк» аказалі дапамогу сялянам вёсак Кабанаўка, Калінаўка, Кароткавічы, Плесавіцкая Слабодка, Змяёўка, Святое ва ўборцы ўраджаю, сяўбе азімых, абмалоце збожжа ў 200 гаспадарках.

П.Я.Кірычэнка.

Партызанскі рух

Адной з першых партызанскіх груповак, якія з'явіліся на тэрыторыі раёна, быў атрад імя Р.І.Катоўскага. У верасні 1941 г. каля вёскі Антонаўка Кароткавіцкага сельсавета група ваеннаслужачых з 29-й механізаванай дывізіі 10-й арміі арганізавала партызанскі атрад, камандзірам якога стаў Н.П.Каленчанка, камісарам — П.А.Анікін, начальнікам штаба — старшы лейтэнант Рвачоў. У атрадзе налічвалася 32 чалавекі. У далейшым ён папаўняўся з ліку жыхароў Жлобінскага і Рагачоўскага раёнаў, а ў кастрычніку 1941 г. партызаны перадыслацыраваліся ў Быхаўскі раён, адтуль — у Арлоўскую вобласць (Клятнянскі р-н). Далейшы лёс атрада невядомы.

Партызанская барацьба на Жлобіншчыне шырока разгарнулася з верасня 1942 г. Для кіраўніцтва камуністычным падполлем і партызанскім рухам Гомельскі абком КП(б)Б стварыў 29.6.1942 г. Жлобінскі раённы падпольна-партыйны цэнтр. У верасні 1942 г. ЦК КП(б)Б накіраваў на чале самастойных груп Дз.Ц.Шыбінскага ў Стрэшынскі, І.А.Крышнёва ў Жлобінскі раёны. 24.9.1942 г. абедзве групы аб'ядналіся ў адзін партызанскі атрад «Смерць фашызму» (камандзір І.А.Крышнёў, камісар Дз.Ц.Шыбінскі). Міжрайком КП(б)Б пачаў сваю дзейнасць з кастрычніка 1942 г., базіраваўся ў партызанскім атрадзе «Смерць фашызму». У маі 1943 г. атрад падзелены на 2 — «Смерць фашызму» і «Жалязняк». У верасні 1943 г. на базе атрада «Смерць фашызму» створана партызанская брыгада імя П.К.Панамарэнкі.

Паводле слоў інструктара-падрыўніка, а пазней камандзіра падрыўной групы атрада «Смерць фашызму» Аркадзя Смолкіна, які прыбыў на тэрыторыю раёна ў канцы лета 1942 г., з прыходам групы І.А.Крышнёва (падпольная клічка «Грозны») узмацніліся ўдары па камунікацыях гітлераўцаў. Падрыўнікі спалілі гужатранспартны мост на р. Ала, на перагоне Яшчыцы—Шацілкі ўзарвалі паравоз і 2 вагоны з жывой сілай праціўніка, на перагоне Жлобін—Хальч пусцілі пад адхон поезд, у якім перавозіліся войскі, на перагоне Жлобін—Салтанаўка знішчылі паравоз, 2 платформы з гарматамі, 4 вагоны з салдатамі. На станцыі Салтанаўка падарвалі воданапорную вежу, што ўскладніла запраўку паравозаў вадой. У час «рэйкавай вайны» на перагоне Салтанаўка—Буда-Кашалёва ўзарвалі 118 чыгуначных рэек. Рух паяздоў на гэтым участку аднавіўся толькі праз 5 дзён.

Партызанскі атрад «Смерць фашызму» хутка пачаў весці адкрытыя баі з ворагам. Мормальскі гітлераўскі гарнізон быў блізка ад партызанскай стаянкі і перашкаджаў народным мсціўцам. Партызаны вырашылі ліквідаваць яго. У сувязі з гэтым камандзір групы А.П.Халадок у справаздачы за лістапад—снежань 1942 г. на імя камандзіра брыгады № 123 Ф.І.Паўлоўскага пісаў: «... Сумесна з атрадам «Грознага» мы ўдзельнічалі ў раз-

Магіла невядомых партызан у в. Кароткавічы.

громе гарнізона паліцыі на ст. Мормаль, дзе забіта 26 паліцэйскіх». У якасці трафеяў народным мсціўцам дасталіся 3 ручныя кулямёты, 29 вінтовак. Партызаны правялі некалькі дыверсій на чыгункі, перашкаджалі рамонтным камандам аднаўляць пуці, паляпшаць яго тэхнічныя якасці.

26.3.1943 г. партызанскія атрады «Смерць фашызму» і «За Радзіму» ліквідавалі варожы гарнізон у в. Таўстыкі. Пазней знішчана асінае гняздо ў Луках.

У снежні 1942 г., студзені—сакавіку 1943 г. народныя мсціўцы вялі баі каля вёсак Антонаўка, Кароткавічы, Майскае. Яны перашкаджалі акупантам рабаваць насельніцтва, уганяць працаздольных на катаргу ў Германію.

Як успамінаў Іван Кірылавіч Тарасаў (былы камандзір разведвальна-дыверсійнай групы штаба брыгады імя Варашылава), яму, Барысу Фяськову і Мікалаю Кручкову было дадзена заданне дастаць зброю. У канцы сакавіка 1943 г. яны выехалі ў Стрэшынскі раён. Каля Горваля пераправіліся цераз Бярэзіну і прыбылі ў Ніжнюю Албу. Тут ім расказалі, што ў суседняй вёсцы размешчаны гарнізон, які налічвае 22 паліцэйскіх. Партызаны звязаліся з падпольшчыкамі гэтай вёскі, якімі кіравала Люба (прозвішча, на жаль, ён не памятае). Вынік сумесных дзеянняў — знішчэнне варожага гарнізона.

У сакавіку 1943 г. перастаў існаваць Радушскі гарнізон, а потым партызаны ліквідавалі апорны пункт гітлераўцаў у в. Замен-Рыння.

2.4.1943 г. групай партызан пад камандаваннем М.П.Аніпкі пасля кароткага бою з паліцыяй быў узарваны Салтанаўскі спірта-гарэлачны завод. Выведзены са строю машыны і паравыя магістралі.

Член адной з гарадскіх патрыятычных груп Кірыл Нікіткоў папаў пад падазрэнне жлобінскага гестапа, але яму ўдалося пакінуць горад і перабрацца ў в. Кругавец да дваюраднага брата Пятра Нікіткова. Тут ён знайшоў аднадумцаў, праз сваю сястру Наташу наладзіў сувязь з народнымі мсціўцамі. Абапіраючыся на падрабязную інфармацыю і непасрэднае садзеянне мясцовых патрыётаў, партызаны 5.4.1943 г. паспяхова разграмілі варожы гарнізон у в. Пірэвічы. Адсюль на наступны дзень у навакольныя вёскі Скепня, Нікалаеўка, Завад, Баранаўка, Кругавец было адпраўлена больш 100 падвод з соллю і пшаніцай, астатняе спалена.

Вясной 1943 г. на левабярэжжы раёна пачаў дзейнічаць партызанскі атрад № 256 10-й Журавіцкай брыгады. Ім 9 красавіка разгромлены мамкоўскі паліцэйскі гарнізон, у складзе якога знаходзілася 140 чалавек. Было забіта 7 паліцэйскіх, захоплены 4 кулямёты, 20 вінтовак, іншыя трафеі. 15.3.1943 г. быў разгромлены суседні гарадзецкі гарнізон (10 паліцэйскіх забіты, захоплены 2 гарматы, 14 кулямётаў і 4 мінамёты, патроны і г.д.), які пастаянна трымаў у жаху насельніцтва Кіраўскага сельсавета.

У канцы красавіка 1943 г. быў разгромлены нямецкі гарнізон у в. Чацвярня. Камендант і 60 гітлераўцаў былі забіты, 118 чалавек узяты ў палон.

Што тычыцца чыгункі, то яе «апякалі» не толькі «мясцовыя», але і падрыўныя групы партызанскіх атрадаў і злучэнняў іншых раёнаў і зон. Для іх былі вызначаны пэўныя ўчасткі. Так, загадам начальніка БШПР П.З.Калініна ад 21.4.1943 г. за 10-й Журавіцкай брыгадай замацоўваўся ўчастак на чыгуначнай лініі Рагачоў—Жлобін—Салтанаўка. Такое размеркаванне «жалезкі» не скоўвала дзеянні падрыўных груп, а, наадварот, дазваляла ім наладзіць добрыя кантакты з суседзямі, пазбегнуць шэрагу непаразуменняў пры выхадзе да чыгункі і садзейнічала паспяховаму правядзенню аперацый. Толькі народныя мсціўцы 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады ў сакавіку—красавіку 1943 г. на ўчастках Жлобін—Быхаў і Жлобін—Бабруйск пусцілі пад адхон 32 эшалоны з жывой сілай і тэхнікай гітлераўцаў, узарвалі і пашкодзілі 7 мастоў, больш 40 аўтамашын, у жніўні 1943 г. на ўчастку Жлобін—Бабруйск узарвалі 140 рэек, разбурылі стрэлачныя пераводы.

Некаторае ўяўленне пра дзеянні партызан на чыгунцы даюць ніжэй зробленыя запісы.

5.4.1943 г. Каля в. Чарцёж дыверсійная група на чале са старшым сяржантам Говіным пусціла пад адхон варожы эшалон з жывой сілай і тэхнікай, які следаваў з Бабруйска ў Жлобін. Знішчаны паравоз і 9 вагонаў.

21.4.1943 г. Непадалёк ад гэтага месца дыверсійная група пад камандаваннем Якубоўскага падарвала эшалон і знішчыла паравоз, 10 вагонаў з аўтамашынамі і запчасткамі.

28.4.1943 г. У 3 гадзіны 5 хвілін ночы дыверсійная група пад камандаваннем Самцова з удзелам Кірылкіна, Барсука, Акулава і Татарына побач з Чырвоным Берагам падарвала варожы эшалон, які ішоў на Жлобін. Разбіты паравоз, 6 вагонаў з харчаваннем. Забіта і паранена 30 салдат і афіцэраў гітлераўскай арміі.

30.4.1943 г. У адну гадзіну 10 хвілін ночы дыверсійная група лейтэнанта Мельнікава (уваходзілі Варонін і Н.Вераб'ёў) пусціла там жа пад адхон састаў, які рухаўся з Бабруйска на Жлобін, у выніку чаго знішчаны паравоз і 11 пляцовак з аўтамашынамі.

1.5.1943 г. У 2 гадзіны 30 хвілін ночы дыверсійная група на чале з Самцовым і лейтэнантам Еўтуховічам з удзелам партызан К.Барсука, В.Каралькова, Мяснікова, Д.Плявакі, Ракіціна і Рудчанкі каля Чырвонага Берага падарвала варожы эшалон і знішчыла паравоз і 8 вагонаў з харчаваннем. Тая ж група народных мсціўцаў 3.5.1943 г. прыкладна ў тым жа месцы ў 1 гадзіну 35 хвілін падарвала эшалон і знішчыла паравоз, 10 вагонаў з тэхнікай. Забіта і паранена 75 варожых салдат і афіцэраў.

4.5.1943 г. Дыверсійная група камсамольца Юліка Смоліча з Рэчыцкага атрада імя Варашылава на чыгуначным перагоне Жлобін—Салтанаўка паставіла міну. Месца замаскіравалі, прымацавалі да чакі ўзрывацеля нацяжны шнур. Праз некаторы час на чыгуначны пуць выйшла ахова. 6 салдат прайшло без затрымкі, а сёмы, мабыць, штосьці западозрыў, бо спыніўся і стаў пільна аглядаць месца закладкі міны. І каб 15 кг толу не прапалі дарэмна, старшы групы загадаў Ільі Арэшчанкову тузануць за шнур (метад «вуды»). На месцы ўзрыву засталася глыбокая варонка, вакол — кавалкі шпал і варожая ахова.

11.5.1943 г. На чыгуначным перагоне Хальч—Салтанаўка групай партызан з 5 чалавек (старшы У.Банькоў) у гадзіну ночы ўзрывам скінуты пад адхон паравоз і 3 вагоны. Затрымка руху на ўчастку — 3 гадзіны.

17.5.1943 г. На гэтым жа перагоне ў 2 гадзіны 30 хвілін 5 падрыўнікоў (старшы У.Банькоў) узарвалі пуць і знішчылі паравоз, 13 платформ, 17 танкаў, 15 аўтамашын, забілі 70 гітлераўцаў. Толькі праз 12 гадзін на ўчастку аднавіўся рух паяздоў.

20.5.1943 г. Каля Жлобіна быў узарваны варожы эшалон, у якім перавозілася гарэлка. Разляцеўся вагон, але некаторыя бутэлькі захаваліся. Нямецкія салдаты, налізаўшыся шнапсу, крычалі: «Гут, партызан!»

27.5.1943 г. На перагоне Салтанаўка—Старая Рудня ў 10 гадзін 30 хвілін спушчаны пад адхон воінскі эшалон з жывой сілай, тэхнікай і харчаваннем. Разбіты паравоз і 5 вагонаў. Ворагу прыйшлося замяніць 6 рэек і 50 шпал.

28.5.1943 г. На тым жа перагоне ў 11 гадзін 30 хвілін скінуты пад адхон воінскі эшалон з жывой сілай і аўтамашынамі. Разбіты паравоз, 2 платформы, 4 вагоны з гітлераўцамі, 2 аўтамашыны. Прыйшлося аднаўляць 65 шпал і 9 рэек. Затрымка руху — 18 гадзін.

3.6.1943 г. Дыверсійная група (кіраўнік Якубоўскі) каля Чырвонага Берага скінула пад адхон паравоз, 6 платформаў з авіябомбамі і 2 вагоны з жывой сілай праціўніка.

Саўінфармбюро 8 чэрвеня 1943 г. паведамляла: «Партызанскі атрад «Жалязняк», які дзейнічае ў адным з раёнаў Гомельскай вобласці, падарваў 2 эшалоны праціўніка. Разбіты паравоз, 11 вагонаў з войскамі і 2 платформы з зенітнымі гарматамі...»

Падрыўнікі групы Дыркова (5 чалавек) даведаліся пра гэта паведамленне пазней. А ў той дзень яны на перагоне Жлобін—Хальч у 11 гадзін узрывам на чыгунцы, знішчылі паравоз, 7 вагонаў, 9 аўтамашын, 20 гітлераўцаў. Толькі праз 3 гадзіны аднавіўся рух паяздоў.

29.6.1943 г. У 4 гадзіны 30 хвілін ночы дыверсійная група (кіраўнік Самцоў, падрыўнікі К.Барсук, Брэндзін, Я.Плявака, Салікаў) каля в. Чарцёж пусцілі пад адхон варожы эшалон, які следаваў з Жлобіна на Бабруйск. Разбіты паравоз, 4 пляцоўкі з аўтамашынамі, 5 вагонаў.

30.6.1943 г. У 6 гадзін 30 хвілін раніцы дыверсійная група (лейтэнант Еўтуховіч, падрыўнікі Філатаў, Барысевіч, Давыдкін, Чахоўскі) каля Чырвонага Берага скінула пад адхон варожы эшалон, які рухаўся на Жлобін. Разбіты паравоз, 14 платформ з аўтамашынамі.

Чыгунка ў раёне Чырвонага Берага летам 1943 г. прыцягнула ўвагу таксама спецыяльнай групы А.М.Рабцэвіча.

12.6.1943 г. Па заданні камандзіра падпольшчык Г.Навуменка на станцыі Чырвоны Бераг устанавіў магнітную міну пад эшалон з гаручым. У выніку ўзрыву рух на гэтым участку быў спынены на 9 гадзін. Праз чатыры дні Г.Навуменка знішчыў яшчэ адзін састаў з гаручым.

Актывізацыя дзеянняў партызан і нарошчванне ўдараў па варожых камунікацыях узрушыла акупацыйныя ўлады. Да канца чэрвеня ў Беларусі для барацьбы з партызанамі было сканцэнтравана 96 тыс. гітлераўскіх ваяк. Прыбылі войскі і ў Жлобінскі раён. Акупанты ўздоўж чыгункі Жлобін—Гомель у вёсках стварылі вялікія гарнізоны,

правялі карныя аперацыі. У перыяд з 14 па 27 красавіка 1943 г. пры падтрымцы авіяцыі і артылерыі праціўнік пачаў захады, каб знішчыць партызанскі атрад «Смерць фашызму». Але народныя мсціўцы не спалохаліся і самі нанеслі адчувальны ўдар па ворагу.

У сваім дзённіку начальнік штаба Гомельскага партызанскага злучэння Е.І.Барыкін 19.7.1943 г. пісаў: «Мінулай ноччу кіраўцы, жалезнякоўцы і катоўцы «рамантавалі» чыгунку Жлобін—Калінкавічы. Дзве гадзіны там раздаваліся ўзрывы. Хлопцы прывялі ў непрыгоднасць 5 км палатна і 5 км сувязі».

1.8.1943 г. У гісторыю Вялікай Айчыннай вайны жнівеньская аперацыя на чыгункі ўвайшла пад назвай «рэйкавай вайны» і аказала вялікую дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі. Увечары 3 жніўня партызаны занялі зыходныя пазіцыі, а ноччу паміж Жлобінам і Шацілкамі, Жлобінам і Бабруйскам, Жлобінам і Салтанаўкай загрымелі частыя ўзрывы. Уверх узляталі шпалы, рэйкі. Немцы практычна былі бяссільны перашкодзіць шырокамаштабнай партызанскай дыверсіі. Але сякія-такія спробы прадпрымалі. У бок Салтанаўкі са Жлобіна быў накіраваны спецпоезд з войскамі. Прыбыў ён да месца падрыву рэек, калі партызаны адышлі ад чыгункі.

На працягу некалькіх дзён і начэй па чыгункі не хадзілі паязды. А перад гэтым толькі на адным участку Жлобін—Гомель у суткі прапускалася больш 40 эшалонаў. У ліпені—жніўні было знішчана або пашкоджана 11 мастоў, 56 аўтамашын, разгромлена 5 варожых апорных пунктаў. У жніўні і верасні на ўчастках Жлобін—Гомель і Жлобін—Калінкавічы ўзарвана больш 1500 рэек.

Не толькі ў час «рэйкавай вайны» вызначыўся кіраўнік дыверсійна-падрыўной групы А.І.Верамейчык. Разам з іншымі ён скінуў пад адхон 22 варожыя эшалоны, зрабіў некалькі дыверсійных актаў на станцыі Жлобін. На рахунку Дз.І.Храмцова 16 знішчаных гітлераўскіх эшалонаў і некалькі дыверсійных актаў у дэпо. Я.М.Берднікаў скінуў пад адхон 9 варожых эшалонаў, падарваў 54 рэйкі, знішчыў 25 нямецкіх салдат і афіцэраў на вузле. За здзейсненыя подзвігі ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. 6 разоў удзельнічаў у падрыве варожых эшалонаў баец, а потым палітрук роты брыгады «Жалязняк» М.Г.Маршын.

Фашысты, нягледзячы на прынятыя меры, не ведалі спакою. Вораг сам вымушаны быў прызнацца ў гэтым. «Партызаны актывізуюць свае дзеянні, настрой насельніцтва да нямецкіх улад, раённага кіраўніцтва і паліцыі нявызначаны». Так пісаў начальнік стрэшынскай паліцыі 1.4.1943 г. на імя начальніка бабруйскай абласной паліцыі.

А.І.Верамейчык.

Дз.І.Храмцоў.

1 мая 1943 г. партызаны брыгады імя Чапаева (Рэчыцкая зона) «апрабавалі» захопленую ў ворага гармату і выпусцілі па Стрэшыну 20 снарадаў. Фашысты і іх памагатыя ў спешным парадку пакінулі «асінае гняздо» і ўцяклі ў Жлобін. Варожы гарнізон у Стрэшыне быў канчаткова ліквідаваны ў ноч на 28.9.1943 г.

12 верасня партызаны 108-га атрада імя Р.І.Катоўскага ліквідавалі гарнізон гітлераўцаў у в. Дабравольшча. Тады ж народныя мсціўцы з атрада «Смерць фашызму» разгромілі і гарнізон праціўніка, які дыслацыраваўся на тэрыторыі былога птушкакамбіната.

Медфельчар Клаўдзія Шульга і санітарка Ціна Макоўская, медсёстры Ганна Яромава і Ніна Шпакава (атрад імя Фрунзе), многія іншыя жанчыны забяспечвалі паспяховае правядзенне баявых аперацый, сачылі за здароўем і бытам народных мсціўцаў.

У выніку летняга (1943 г.) наступлення войскі Цэнтральнага фронту ўступілі на зямлю Беларусі і выйшлі на правы бераг Дняпра. Адступаючы, вораг вымушаны быў таксама лічыцца з тым, што гэты бераг паміж Рэчыцай і Жлобінам у значнай ступені кантраляваўся народнымі мсціўцамі. Важнейшыя дарогі, па якіх можна было адысці, праходзілі праз партызанскую зону. У многіх месцах яны былі перакапаны, завалены дрэвамі і замініраваны. Улічваючы гэта, гітлераўскае камандаванне вырашыла нанесці ўдар па партызанах, маючы намер рассеяць іх і зрабіць праход свабодным для сваіх часцей.

24 кастрычніка сіламі да 2 дывізій гітлераўцы пачалі наступ на зону народных мсціўцаў з боку Рэчыцы і Васілевіч. Партызанскія брыгады «Жалязняк», імя П.К.Панамарэнкі, імя Варашылава, імя В.І.Чапаева, «Бальшавік», імя Н.А.Шчорса і 108-ы імя Р.І.Катоўскага атрад, які дзейнічаў самастойна, да 1 лістапада стрымлівалі націск пераўзыходзячых сіл праціўніка, знішчылі 117 гітлераўскіх салдат і афіцэраў. Толькі тады, калі былі выкарыстаны ўсе боепрыпасы, партызаны адышлі на левы бераг Бярэзіны па наведзенаму цераз раку мосце.

У гэты час каля в. Глушыца былога Стрэшынскага раёна вялося будаўніцтва пасадачнай пляцоўкі і пантоннага моста цераз Бярэзіну. 27 кастрычніка былі прыняты першыя 2 самалёты франтавой авіяцыі. Атрыманы боепрыпасы. Адпраўлены цяжка параненыя.

16 лістапада партызанская брыгада «Жалязняк» атрымала загад разам з брыгадай імя П.К.Панамарэнкі і 108-м атрадам імя Р.І.Катоўскага «асядлаць» дарогу з Рэчыцы ў Горваль і Шацілкі, не прапусціць па ёй гітлераўскія часці, якія адступалі пад ударамі 48-й і 65-й армій.

Ноччу з 17 на 18 лістапада камандаванне брыгады імя Панамарэнкі разведала абстаноўку ў Горвалі. Досвіткам вярнуліся адтуль разведчыкі на чале з Васілём Дзямідовічам і далажылі, што там шмат салдат праціўніка, аўтамашын... Камандаванне вырашыла нанесці апярэджваючы ўдар, у выніку якога партызаны не дазволілі ворагу, які меў на ўзбраенні танкі, бронемашыны і артылерыю, прабіцца на Шацілкі. Страціўшы больш 25 аўтамашын, вялікую колькасць жывой сілы і, пераканаўшыся, што цераз партызанскія заслоны ім не прабіцца, фашысты павярнулі да Горваля і пачалі спешна наводзіць пераправу. Яны меркавалі злучыцца з гомельскай групоўкай.

Камандаванне аб'яднанай групоўкі народных мсціўцаў атрымала загад не толькі не выпусціць праціўніка, але і разграміць яго. 19 лістапада, калі да Горваля падышлі авангардныя часці Чырвонай Арміі, партызаны ўварваліся ў вёску і прыціснулі фашыстаў да ракі. Ахопленыя панікай, акупанты кінуліся ўплаў цераз Бярэзіну, але толькі адзінкі з іх змаглі перабрацца на супрацьлеглы бераг. Праціўнік страціў у гэтым баі звыш 150 салдат і афіцэраў. За час баёў партызаны вызвалілі каля 1500 савецкіх грамадзян, якіх гітлераўцы збіраліся ўгнаць у Германію, захапілі 110 аўтамашын, у т.л. 7 легкавых. У грузавых аўтамабілях знаходзіліся боепрыпасы, харчаванне, амбундзіраванне. У ліку трафеяў былі паром, вялікая колькасць пантоннай маёмасці і сярэдні танк.

Гітлераўцы рабілі неаднаразовыя спробы пераправіцца цераз Бярэзіну і зноў захапіць Горваль. Але дасягнуць мэты не змаглі. Партызаны трывала ўтрымлівалі пазіцыі на працягу 5 сутак да падыходу часцей Чырвонай Арміі, дапамагалі арганізаваць пераправу войск. Усе захопленыя трафеі неўзабаве былі перададзены часцям 48-й арміі генерал-лейтэнанта П.Л.Раманенкі.

У апошніх партызанскіх баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі вызначыліся многія камандзіры і партызаны. Камбрыг П.Токараў, камандзіры атрадаў С.В.Пятроў, М.Г.Савін, камісары Р.А.Варанцоў, П.Н.Архіпенка, М.Б.Логвін першымі ўзнімаліся ў атаку і вялі за сабой байцоў. У баях вызначыліся камандзіры рот Ф.А.Казак і М.М.Лебедзеў, камандзір узвода П.Ярашэвіч, палітрук узвода падрыўнікоў А.Харамецкі, начальнік разведкі Я.Вараб'ёў, байцы Р. і П. Навуменкі, разведчыкі С.З.Агапаў, В.М.Парашчанка, Н.М.Савельеў, Е.С.Кузняцоў, В.М.Рудкоўскі, падрыўнікі У.Федасеенка і Д.Ніжнікаў. Знаходзіліся ў радах атакуючых і ўмела кіравалі боем начальнікі штабоў атрадаў П.П.Бондараў, Дз.В.Баравік, К.Р.Макараў.

Успамінаючы той час, былы начальнік БШПР, першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка пісаў: «Партызанская брыгада «Жалязняк» на р. Бярэзіна авалодала пераправамі каля населеных пунктаў Сінічкіна і Брод і замацавалася ўздоўж заходняга берага ракі на працягу 17 км. Брыгада адбіла ўсе спробы праціўніка фарсіраваць Бярэзіну, утрымала тут пераправы да прыходу 35-й гвардзейскай танкавай брыгады А.А.Асланава і забяспечыла яе пераправу на заходні бераг».

На гэтым участку партызанскай абароны яшчэ 19 лістапада фашысцкае падмацаванне са Жлобіна спрабавала каля в. Адрубы пераправіцца цераз Бярэзіну, каб дапамагчы гітлераўскім войскам, якія трапілі ў цяжкае становішча. Але партызаны брыгады «Жалязняк» адкрылі агонь, і прыбыўшыя войскі, не ўступаючы ў бой, адыйшлі да в. Таўстыкі.

У той час, калі часці 48-й арміі пераправаўляліся ў Горвалі цераз Бярэзіну, уверх па цячэнні ракі, падраздзяленні Чырвонай Арміі, якія падышлі сюды, і партызаны аказаліся ў

цяжкім становішчы: у лоб наступаць было нельга — наперадзе забалочаная пойма, непазбежны вялікія страты. Было вырашана накіраваць у размяшчэнне праціўніка некалькі груп з мэтай разведаць сістэму абароны. У ліку іх была група з брыгады «Жалязняк» у складзе П.І.Іванькова, В.А.Багачова, П.Г.Філіпенкі, Л.Дударава, А.М.Навуменкі і В.Т.Казлова. Камандаваў групай Я.Бердніка. Пазней жалязнякоўцы ўдарылі з фронту, іншыя — з тылу і флангу. Праціўнік паспешліва адступіў, аднак, перагрупаваўшы свае сілы, перайшоў у контратаку. Але партызаны і рота чырвонаармейцаў мужна адбівалася, на працягу 2 сутак стрымлівалі атакі ворага. 24 лістапада яны перадалі рубеж абароны і пабудавалі каля в. Адрубы пантонны мост падышоўшым часцям Чырвонай Арміі. У 1972 г. ў гонар баявых дзеянняў падпольшчыкаў і партызан каля в. Лугавая Вірня ўстаноўлены абеліск з барэльефнай выявай партызана з аўтаматам. *П.Я.Кірычэнка.*

Партыйныя органы

ЖЛОБІНСКІ МІЖРАЙКОМ КП(б)Б

Дзейнічаў з кастрычніка 1942 г. да мая 1943 г. Гомельскі абком КП(б)Б, які знаходзіўся тады ў Маскве, 29.6.1942 г. пастанавіў стварыць у ліку іншых «Жлобінскі раённы падпольна-партыйны цэнтр» для кіраўніцтва барацьбой партыйных арганізацый і партызанскіх атрадаў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а 3.7.1942 г. зацвердзіў склад цэнтра: Дз.Ц.Шыбінскі (кіраўнік), І.А.Крышнёў, І.М.Дзікан (пазней накіраваны ў Журавіцкі раён), К.К.Карпенка.

Члены міжрайкома КП(б)Б Дз.Ц.Шыбінскі і І.А.Крышнёў прыбылі: першы — у Стрэшынскі, другі — у Жлобінскі раёны ў верасні 1942 г. на чале самастойных груп. 24.9.1942 г. абедзве групы аб'ядналіся ў партызанскі атрад «Смерць фашызму» (камандзір І.А.Крышнёў, камісар Дз.Ц.Шыбінскі).

Міжрайком КП(б)Б распаўсюджваў сваю дзейнасць на Жлобінскі і Стрэшынскі раёны. Базіраваўся ў партызанскім атрадзе «Смерць фашызму». Пры раз'яднанні атрада ў маі 1943 г. на 2 — «Смерць фашызму» з месцам дыслакацыі ў Стрэшынскім раёне і «Жалязняк» у Жлобінскім раёне і стварэннем у кожным з гэтых раёнаў райкомаў КП(б)Б — міжрайком спыніў сваю дзейнасць.

Склад міжрайкома КП(б)Б: сакратар Дзмітрый Цімафеевіч Шыбінскі; члены міжрайкома Клаўдзія Ксенафонтаўна Карпенка, Іоў Апанасавіч Крышнёў.

ЖЛОБІНСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б

Дзейнічаў з мая да 25.11.1943 г. У жніўні 1941 г. ў тыле ворага застаўся другі сакратар Жлобінскага райкома партыі І.А.Крышнёў. Ён знаходзіўся ў раёне да верасня 1941 г. Праследаваўся фашыстамі, пакінуў раён і ў снежні 1941 г. перайшоў лінію фронту. У верасні 1942 г. І.А.Крышнёў быў накіраваны ЦК КП(б)Б у Жлобінскі раён на чале арганізатарскай групы і як член Жлобінскага міжрайкома партыі.

Жлобінскі падпольны райком КП(б)Б аформлены ў маі 1943 г. Сакратаром яго спачатку быў І.А.Крышнёў. Райком партыі базіраваўся ў партызанскім атрадзе «Жалязняк». У верасні 1943 г. атрад быў разгорнуты ў партызанскую брыгаду «Жалязняк». Пашырыўся і склад падпольнага райкома КП(б)Б з трох да пяці чалавек. Сакратаром яго стаў Г.В.Злынаў. І.А.Крышнёў выбыў за лінію фронту.

Склад падпольнага райкома КП(б)Б: сакратары Іоў Апанасавіч Крышнёў (май—верасень 1943), Георгій Васілевіч Злынаў (верасень 1943 — 25.11.1943); члены райкома: Георгій Васілевіч Злынаў (май—верасень 1943), Апанас Іванавіч Карунчык (май—25.11.1943), Міхаіл Герасімавіч Маршын, Фёдар Васілевіч Сполахаў, Аляксандр Іванавіч Савасцьянчык (усе з верасня да 25.11.1943).

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Шлях сацыялізма» (рэдактар Мікалай Мікалаевіч Целяпнёў).

СТРЭШЫНСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б

Дзейнічаў з мая да 21.11.1943 г. Да ліпеня 1943 г. сакратаром падпольнага райкома КП(б)Б з'яўляўся камісар партызанскага атрада «Смерць фашызму» Дз.Ц.Шыбінскі.

У ліпені 1943 г. ў сувязі з адкліканнем Дз.Ц.Шыбінскага ў Маскву Гомельскі падпольны абком КП(б)Б зацвердзіў сакратаром райкома А.І.Савасцьянчыка.

У верасні 1943 г. партызанскі атрад «Смерць фашызму» быў рэарганізаваны ў партызанскую брыгаду імя П.К.Панамарэнкі. У гэты час змяніўся склад падпольнага райкома партыі. А.І.Савасцьянчык перайшоў у Жлобінскі райком партыі. Сакратаром Стрэшынскага райкома стаў камісар брыгады імя П.К.Панамарэнкі Я.І.Садавы. Райком партыі базіраваўся ў партызанскай брыгадзе імя П.К.Панамарэнкі.

Склад падпольнага райкома КП(б)Б: сакратары Дзмітрый Цімафеевіч Шыбінскі (май—ліпень 1943), Аляксандр Іванавіч Савасцьянчык (ліпень—верасень 1943), Яўген Рыгоравіч Садавы (верасень — 21.11.1943); члены райкома: Іван Іванавіч Бандарэнка, Мітрафан Дзямідавіч Антуськаў, Міхаіл Пятровіч Кручкоў (усе з верасня да 21.11.1943).

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Сталінскі шлях» (рэдактар Міхаіл Пятровіч Кручкоў).

ЖЛОБІНСКІ ПАДПОЛЬНЫ МІЖРАЙКОМ ЛКСМБ

Дзейнічаў з кастрычніка 1942 г. да мая 1943 г. Створаны Гомельскім падпольным абкомам ЛКСМБ. Кіраваў камсамольскай работай у Жлобінскім і Стрэшынскім раёнах. Асноўная база знаходзілася ў партызанскім атрадзе «Смерць фашызму» (камандзір І.А.Крышнёў, камісар Дз.Ц.Шыбінскі).

Склад падпольнага міжрайкома ЛКСМБ. Сакратар — Іосіф Намётавіч Намётаў (кастрычнік 1942 — май 1943; сакратаром міжрайкома быў зацверджаны М.Ф.Юрскі, але ён загінуў 1.10.1942 г. Фактычна сакратаром міжрайкома з кастрычніка 1942 г. з'яўляўся І.Н.Намётаў, будучы намеснікам сакратара. 26.3.1943 г. І.Н.Намётаў быў зацверджаны сакратаром міжрайкома). Члены міжрайкома: Сяргей Агеевіч Каваленка і Леанід Еўдакімавіч Ярашэвіч (кастрычнік 1942 — май 1943).

ЖЛОБІНСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ

Дзейнічаў з ліпеня 1942 г. да кастрычніка 1942 г.; з мая 1943 г. да 25.11.1943 г. У перыяд абарончых баёў у ліпені—жніўні 1941 г. на тэрыторыі Жлобінскага раёна паспяхова дзейнічаў Жлобінскі знішчальны батальён, большую палову якога складалі камуністы і камсамольцы. Байцы гэтага батальёна, што засталіся ў тыле ворага, камсамольцы П.Я.Скварчэўскі, А.А.Валько, М.І.Елісееў, І.С.Ісаенка, В.І.Сяліцкі і іншыя стваралі камсамольска-маладзёжныя падпольныя групы і арганізацыі ў горадзе Жлобін і на тэрыторыі раёна. Іх дзейнасць накіроўвалі гомельскія падпольныя абкомы КП(б)Б і ЛКСМБ.

У ліпені 1942 г. ЦК ЛКСМБ накіраваў у Жлобінскі раён камсамольскім арганізатарам і сакратаром падпольнага райкома камсамола М.Ф.Юрскага, які ў гэтым жа месяцы прыступіў да работы. Пасля гібелі М.Ф.Юрскага члены райкома С.А.Каваленка* і І.Н.Намётаў увайшлі ў склад Жлобінскага падпольнага міжрайкома ЛКСМБ. З кастрычніка 1942 г. да мая 1943 г. камсамольскай работай у раёне кіраваў Жлобінскі міжрайком ЛКСМБ.

У маі 1943 г. падпольны райком камсамола быў зацверджаны ў новым складзе. Асноўная база знаходзілася ў партызанскай брыгадзе «Жалязняк».

Склад падпольнага райкома ЛКСМБ. Сакратары: Міхаіл Фёдаравіч Юрскі (ліпень 1942 — 1.10.1942, загінуў); Павел Яўгенавіч Скварчэўскі (май 1943 — 25.11.1943); Вера Пятроўна Махнач (сакратар па прапагандзе; 1.9.1943 — лістапад 1943).

Члены райкома: Іосіф Намётавіч Намётаў (ліпень — кастрычнік 1942, у маі 1943 — 25.11.1943 намеснік сакратара), Сяргей Агеевіч Каваленка (ліпень 1942 — кастрычнік 1942, май 1943 — 25.11.1943), Вера Пятроўна Махнач (май 1943 — 1.9.1943), Нічыпар Васілевіч Злынаў (май 1943 — 25.11.1943), Рыгор Піменавіч Завадоўкін (май 1943 — 25.11.1943).

Інструктары райкома па падпольнай рабоце: Алёна Сямёнаўна Бабкова (май 1943 — 25.11.1943), Тамара Іосіфаўна Раміська (май 1943 — 25.11.1943), Абрам Саламонавіч Смолкін (май 1943 — лістапад 1943), Ганна Васілеўна Канаплянікава (1.9.1943 — 23.11.1943).

---

* С.А.Каваленка працаваў інструктарам дыверсійнай справы Жлобінскага падпольнага райкома ЛКСМБ.

СТРЭШЫНСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ

Дзейнічаў з мая 1943 г. да 29.11.1943 г. Да стварэння падпольнага райкома камсамольскай работай у раёне кіравалі Гомельскі падпольны абком і Жлобінскі падпольны міжрайком камсамола. Асноўная база райкома знаходзілася ў партызанскім атрадзе «Смерць фашызму» і брыгадзе імя П.К.Панамарэнкі.

Склад падпольнага райкома ЛКСМБ. Сакратары: Іван Паўлавіч Грыневіч (май 1943 — 1.6.1943); Леанід Еўдакімавіч Ярашэвіч (1.6.1943 — 29.11.1943). Члены райкома: Леанід Еўдакімавіч Ярашэвіч (май 1943 — 1.6.1943); Вольга Рыгораўна Крышнёва (май 1943 — 29.11.1943); Пётр Дзмітрыевіч Пацаў (май 1943 — 29.11.1943); Мікалай Мітрафанавіч Савельеў (май 1943 — 29.11.1943).

Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Жлобінскага і былога Стрэшынскага раёнаў у 1941—44 гг.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА «ЖАЛЯЗНЯК»

Створана ў верасні 1943 г. 6.5.1943 г. з партызан, выдзеленых асобным атрадам «Смерць фашызму», арганізаваны атрад «Жалязняк» (камандзір Васіль Ільіч Шаруда, камісар Георгій Васілевіч Злынаў, начальнік штаба Яўген Іванавіч Драздоўскі). Загадам па партызанскаму злучэнню Гомельскай вобласці ад 10.9.1943 г. атрад разгорнуты ў брыгаду пад той жа назвай у складзе 116-га, 117 і 119-га атрадаў. Брыгада дзейнічала ў Жлобінскім раёне. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 25.11.1943 г. ў складзе 3 атрадаў агульнай колькасцю 964 партызаны, з іх мужчын — 892, жанчын — 72; беларусаў — 721, рускіх — 170, украінцаў — 23, іншых нацыяльнасцей — 50; членаў ВКП(б) — 35, кандыдатаў — 35, членаў ВЛКСМ — 151, беспартыйных — 743. Камандзір брыгады В.І.Шаруда, камісар Г.В.Злынаў, начальнік штаба Рыгор Піменавіч Завадоўкін (усе з верасня да лістапада 1943).

Камандзір партызанскай брыгады «Жалязняк» В.І.Шаруда (справа), камісар Г.В.Злынаў.

Партызанскі атрад № 116-ы. Арганізаваны ў верасні 1943 г. з партызан 6-й роты атрада «Жалязняк». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 314 партызан. Камандзір атрада Іван Якаўлевіч Пабалавец, камісар Аляксандр Іванавіч Савасцьянчык (абодва з верасня да лістапада 1943), начальнікі штаба Міхаіл Іосіфавіч Кліцуноў (верасень—кастрычнік 1943, загінуў), Аляксандр Іванавіч Верамейчык (кастрычнік—лістапад 1943).

Партызанскі атрад № 117-ы. Сфарміраваны ў верасні 1943 г. з партызан 7-й роты атрада «Жалязняк». На момант злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 238 партызан. Камандзір атрада Я.І.Драздоўскі, камісар Анатоль Пятровіч Аполасаў, начальнік штаба Сяргей Паўлавіч Гарэлік (усе з верасня да лістапада 1943).

Партызанскі атрад № 119-ы. Створаны ў верасні 1943 г. з партызан 9-й роты атрада «Жалязняк». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 349 партызан. Камандзір Антон Анісіфоравіч Гусельнікаў, камісар Уладзімір Акімавіч Капусцін, начальнік штаба Павел Еўдакімавіч Мілаванаў (усе з верасня да лістапада 1943).

Партызаны наносілі ўдары на чыгунках Жлобін—Гомель, Жлобін—Калінкавічы, на шашэйных і грунтавых дарогах у Стрэшынскім і Жлобінскім раёнах. Вялі баі па ачышчэнні раёна дыслакацыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Разам з іншымі атрадамі, у

тым ліку і атрадам «Смерць фашызму», разгромілі гарнізоны ў в. Мормаль (снежань 1942), Таўстыкі, Верхняя Алба (люты 1943), Радуша (сакавік 1943), паліцэйскія ўчасткі ў в. Лукі і Сцяпы, на ст. Чырвоны Бераг, з атрадам 108-м імя Катоўскага гарнізон у в. Замен-Рыння Жлобінскага раёна (жнівень 1943). У снежні 1942 г., студзені, сакавіку 1943 г. разам з іншымі партызанскімі атрадамі Гомельскай вобласці вялі баі супраць карных экспедыцый, засадныя і адкрытыя баі каля вёсак Петрыцкае Брагінскага, Лазараўка, Пружынішча, Прыстань Акцябрскага і вёсак Антонаўка, Кароткавічы, Майскае Жлобінскага раёнаў. З лета 1943 г. разам з атрадам «Смерць фашызму» партызанскай брыгады імя Панамарэнкі ўтрымлівалі ці кантралявалі населеныя пункты Стрэшынскага і Жлобінскага раёнаў. Толькі ў жніўні і верасні 1943 г. ў аперацыі «рэйкавая вайна» падарвалі больш за 1,5 тыс. рэек. У ліпені—жніўні 1943 г. падарвалі або пашкодзілі 11 мастоў, 56 аўтамашын, разгромілі 5 варожых апорных пунктаў. У баях захапілі 22 кулямёты, 4 мінамёты, каля 150 вінтовак. У кастрычніку 1943 г. абаранялі партызанскую зону ў межах в. Задзярэеўка, Шалковічы, Чарнейкі і Сведскае Васілевіцкага раёна. Да падыходу часцей Чырвонай Арміі разам з партызанскай брыгадай імя Панамарэнкі і атрадам 108-м імя Катоўскага заблакіравалі дарогу Горваль—Шаціпкі на ўчастку паміж в. Селішча і Крапіўня, напалі на гарнізон у в. Горваль і захапілі калону варожых аўтамашын. У гэтых баях партызаны 119-га атрада знішчылі 15 варожых аўтамашын. Партызаны брыгады «Жалязняк» пабудавалі мост цераз р. Бярэзіна каля в. Атрубы, утрымлівалі яго да падыходу Чырвонай Арміі.

Літ.: В грозовые годы. Мн., 1973; Непокоренная Белоруссия. М., 1963.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ П.К.ПАНАМАРЭНКІ

Створана ў верасні 1943 г. на базе асобнага партызанскага атрада «Смерць фашызму». Пры фарміраванні брыгады арганізаваны новыя атрады імя Г.К.Жукава і імя М.І.Калініна. Брыгада дзейнічала ў Жлобінскім, Стрэшынскім, Рэчыцкім раёнах Гомельскай, Парыцкім і Васілевіцкім Палескай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 21.11.1943 г. ў складзе 3 атрадаў агульнай колькасцю 938 партызан, з іх мужчын — 875, жанчын — 63; беларусаў — 771, рускіх — 121, украінцаў — 32, іншых нацыянальнасцей — 14; членаў ВКП(б) — 29, кандыдатаў — 35, членаў ВЛКСМ — 146, беспартыйных — 728. Камандзір брыгады Іван Іванавіч Бандарэнка, камісар Яўген Рыгоравіч Садавы, начальнік штаба Канстанцін Васілевіч Ніжнікаў; усе з верасня да лістапада 1943 г.

Партызанскі атрад «Смерць фашызму». У ліпені 1942 г. група А.І.Савасцьянчыка ў складзе 9 чалавек (жыхары в. Антонаўка Кароткавіцкага сельсавета) пачала свае дзеянні па барацьбе з акупантамі. Крыху пазней (у верасні) з савецкага тылу ў Жлобінскі і Стрэшынскі раёны па заданні ЦК КП(б)Б прыбылі арганізацыйныя групы І.А.Крышнёва і Дз.Ц.Шыбінскага. 24.9.1942 г. групы аб'ядналіся ў партызанскі атрад, якому далі назву «Смерць фашызму». У кастрычніку гэтага ж года ў яго ўліўся партызанскі атрад з Брэсцкай вобласці (створаны ў маі 1942 на базе групы В.І.Шаруды, якая дзейнічала ў Маларыцкім раёне з сакавіка 1942). Па рашэнні камандавання ён стаў прасоўвацца на ўсход на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі. Камандзір атрада: Васіль Ільіч Шаруда, «Лёня» (прозвішча не ўстаноўлена; загінуў у Хойніцкім раёне Палескай вобласці). На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі атрад налічваў 273 партызаны. Камандзіры: Іоў Апанасавіч Крышнёў (верасень 1942 — май 1943), Дзмітрый Цімафеевіч Шыбінскі (май 1943 —

Помнік у гонар партызанскага атрада «Смерць фашызму» ў в. Антонаўка.

чэрвень 1943), Іван Іванавіч Бандарэнка (чэрвень—верасень 1943), Парфірый Фёдаравіч Токараў (верасень—лістапад 1943); камісары: Дзмітрый Цімафеевіч Шыбінскі (верасень 1942 — май 1943), Аляксандр Іванавіч Савасцьянчык (май—жнівень 1943), Яўген Рыгоравіч Садавы (жнівень—верасень 1943), Мікалай Барысавіч Логвінаў (верасень—лістапад 1943); начальнікі штаба: Яўген Іванавіч Драздоўскі (верасень 1942 — май 1943), Аляксандр Рыгоравіч Купрэенка (чэрвень 1943), Сяргей Васілевіч Пятроў (чэрвень—верасень 1943), Канстанцін Рыгоравіч Махроў (верасень—лістапад 1943), Павел Васілевіч Астапенка (лістапад 1943).

Партызанскі атрад імя Г.К.Жукава. Арганізаваны ў верасні 1943 г. з асабовага складу, выдзеленага атрадам «Смерць фашызму». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі атрад налічваў 299 партызан. Камандзір Сяргей Васілевіч Пятроў; камісар Георгій Аляксандравіч Варанцоў, начальнік штаба Павел Парамонавіч Бондараў; усе з верасня да лістапада 1943 г.

Партызанскі атрад імя М.І.Калініна. Утвораны ў верасні 1943 г. з асабовага складу, выдзеленага атрадам «Смерць фашызму». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі атрад налічваў 310 партызан. Камандзір атрада Мікалай Георгіевіч Савін, камісар Павел Навумавіч Архіпенка, начальнік штаба Дзмітрый Васілевіч Баравікоў; усе з верасня да лістапада 1943 г.

Партызаны вялі баі, каб ачысціць раён сваёй дыслакацыі ад варожых апорных пунктаў. Разам з партызанскай брыгадай «Жалязняк» утрымлівалі і кантралявалі тэр. Стрэшынскага і Жлобінскага раёнаў. У снежні 1942 г., студзені, лютым, красавіку, чэрвені, кастрычніку 1943 г. ўдзельнічалі ў абарончых баях супраць карнікаў, у разгроме варожых апорных пунктаў у в. Мормаль, Таўстыкі, г.п. Стрэшын Стрэшынскага, в. Радуша Жлобінскага раёнаў, у баях каля в. Лубенікі (на чыгуначным участку Жлобін—Шацілкі), Майскае Брагінскага, Пружынішча Парыцкага, в. Новыя Маркавічы Стрэшынскага раёнаў. У жніўні 1943 г. ў аперацыі «рэйкавая вайна» падарвалі каля 200 рэек. У лістападзе 1943 г. пры падыходзе часцей Чырвонай Арміі разам з брыгадай «Жалязняк» і атрадам 108-м імя Катоўскага перарэзалі дарогу Горваль—Шацілкі, вялі засадныя баі, напалі на апорны пункт у в. Горваль і захапілі больш за 100 варожых аўтамашын.

Дакументы сведчаць

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА «СМЕРЦЬ ФАШЫЗМУ» ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ АБ БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ АТРАДА ЗА ПЕРЫЯД З ВЕРАСНЯ 1942 г. ПА 7 ЛЮТАГА 1943 г. І АБ УЗБРАЕННІ АТРАДА ПА СТАНУ НА 7 ЛЮТАГА 1943 г.

7 лютага 1943 г.

Па заданні ЦК КП(б) Беларусі групы Крышнёва і Шыбінскага прыбылі ў Жлобінскі і Стрэшынскі раёны ў сярэдзіне верасня 1942 г. З-за малалікасці іх асабовага саставу групы 24 верасня 1942 г. аб'ядналіся для сумеснай работы.

За перыяд знаходжання ў глыбокім тыле праціўніка намі праведзена наступнае. З першых дзён прыбыцця ў раён дзеяння мы пачалі праводзіць разведвальную работу, наладжваць сувязь з мясцовым насельніцтвам і прыцягваць яго лепшую частку ў партызанскі атрад, праводзіць работу па разлажэнні асабовага саставу паліцэйскіх участкаў на месцах і праводзіць дыверсійную работу на чыгуначных і шасейных дарогах. Спушчана пад адхон 3 воінскія чыгуначныя эшалоны праціўніка, у выніку чаго знішчаны 3 паравозы, 2 вагоны з людскім саставам, дзе загінула да 60 немцаў, 4 вагоны з боепрыпасамі, 6 вагонаў з харчаваннем і некалькі вагонаў з буйной рагатай жывёлай. Спалены мост даўжынёй 135 пагонных метраў на рацэ Ала на дарозе Чырвоны бераг—Парычы. Пашкоджана тэлеграфна-тэлефонная лінія сувязі Жлобін—Стрэшын даўжынёй 650 м. Знішчана тэлефонна-тэлеграфная сувязь на чыгунцы Жлобін—Калінкавічы працягласцю 1 км і потым на працягу 3 месяцаў не давалі праціўніку аднавіць тэлеграфна-тэлефонную сувязь, штодзённа разганяючы рабочую калону немцаў, якія спрабавалі аднавіць сувязь. Разгромлены Мормальская валасная ўправа і 3 паліцэйскія ўчасткі. Пры разгроме паліцэйскіх участкаў і валасной управы забіты бурга-

містр, 2 старасты, 47 паліцэйскіх, 52 немцы і «добраахвотнікі», у тым ліку 1 унтэр-афіцэр. Падбілі аўтамашыну і ўзялі ў палон жывым унтэр-афіцэра.

У абстаноўцы, якая склалася ў месцы дзеяння, партызанскі атрад прыйшлося вывесці з раёну і часова знаходзіцца больш месяца на тэрыторыі Лоеўскага, Брагінскага і Рэчыцкага раёнаў, дзе таксама давялося прыняць на сябе 5 баёў з немцамі і «добраахвотнікамі». У гэтых баях намі было знішчана больш 100 немцаў і «добраахвотнікаў» (якія іменавалі сябе «казакамі»). Захоплена 10 коней і боепрыпасы. Намі ў гэтых баях страчана 7 чалавек забітымі і 12 паранена.

На 7 лютага 1943 г. асабовы састаў партызанскага атрада налічвае 175 чалавек, з іх 60 чалавек без зброі. Узбраенне атрада: кулямётаў — 7, аўтаматаў — 8, вінтовак — 100, гранат — 20, патронаў — 2800.

Камандзір атрада Крышнёў (Грозны)

Камісар атрада Шыбінскі

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1973. Т. 2. С. 143—144.

ПАРТЫЗАНСКІ ПОЛК 255-ы

Дзейнічаў у Айчынную вайну на акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі Гомельскай (Рагачоўскі, Жлобінскі, Буда-Кашалёўскі раёны), Магілёўскай (Быхаўскі, Кіраўскі, Клічаўскі раёны) і Мінскай (Крупскі раён) абласцей.

Створаны ў лістападзе 1943 г. на базе 255-га атрада. У жніўні 1941 г. з партыйна-савецкага актыву, які застаўся ў Рагачоўскім раёне, па заданні ЦК КП(б)Б створаны Рагачоўскі партызанскі атрад. У кастрычніку частка асабовага складу атрада на чале з камандзірам М.Ц.Кузняцовым выйшла ў савецкі тыл. Астатнюю частку ўзначаліў сакратар падпольнага райкома КП(б)Б С.М.Свярдлоў. У лістападзе 1941 г. А.А.Бірукоў і М.К.Марусаў у Быхаўскім раёне стварылі партызанскую групу, якая колькасна выросла і ў красавіку 1942 г. аформілася ў атрад. У ліпені атрад наладзіў сувязь з Клічаўскім аператыўным цэнтрам і ўвайшоў у яго як 255-ы атрад з дыслакацыяй у Рагачоўскім раёне. Камандзір М.К.Марусаў, камісар А.А.Бірукоў, начальнік штаба В.В.Чысцякоў. У гэты час паводле ўказання Рагачоўскага падпольнага райкома КП(б)Б атрад 255-ы аб'яднаны з Рагачоўскім партызанскім атрадам. Аб'яднанаму атраду нададзены № 255. Камандзіры М.К.Марусаў, В.А.Мінайлаў; камісары А.А.Бірукоў, А.К.Іванюк, І.А.Ярымаў; нач. штаба В.В.Чысцякоў, В.А.Мінайлаў, А.І.Красічкаў (в.а.), П.М.Зайцаў. З сакавіка 1943 г. атрад дзейнічаў у партызанскай брыгадзе 8-й Рагачоўскай Гомельскай вобл. У лістападзе 1943 г. паводле рашэння Рагачоўскага падпольнага райкома КП(б)Б разгорнуты ў партызанскі полк 255-ы 3-батальённага складу. З сакавіка 1944 г. дзейнічаў у Рагачоўскай ВАГ. Камандзір палка В.А.Мінайлаў; камісары А.Н.Захарава (лістапад 1943 — май 1944), В.У.Паўлаў (з мая 1944); нач. штаба І.А.Ярымаў.

28.6.1944 г. полк (849 партызан) злучыўся з Чырвонай Арміяй. На дзень злучэння яднаў 3 батальёны. 1-ы батальён. Камандзір В.І.Шынкевіч; камісары М.Ф.Кавалёў, І.Ф.Чаша; нач. штаба А.І.Красічкаў, М.А.Шынкевіч. 2-і батальён. Камандзіры С.В.Старчанка, Ф.К.Іваноў; камісар П.М.Рэйдар; нач. штаба Г.К.Мяшкоў. 3-і батальён. Камандзір І.В.Сакалоў, камісар М.І.Радзіёнаў, начальнік штаба М.В.Швалёў.

Партызаны асноўны ўдар наносілі на чыгуначных участках Быхаў—Рагачоў—Жлобін, Жлобін—Бабруйск. У жніўні 1943 г. ў аперацыі «рэйкавая вайна» падарвалі больш за тысячу рэек. У ліпені 1942 г., студзені, сакавіку, маі, ліпені, кастрычніку—лістападзе 1943 г., лютым і маі 1944 г. вялі баі з карнікамі. У ліпені 1942 г. — жніўні 1943 г. самастойна і ў складзе 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады ў баях па ачышчэнні тэрыторыі Рагачоўскага і сумежных з ім раёнаў разграмілі каля 20 варожых апорных пунктаў і паліцэйскіх участкаў, гарнізоны ў в. Гарадзец (жнівень 1942), Гадзілавічы (кастрычнік 1942), Фалевічы (снежань 1942), Забалацце (снежань 1942), Побалава (снежань 1942, люты 1943) Рагачоўскага, Стары Крывец і Дзедлава (кастрычнік 1942) Журавіцкага, Струкі Буда-Кашалёўскага раёнаў. У кастрычніку 1942 г. ў Буда-Кашалёўскім раёне захапілі склад з боепрыпасамі (больш за мільён патронаў), зброяй. У Крупскім раёне разам з партызанскім атрадам 257-м учынілі налёты на апорныя пункты ў в. Выдрыца і Ухвала. Партызану палка П.І.Кавалёву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА 8-я РАГАЧОЎСКАЯ

Дзейнічала ў Айчынную вайну на акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі Гомельскай (Рагачоўскі, Журавіцкі,

Жлобінскі, Буда-Кашалёўскі раёны) і Магілёўскай (Клічаўскі, Быхаўскі, Кіраўскі, Бярэзінскі раёны) абласцей.

Створана ў лютым 1943 г. паводле загада Клічаўскага аператыўнага цэнтра на базе партызанскага атрада 255-га, партызанскага атрада 257-га, у сакавіку створаны партызанскі атрад 258-ы і партызанскі атрад 259-ы. У красавіку сфарміраваны спецатрад (пазней партызанскі атрад 252-і). У лістападзе 1943 г. паводле рашэння Рагачоўскага падпольнага райкома КП(б)Б атрад 255-ы разгорнуты ў партызанскі полк 255-ы. У лістападзе брыгада перадыслацыравана ў Клічаўскі раён. Камандзіры брыгады Ф.С.Тарасевіч (люты 1943 — люты 1944), В.В.Чысцякоў (люты—сакавік 1944); камісары А.А.Бірукоў (люты—ліпень 1943), В.У.Паўлаў (ліпень 1943 — сакавік 1944); начальнік штаба В.В.Чысцякоў (люты 1943 — люты 1944), М.Ф.Рубіс. У сакавіку 1944 г. паводле рашэння Рагачоўскага падпольнага КП(б)Б брыгада пераўтворана ў Рагачоўскую ваенна-аператыўную групу.

Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгуначных участках Рагачоў—Быхаў, Рагачоў—Жлобін, Жлобін—Бабруйск. У жніўні 1943 г. ўдзельнічалі ў аперацыі «рэйкавая вайна». На ўчастку Жлобін—Бабруйск падарвалі 140 рэек, разбурылі стрэлачныя пераводы і пашкодзілі раз'езд Амельня; 28.8.1943 г. на гэтым участку падарвалі больш за 1 тысячу рэек. У сакавіку—красавіку 1943 г. пусцілі пад адхон і абстралялі 32 эшалоны праціўніка, падарвалі і пашкодзілі 7 мастоў, больш за 40 аўтамашын. Знішчылі некалькі дзесяткаў варожых апорных пунктаў, паліцэйскіх участкаў і ўпраў, у т.л. ў в. Рэкта (жнівень 1943), Дзедава, Гадзілавічы, Стралкі, Побалава, Ціхінічы Рагачоўскага раёна, напалі на гарнізон у в. Падсёлы (16.8.1943) Кіраўскага раёна. У лютым, маі, ліпені, кастрычніку—лістападзе 1943 г. і ў лютым 1944 г. вялі баі з карнікамі за ўтрыманне партызанскай зоны, за прарыў блакады і выхад з акружэння.

Партызанскі спецыяльны атрад «Храбрацы» НКДБ БССР

1.7.1942 г. група (14 чалавек) закінута ў варожы тыл. 17.3.1943 г. на базу групы закінуты 22 байцы, 7.6.1943 г. яшчэ 4. Група папоўнілася мясцовым насельніцтвам і ператворана ў атрад, які дзейнічаў у Гомельскім, Жыткавіцкім, Жлобінскім, Калінкавіцкім, Мазырскім, Акцябрскім, Петрыкаўскім, Рагачоўскім, Быхаўскім, Бабруйскім, Асіповіцкім, Івацэвіцкім, Лунінецкім, Пінскім р-нах. Партызаны атрада правялі больш за 200 дыверсій на чыгуначных, шашэйных дарогах, у Асіповічах, Мазыры, Бабруйску, Калінкавічах; пусцілі пад адхон, узарвалі і спалілі 91 варожы эшалон з жывой сілай і тэхнікай, знішчылі і пашкодзілі 24 танкі (з іх 5 «тыграў»), 23 бронемашыны, бронецягнік, 102 аўтамашыны, 35 электраматораў, 2 катэры, 4 лакамабілі, 2 падымальныя краны, узарвалі і спалілі склад з авіябомбамі, 5 шашэйных мастоў, 3 лесапільныя заводы, пашкодзілі каля 300 м чыгуначнага пуці, 2,5 км тэлеграфнатэлефоннай сувязі, разграмілі 2 гарнізоны і інш. Яны здабывалі і перадавалі савецкаму камандаванню звесткі пра ўзбраенне і размяшчэнне гарнізонаў, аэрадромаў праціўніка, пра абарончыя збудаванні на р. Сож, Дняпро, Бярэзіна, Прыпяць, перадыслакацыю варожых войск. Партызаны вялі палітычную прапаганду сярод насельніцтва, сярод варожых фарміраванняў, у тым ліку сярод славацкіх салдат. 12.7.1944 г. байцы атрада (204 чалавекі) злучыліся з Чырвонай Арміяй; большасць узнагароджаны ордэнамі і медалямі, камандзіру атрада А.М.Рабцэвічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Партызанскі асобны атрад імя Р.І.Катоўскага

Арганізаваны ў верасні 1941 г. з воінаў 29-й мехдывізіі 10-й арміі па ініцыятыве капітана Н.П.Каленчанкі. Спачатку атрад налічваў 32 байцы і размяшчаўся ў раёне в. Антонаўка Кароткавіцкага сельсавета. Камандзір Н.П.Каленчанка, камісар П.А.Анікін, начальнік штаба старшы лейтэнант Рвачоў. Пазней атрад папоўніўся жыхарамі Жлобінскага і Рагачоўскага раёнаў. Дзейнічаў на тэрыторыі гэтых раёнаў, а пазней у Быхаўскім раёне Магілёўскай вобласці. У верасні 1942 г. выцеснены карнікамі ў Арлоўскую вобласць. Далейшыя звесткі аб атрадзе невядомы.

Партызанскі 108-ы асобны атрад імя Р.І.Катоўскага

Створаны ў сакавіку 1943 г. па заданні Клічаўскага аператыўнага цэнтра з групы партызан 810-га палка Магілёўскай вобласці і накіраваны ў Жлобінскі раён. З 11.3.1943 г. ўваходзіў у склад 10-й Журавіцкай брыгады, а ў жніўні 1943 г. перададзены 1-й Буда-Кашалёўскай брыгадзе. Пазней выдзеліўся ў са-

мастойны атрад. У маі 1943 г. атрымаў нумарное абазначэнне 108-ы, у ліпені яму прысвоена імя Р.І.Катоўскага. Дзейнічаў у Жлобінскім, Журавіцкім і Буда-Кашалёўскім раёнах. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 23.11.1943 г. і налічваў на той момант 344 партызаны, з іх мужчын — 318, жанчын — 26; беларусаў — 212, рускіх — 97, украінцаў — 11, іншых нацыянальнасцей — 24; членаў ВКП(б) — 19, кандыдатаў — 19; членаў ВЛКСМ — 106, беспартыйных — 200. Камандзір атрада Мікалай Аляксандравіч Труснаў (сакавік—лістапад 1943), камісары Станіслаў Паўлавіч Каспрук (сакавік—жнівень 1943), Фёдар Васілевіч Сполахаў (жнівень—лістапад 1943), начальнік штаба Рыгор Іванавіч Караткоў (сакавік—лістапад 1943). Партызаны наносілі ўдары па варожых камунікацыях на чыгуначных участках Быхаў—Жлобін—Буда-Кашалёва. У жніўні 1943 г. з партызанскай брыгадай «Жалязняк» разбілі варожы гарнізон у в. Замен-Рыння Жлобінскага раёна. Пры падыходзе перадавых часцей Чырвонай Арміі разам з партызанскімі брыгадамі імя Панамарэнкі і «Жалязняк» перарэзалі дарогу Горваль—Шацілкі, напалі на варожы апорны пункт у в. Горваль Рэчыцкага раёна і захапілі калону аўтамашын.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА 10-я ЖУРАВІЦКАЯ

Дзейнічала ў Айчынную вайну на акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі Гомельскай вобласці (Журавіцкі, Буда-Кашалёўскі, Кармянскі, Церахоўскі, Рагачоўскі, Жлобінскі, Чачэрскі раёны).

Створана ў сакавіку 1943 г. паводле загада Клічаўскага аператыўнага цэнтра на базе партызанскага атрада 256-га. У час фарміравання брыгады атрад 256-ы ўзбуйнены, з яго асабовага складу сфарміраваны атрады 260-ы, 261-ы, 262-і і ўключаны асобны атрад 108-ы. Пазней у брыгадзе сфарміраваны атрады П.Я.Мацюшкова, В.А.Трубачова, П.П.Рымарава, 266-ы, 267-ы «За Радзіму», 268-ы імя 25-годдзя камсамола. 1.5.1943 г. атрадам П.Я.Мацюшкова, В.А.Трубачова, П.П.Рымарава нададзены нумарныя абазначэнні (адпаведна): 263-і, 264-ы, 265-ы. У ліпені атрадам нададзены найменні: 256-ы імя Сталіна, 260-ы імя Калініна, 261-ы імя Чапаева, 262-і імя Чкалава, 263-і імя Кутузава, 264-ы імя Суворава, 265-ы імя Варашылава, 266-ы імя Фрунзе, 108-ы імя Катоўскага. Паводле загада ўпаўнаважанага ЦК КП(б)Б і БШПР па

Помнік у гонар партызан 266-га атрада імя М.В.Фрунзе ў пас. Аляксандраўка.

Гомельскай вобласці ад 12.8.1943 г. атрады 262-і імя Чкалава, 263-і імя Кутузава, 108-ы імя Катоўскага, перададзены для фарміравання партызанскай брыгады 1-й Буда-Кашалёўскай. Камандзіры партызанскай брыгады 10-й Журавіцкай С.М.Белых (сакавік—красавік 1943, загінуў), І.М.Гаўрылаў (май—кастрычнік 1943); камісары І.М.Дзікан (сакавік—верасень 1943, паводле ўдакладненых звестак), К.М.Драчоў (верасень—кастрычнік 1943); начальнік штаба Ц.К.Антонаў.

28 верасня, 2 кастрычніка, у снежні 1943 г., 24.2 і 27.6.1944 г. брыгада (2759 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй. На час злучэння яднала 8 атрадаў. Атрад 256-ы імя І.В.Сталіна, створаны ў снежні 1942 г. з арганізатарскай групы М.І.Дзікана і С.М.Белых, якая накіравана ў ліпені 1942 г. па заданні ЦК КП(б)Б у варожы тыл, у кастрычніку прыбыла ў Рагачоўскі, потым перабазіравалася ў Журавіцкі раён. Камандзіры атрада

У.Б.Паўлаў.

С.М.Белых, Я.І.Штапенка; камісары М.І.Дзікан, І.А.Міхуноў; начальнік штаба П.К.Антонаў, І.Г.Марозаў. Атрад 260-ы імя М.І.Калініна створаны ў сакавіку 1943 г. з асабовага складу 2-й роты атрада 256-га. Камандзіры І.М.Гаўрылаў, М.Р.Грызлоў; камісары Ф.Л.Жураўлёў, А.С.Гонтараў, А.С.Кудасаў; начальнік штаба С.С.Дудалёў. Атрад 261-ы імя В.І.Чапаева створаны ў сакавіку 1943 г. з асабовага складу 3-й роты 256-га атрада. Камандзіры М.П.Жураўлёў; камісары Я.М.Нікіфараў, А.С.Гонтараў; начальнік штаба В.М.Анікіевіч. Атрад 264-ы імя А.В.Суворава створаны ў красавіку 1943 г. з асабовага складу 4-й роты 256-га атрада. Камандзір В.А.Трубачоў; камісары М.Я.Афанасенка, К.П.Казакоў; начальнік штаба У.П.Качаткоўскі. Атрад 265-ы імя К.Я.Варашылава створаны ў сакавіку 1943 г. з ініцыятыўнай групы П.П.Рымарава і К.М.Драчова, вылучанай партызанскай брыгадай 8-й Рагачоўскай. Камандзіры П.П.Рымараў, К.М.Драчоў, П.П.Пушкароў; камісары К.М.Драчоў, М.Ф.Шабеткін; начальнік штаба І.Я.Семешкін. Атрад 266-ы імя М.Ф.Фрунзе створаны паводле загада брыгады ад 25.5.1943 г. з ініцыятыўнай групы У.Б.Паўлава. Камандзір У.Б.Паўлаў; камісар У.І.Дубінін; начальнік штаба М.М.Цалікаў, Л.А.Панкоў. Атрад 267-ы «За Радзіму» створаны ў жніўні 1943 г. з асабовага складу 5-й роты 256-га атрада. Камандзір З.П.Самыкін, камісар В.П.Холадаў, начальнік штаба І.М.Пунінскі. Атрад 268-ы імя 25-годдзя камсамола створаны ў верасні 1943 г. з часткі асабовага складу брыгады. Камандзір К.Ф.Чарненка, камісар І.Р.Бязмельніцын, начальнік штаба І.Л.Раманаў.

Партызаны наносілі ўдары на чыгуначным участку Гомель—Жлобін каля станцый Хальч, Рудня, Салтанаўка, Шарыбаўка. У чэрвені—жніўні 1943 г. ўчынілі больш за 50 дыверсій па падрыве варожых эшалонаў. У аперацыі «рэйкавая вайна» на ўчастку Салтанаўка—Шарыбаўка падарвалі каля 2 тыс. рэек. У адкрытых і засадных баях разграмілі 11 варожых апорных пунктаў, нямецкіх паліцэйскіх участкаў, знішчылі 95 аўтамашын, 3 склады. Захапілі 27 кулямётаў, 6 аўтаматаў, 239 вінтовак.

Дзяўчаты-падпольшчыцы

У 1942 годзе на тэрыторыі Жлобіна дзейнічала некалькі падпольных камсамольскіх арганізацый і груп. Яны складалі своеасаблівы камсамольскі цэнтр, які потым стаў добрай базай для стварэння падпольнага райкома камсамола.

Адной з такіх арганізацый кіравала Ганна Канаплянікава. Яна ўмела накіроўвала дзейнасць сваіх паплечнікаў, сама прымала актыўны ўдзел у аперацыях супраць акупантаў. Аднойчы я, будучы ўжо другім сакратаром падпольнага райкома камсамола, перадала ёй загад разведаць размяшчэнне зенітных гармат у летнім парку. Зрабіць гэта было надзвычай цяжка, бо тэрыторыя моцна ахоўвалася немцамі. І ўсё ж Аня разам з Клавай Нікалаевай пранікла ў парк і здабыла неабходныя звесткі.

Члены арганізацыі Г.Канаплянікавай збіралі даныя аб руху варожых эшалонаў з ваеннымі грузамі і войскамі, падрывалі нямецкія аўтамашыны.

На тэрыторыі горада дзейнічалі таксама групы Тамары Раміська, Таццяны Байкачовай і іншыя. У вёсках вялі работу падпольныя камсамольскія арганізацыі Валянціны Худалей, Варвары Фамянок.

Слаўныя справы Т.Раміська вядомы далёка. Фашысты расстралялі яе бацькоў і старэйшую сястру, спалілі дом. Але гэта не зламала маладую падпольшчыцу і разведчыцу. Апранутая пад старую жанчыну ці пад выглядам жабрачкі яна пранікала ў самыя небяспечныя месцы і прыносіла каштоўныя звесткі. Са сваімі сяброўкамі аднойчы даставіла ў штаб партызанскага атрада паліцэйскага ў якасці «языка».

Чырвонаармеец Пётр Мяснікоў у ходзе наступу забяспечыў камандзіра надзейнай сувяззю, злучыў звыш 60 парываў тэлефоннага кабелю. У ходзе бою вызначыліся таксама радавыя Аляксей Мотасаў, Васіль Сцепаненка, Яўген Марошанка і іншыя. У поспех бою ўнеслі свой уклад сапёры, зенітчыкі, воіны іншых спецыяльнасцей. 23-гадовы санінструктар старшы сяржант медыцынскай службы Алёна Далгова вынесла з поля бою 32 параненыя.

Вораг паступова адкатваўся. Часці дывізіі цяснілі яго ў напрамку Жлобіна, прыкрываючыся з фронту і флангаў артылерыяй.

У Старую Рудню быў пасланы капітан Пётр Герасімаў з групай афіцэраў, каб знайсці памяшканне для штаба.

Пакуль штаб перабіраўся на новае месца, апусціўся ранні снежаньскі змрок. У гэты час часці дывізіі выйшлі на рубеж — заходняя ўскраіна невялікага населенага пункта Хальч і чыгуначнай станцыі аднайменнай назвы, перарэзаўшы на часткі групіроўку праціўніка ў гэтым раёне. Аднак далей прасунуцца не змаглі. Вораг трывала засеў на загадзя падрыхтаваных пазіцыях, праходзячых па паўднёвых ускраінах вёсак Чацвярня, Лугавая Вірня. На гэтым рубяжы часці дывізіі затрымаліся на некалькі дзён. Вялі разведку, падцягвалі тылы.

5 снежня быў атрыманы загад аб здачы баявога ўчастка. Да трох гадзін наступнага дня часці сканцэнтраваліся ў раёне населеных пунктаў Скепня-1 і Скепня-2.

У той жа дзень дывізія выйшла да Дняпра. На бераг Дняпра прыбылі таксама іншыя дывізіі корпуса. Хутка пачалі паступаць сродкі ўзмацнення. На параўнальна невялікім участку апрача стралковых за некалькі дзён былі сканцэнтраваны артылерыйская, асобная гвардзейская мінамётная дывізіі, танкавая брыгада і іншыя часці. Мэта манеўру — адрэзаць з захаду жлобінскую групоўку праціўніка.

197-я дывізія знаходзілася ў другім эшалоне корпуса. Выкарыстоўваючы часовае зацішша, палкі і батальёны працягвалі ўзводзіць абарончыя рубяжы, праводзілі рэкагнасціровачныя работы на шляхах верагоднага ўводу ў бой дывізіі.

Раніцай 14 снежня пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі корпус перайшоў у нас-

тупленне. 273-я стралковая дывізія, якая дзейнічала ў напрамку прарыву, авалодала апорным пунктам Пудымаў (паміж вёскамі Нівы і Папаратнае; знішчаны і пасля вайны не адноўлены) і выйшла да безымянных вышынь паўночна-заходняй ракі Дабысна. Тут яна падверглася магутнай контратацы ворага і вымушана была пакінуць захопленыя пазіцыі.

Матэрыялы з кн. А.Алтуніна «На службе Отечеству». М., 1985.

На левым флангу

4.12.1943 г. разведчыкі 1026-га стралковага палка 260-й стралковай дывізіі выйшлі да вёскі Чацвярня. Разведчык Рыгор Паклонскі заўважыў варожы патруль і знішчыў яго. Ліквідаваць бясшумна не ўдалося. Узвод разведчыкаў, дзе я займаў пасаду памочніка камандзіра, павёў агнявы бой. Каб ворагі не змаглі выявіць колькі нас, мы рассяродзіліся і вялі бой, перабягаючы ад укрыцця да ўкрыцця. Немцы пачалі нізінай адыходзіць у бок Дняпра, але бой ішоў амаль за кожную хату. Неўзабаве падышлі асноўныя сілы палка.

Так на досвітку 4 снежня 1943 г. мы без страт авалодалі вялікай в. Чацвярня, якую гітлераўцы не паспелі спаліць.

Разведчыкі рушылі далей. Непадалёку ад вёскі быў новы варожы рубеж абароны, які праходзіў праз лес. Тут таксама завязаўся бой. Паступова перавага ўсталявалася на нашым баку, і бой адкаціўся на вялікую лясную паляну, якую мясцовыя жыхары называлі Ермаковым полем. Тут мы «асядлалі» пясчаную граду, бо рухацца далей не маглі, — полк за дні наступлення панёс страты ў людзях і ва ўзбраенні, адсталі тылы. Зіма 1943—44 гг. была слякотнай, з частымі адлігамі і дажджамі, дарогі развезла. Наша камандаванне, узважыўшы абставіны, аддало загад спыніць наступленне. На Ермаковым полі хутка раслі бугаркі-брустверы адзінкавых акопаў, якія потым пад агнём ворага злучаліся траншэямі пярэдняга краю нашай абароны.

Гітлераўцы абаранялiся на загадзя падрыхтаваным рубяжы па левым беразе Дняпра. Правае крыло яго ўпіралася ў раку ў раёне вёскі Чацвярня, адсюль фашысцкія акопы цягнуліся да вёсак Калыбаўка, Бабоўка, Чорная Вірня, Майскае, Турск і да Дняпра ў Рагачоўскім раёне.

Абарону ворагі добра ўмацавалі. Былі ў некалькі радоў акопы ў поўны профіль, блiндажы, агнявыя кропкі, прыстраляны ўсе бліжэйшыя подступы.

У зоне дзеянняў нашага палка разведчыкам было загадана сканцэнтравацца на левым флангу. Тут пясчаная каса заканчвалася і пачыналася балоцістая нізіна. Акапацца нельга, бо выступае вада. Толькі дробны хмызняк хаваў нас ад варожых вачэй, але ад куль і асколкаў не ахоўваў.

«Выявіце, што думаюць рабіць захопнікі», — загадаў начальнік штаба капітан Мікалай Міхайлавіч Арлоў. Фашыстам вельмі не на руку было, што мы выйшлі на Ермакова поле, левы край якога ўпіраўся ў Днепр. Тут немцы праяўлялі падазроную актыўнасць: вялі інтэнсіўны агонь, перагрупоўваліся. Мы накіравалі сюды сваіх самых вопытных разведчыкаў Музалева і Канаплёва, якія былі ўзброены кулямётамі, а Раманаву і Кіру даручылі з наступленнем цемнаты разведаць подступы да абароны немцаў.

Раманаў і Кіра і ў баі, і на адпачынку былі заўсёды разам. Калі татарын Кіра ішоў на заданне, то следам за ім крочыў са сваёй снайперскай вінтоўкай і марыец Раманаў. Ва ўзводзе разведчыкі жартам называлі іх сваім інтэрнацыяналам і былі ўпэўнены, што ніколі яны не падвядуць. Разведчык Мікалай Чудайкін заўважыў, што каля разбуранага праз рачулку моста ёсць кулямётнае гняздо. З яго ворагі абстрэльвалі ўвесь пярэдні край разведчыкаў і нейтральную зону. З наступленнем ночы вырашылі знішчыць кулямётную кропку і яе разлік. Дапамагчы Чудайкіну ў гэтай аперацыі згадзіліся Музалеў і Канаплёў. Першым папоўз Чудайкін з дзвюма супрацьтанкавымі гранатамі ў руках. За ім, праз дзесяць метраў, Музалеў, потым зноў праз такі ж інтэрвал Канаплёў. Сувязь паміж імі — тэлефонны кабель. Таргане яго тры разы першы разведчык, усе паўзуць хутчэй, адзін раз — замірaюць. А тут, як на зло, неба вызвездзіла, фрыцы раз за разам кідаюць ас-

вятляльныя ракеты. Пры кожным стрэле з ракетніцы разведчыкі заміралі, зліваліся з шэрай зямлёю. Бліжэй і бліжэй кулямётнае гняздо. Яно ўжо на кідок гранаты. Каля глыбокай снараднай варонкі Чудайкін узняўся, кінуў адну за другой гранаты і сам упаў у яму. Грымнулі выбухі, рэха іх пакацілася над полем і лесам. Ліквідацыя кулямётнай кропкі дала магчымасць разведаць варожы пярэдні край і даставіць патрэбныя даныя ў штаб палка. Байцы загадзя падрыхтаваліся да адбіцця варожай атакі. Калі фашысты днём 5 снежня атакавалі полк на Ермаковым полі, то панеслі вялікія страты і адкаціліся на свой зыходны рубеж.

Фронт на подступах да Жлобіна стабілізаваўся. Разведчыкі не адну ноч прабіраліся ў тыл ворага і дастаўлялі камандаванню патрэбныя разведданыя. Полк трымаў абарону на Ермаковым полі ўвесь снежань 1943 і студзень 1944 г. А потым у лютым было наступленне пад Рагачовам, вызваленне яго ад акупантаў, і фронт, ушчыльную наблізіўшыся да Жлобіна, стаяў тут аж да правядзення аперацыі «Багратіён» па вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

І.І.Гарбатко.

Гарнізон чатырох гвардзейцаў

Гэта было пад Жлобінам. Міль Куготаў — жыхар сяла Верхні Куркужын Баксанскага раёна (Кабардзіна-Балкарыя), якое раскінулася ўздоўж горнай рэчкі Куркужын, — не падазраваў, што могуць быць такія балоты, якія ўбачыў на беларускай зямлі. Ваяваць тут яму было цяжэй, чым іншым: ён адказваў не толькі за сябе, але і за баявую машыну, таму што быў механікам-вадзіцелем танка Т-34 у 15-й гвардзейскай танкавай брыгадзе.

Лінія абароны не была суцэльнай. Было вырашана правесці разведку боем і захапіць бліжэйшую вёску. У разведку паслалі танк вадзіцеля Куготава. Выявіўшы танк, гітлераўцы адкрылі агонь з усіх відаў зброі. Пераканаўшыся, што вёска знаходзіцца ў руках ворага, танкісты пачалі адыход. У гарачцы бою арыенціры былі страчаны, і танк заграз у балоце.

На досвітку, калі танкісты сабраліся цягнуць да машыны ўсё, што дапамагло б ім вызваліцца з «балотнага палону», фашысты рушылі ў напрамку нашых пазіцый. Іх паводзіны дазвалялі меркаваць, што аб застраўшым танку яны не ведалі.

«Гарнізон чатырох гвардзейцаў», як адразу назваў сябе экіпаж, хутка падрыхтаваўся да бою. Пачуўшы яго гукі, на дапамогу адважным танкістам паспяшалася ўся рота. Але калі яна падышла, усё было скончана. На полі бою засталося каля 60 варожых салдат. Астатнія ўцяклі. Выцягнуўшы з балота танк, гвардзейцы вярнуліся ў размяшчэнне брыгады.

Увесь «гарнізон» быў узнагароджаны. Міль Куготаў атрымаў медаль «За адвагу».

В.Разанаў.

Падзеі тых дзён

Пасля шпіталю я трапіў у 146-ы запасны стралковы полк, потым мяне прызначылі ў вучэбны ўзвод аўтаматчыкаў. Наш атрад уліўся ў рэгулярную часць, а неўзабаве атрымаў заданне заняць абарону на левым беразе Дняпра, насупраць горада Жлобін. Тут мы стаялі ў чэрвені 1944 г., а за 3 дні да наступлення былі высунутыя на зыходныя рубяжы. На правым беразе ракі — гітлераўцы.

Камандзір атрада маёр Горлаў аддаў загад узводу аўтаматчыкаў узяць участак у раёне чыгуначнага моста. Пад камандаваннем малодшага лейтэнанта Рыбкі мы адправіліся выконваць заданне. Помню, што ў ліку іншых аўтаматчыкаў ішлі татарын Шарыфулін, беларус Гаркаўцоў, ленінградзец Канстанцінаў. Немцы заўважылі нас, пачалі стральбу. Але мы беглі ўперад, кожны з нас спяшаўся. Шлях нам перагарадзіла старыца. Адзін з аўтаматчыкаў быў забіты, пераплываючы, стаў тануць Гаркаўцоў. Разам з камандзірам аддзялення мы выцягнулі яго на бераг. Увесь

участак, па якім мы прабіраліся да моста, быў замініраваны. Упарадзе ўзвода ішоў аўтаматчык Шарыфулін, перасцерагаючы ўзвод ад мін.

Неўзабаве мы дасягнулі моста. Але ўзысці на яго не было ніякай магчымасці: мост быў узарваны. Да сярэдзіны ракі давялося прабірацца па разбітых фермах. Шарыфулін першым дасягнуў берага. Непадалёку ад бліндажа на правым беразе Дняпра ён знайшоў невялікую лодку і паплыў нам насустрач. Дабраўшыся да берага, узвод заняў абарону.

За вызваленне Жлобіна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў камандзір узвода аўтаматчыкаў малодшы лейтэнант Рыбка быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У.І.Шпіленка.

Радкі пра вызваліцеляў

АЛАБЯРДЫЕЎ Ахмет. Ваяваў у складзе 73-й стралковай дывізіі 48-й арміі, якая са студзеня 1944 г. займала лінію абароны Жлобін—Праскурні.

21 лютага ў раёне в. Праскурні ў час наступлення праціўніка даставіў на перадавую ў роту, якой камандаваў Дземчанка, 5 каробак з патронамі і замяніў загінуўшага наводчыка. Знішчыў больш за 20 варожых салдат. За гэты бой узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені. За баі на беларускай зямлі атрымаў ордэн Славы 2-й ступені, потым 3-й ступені. Прымаў удзел у парадзе Перамогі.

А.Алабярдыеў.

БЯРОЗКІН Мацвей Акімавіч. Нарадзіўся ў 1896 г. ў Екацярынбургу. У гады 1-й сусветнай вайны быў салдатам царскай арміі, прымаў удзел у грамадзянскай і савецка-фінляндскай войнах. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У канцы 1943 г. камандзір стралковай роты 73-й стралковай дывізіі. Гэта быў сталы паважаны чалавек, які меў вялікі вопыт баявых дзеянняў і быў старэйшы па ўзросту за многіх камандзіраў. Вызначыўся ў наступальных баях каля Стрэшына, вёсак Затон і Праскурні, а раней пры фарсіраванні Бярэзіны і ачышчэнні ад ворага левабярэжжа Дняпра. Узнагароджаны 6 ордэнамі, у т.л. ордэнамі Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга за мужнасць і адвагу ў баях на жлобінскай зямлі і вызваленне Жлобіна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.



Помнік на месцы подзвігу М.П.Жуйкова і П.М.Мазіліна ў в. Мормаль.

ГАРБАТКО Іван Іосіфавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. У складзе 260-й Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава Ковельскай стралковай дывізіі 1-га Беларускага фронту прымаў удзел у вызваленні Добрушскага, Буда-Кашалёўскага, Жлобінскага і іншых раёнаў. Жыве ў г. Херсон.

ДАЛГОЎ Аляксей Іосіфавіч. Нарадзіўся ў г. Каршы (Узбекістан). З 1940 г. ў арміі. Служыў у Беларусі. У бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўступіў у першы дзень вайны. За час баёў пад Жлобінам старшы сяржант А.І.Далгоў з байцамі знішчыў звыш 30 ворагаў і быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені. У снежні 1943 г. каля г.п. Стрэшын група байцоў пад камандаваннем памочніка камандзіра ўзвода 73-й стралковай дывізіі А.І.Далгова захапіла 7 палонных. Узнагароджаны медалём «За адвагу». Потым былі баі каля в. Праскурні. Загінуў на тэрыторыі Польшчы.

ЖУЙКОЎ Мікалай Пятровіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў пас. Ялоўскі Ярскага раёна Удмурціі. На фронце з красавіка 1943 г. 1.3.1944 г. асобнаму кулямётна-артылерыйскаму батальёну пад камандаваннем лейтэнанта М.П.Жуйкова была пастаўлена задача авалодаць апорным пунктам праціўніка — вышынёй каля вёскі Мормаль. Пасля артпадрыхтоўкі батальён авалодаў першай лініяй абароны ворага, але далейшы яго рух наперад спыніў кулямётны агонь з дзота. Цяжка паранены, М.П.Жуйкоў дапоўз да дзота і кінуў 2 гранаты, але агонь працягваўся. Сабраўшы апошнія сілы, камандзір кінуўся грудзьмі на амбразуру дзота. Гераічная смерць камандзіра падняла байцоў у атаку. Тады старшы сяржант П.М.Мазілін паўтарыў подзвіг свайго камандзіра. Натхнёныя гэтымі подзвігамі, байцы зноў кінуліся ў атаку і авалодалі вышынёй, нанёсшы праціўніку вялікія страты. Пасмяротна М.П.Жуйкоў узнагароджаны ордэнам Леніна. Імем М.П.Жуйкова названа вуліца ў в. Мормаль.

ІСАЧАНКА Аляксандр Лаўрэнавіч. Падрыўнік, разведчык і адначасова сакратар Гомельскага падпольнага гаркома ЛКСМБ. Нарадзіўся 14.3.1919 г. ў в. Хоўхла Буда-Кашалёўскага раёна. У жніўні 1941 г. ён стаў у шэрагі народных мсціўцаў і неаднойчы выходзіў на чыгунку Жлобін—Гомель. Пры падрыхтоўцы дыверсіі 7 кастрычніка 1942 г. каля в. Завад загінуў пры ўзрыве снарада, з якога выплаўляўся тол. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна і Залатой Зоркай Героя Савецкага Саюза.

КУЛЯШОЎ Сяргей Аляксандравіч. Старшы лейтэнант. У гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляўся наместнікам камандзіра эскадрыллі 196-й штурмавой авіяцыйнай дывізіі, якая прымала ўдзел у вызваленні Жлобіна ў 1944 г. і атрымала назву «Жлобінская». Пазней яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Храбры воін неаднаразова вызначаўся ў баях, наносіў моцныя ўдары па ворагу на дняпроўскіх берагах.



Надпіс на помніку на магіле І.А.Лазенкі.

ЛАЗЕНКА Іван Аркадзевіч. Нарадзіўся 22.4.1917 г. ў с. Каўтуноўка Прылуцкага р-на Чарнігаўскай вобл. Разам з іншымі лётчыкамі пракладваў шлях наземным войскам, якія імкнуліся да Жлобіна. 15.12.1943 г. вёў разведку і загінуў у паветраным баі. Пахаваны ў в. Скепня. Пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

ЛАЦКОЎ Мікалай Сяргеевіч. Нарадзіўся 17.1.1917 г. ў г. Аткарск Саратаўскай вобласці. 29.11.1943 г. група самалётаў, якую вёў камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка М.С.Лацкоў на чыгуначным вузле знішчыла паравоз і каля 30 вагонаў з ваеннымі грузамі, зрабіла значныя пашкоджанні пуцей і збудаванняў. У паветраным баі ў небе Жлобіна адважны камандзір асабіста збіў адзін фашысцкі самалёт і адзін у складзе групы.

МАЗІЛІН Піліп Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1894 г. ў в. Дзмітрыеўка Аксубаеўскага раёна (Татарстан). На фронце з красавіка 1942 г., камандзір разліку станковага кулямёта асобнага кулямётна-артылерыйскага батальёна, старшы сяржант. Загінуў пры вызваленні вёскі Мормаль. Паўтарыў подзвіг свайго камандзіра М.П.Жуйкова — закрыў грудзьмі амбразуру варожага дзота. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

М.Р.Марушчанка.

Імем П.М.Мазіліна названа вуліца ў в. Мормаль, дзе пастаўлены помнік П.М.Мазіліну і М.П.Жуйкову. На месцы бою пастаўлены памятны знак.

МАРТЫНАЎ Майсей Мікітавіч. Нарадзіўся 23.2.1909 г. ў Кіеве. 25.6.1944 г. кулямётны ўзвод пад яго камандаваннем прарваў абарону праціўніка каля в. Замен-Рыння, захапіў тры лініі траншэй ворага, адбіў 7 контратак гітлераўцаў.

МАРУШЧАНКА Міхаіл Радзівонавіч. Нарадзіўся 3.3.1924 г. ў пас. Нефцягорск Краснадарскага краю. Скончыў Краснадарскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў. З 1943 г. на фронце, малодшы лейтэнант, лётчык 517-га знішчальнага авіяпалка 282-й знішчальнай авіядывізіі 16-й паветранай арміі. Загінуў 30.11.1943 г.

Амаль 36 гадоў беларуская зямля хавала пра яго тайну. Увесь гэты час шукалі яго магілу родзічы. Дапамог выпадак. Летам 1978 г. следапыты атрада РВС «Пошук» (разведчыкі ваеннай славы) Гомельскага ГПТВ-56 імя П.Я.Галавачова сумесна з навуковымі супрацоўнікамі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея рабілі экспедыцыю ў Жлобінскі раён. У іх задачу ўваходзіла выяўленне месц гібелі экіпажаў савецкіх самалётаў. Адно з такіх месц паказаў старажыл в. Аляксандраўка Майскага сельсавета Ф.Ц.Кузьмін. Яно знаходзіцца непадалёку ад Дняпра. Следапыты былі здзіўлены, калі Фёдар Цімафеевіч назваў і прозвішча лётчыка — Марушчанка. Высветлілася, што неўзабаве пасля заканчэння вайны на месцы падзення самалёта былі падабраны лісткі камсамольскага білета і пасведчанне асобы. З іх даведаліся прозвішча лётчыка.

У канцы верасня 1979 г. ў Жлобіне адбылася ўрачыста-жалобная цырымонія перапахавання астанкаў загінуўшага лётчыка М.Р.Марушчанкі. Урна з прахам пахавана на брацкіх могілках. На мемарыяльнай пліце залатымі літарамі напісана: «Малодшы лейтэнант Марушчанка Міхаіл Радзівонавіч. 1924—1943 гг.».

МАСІК Пётр Ісакавіч. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, падпалкоўнік, камандзір 4-га Жлобінскага матарызаванага пантонна-маставога палка. За ўдзел у вызваленні Жлобіна полк пад яго камандаваннем атрымаў найменне «Жлобінскі». Пасля службы ў арміі жыў у г. Бендэры (Малдова). 24.6.1969 г. прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Жлобіна. Памёр у 1993 г.

МЯРКУР'ЕЎ В.А. Камандуючы артылерыяй 399-й стралковай дывізіі. Нарадзіўся на Урале. Вызначыўся ў баях за вёскі Верхняя Алба, Шыхаў, Праскурні, Саланое, г.п. Стрэшын. За ўмелую арганізацыю баявых дзеянняў падначаленых у час прарыву абароны праціўніка пры вызваленні Жлобіна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

ПАСАР Аляксандр Падаліевіч. Нарадзіўся 13.1.1922 г. ў с. Курун Нанайскага раёна Хабараўскага краю. 22.6.1944 г. старшы сяржант А.П.Пасар з групай байцоў пераправіўся цераз Дняпро з мэтай разведаць пярэдні край праціўніка. У баі адважныя разведчыкі знішчылі 11 гітлераўцаў і захапілі «языка», даставілі камандаванню неабходныя каштоўныя звесткі.

СЕЙТВЕЛІЕЎ Сейтнафе. Нарадзіўся 29.5.1919 г. ў в. Таў-Кіпчак Сімферопальскага раёна (Крым). У арміі з 1939 г., гвардыі сяржант, камандзір гарматы знішчальнай супрацьтанкавай батарэі. У чэрвені 1944 г. ў час прарыву варожай абароны ўмела арганізаваў дзеянні падначаленых, што садзейнічала вызваленню Жлобіна.

НАЗАРАНКА Вадзім Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў Варонежы. Скончыў Краснадарскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, лейтэнант, старшы лётчык 519-га знішчальнага авіяпалка 283-й знішчальнай авіядывізіі 16-й паветранай арміі. Загінуў 21.2.1944 г.

37 гадоў лічыўся В.А.Назаранка без вестак прапаўшым. І ўсе гэтыя гады прыдняпроўскі луг захоўваў пра яго тайну. У ліпені 1984 г. супрацоўнікі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея разам з навучэнцамі Жлобінскага прафтэхвучылішча механізацыі непадалёку ад в. Чацвярня праводзілі раскопкі на месцы падзення падбітага ў гады вайны самалёта. З балотнага грунту былі выцягнуты

С.Ц.Пабядзінскі.

М.І.Панчанка.

П.Л.Раманенка.

абломкі франтавога знішчальніка, астанкі лётчыка, яго дакументы і асабістыя рэчы.

31.10.1984 г. ў Жлобіне адбылася ўрачыста-жалобная цырымонія перапахавання астанкаў лётчыка В.А.Назаранкі. На мемарыяльнай пліце залатымі літарамі напісана: «Старшы лётчык лейтэнант Вадзім Назаранка. 1923—1944 гг.».

ПАБЯДЗІНСКІ Сяргей Цімафеевіч. У Чырвонай Арміі з 1934 г. З 1941 г. на фронце, капітан, камандзір 508-га асобнага кулямётна-артылерыйскага батальёна 115-га ўмацаванага раёна. Удзельнічаў у Сталінградскай і Курскай бітвах, у вызваленні Жлобіншчыны. Да 1954 г. ў арміі, служыў у Калінінградскай вобласці, потым на Курыльскіх астравах. З 1983 г. жыў у Жлобіне. Памёр у 1998 г.

ПАНЧАНКА Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў г. Майкоп Краснадарскага краю. З 1938 г. ў Чырвонай Арміі. Скончыў Падольскае артылерыйскае вучылішча. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Удзельнічаў у абароне Тулы, Масквы. Прымаў удзел у вызваленні Жлобіншчыны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені. Жыве ў Жлобіне.

ПІЧУГІН Фёдар Піліпавіч. Нарадзіўся 22.4.1891 г. ў в. Вадап'янаўка Варонежскай вобласці. З 1914 г. ў арміі. У 1928 г. здаў экстэрнам экзамены за курс ваеннай школы рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, яшчэ праз год скончыў вышэйшыя стралковыя курсы «Выстрал». У Вялікую Айчынную вайну на фронце, генерал-маёр, узначальваў 115-ы Жлобінскі ўмацаваны раён. У ходзе Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі ў лютым 1944 г. раён ліквідаваў існаваўшы на левабярэжжы Дняпра плацдарм гітлераўцаў, вызваліў в. Майскае і суседнія населеныя пункты. За ўдзел у вызваленні Жлобіна 115-ы ўмацаваны раён 48-й арміі (камендант Ф.П.Пічугін) атрымаў найменне «Жлобінскі». Жыў у Варонежы. Званне ганаровага грамадзяніна Жлобіна прысвоена 24.6.1969 г. Памёр 22.12.1972 г.

РАМАНЕНКА Пракоп Логвінавіч. Нарадзіўся 25.2.1897 г. на хут. Раманенкі Роменскага раёна Сумскай вобласці. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1933), Генштаба (1948). У арміі з 1914 г., у Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай, савецка-фінляндскай войнаў. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Заходнім, Бранскім, Паўднёва-Заходнім, 1-м Беларускім франтах, камандуючы арміямі, намеснік камандуючага фронтам. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў. У час вызвалення Беларусі камандуючы 48-й арміяй, якая ўдзельнічала ў Гомельска-Рэчыцкай, Калінкавіцка-Мазырскай, Рагачоўска-Жлобінскай, Бабруйскай, Люблінска-Брэсцкай аперацыях. У 1945—47 гг. камандуючы Усходне-Сібірскай ваеннай акругі. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 2 ордэнамі Суворава 1-й ступені, 2 ордэнамі Кутузава 1-й ступені, 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, медалямі, ордэнамі замежных краін. Памёр 10.3.1949 г.

СІРЫЧЭНКА Мікалай Трафімавіч. Нарадзіўся 9.12.1921 г. ў с. Мандрава Валуйскага раёна Белгародскай вобласці. 5.12.1943 г. знішчальна-супрацьтанкавая батарэя старшага лейтэнанта М.Т.Сірычэнкі ў баі каля в. Дабрагошча знішчыла 4 агнявыя кропкі праціўніка і амаль узвод гітлераўцаў, што дало магчымасць стралковаму палку перапраўіцца цераз балота і штурмаваць вышыню. Адбіваючы контратаку, батарэя знішчыла 2 сама-

ходныя гарматы і больш за 60 гітлераўцаў. 6.12.1943 г., калі праціўнік пацясніў савецкія падраздзяленні, батарэя засталася на пазіцыі і адбіла контратаку, знішчыўшы каля 200 гітлераўцаў. Будучы параненым, адважны камандзір батарэі не пакінуў поле бою. 16.5.1944 г. М.Т.Сірычэнку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

ЦЕМІРГАЛЕЕЎ Курбан, разведчык. Ваяваў у складзе 115-га ўмацаванага раёна. Поўны кавалер ордэна Славы. Вызначыўся ў баях каля Жлобіна на Дняпры.

ШЫЛКОЎ Анфілофій Пятровіч. Нарадзіўся 14.3.1917 г. ў с. Турушава Ісецкага раёна Цюменскай вобласці. 8.12.1943 г. ў баі за в. Дабрагошча старшы сяржант А.П.Шылкоў замяніў параненага камандзіра батарэі М.Т.Сірычэнку, арганізаваў кругавую абарону, утрымаў рубеж і нанёс праціўніку значны ўрон. 16.5.1944 г. А.П.Шылкову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

ШМАРЫН Фёдар Сяргеевіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў Мурашынскім раёне Кіраўскай вобласці. Гвардыі малодшы лейтэнант лётчык Ф.С.Шмарын пачаў свой баявы шлях у баях пад Жлобінам у лютым 1944 г. Першы вылет адбыўся 22 лютага ў ролі вядомага ў саставе 6 самалётаў ІЛ-2. Лётчыкам была пастаўлена задача знішчыць падыходзячыя рэзервы праціўніка ў раёне станцый Чырвоны Бераг і Тошчыца. Нягледзячы на моцнае супрацьдзеянне зенітнай артылерыі, малады лётчык, які першы раз сустрэўся з ворагам, падавіў агонь батарэі і з трох заходаў знішчыў аўтамашыну, адну павозку, больш за 10 салдат праціўніка. У Жлобінскай аперацыі ён зрабіў 12 паспяховых баявых вылетаў, пры гэтым знішчыў вялікую колькасць тэхнікі і жывой сілы ворага.

Першую баявую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі — ён атрымаў за баі пад Жлобінам, да канца вайны стаў Героем Савецкага Саюза. Зрабіў 114 баявых вылетаў, з якіх 19 разоў вадзіў сам групы ў бой, удзельнічаў у 9 паветраных баях.

Аляксандр Кулакоў.

Героі Савецкага Саюза і поўны кавалер ордэна Славы

АНІШЧАНКА Сяргей Пятровіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 20.4.1923 г. ў в. Сцяпы Жлобінскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну партызанскі сувязны атрада «Жалязняк». З восені 1943 г. ў Чырвонай Арміі. Вызначыўся 24—25.6.1944 г. ў час прарыву абароны ворага і фарсіравання р. Друць каля в. Каласы Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Пад моцным агнём праціўніка С.П.Анішчанка з групай байцоў пераправіўся цераз раку, наблізіўся да варожай траншэі, закідаў яе гранатамі і захапіў плацдарм. Знішчыў разлік станковага кулямёта, 20 гітлераўцаў, 12 узяў у палон. Загінуў 31.7.1944 г. ў баі за вызваленне Польшчы. Пахаваны ў в. Стрэбня Беластоцкага ваяводства (Польшча). Яго імем названа Шчадрынская сярэдняя школа, дзе ён вучыўся.

БАЖЭНАЎ Анатоль Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (20.12.1943). Нарадзіўся 4.6.1920 г. ў с. Дурой Прыаргунскага раёна Чыцінскай вобласці. Пасля сканчэння курсаў трактарыстаў працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі і на фронце з 1942 г. Памочнік камандзіра ўзвода разведкі 270-га гвардзейскага стралковага палка 89-й гвардзейскай стралковай дывізіі 37-й арміі. Ваяваў пад Сталінградам, Бялградам, Харкавам, асабліва вызначыўся сваёй храбрасцю ў бітве за Дняпро.

...Перад дывізіяй стаяла задача фарсіраваць Дняпро і захапіць чыг. ст. Пяціхаткі. Выканаць заданне камандавання вызваліся 25 смельчакоў. Ноччу 29.9.1943 г. група разведчыкаў на чале з А.В.Бажэнавым адна з першых пераправілася на правы бераг Дняпра. Праціўнік апамятаўся толькі тады, калі

С.П.Анішчанка.

А.В.Бажэнаў.

М.У.Барташоў.

М.С.Быкаў.

Дз.В.Бярнацкі.

З.Д.Віхнін.

воіны прасачыліся ўжо ў варожыя траншэі. Двое сутак група адбівала шалёныя атакі гітлераўцаў, чым забяспечыла магчымасць пераправы савецкім войскам. Націск гвардзейцаў быў настолькі моцным, што фашысты не вытрымалі і пабеглі, пакінуўшы на полі бою 17 загінуўшых, два станковых і тры ручныя кулямёты, адзін мінамёт, 13 аўтаматаў і г.д.

Пасля вайны разам з жонкай Аляксандрай Фёдараўнай, былым франтавым саніструктарам, А.В.Бажэнаў прыехаў у в. Пірэвічы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, медалямі. Памёр у 1999 г. *С.Мар'янік.*

БАРТАШОЎ Макар Уласавіч. Герой Савецкага Саюза (14.9.1945). Нарадзіўся 20.9.1909 г. ў Жлобіне. Скончыў Ленінградскую ваенна-тэарэтычную школу лётчыкаў (1930), Ейскую школу марскіх лётчыкаў (1932). У Чырвонай Арміі з 1929 г. Вызначыўся ў 1945 г. ў час вайны з Японіяй. З 9 да 17.8.1945 г. марская авіядывізія пад камандаваннем палкоўніка М.У.Барташова наносіла масіраваныя ўдары па часцях Квантунскай арміі ў партах Юкі, Расін, Сейсін, на чыгуначных станцыях, знішчыла 24 караблі і транспарты праціўніка. Загінуў 7.2.1948 г. пры выкананні службовых абавязкаў. Пахаваны ў г. Калінінград. Яго імем названа вуліца ў Жлобіне, на доме № 21 установлена мемарыяльная дошка.

БЫКАЎ Міхаіл Сямёнавіч. Герой Савецкага Саюза (15.5.1946). Нарадзіўся 16.10.1922 г. ў Жлобіне. Скончыў Адэскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1940) і Вышэйшыя лётна-тактычныя курсы (1952). У Чырвонай Арміі з 1940 г. З 1941 г. на Заходнім, Бранскім, 1-м і 4-м Украінскім франтах. Камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка капітан М.С.Быкаў зрабіў 174 баявыя вылеты, знішчыў і пашкодзіў 52 варожыя танкі, 200 аўтамашын, 150 павозак з грузам, 40 гармат, 12 самалётаў на аэрадромах, узарваў 12 складоў з боепрыпасамі. Да 1954 г. служыў у Савецкай Арміі, маёр. Жыў у г. Бабруйск. Памёр 30.4.1991 г.

БЯРНАЦКІ Дзмітрый Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (27.6.1945). Нарадзіўся 24.7.1912 г. ў г.п. Стрэшын Жлобінскага раёна. Скончыў Арлоўскае пяхотнае вучылішча (1942). У Чырвонай Арміі з 1941 г. З 1942 г. на Сталінградскім, Данскім, Сцяпным, 2-м і 1-м Украінскім франтах. Ад'ютант старшы батальёна Дз.В.Бярнацкі вызначыўся пры фарсіраванні Одэра каля г. Брэслаў. Ноччу 21.1.1945 г. з групай байцоў пераправіўся цераз раку і ў рукапашным баі выбіў праціўніка з траншэй, адбіў 5 варожых контратак. Загінуў у баі 23.1.1945.

ВІХНІН Залман Давыдавіч. Герой Савецкага Саюза (16.10.1943). Нарадзіўся ў ліпені 1909 г. ў в. Шчадрын Жлобінскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну з лютага 1943 г. на Ленінградскім і Цэнтральным франтах, удзельнік Курскай бітвы. Капітан З.Д.Віхнін вызначыўся ў бітве за Дняпро ў Брагінскім раёне Гомельскай вобл. 25.9.1943 г. на чале групы прыкрыцця фарсіраваў Дняпро і забяспечыў пераправу 2 батальёнаў пяхоты. Загінуў у баі за вызваленне вёсак Бярозкі і Новая Ёлча Брагінскага раёна Гомельскай вобл. 26.9.1943 г. Пахаваны ў г. Чарнігаў.

КАВАЛЁЎ Мікалай Кузьміч. Герой Савецкага Саюза (29.6.1945). Нарадзіўся ў жніўні 1917 г. ў в. Селівонаўка Жлобінскага раёна. Скончыў ваенна-палітычнае вучылішча (1941), курсы «Выстрал» (1943). Працаваў тэхнікам у дэпо ст. Жлобін. У Чырвонай

М.К.Кавалёў.

М.Р.Кавалёў.

В.І.Казлоў.

М.С.Рогаў.

Арміі з 1938 г. Са жніўня 1941 г. на фронце. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Беларусі, Прыбалтыкі. Вызначыўся ў баях на тэрыторыі Усходняй Прусіі. 17.3.1945 г. полк пад камандаваннем гвардыі падпалкоўніка М.К.Кавалёва на подступах да в. Ленхефен захапіў 6 гармат, 14 кулямётаў, каля 200 гітлераўцаў. Загінуў у гэтым баі. Яго імем названа вуліца ў Жлобіне, устаноўлена мемарыяльная дошка.

КАВАЛЁЎ Мікіта Рыгоравіч. Герой Савецкага Саюза (24.4.1944). Нарадзіўся 20.12.1909 г. ў в. Майскае Жлобінскага раёна. Скончыў Ульянаўскае бранятанкавае вучылішча (1937), Ленінградскую вышэйшую бранятанкавую школу (1953). У Чырвонай Арміі з 1931 г. З лістапада 1941 г. на Заходнім, Паўночна-Заходнім, Варонежскім, 1-м і 2-м Украінскім, Забайкальскім франтах. Вызначыўся ў баях пры вызваленні Кіева. 6.11.1943 г. танкавы батальён пад камандаваннем гвардыі маёра М.Р.Кавалёва ў ліку першых уварваўся ў Кіеў і, адбіваючы контратакі праціўніка, знішчыў 8 танкаў і самаходных гармат, 24 пушкі, 124 кулямёты, 26 аўтамашын, 340 павозак з грузам. Удзельнік савецка-японскай вайны 1945 г. Да 1969 г. ў Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыў у Мінску. Памёр 10.5.1978 г.

КАЗЛОЎ Васіль Іванавіч. Дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1.9.1942). Нарадзіўся 18.2.1903 г. ў в. Заграддзе (цяпер в. Малевічы) Жлобінскага раёна. Скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі (1933). У 1928—40 гг. на савецкай і партыйнай рабоце. З 1940 г. намеснік старшыні СНК БССР, з сакавіка 1941 г. сакратар Мінскага абкома КП(б)Б. З ліпеня 1941 г. 1-ы сакратар Мінскага абкома КП(б)Б і камандзір Мінскага партызанскага злучэння. У 1944—48 гг. 1-ы сакратар Мінскіх абкома і гаркома КП(б)Б. У 1947 г. Старшыня Вярхоўнага Савета, у 1948—67 гг. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. З 1949 г. член ЦК КПБ. З 1956 г. кандыдат у члены, з 1966 г. член ЦК КПСС. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР з 1946 г., БССР з 1947 г. Аўтар кніг успамінаў «Людзі асобага складу» (1967), «Верны да канца» (2-е выд., 1973). Памёр 2.12.1967 г. Яго імем названы вуліца і завод у Мінску, вуліцы ў Салігорску і Жлобіне, саўгас і школа ў Жлобінскім р-не; у Салігорску каля школы № 5 пастаўлены помнік; у Мінску на доме, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка, у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны створана экспазіцыя пра героя.

ЛІСНЕЎСКІ Віктар Пятровіч. Поўны кавалер ордэна Славы. Нарадзіўся 21.2.1908 г. ў в. Чарцёж Жлобінскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г. Камандзір стралковага аддзялення малодшы сяржант В.П.Ліснеўскі вызначыўся пры вызваленні Украіны, Польшчы, у баях на тэрыторыі Германіі: 24.12.1943 г. пад агнём праціўніка ліквідаваў 4 пашкоджанні тэлефоннай лініі; 21.7.1944 г. ў ліку першых фарсіраваў Заходні Буг, акапаўся і адбіваў варожыя контратакі, потым уварваўся ў траншэю праціўніка і закідаў гранатамі кулямётны разлік; 16.4.1945 г. пры прарыве абароны праціўніка каля г. Лебус (Германія) са сваім аддзяленнем захапіў варожыя траншэі, адбіў некалькі контратак. Пасля вайны В.П.Ліснеўскі жыў у г. Дружкоўка Данецкай вобл. Памёр 9.10.1987 г.

РОГАЎ Міхаіл Сафронавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся

П.А.Странакоў.

А.С.Андрухоў.

П.А.Карыбскі.

М.В.Кутоўскі.

17.10.1916 г. ў в. Верхняя Алба Жлобінскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1939 г. З 1941 г. на Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, 2-м Украінскім франтах. Старшына эскадрона кавалерыйскага палка М.С.Рогаў вызначыўся пры вызваленні Румыніі. 29.8.1944 г. з трыма добраахвотнікамі абышоў умацаваны раён, пераадолеў міннае поле, уварваўся ў траншэю праціўніка, знішчыў разлік станковага кулямёта і дзот, гэтым садзейнічаў наступленню палка. Загінуў 25.10.1944 г. на тэрыторыі Венгрыі. Яго імем названа сярэдняя школа ў в. Верхняя Алба.

СТРАНАКОЎ Пракоп Авяр'янавіч. Герой Савецкага Саюза (24.12.1943). Нарадзіўся 6.6.1917 г. ў в. Грачухі Жлобінскага раёна. Скончыў курсы малодшых лейтэнантаў (1942), Вышэйшую афіцэрскую артылерыйскую школу (1951). У Чырвонай Арміі з 1938 г. З 1942 г. на фронце. Камандзір артылерыйскага ўзвода лейтэнант П.А.Странакоў вызначыўся пры вызваленні Лоеўскага раёна. 12.10.1943 г. на чале групы разведчыкаў пад агнём праціўніка пераправіўся цераз Дняпро і разведаў агнявыя кропкі ворага, якія былі потым знішчаны савецкай артылерыяй. 21.10.1943 г. ў баях за расшырэнне плацдарма замяніў параненага камандзіра роты, павёў байцоў у атаку і першым уварваўся ў траншэю праціўніка; паранены не пакінуў поля бою. Да 1958 г. служыў у Савецкай Арміі, маёр. Памёр 12.10.1961 г.

Удзельнікі Парада Перамогі, які адбыўся ў Маскве 24 чэрвеня 1945 г.

АНДРУХОЎ Андрэй Сямёнавіч, н. ў 1920 г. ў в. Шыхаў Жлобінскага раёна. Скончыў сямігодку і фабрычна-заводскае вучылішча ў Жлобіне. У Чырвонай Арміі з 1940 г., служыў каля г. Каўнас (Літва). У Вялікую Айчынную вайну на фронце. У канцы 1941 г. накіраваны на вучобу ў Маскву, дзе асвоіў рэактыўныя мінамёты «Кацюшы». 11.9.1942 г. ў складзе 92-га гвардзейскага мінамётнага палка ўдзельнічаў у абароне Сталінграда, контрнаступленні і акружэнні варожай групіроўкі войск, потым у баях пад Арлом і Курскам, наступальнай аперацыі «Баграціён», вызваленні Гомеля, Жлобіна, Бабруйска, Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях, штурме Берліна. Дэмабілізаваўся ў маі 1946 г. Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу» і інш. Пасля вайны да выхаду на пенсію працаваў машыністам Жлобінскага лакаматыўнага дэпо. Жыве ў Жлобіне.

КАРЫБСКІ Пётр Андрэевіч, н. ў 1923 г. ў Жлобіне. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны добраахвотна ўступіў у Жлобінскі знішчальны батальён, быў разведчыкам да 17 жніўня 1941 г. Пасля сканчэння паскораных курсаў пяхотнага вучылішча лейтэнант 34-й асобнай марской брыгады. У складзе 11-га гвардзейскага корпуса 9-й арміі ўдзельнічаў у гераічнай абароне і вызваленні Каўказа, Данбаса, Херсонскай, Запарожскай, Нікалаеўскай, Адэскай абласцей Украіны, пазней ка-

мандзір кулямётнай роты 301-й стралковай дывізіі 3-га Украінскага фронту. Вызначыўся ў Яска-Кішынёўскай аперацыі, пры вызваленні Польшчы, у разгроме варожай групіроўкі на берлінскім напрамку, штурме і ўзяцці «фюрэр-бункера» імперскай канцылярыі. Баявы шлях П.А.Карыбскага адзначаны шматлікімі ўзнагародамі. Сярод іх ордэн Чырвонага Сцяга, два — Чырвонай Зоркі, тры — Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, 2 медалі «За баявыя заслугі» і інш. Пасля дэмабілізацыі з арміі (1954) і да выхаду на пенсію працаваў у лакаматыўным дэпо. У 1998 г. прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Жлобіна. Жыве ў Жлобіне.

КУТОЎСКІ Мікалай Васілевіч, н. ў 1920 г. ў в. Радуша Жлобінскага раёна. Да вайны скончыў Бабруйскі тэхнікум механізаванай апрацоўкі драўніны, потым курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, працаваў у Скяпнянскай сямігодцы. У ліпені 1941 г. добраахвотна пайшоў на фронт. Пад г. Арол батальён трапіў у акружэнне. Прыняўшы бой, многія байцы і камандзіры змаглі перайсці варожую лінію. Уцалелая частка батальёна была накіравана ў г. Троіцк Чэлябінскай вобласці. Пасля М.В.Кутоўскі скончыў Міаскае ваеннае вучылішча. Ваяваў на Карэльскім фронце ў 46-м гвардзейскім мінамётным палку 7-й арміі. З мая 1943 г. да лютага 1945 г. камандаваў агнявым узводам, удзельнічаў у абарончых баях на Кольскім паўвостраве і каля г. Мурманск, у чэрвені—жніўні 1944 г. — у Свірска-Петразаводскай аперацыі па выгнанні фашыстаў з Савецкага Запаляр'я і вызваленні Карэліі, у 1945 г. — у разгроме японскай Квантунскай арміі. Ваенную службу закончыў у снежні 1946 г. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені, многімі медалямі. Пасля вайны скончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут, працаваў выкладчыкам матэматыкі ў Радушскай сярэдняй школе. Памёр у 1995 г.

МАРТЫНАЎ Валянцін Сямёнавіч, н. ў 1924 г. ў с. Сетнае Сумскай вобласці. Працоўную дзейнасць пачаў у чэрвені 1941 г. пуцявым рабочым 7-й дыстанцыі пуці Разанска-Уральскай чыгункі. У жніўні 1942 г. паступіў у Ленінградскае ваеннае вучылішча, якое было эвакуіравана ў г. Уральск. Пасля яго скончэння В.С.Мартынаў — старшына роты 46-га

В.С.Мартынаў.

С.С.Осіпаў.

гвардзейскага мінамётнага палка, ваяваў на Карэльскім фронце, удзельнічаў у разгроме японскай Квантунскай арміі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. З ліпеня 1946 г. і да выхаду на пенсію працаваў машыністам лакаматыўнага дэпо. Жыве ў Жлобіне.

ОСІПАЎ Сяргей Сямёнавіч, н. ў 1922 г. ў с. Кондаль Пензенскай вобласці. Пасля скончэння сямігодкі да студзеня 1941 г. працягваў вучобу ў будаўнічым тэхнікуме, потым у вышэйшай авіяцыйнай школе пілотаў і ў авіяцыйным вучылішчы. У лютым 1943 г. накіраваны ў 165-ы авіяполк 16-й паветранай арміі. У складзе палка прайшоў усю вайну, зрабіў 443 баявыя вылеты. Летам 1943 г. ўдзельнічаў у баях на Курскай дузе. У першым жа паветраным баі знішчыў варожы самалёт. Сам за ўвесь час баявых дзеянняў ніводнага разу не быў збіты. Вызначыўся таксама ў Арлоўска-Курскай аперацыі, вызваленні Гомельшчыны, Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях. Пасля вайны жыў у Жлобіне. Памёр у 1996 г.

ХАЛІМОНЕНКА Рыгор Сцяпанавіч, н. ў 1922 г. ў в. Стоўпня Рагачоўскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1941 г. Служыў радыстам у розных вайсковых часцях. Яго баявы шлях пачаўся пад Сталінградам і закончыўся ва Усходняй Прусіі. Пад Кёнігсбергам быў цяжка паранены. Доўгі час знаходзіўся ў шпіталі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны доўгі час жыў і працаваў у Жлобіне. Памёр у 1967 г.

Р.В.Дзмітрыеў.

Яны прайшлі дарогамі вайны

Некалькі тысяч ураджэнцаў Жлобінскага раёна ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне ў складзе Чырвонай Арміі, партызанскіх фарміраванняў і падполля. Яны абаранялі нашу Радзіму ад фашысцкай навалы. Кожны з іх, хто дажыў і не дажыў да доўгачаканай Перамогі, хто названы і не названы ў гэтай кнізе, зрабіў свой уклад у агульную справу. Усім ім вялікая і шчырая ўдзячнасць нашчадкаў за ратны подзвіг у імя будучага. Раённая камісія па стварэнні кнігі «Памяць» загадзя просіць прабачэння за тое, што не ўдалося ўстанавіць прозвішчы ўсіх землякоў, якія прайшлі дарогамі вайны і з перамогай вярнуліся дамоў.

ГОРАД ЖЛОБІН

Абакумов Михаил Васильевич, р. в 1923; **Абловецкий** Виктор Павлович, р. в 1925; **Абрамчук** Сергей Емельянович, р. в 1926; **Авсяников** Михаил Прохорович, р. в 1907; **Алексеев** Василий Никифорович, р. в 1925; **Алексеенко** Ефим Емельянович, р. в 1907; **Алексеенко** Степан Сафронович, р. в 1919; **Алимбочков** Павел Яковлевич, р. в 1916; **Алимбочкова** Мария Ивановна, р. в 1918; **Альшевская** Алєксандра Петровна, р. в 1912; **Амбражей** Михаил Тимофеевич, р. в 1923; **Амбражей** Софья Романовна, р. в 1920; **Ананьев** Александр Николаевич, р. в 1915; **Андреев** Михаил Петрович, р. в 1923; **Андриенко** Иван Платонович, р. в 1926; **Андросов** Василий Васильевич, р. в 1919, старший лейтенант; **Андросова** Лидия Александровна, р. в 1924; **Андрухов** Андрей Семенович, р. в 1923, старший сержант, участник Парада Победы в Москве в 1945 г.; **Андрухов** Николай Семенович, р. в 1923; **Андрухова** Любовь Васильевна, р. в 1926; **Андрюшенко** Василий Иванович, р. в 1914; **Аникеев** Анатолий Яковлевич, р. в 1926; **Аниховская** Лидия Павловна, р. в 1920; **Анохин** Петр Михайлович, р. в 1925; **Аношко** Иван Кузьмич, р. в 1916; **Антоненко** Николай Васильевич, р. в 1920; **Арехович** Николай Павлович, р. в 1915; **Артамонов** Иван Андреевич, р. в 1920, почетный гражданин города, начальник вагонного депо; **Архипенко** Иван Петрович, р. в 1922; **Архипенко** Павел Наумович, р. в 1919, командир партизанского отряда; **Архипов** Александр Ефремович, р. в 1909; **Архипов** Иван Даниилович, р. в 1909; **Афанасенко** Алексей Тихонович, р. в 1926; **Афанасенко** Владимир Васильевич, р. в 1923; **Ахрамович** Евгений Даниилович, р. в 1920; **Бабич** Владимир Филиппович, р. в 1916; **Бавдей** Георгий Иосифович, р. в 1924; **Байдаков** Владимир Никитич, р. в 1907; **Байдаков** Гавриил Петрович, р. в 1914; **Байдалов** Валентин Григорьевич, р. в 1925; **Байнис** Николай Евгеньевич, р. в 1922; **Байсуров** Петр Павлович, р. в 1905; **Бакатович** Дмитрий Васильевич, р. в 1911; **Бакун** Александр Сергеевич, р. в 1927; **Балашов** Михаил Иванович, р. в 1926; **Баленков** Павел Петрович, р. в 1925; **Барабанщиков** Михаил Иванович, р. в 1922; **Баранов** Иван Антонович, р. в 1919; **Барановский** Валентин Францевич, р. в 1924; **Барановский** Владимир Брониславович, р. в 1900; **Барановский** Иван Исакович, р. в 1918; **Баргер** Наум Леонович, р. в 1925; **Бареко** Иван Яковлевич, р. в 1919; **Барилов** Петр Дмитриевич, р. в 1917; **Батраков** Андрей Иванович, р. в 1927; **Батурин** Вадим Михайлович, р. в 1913; **Батурин** Владимир Михайлович, р. в 1924; **Батурин** Николай Михайлович, р. в 1918; **Батурина** Ольга Степановна, р. в 1921; **Батюшков** Евдоким Николаевич, р. в 1908; **Бегунов** Григорий Дмитриевич, р. в 1914, майор; **Бегунова** Мария Харитоновна, р. в 1923; **Беззубов** Иван Исакович, р. в 1919; **Бекаревич** Алексей Григорьевич, р. в 1922; **Беленков** Михаил Яковлевич, р. в 1922; **Белоусов** Григорий Андреевич, р. в 1923; **Белоусова** Елена Григорьевна, р. в 1921; **Белун** Иван Федорович, р. в 1920, капитан; **Бельчиков** Иван Трофимович, р. в 1917; **Белявская** Зинаида Максимовна, р. в 1926; **Беляковский** Николай Устинович, р. в 1923, сержант; **Береговцов** Владимир Афанасьевич, р. в 1922; **Береснев** Иван Семенович, р. в 1924; **Береснев** Николай Николаевич, р. в 1922; **Береснев** Степан Иванович, р. в 1923; **Беркович** Галина Иосифовна, р. в 1924; **Бибиков** Василий Васильевич, р. в 1915; **Бизюк** Владимир Владимирович, р. в 1923; **Биланова** Зинаида Степановна, р. в 1921; **Близнец** Иван Васильевич, р. в 1924; **Бобер** Николай Иванович, р. в 1925; **Богданов** Василий Ефимович, р. в 1925; **Богданов** Василий Кириллович, р. в 1926; **Богданов** Евгений Константинович, р. в 1922, капитан; **Богомазов** Кузьма Борисович, р. в 1922; **Богомазов** Павел Артемьевич, р. в 1925; **Богуан** Иван Кузьмич, р. в 1927; **Богуанов** Василий Иванович, р. в 1925; **Богуш** Мигдон Павлович, р. в 1922; **Богуш** Степан Иванович, р. в 1919; **Бодиловский** Петр Савельевич, р. в 1922; **Бойкачев** Иосиф Иванович, р. в 1920; **Бойкачев** Петр Иосифович, р. в 1915; **Болдуев** Иван Корнеевич, р. в 1922; **Боломожнов** Константин Петрович, р. в 1922; **Болоховец** Николай Васильевич, р. в 1920, капитан; **Бондарев** Владимир Федорович, р. в 1921; **Бондарев** Илья Яковлевич, р. в 1920; **Бондарев** Михаил Васильевич, р. в 1923; **Бондарев** Петр Андреевич, р. в 1925; **Бондарева** Александра Онуфриевна, р. в 1924; **Бондарчик** Таисия Терентьевна, р. в 1917; **Бородулин** Николай Егорович, р. в 1925; **Босяев** Василий Иванович, р. в 1926; **Бохволов** Борис Николаевич, р. в 1926; **Брант** Рудольф Егорович, р. в 1923; **Бродецкий** Андрей Иосифович, р. в 1923; **Буван** Михаил Николаевич, р. в 1908; **Будникова** Тамара Павловна, р. в 1924; **Будницкая** Мария Онуфриевна, р. в 1922; **Буйневич** Иван Михайлович, р. в 1918; **Бутковский** Василий Николаевич, р. в 1914; **Бутько** Дмитрий Остапович, р. в 1909; **Бушкевич** Констан-

Сярод працаўнікоў Беларускай магістралі шырокае распаўсюджванне атрымаў рух за права называцца «Лепшы машыніст дарогі», ініцыятарамі якога выступілі машыністы Жлобінскага дэпо П.Кураш, В.Жалезнякоў, Н.Гулевіч, Н.Дудзенка, Н.Лявіцкі.

З агульнай колькасці 2890 рабочых на вузле (тагачасная самая магутная і паважаная арганізацыя ў горадзе) было 1607 стаханаўцаў, 696 ударнікаў, 459 ленінцаў, 421 чалавек выканалі і перавыканалі заданні пяцігадовага плана. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 28.7.1949 г. «Аб узнагароджанні ўрадавымі ўзнагародамі работнікаў за доўгатэрміновую і бездакорную працу на чыгуначным транспарце» па вузлу было ўзнагароджана: ордэнам Леніна — 59 чал., «Працоўнага Чырвонага Сцяга» — 38, «Знак Пашаны» — , медалём «За працоўную доблесць» — 72 чал.

У сувязі з утварэннем адзінай чыгуначнай сеткі рэспублікі ў 1954 г. Жлобінскае аддзяленне было ліквідавана, а чыгуначны вузел стаў лінейнай транспартнай адзінкай Беларускай чыгункі. У яго біяграфіі пачынаецца новы перыяд. Замест паравозаў на лінію выйшлі цеплавозы і дызель-паязды. Паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічная база дэпо, станцыі, дыстанцый сувязі і пуці, іншых гаспадарчых адзінак. На вытворчасць прыйшлі больш адукаваныя кадры, якія змяняюць аблічча вузла і працягваюць традыцыі старэйшага пакалення. *П.Я.Кірычэнка, С.І.Сухоцкі.*

Жытло ў руінах

Гэта было ў студзені 1945 года. З Магілёва-на-Дняпры я ехаў у шпіталь у г. Мінск. У Жлобіне патрэбна было зрабіць перасадку. За ноч у поездзе я вельмі замёрз, і мне хацелася выпіць кіпеню. Вакзала не было, наўкол руіны. Але мне пашанцавала — сярод суцэльных развалін заўважыў невялікі дымок. Вельмі ўзрадаваўся, што нарэшце з'явілася жыллё. Не раздумваючы, пашагаў да цэлі. Наблізіўся. Аднак не адразу разабраўся, адкуль дымок і што яго вылучае. Калі разабраўся ў абстаноўцы, несказана быў здзіўлены: з кавалкаў дошак, бляхі і яшчэ няведама з чаго было зроблена нешта падобнае на балаган. Адтуль, з сярэдзіны, струменіўся дымок. Пасля нядоўгага замяшання зразумеў: калі ёсць дымок, значыць тут хтосьці жыве. Стаў шукаць дзверы. Знайшоў. Але назваць тое, што ўбачыў, дзвярыма ніяк нельга.

Папаўшы ў «балаган», убачыў даволі маладую жанчыну, якая карміла дзіця. Яна засаромелася і спыніла кармленне. Я ў гэты час, як гаворыцца, замёр і адчуў нязручнасць. Але, сабраўшыся з сіламі, звярнуўся да гаспадыні: «Ці няма ў вас кіпеню?» У адказ: «Нагрэць можна, ды посуду няма. Ды я тут нядаўна, яшчэ і не ведаю, дзе ўзяць ваду». Змучаны твар з уваліўшыміся вачыма глядзеў на мяне. Я стаяў і маўчаў, а сэрца ўсё болей шчыміла ў грудзях.

І толькі калі прыйшоў у сябе, пачаў бліжэй разглядаць жытло. Яно было зроблена з рознага ламачча, складзенага ў адну кучу, і было няўцям, як усё гэта трымаецца ў адным цэлым. Праз шматлікія дзіркі быў відаць снег на вуліцы.

Я развітаўся, павярнуўся да дзвярэй, але выйшаў не адразу. Слёзы літаральна душылі мяне.

Міхаіл Бяленка.

РАЁНКА ПАВЕДАМЛЯЛА

20.2.1947 г.

Гаспадараннe нямецка-фашысцкіх захопнікаў у горадзе прывяло да амаль поўнага знішчэння жыллёвага фонду. З часу вызвалення Жлобіна для індывідуальных забудоўшчыкаў выдзелена 690 зямельных участкаў. Больш 400 хат адбудаваны ўжо і заселены.

25.2.1947 г.

У асноўным адноўлены хлебакамбінат, які быў знішчаны акупантамі. Уведзены ў дзеянне 4 жаравыя печы. Да 1 чэрвеня бягучага года хлебакамбінат будзе поўнасцю адноўлены і зможа выйсці на даваенную магутнасць — выпуск 40 тон прадукцыі ў суткі.

Люты — сакавік 1947 г.

Члены калгаса імя Куйбышава Фёдар Кавальчук, Пётр Байдакоў, Саша Осіпава, Міхаіл Шашукоў з асабістых запасаў папоўнілі насенны фонд гаспадаркі. Першы перадаў 32 кг бульбы, астатнія — па 16 кг.

Калгаснікі сельгасарцелі «Верны шлях» (Лукаўскі сельсавет) перадалі ў агульны насенны фонд 61 пуд уласнай бульбы, 72 кг пшаніцы, 5 кг насення агародных культур.

Вера Рэпіхава, Вулляна Кліцунова, Лукер'я Байкачова, Парасся Кручышына і іншыя гаспадыні з калгаса «Чырвоны партызан» за першы дзень перадалі яму 11 кг насення агародных культур. З іх 700 г належала Аляксандры Чубаравай.

Брыгадзір калгаса імя Кірава П.Савасцьянаў за 1946 год выпрацаваў 500 працадзён. Для папаўнення насеннага фонду гаспадаркі перадаў 50 кг бульбы.

Старшыня калгаса «Чырвоны Жлобін» Канстанцін Казлоў перадаў гаспадарцы 80 кг бульбы і 2 кг квасолі. Аляксей Усціновіч, Серафіма Лавецкая, Н.Дубадзелава таксама падзяляліся з калгасам насеннем «другога хлеба».

8.3.1947 г.

Ганаровага звання «Маці-гераіня» ўдастоена Бацюшкова Наталля Васілеўна — калгасніца сельгасарцелі імя Войкава Рэкцянскага сельсавета. Яна нарадзіла і выхавала 12 дзяцей — 6 сыноў і 6 дачок.

У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны ўсе сыны Наталлі Васілеўны на франтах адстойвалі свабоду і незалежнасць Радзімы. Зараз 2 яе сыны Ісак і Мікалай — лётчыкі, сын Уладзімір — капітан Савецкай Арміі, Васіль — інжынер-будаўнік. Чацвёра — старэйшы сын Пятро, дочкі Ганна, Фёкла і Валянціна працуюць у калгасе. Тры дачкі — служачыя, сын Міхаіл — рабочы паравознага дэпо.

Дзеці — гонар маці, і яны часта збіраюцца разам пад дахам бацькавай хаты, адкуль пайшлі на вайну і ў самастойнае жыццё.

За перыяд з 1944 г. па 1947 г. мнагадзетным і адзінокім маці выплачана дзяржаўнай дапамогі 1 605 652 руб. 8 маці прысвоена ганаровае званне, 366 уручаны медалі «Мацярынская слава».

20.4.1947 г.

За пасляваенны перыяд выпушчана 55 аграномаў. У гэтым годзе навучаецца 300 студэнтаў. Мяркуецца выпусціць 68 аграномаў і 17 механікаў.

26.6.1947 г.

Паводле слоў старшыні калгаса імя Кірава Івана Новікава, летась у гаспадарцы цяслярскай брыгадай на чале з Быкавым было пабудавана 36 дамоў. Вывезена 2130 м^3 лесаматэрыялу. Цяпер прымаюцца захады, каб перасяліць з зямлянак апошнія чатыры сям'і. Спецыяльна створаная для гэтага брыгада (кіраўнік Старасоцкі) абавязалася да пачатку ўборкі ўраджаю выканаць асноўныя работы. Пастаўлены ўжо зруб для хаты калгасніцы Мацвеевай, вывозіцца лес на пабудову дома калгасніцы Іванчыкавай. Навасяллі будуць да кастрычніцкіх свят.

— Мой муж загінуў на фронце, праклятыя немцы спалілі хату, усё забралі, — распавядае Палагея Цімафеева. — Але мяне, дзякуй, не пакінулі ў бядзе, калгас пабудаваў ужо новы дом.

14.9.1947 г.

Жлобінскі радыёвузел прыступіў да радыёфікацыі калгасаў. У гаспадарцы «Перамога 2-й пяцігодкі» ўстаноўлена 45 радыёкропак. Лінія слупоў працягнулася ў бок в. Лугавая Вірня на адлегласці 5 км. Адначасова вядзецца падвеска правадоў у бок калгаса «Яскравы шлях».

10.10.1947 г.

Будаўнічая брыгада калгаса імя Калініна закончыла будаўніцтва 6 дамоў сем'ям, якія пражываюць у зямлянках. Калгаснікі Цыркунова, Саўчанка, Кісялёва, Лазебнік, Мізянкоў, Волікаў перасяліліся.

Два дамы пабудаваны ў калгасе «Зара» Бабоўскага сельсавета. Назаўсёды пакінулі зямлянкі калгасніцы Настасся Гірыловіч і Ганна Лукіна.

9.12.1947 г.

Да рэвалюцыі ў Жлобіне было 2 школы, дзе навучалася 350 вучняў. У Лукаўскай і Старарудняскай валасцях у 15 пачатковых школах займалася 500 рабят. Цяпер у межах раёна функцыяніруюць сельскагаспадарчы тэхнікум, 4 сярэднія, 12 сямігадовых і 41 пачатковая школы. Тут займаюцца 9678 вучняў. Выкладаюць прадметы 367 настаўнікаў.

24.12.1947 г.

Чатыры дні назад пракладзена паўкіламетра фідэрнай лініі для радыёфікацыі Жлобін-Паўднёвага, устаноўлена 8 радыёкропак.

27.6.1948 г.

За пасляваенны час пабудавана 2012 дамоў для вясковага насельніцтва, з іх 35 бясплатна, за кошт дзяржавы. Пабудавана і адноўлена 7 пачатковых, 5 няпоўных сярэдніх і адна сярэдняя школы. У 56 школах раёна навучаецца больш 9,5 тыс. дзяцей. Поўнасцю адноўлены птушкакамбінат. Для задавальнення мясцовых патрэб працуе ў раёне 7 арцелей.

5.12.1949 г.

«У 19 гадоў паступіў на чыгунку, — пісаў І.Арлоў-Арлоўскі. — Стаў чорнарабочым дэпо, а так хацелася на паравоз. І толькі праз 10 год збылася мара, калі я па ступеньках паравоза падняўся ў яго кабіну. Працаваць было нялёгка, але прэстыжна. Але мы не скардзіліся, у любы час сутак і ў любое надвор'е вадзілі паязды па мірных рэйках. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў пад Сталінградам, на ўчастках франтавых дарог у іншых месцах. За сумленную працу ўзнагароджаны ордэнамі Леніна і «Знак Пашаны», медалямі «За працоўную доблесць», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне». У 1946 годзе, калі за плячыма было ўжо 64 гады жыцця, пайшоў на заслужаны адпачынак».

«Гомельская праўда». 1944 г. 1 ліпеня.

Для Жлобінскага раёна з Гомеля адгружана аблспажыўсаюзам на 100 тысяч рублёў розных тавараў. Сярод іх соль, мыла, запалкі і мануфактура. У бліжэйшыя дні туды будзе накіравана гатовае адзенне і шэраг іншых тавараў.

Падрыхтаваў П.Шутаў.

У мірнай працы

Прамысловасць. 1960-я гады адзначаны далейшым ростам прамысловай вытворчасці горада і раёна.

У 1962 г. прамысловасць горада і раёна план вытворчасці прадукцыі выканала на 105%. Звыш плана дадзена прадукцыі на 296 тыс. руб. (у цэнах 1961 г.). У працы вызначыліся калектывы Чырвонабярэжскага крухмала-патачнага завода, птушкакамбіната, торфазавода «Лукскі», спіртзавода, камбіната будаўнічых матэрыялаў, кар'ера «Фармпяскі». Працягвалася работа па зніжэнню сабекошту выпускаемай прадукцыі, паляпшэнню іншых паказчыкаў. Пачалося будаўніцтва школы-інтэрната, 6 сельскіх клубаў, 5 магазінаў, раённага Дома культуры, 9 школ (у т.л. СШ № 7 у горадзе), 2 пунктаў камбіната бытавога абслугоўвання, гарадскога вадаправода. За год здадзена ў эксплуатацыю 3 тыс. м^2 жылля. Індывідуальныя забудоўшчыкі ўзвялі 600 дамоў.

У 1964 г. прамысловасць горада і раёна звыш плана вырабіла прадукцыі на 3 млн. 90 тыс. руб. У параўнанні з папярэднім годам аб'ём выпуску прадукцыі павялічаны на 40%. Працаўнікі раёна ў той час з павагай гаварылі пра калектывы мэблевай фабрыкі (дырэктар Р.Д.Бегуноў), паравознага і вагоннага дэпо (начальнікі М.С.Паваляеў і І.А.Артамонаў), хлебазавода (дырэктар М.М.Сушынскі), іншых, хто вызначыўся ў працы.

У 1965 г. прамысловасць горада і раёна выканала план на 104,5%. Прыбытак на 1 руб. асноўных фондаў склаў 33 кап. Уведзена ў строй 6043 м^2 жылля, частка гарадскога водаправода, працягвалася ўзвядзенне завода па рамонту і будаўніцтву дарожных машын («Рамбуддармаш»), пачата будаўніцтва новай гасцініцы, камбікормавага завода, сярэдняй школы на 964 вучнёўскія месцы, рэстарана на 260 пасадачных месцаў, магазінаў у горадзе і на сяле.

Жлобін па-сутнасці ператварыўся ў вялікую будаўнічую пляцоўку. Узводзіліся жылыя дамы для працаўнікоў камбікормавага завода, райаб'яднання «Сельгастэхнікі», дзіцячых дашкольных устаноў, інтэрнатаў. Пачалася рэканструкцыя лакаматыўнага дэпо,

дзе прадугледжвалася арганізаваць рамонт магістральных лакаматываў. Будаўнікі здалі ў эксплуатацыю сярэдню школу, 24-хкватэрны дом, гасцініцу на 100 месцаў, шэраг іншых аб'ектаў.

Зразумела, што рост усіх галін гаспадаркі не мог быць дасягнуты без самаадданай працы людзей, спаборніцтва, укаранення дасягненняў навукі і практыкі, павышэння ролі матэрыяльнага і маральнага стымулявання. У выніку калектыў будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі (дырэктар Аляксей Сяргеевіч Вярхоўскі) заняў 1-е месца ў рэспубліканскім спаборніцтве, атрымаў пераходны Чырвоны Сцяг ЦК КПБ і СМ БССР. У сваёй галіне заняў 2-е месца калектыў фабрыкі мастацкай інкрустацыі (дырэктар Леанід Майсеевіч Ліпоўскі). На вечнае захаванне памятны сцяг Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі пакінуты неаднаразоваму пераможцу ў спаборніцтве — калектыву вагоннага дэпо (начальнік Іван Андрэевіч Артамонаў).

На працягу 1969—70 гг. усе прамысловыя прадпрыемствы горада перайшлі на новыя ўмовы планавання і эканамічнага стымулявання. У выніку выпуск прадукцыі ўзрос на 17,8%. У 1973 г. здадзены ў эксплуатацыю 25 тыс. м^2 жылля, новы будынак гарадскога малочнага завода, жывёлагадоўчы комплекс у калгасе імя Жданава, пабудаваны 35 новых кароўнікаў, 14 свінарнікаў, 3 механічныя майстэрні, птушнік у саўгасе «Жлобін». Будаваўся новы мясакамбінат, завод буйнапанэльнага домабудавання ў пас. Лукскі. Чыгуначнікі звыш плана перавезлі 6,5 млн. т народнагаспадарчых грузаў. Грузаабарот аўтатранспарту павялічыўся на 24,8%. Ураджайнасць збожжавых дасягнула 24,1 ц з га, бульбы — 171 ц.

Жлобін 7 сакавіка 1963 г. становіцца горадам абласнога падпарадкавання, і настае час яго бурнага прамысловага і сацыяльна-культурнага развіцця. Будуюцца новыя прадпрыемствы лёгкай і харчовай, дрэваапрацоўчай і камбікормавай, металургічнай прамысловасці. Ствараецца свая будаўнічая база: ПМК-40, міжкалгасбуд, Рамбудучастак, Будаўніча-мантажнае ўпраўленне меліярацыі. З ростам аб'ёмаў будаўніцтва ўзнікла неабходнасць стварэння будаўнічага трэста, і ў 1981 годзе ён быў арганізаваны. Яго падраздзяленнямі сталі ўпраўленні: два будаўнічыя, механізацыі будаўнічых работ (УМБР), вытворча-тэхнічнай камплектацыі (УВТК), будаўнічая база, шэраг спецыялізаваных службаў. Будтрэст № 40 — сучасная будаўнічая арганізацыя, якая ўзводзіць жыллё, аб'екты вытворчага і сацыяльнага прызначэння, займаецца рэканструкцыяй і рамонтам.

Адміністрацыйны будынак будтрэста № 40 у Жлобіне.

Старэйшым прадпрыемствам горада з'яўляецца мэблевая фабрыка — пераемніца невялікага прамысловага камбіната на беразе Дняпра, які ўзнік на базе майстэрні арцелі «Чырвоны мэбельшчык» (выпускала матрацы, шафы, канапы) і іншых саматужных арцеляў. Была праведзена рэканструкцыя. На новай пляцоўцы пабудавалі зборачна-аддзелачны цэх, кацельню на 30 т пары ў суткі, іншыя вытворчыя памяшканні. У 1971 г. фабрыка ўвайшла ў Бабруйскае дрэваапрацоўчае аб'яднанне і паступова пераходзіць ад выпуску шафчыкаў, табурэтак, сталоў і медыцынскай мэблі да вытворчасці кухонных гарнітураў «Мідзі», «Рэкта», «Агрэст» і становіцца буйнейшым структурным падраздзяленнем аб'яднання. З 1989 г. калектыў фабрыкі перайшоў да выпуску новых мадэлей гарнітураў з выкарыстаннем нержавеючай сталі, сінтэтычнага шпона, арэхавай тэкстуры, каляровай поліэфірнай эмалі. Сёння фабрыка — адкрытае акцыянернае таварыства «Жлобінмэбля».

Значную ўдзельную вагу ў выпуску паслявоеннай прадукцыі займала арцель «Аб'яднаная праца» — пераемніца кравецкай майстэрні, якая ўзнікла ў 1928 г. У кастрычніку 1960 г. на базе арцелі ўтвораны камбінат бытавога абслугоўвання. А ў 1961 г. ад КБА адпачкоўваецца швейны цэх, які стаў асновай будучай швейнай фабрыкі. Тады ў КБА засталося працаваць 220 чалавек. На вуліцы Першамайская ў Жлобіне пабудаваны «Дом быту», у буйных населеных пунктах адкрываюцца

комплексныя прыёмныя пункты. У лістападзе 1996 г. камбінат бытавога абслугоўвання ператвораны ў адкрытае акцыянернае таварыства.

15.12.1967 г. ў строй уступіў завод па рамонту і будаўніцтву дарожных машын «Рамбуддармаш». Першынцам яго прадукцыі быў капітальна адрамантаваны бульдозер Л-271. Цяпер апрача рамонту будаўнічай і дарожнай тэхнікі завод выпускае бетонамяшалкі (растворныя вузлы), розныя металаканструкцыі і пад'ёмныя механізмы. У 1997 г. прадпрыемства ператворана ў адкрытае акцыянернае таварыства «Жлобінскі рамонтна-механічны завод».

У 1975 г. пачалося будаўніцтва буйнейшай у Еўропе фабрыкі штучнага футра на амерыканскім абсталяванні, мантаж якога і пусканаладачныя работы выкананы ў асноўным сіламі рабочых прадпрыемства. Першапачатковая магутнасць фабрыкі складала 25 млн. м^2 футра ў год. У 1984 г. на існаваўшых вытворчых плошчах пачала дзейнічаць эксперыментальная швейная фабрыка. Утварылася вытворчае аб'яднанне штучнага футра, якое займалася вырабамі футра і выпускам з яе гатовай прадукцыі, якая карысталася вялікім попытам. З 1.1.1997 г. прадпрыемства стала ААТ «Белфа». Для падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў у 1981 г. пры фабрыцы штучнага футра было адкрыта тэхнічнае вучылішча № 143 тэкстыльшчыкаў на 550 вучнёўскіх месцаў. На яго базе рыхтуюцца некаторыя спецыялісты для Беларускага металургічнага завода.

Развіццё футравай вытворчасці пацягнула за сабой рост насельніцтва горада, вырашэнне шэрагу сацыяльных праблем. У студзені 1985 г. пачаў дзейнічаць санаторый-прафілакторый «Пралеска». Побач будавалася дзіцячая база адпачынку на 320 месцаў у адну змену. У трэцім мікрараёне адкрыліся інтэрнаты для маладых працаўнікоў. Шмат тут і ў іншых месцах горада пабудавана жылля, магазінаў, дзіцячых садкоў. Калектыў прадпрыемства ў цяжкі для СШ № 2 і школы-інтэрната час аказаў ім вялікую дапамогу ў рамонце, умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы, з'яўляецца добрым спонсарам і цяпер.

У 1973 г. было пачата будаўніцтва новых магутнасцей на мясакамбінаце, і ў кастрычніку 1976 г. атрымана першая прадукцыя. Магутнасць прадпрыемства — 120 тон перапрацаванага мяса і 15 тон каўбасных вырабаў у адну змену. Яно спажывае мясцовую і сыравіну калгасаў і саўгасаў суседніх Буда-Кашалёўскага, Кармянскага, Рагачоўскага, Акцябрскага, Светлагорскага і Чачэрскага раёнаў.

У 1961 г. атрымала статус самастойнага прадпрыемства фабрыка мастацкай інкрустацыі. Свой пачатак яна бярэ ў 1950 г., калі ў Жлобіне па ініцыятыве групы народных умельцаў на чале з Верай Нікадзімаўнай Дзехцярэнка пачаў дзейнічаць цэх інкрустацыі саломкай Гомельскай фабрыкі мастацкіх вырабаў.

Першымі інкрустатарамі з'яўляліся М.В.Дзехцярэнка, С.С.Панамароў, Э.П.Зарнікава, Ф.Цімашэнка, А.Ф.Гаранкова, М.В.Пераверзеў, М.І.Журава, Т.Андрухова, Т.Ф.Дзе-

Рамонтна-механічны завод у Жлобіне.

мідзенка, З.І.Коваль, Г.І.Казлова, В.П.Самусева, В.І.Сердзюкова, В.М.Барташова, Р.А.Шлёміна, М.Е.Камарова, А.П.Гузава, З.І.Шылянкова, Н.І.Ліпская, М.М.Дамарацкая, А.Ф.Жахвіна, В.Л.Камякова, К.П.Чухраева, Т.П.Чыкілёва, В.М.Пугач, М.А.Івінскі, А.Сарокін, В.А.Прачык, С.А.Селіванаў, В.А.Міхееў, Ф.І.Іваноў, Т.А.Удачкіна, Н.М.Мельнікава.

З'яўленне ў Жлобіне Беларускага металургічнага завода абумоўлена некалькімі фактарамі. Патрэбна было задаволіць попыт рэспублікі ў сартавым пракаце, арганізаваць вытворчасць металакорду для шыннай прамысловасці, вырашыць шэраг сацыяльных праблем. 19.3.1982 г. ў Маскве падпісаны кантракт на будаўніцтва завода, а 8 красавіка адкрыта будаўнічая пляцоўка. Закладка завода адбылася 14 верасня 1982 года. Адбыўся мітынг, закладзена капсула з пісьмом да будучых пакаленняў. Будаваўся металургічны з актыўным удзелам замежных фірм: аўстрыйскай «Фэст-Альпінэ» і італьянскай «Данієлі». 1 чэрвеня 1983 г. яны пачалі мантаж канструкцый электрасталеплавільнага цэха. 15.10.1984 г. пушчаны электрасталеплавільны цэх і зроблена першая плаўка, якую ажыццявіў вопытны сталявар Міхаіл Паўлавіч Гуляеў. 25.11.1984 г. адбылося афіцыйнае падпісанне акта прыёмкі-здачы ў эксплуатацыю Беларускага металургічнага завода.

Першым дырэктарам прадпрыемства быў Дзеражант Лявонавіч Акопаў, які быў прызначаны на гэту пасаду ў лютым 1981 г. Яго пераемнікам у жніўні 1985 г. стаў Міхаіл Рыгоравіч Ціханоўскі. З мая 1989 г. калектыў металургаў узначаліў кандыдат тэхнічных навук Юрый Васільевіч Феакцістаў, які ў лістападзе 1994 г. атрымаў статус генеральнага дырэктара.

19.9.1986 г. завод выпусціў першую мільённую тону сталі, а 29 ліпеня наступнага года — мільённую тону беларускага пракату. 20.8.1987 г. зроблены пробны пуск травільнай установкі сталедротавага цэха № 1. У маі 1990 г. металакорд і бартавы дрот выйшлі на сусветны рынак. У верасні 1996 г. адкрыты тэхнікум БМЗ, а з 1.9.1998 г. пачаў дзейнічаць філіял Гомельскага політэхнічнага інстытута па падрыхтоўцы спецыялістаў для завода.

Калісьці Жлобін быў горадам чыгуначнікаў, а цяпер усё больш і больш набывае рысы горада металургаў. На паўночна-ўсходняй ускраіне ўзнік па-сутнасці другі горад, дзе ў 16-м, 17-м, 18-м, 19-м, 20-м мікрараёнах пабудаваны 5- і 9-павярховыя дамы, аб'екты сацкультбыту, жыве больш палавіны насельніцтва Жлобіна. Створана свая жыллёва-камунальная служба.

Швейная фабрыка ў Жлобіне.

У 1963 г. швейная фабрыка перайшла на выпуск адзення дзіцячага асартыменту: касцюмаў баваўняных і шарсцяных для хлопчыкаў ясельнага і дашкольнага ўзросту. Да 1971 г. прадпрыемства рэканструявалі і расшырылі. У новым чатырохпавярховым будынку размясціліся 2 пашывачныя, раскройна-падрыхтоўчы і эксперыментальныя цэхі, склад гатовай прадукцыі. Да іх прымкнула 5-павярховая прыбудова адміністрацыйна-бытавога корпуса. А ў старым будынку размясцілася сталовая на 120 месцаў, зала пасяджэнняў. У 1974 г. пабудавалі інтэрнат на 360 месцаў. Праз год здалі ў эксплуатацыю фабрычны дзіцячы садок на 280 месцаў. Расшырэнне вытворчасці дазволіла разнастаіць асартымент вырабаў. Тут у розны час выпускалі шарсцяныя, баваўняныя і джынсавыя касцюмчыкі для хлопчыкаў дашкольнага ўзросту, фартухі школьныя, піянерскую форму, штаны-джынсы мужчынскія, жаночыя, падлеткавыя.

Пяцігодка 1986—90 гг. была перыядам, калі ў развіцці народнай гаспадаркі горада і раёна адбываліся негатыўныя, характэрныя для ўсёй краіны, з'явы: разбалансаванасць матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, з'явы ў грамадскім жыцці выклікалі парушэнні ў рабоце прамысловых прадпрыемстваў, будаўнічых арганізацый, калгасаў, саўгасаў. Тэмпы вытворчасці тавараў народнага спажывання заставаліся таксама нізкімі. У эканоміцы адсутнічалі дзейсныя эканамічныя стымулы.

Аднак паправіць сітуацыю не маглі і тыя 156 створаных да таго часу розных гарадскіх кааператываў, дзе было занята 2100 чалавек. Толькі невялікая колькасць кааператываў працавала стабільна. З 28 кааператываў, створаных у раёне, 11 — вытворчага профілю, столькі ж будаўнічага, 6 аказваюць паслугі насельніцтву. Адкрыты 4 кааператывы і 3 малыя прадпрыемствы па вырабу будаўнічых матэрыялаў, перапрацоўцы мяса, мантажу сетак газаправодаў у дамах сельскіх жыхароў.

Нягледзячы на сацыяльныя ўзрушэнні таго часу, заставаўся высокім навуковы, інтэлектуальны і адукацыйны патэнцыял інжынерна-тэхнічных работнікаў. На народнагаспадарчых аб'ектах працавалі звыш 7 тыс. чалавек з вышэйшай адукацыяй, больш 10 тыс. мелі сярэдне-тэхнічную. Сярод іх — 2 дактары і 16 кандыдатаў тэхнічных навук. З вучонай ступенню ёсць медыцынскія і педагагічныя работнікі.

Адбываліся змены ў гарадской гаспадарцы. Жлобін з 1964 г. пачаў забудоўвацца па генеральнаму плану, распрацаванаму інстытутам «Белдзяржпраект» (карэкціроўка 1975). Прадугледжвалася развіццё горада ў паўночным напрамку, а яго цэнтральная вуліца Першамайская, якая ідзе паралельна чыгункі, павінна звязаць залінейную і паўночную часткі Жлобіна з паркам і Дняпром. За прайшоўшыя гады пабудавана шмат жылля і аб'ектаў сацкультбыту, інжынерных сетак, праведзены работы па добраўпарадкаванню і азеляненню.

Асобнай старонкай у гісторыі Жлобіншчыны з'яўляецца чарнобыльская тэма. Яе тэрыторыю не абмінуў радыеактыўны попел. Насельніцтва краю прыняло, як родных, жыхароў з пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС вёсак Нараўлянскага і Хойніцкага раёнаў. Для іх пабудавана жыллё, адведзена зямля для развіцця падсобнай гаспадаркі. 23.11.1994 г. ў г.п. Стрэшын адкрыты Рэабілітацыйны цэнтр, створаны па праграме ЮНЕСКА (адзін з 9 «Цэнтраў давер'я», што адкрыты на тэрыторыі Беларусі, Расіі, Украіны). Тут ажыццяўляецца сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя пацярпелых ад аварыі.

У 1-й палавіне 1990-х гадоў народная гаспадарка горада і раёна апынулася ў складанай сітуацыі. Упалі тэмпы вытворчасці, будаўніцтва, не хапала сыравіны, скарачалася колькасць працуючых, з'явіліся беспрацоўныя, знізіліся заробкі і жыццёвы ўзровень.



Агульны выгляд кацельнай «Паўночная».

Практычна адзін БМЗ забяспечваў большменш рытмічную работу. Многае было перасэнсавана, удзелена ўвага новым тэхналогіям, пошукам рынкаў збыту, наладжванню трывалых эканамічных сувязяў. Прынятыя меры далі вынікі: да канца 1995 г. сацыяльна-эканамічнае становішча ў горадзе і раёне стала стабілізавацца. За 1997 г. рост аб'ёмаў прамысловай прадукцыі ў супастаўімых цэнах склаў 132,4%, што значна вышэй прагназуемых паказчыкаў. У 10 разоў скараціліся запасы гатовай прадукцыі на складах прадпрыемстваў. Знешнегандлёвы абарот склаў 409,6 млн. долараў ЗША, з іх доля БМЗ — 95%. У лік перадавых выйшлі калектывы Беларускага металургічнага, ААТ «Жлобінмэбля», швейнай фабрыкі, чыгуначнага вузла і інш. Актывізавалася работа па выпуску тавараў народнага спажывання. Павялічыліся аб'ёмы рэалізацыі платных паслуг, палепшылася бытавое абслугоўванне насельніцтва. У Жлобіне адкрыліся новыя магазіны «Цэнтральны», «Калі ласка», «Дняпроўскі», «Валянціна» і іншыя. Працягваецца добраўпа-

радкаванне вуліц горада. Стабільней стаў працаваць аграпрамысловы комплекс раёна. Сярэднегадавы рост аб'ёмаў сельскагаспадарчай прадукцыі роўны 8%. Працаўнікі горада і раёна імкнуцца добрасумленна працаваць, бо яны — сапраўдныя патрыёты сваёй Жлобіншчыны. *Р.В.Дзмітрыеў.*

Сельская гаспадарка раёна ў 1960—80-я гады атрымала далейшае развіццё. На 60-я — першую палову 70-х гадоў прыходзіцца хуткі рост канцэнтрацыі, спецыялізацыі і кааперавання вытворчасці.

У 1960 г. калгасы і саўгасы атрымалі на 100 га сельгасугоддзяў 175,7 ц малака, 27 ц мяса, у т.л. свініны на 100 га ворыва 10,5 ц. Надой малака на фуражную карову склаў 1950 кг. Планы продажу ўсіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі былі выкананы. У 1962 г. за ўвесь пасляваенны час упершыню было сабрана з гектара па 132 ц бульбы. А звяно Віктара Аляксандравіча Марозава з саўгаса «Мормаль» на 40 га атрымала па 315 ц клубняў з гектара. Сабекошт склаў 79,2 кап. за цэнтнер прадукцыі супраць планавай 1 руб. 14 кап. На 30—40 цэнтнераў павысілі ўраджайнасць бульбы калгасы «Звязда», «Шлях Леніна», «Прагрэс», «Чырвоная Зорка». Па выніках работы ў жывёлагадоўлі раёну былі ўручаны 2 пераходныя Чырвоныя Сцягі ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, Гомельскага абкома КПБ і аблвыканкома.

Пачынаецца спецыялізацыя калгасаў. На інтэнсіўны адкорм свіней пераходзяць калгасы «Іскра», «Рассвет», на адкорм буйной рагатай жывёлы — калгас імя Леніна, саўгасы «Пірэвіцкі» і «Чырвонабярэжскі», на вырошчванне птушкі — калгас «1-е Мая» і саўгас «Жлобін». Першыя крокі спецыялізацыі далі станоўчыя вынікі.

Народная гаспадарка горада і раёна ў наступныя гады працягвала набіраць сілу, развівацца ўсебакова, дабівацца новых паказчыкаў росту. У новых умовах планавання (пасля верасняўскага 1966 г. пленума ЦК КПСС) пачаў працаваць шэраг прадпрыемстваў. Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў і саўгасаў, павышалася рэнтабельнасць. Грашовыя даходы ў сельскай гаспадарцы пасля 1965 г. выраслі на 30,7%, а ў калгасах «Чырвоная Зорка», «1-е Мая», імя Леніна — удвая. У 1967 г. атрыманы самы высокі за пасляваенны час надой малака на карову — у сярэднім па раёну 2376 кг.

Калгасы «Рассвет» і «1-е Мая», саўгасы «Лукскі» і «Рэкцянскі» па ўраджайнасці збожжавых з гектара пераўзышлі 20-цэнтнераві рубеж. 12 гаспадарак пачалі спецыялізавацца па вытворчасці малака, 11 — па вытворчасці мяса. З'явіліся спецыялізаваныя гаспадаркі па вытворчасці свініны, вырошчванню авечак, вытворчасці яек і мяса птушкі. У гаспадарках раёна налічвалася 876 трактараў і 259 збожжаўборачных камбайнаў.

У 1960-я — 70-я гады былі зроблены неабходныя захады па выпраўленню раней дапушчаных памылак. Некаторыя гаспадаркі разбуйнілі. Так, на землях калгасаў імя Леніна і «Чырвоная Зорка» ўтварылі калгас Варашылава, на землях калгасаў імя Кірава і Свярдлова — саўгас «Бабоўскі», на землях саўгаса «Мормаль» і калгаса «Іскра» — саўгас «Уперад». Саўгас «Жлобін» быў структурна перароблены — выдзелены саўгас «Нівы» і Жлобінская птушкагадоўчая гаспадарка (яна ўвайшла ў арганізаваную аграпрамысловую сістэму «Птушкапрам»). З калгаса «Рассвет» выдзеліўся калгас «Ленінец». На землях, акаляючых вёскі Затон і Праскурні, утварыўся калгас «50 год БССР». Пазней ліквідавалі калгас «Светлы шлях». У мэтах умацавання эканомікі, паляпшэння кіраўніцтва вёску Зломнае перадалі калгасу «1-е Мая», а в. Вялікі Лес — калгасу «Шлях Леніна». Падзялілі жывёлу, тэхніку, вытворчыя памяшканні. Думалася, што так будзе лепей, але жыццё паказала іншае.

Самым выніковым па вытворчасці сельгаспрадукцыі стаў 1978 г. Было атрымана 507,8 ц малака і 144,4 ц мяса на 100 га сельгасугоддзяў. Надоі на адну фуражную карову склалі 2441 кг малака. З гектара ворыва атрымана па 25 ц збожжа, 169 ц бульбы. Рэалізавана звыш плана 3036 т зерня, 11 тыс. т бульбы. Тым не менш попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю поўнасцю не задавальняўся.

Увесь ход гісторыі сельскай гаспадаркі, пачынаючы з суцэльнай калектывізацыі, указваў на яго карэннае пераўтварэнне, тым больш што неабходнасць у гэтым абвастрылася ў пачатку 80-х гадоў. Згодна з пастановай ЦК КПСС і СМ СССР «Аб далейшым удасканальванні кіравання аграпрамысловым комплексам» у 1985 г. пачалася структурная перабудова асобных гаспадарак раёна. Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база, ўкаранялася аграхімічнае абслугоўванне (створана раённае аб'яднанне «Сельгасхімія»). Станоўча адбіліся на агульнай справе інтэнсіўныя работы па меліярацыі зямель. У 1986 г. раён атрымаў малака 578 ц, мяса 122,6 ц на

100 га сельгасугоддзяў, свініны па 36,1 ц на 100 га ворыва. Надоі малака дасягнулі 2400 кг на карову. Узраслі ўраджаі збожжавых і тэхнічных культур.

Рост жывёлагадоўлі і павелічэнне вытворчасці прадуктаў гэтай галіны патрабавалі ўмацавання кармавой базы, перш за ўсё якасных кармоў. І тут на парадак дня паўстала пытанне аб будаўніцтве камбікормавага завода. Такое прадпрыемства ўзвялі ў 1969 г. Праектная магутнасць складала 200 т рассыпных камбікармоў у суткі. З 1976 г. пачалася рэканструкцыя завода. «Паслабленні» ў калгасна—саўгасным ладзе дазволілі 6 сялянскім гаспадаркам выдзеліцца, зарэгістравацца і самастойна павесці сваю справу. Былі зарэгістраваны 3 малочныя кааператывы. У іх распараджэнні знаходзілася 303 га сельгасугоддзяў, 276 га ворыва і 147 кароў.

Пачатак 90-х гадоў не змяніў становішча, нягледзячы на пераезд вялікай колькасці насельніцтва з забруджаных зон Нараўлянскага і Хойніцкага раёнаў. Колькасць працуючых на сяле павялічылася недастаткова. Гэта былі людзі сталага ўзросту і пенсіянеры. Моладзь не прыжылася. Папоўніць рады актыўных працуючых на сяле не было кім. Моладзь ісці на непрэстыжную, па яе разуменню, работу не хацела. Ва ўзросце да 30 гадоў у гаспадарках раёна працавалі 142 жывёлаводы і 346 механізатараў. З працуючых 855 даярак ва ўзросце 50 і больш гадоў было 468. На 1.1.1991 г. не хапала 230 даярак і звыш 200 механізатараў. Пагоршылася ў гаспадарках маральна-псіхалагічная абстаноўка, выкліканая агульнай сацыяльна-эканамічнай напружанасцю ў краіне. Яна ўскладнялася тым, што ў раёне недастаткова развітая мясцовая прамысловасць, слабая база перапрацоўкі сельгаспрадукцыі.

У ўсё ж, нягледзячы на складаную абстаноўку, пабудавана 161,7 тыс. м^2 жылля. 19 пасёлкаў для перасяленцаў, людзей, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, 7 школ, столькі ж кацельняў, бальніца на 50 месцаў у в. Кірава, участковая амбулаторыя на 100 наведванняў у змену ў в. Кароткавічы, аптэка, 4 фельчарска-акушэрскія пункты, 5 клубаў, 5 сталовых, 12 дзіцячых садкоў, пракладзена 38,3 км газаправоду і газіфікавана звыш 100 дамоў.

Некалькі ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база службы быту на вёсцы. Комплексныя прыёмныя пункты пабудаваны ў пас. Лукскі, вёсках Нівы і Кабанаўка, рэканструяваны ў Чырвоным Беразе, Бабоўцы, Луках. Палепшылася аказанне камунальных паслуг сталым людзям, якіх у раёне больш 14 тыс. чалавек. Пры Кабанаўскім, Пірэвіцкім, Майскім сельвыканкомах створаны кааператывы, якія ўзялі на сябе многія пытанні па бытавому абслугоўванню вяскоўцаў, перш за ўсё старых людзей. *Р.В.Дзмітрыеў.*

Лясная гаспадарка. Важнай з'явай сярэдзіны 1960-х гадоў з'явілася стварэнне адзінай лясной гаспадаркі раёна. У студзені 1966 г. пад юрысдыкцыю створанага Жлобінскага лясніцтва з Буда-Кашалёўскага, Парыцкага (цяпер Светлагорскага) і Рагачоўскага раёнаў перададзена 48 тыс. га лясных угоддзяў, праз 30 год іх плошча павялічылася да 64,3 тыс. га. У структуру лясгаса ўваходзяць 6 лясніцтваў: Дварышчанскае, Кароткавіцкае, Лугавірнянскае, Прыбярэзінскае, Стрэшынскае, Хальчанскае і Чырвонабярэжскае, Шчадрынскае, 14 майстарскіх участкаў, 87 абходаў, 2 цэхі — Дварышчанскі і Хальчанскі — па перапрацоўцы драўніны, базавы пітомнік. Сярод лесакультур пераважаюць сасна (72,8%), елка (1,9), бяроза (23,1%). Дубровы займаюць 2,2%.

З першых гадоў існавання калектыў лясгаса ўзяў кірунак на пасадку лесу на месцах вырубак, пустэчах, пясчаных глебах, якія выводзіліся з севазвароту ў калгасах і саўгасах. Штогод 200—220 га такіх зямель займаліся маладняком.

Лясгас мае добрую тэхніку, пасадны матэрыял, пастаянна нарошчваюцца вытворчыя магутнасці, растуць аб'ёмы выпуску таварнай прадукцыі, уведзены ў дзеянне новы цэх па пастаўках на экспарт дробнатаварнай драўніны. Штогод у розныя адрасы адпраўляецца не менш 10 тыс. м^3 дзелавой драўніны, да 600 м^3 шпалаў, 125—150 т драўнянай стружкі, 150—175 т бярозавага соку, да 25 т жывіцы, да 15 т розных ягад (у асноўным чарнаплоднай рабіны).

Сярод ветэранаў лясной гаспадаркі дырэктар Барыс Якаўлевіч Абрамсон, Аляксандр Арсенцьевіч Камароў, ляснічы Дварышчанскага лясніцтва Міхаіл Анісімавіч Ткачоў, станочнік Павел Мітрафанавіч Магляс, наладчык станкоў Мікалай Віктаравіч Грамыка, лясніцтва Віктар Іванавіч Гаўрыленка, рабочая пітомніка Брушкова, шафёр Сяргей Іванавіч Пракапцоў, ляснічы Хальчанскага лясніцтва Аляксандр Іванавіч Багамазаў і многія іншыя. Кожны з 265 працуючых у лясгасе заслугоўвае добрага

слова, сумленна робіць на першы погляд непрыкметную, але важную справу.

Асвета. Культура. У 1960 г. ў горадзе і раёне дзейнічалі 99 сярэдніх, сямігадовых і пачатковых школ, Пірэвіцкая школа-інтэрнат. У іх навучаліся 13 370 юнакоў і дзяўчат. Большасць школ знаходзілася ў тыпавых, пабудаваных за пасляваенны час будынках.

У 1970/71 навучальным годзе ў раёне былі 102 агульнаадукацыйныя школы, у т.л. 22 сярэднія, 18 няпоўныя сярэднія, 62 пачатковыя. Усенавучам было ахоплена 18 216 дзяцей. Функцыяніравалі 2 дзіцячыя дамы, 12 садоў-ясляў, 9 прышкольных інтэрнатаў.

З 1.9.1960 г. працуе дзіцячая музычная школа, якую ўзначаліла Юлія Якаўлеўна Антушэвіч. У 1961 г. адкрыта дзіцяча-юнацкая спартыўная школа (кіраўнік Гвідон Сцяпанавіч Сушкевіч). Спачатку школа дзейнічала на базе СШ № 5, якая была разбурана ў час вайны і адноўлена ў 2-й палавіне 50-х гадоў. У 1973 г. спартыўная школа атрымала ўласнае памяшканне. Спартыўнай называюць і агульнаадукацыйную школу № 7 (уступіла ў строй у 1963 г.), паколькі яе вучні пастаянныя прызёры круглагадовых школьных спартыўных алімпіяд. Заслуга ў гэтым настаўніка фізкультуры Дзмітрыя Васілевіча Прастаквашына.

У 1961 г. прыняла першых выхаванцаў школа-інтэрнат для дзяцей-сірот. У яе будаўніцтве і станаўленні актыўны ўдзел прыняў вопытны педагог, добры арганізатар дзіцячага калектыву, дырэктар Іван Мацвеевіч Барановіч (раней працаваў дырэктарам дзіцячага дома ў в. Антушы, потым загадчыкам аддзела народнай асветы райвыканкома).

СШ № 8 прыняла першых вучняў 1.9.1967 г., у наступным годзе ёй было прысвоена імя Васіля Іванавіча Казлова, ураджэнца Малевіцкага сельсавета, савецкага і партыйнага дзеяча. Школа стала спецыялізаванай, з навучаннем на французскай мове.

СШ № 9 адкрыла дзверы для першых навучэнцаў у верасні 1976 г. За 20 год існавання з 904 яе выпускнікоў 53 атрымалі залатыя і 31 сярэбраны медалі. Тут вучылася беларуская паэтэса Вольга Куртаніч (Мешчаракова).

У СШ № 10 (пабудавана ў 16-м мікрараёне Жлобіна) заняткі пачаліся 1.9.1984 г. Яна стала развівацца як школа з паглыбленым вывучэннем матэматыкі, фізікі, хіміі і чарчэння. Навучэнцы школы — шматразовыя прызёры гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх школьных алімпіяд. З 1992 г. працуюць тэхнічныя ліцэйскія класы пры факультэце давузаўскай падрыхтоўкі Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі. У 1990 г. ў

Урок фізкультуры ў сярэдняй школе № 13 у Жлобіне.

Будынак выдавецка-паліграфічнага прадпрыемства ў Жлобіне.

17-м мікрараёне адкрыта СШ № 11, праз два гады на гэтым жа школьным двары пабудавана СШ № 12. Іх злучае плавальны басейн «Дэльфін».

Па галандскаму праекту ў 19-м мікрараёне пабудавана СШ № 13. У школе адкрыліся ліцэйскія класы з паглыбленым вывучэннем гуманітарных дысцыплін.

Пачынаючы з 8-й пяцігодкі, у раёне разгарнулася вялікая работа па ўмацаванню матэрыяльнай базы сельскіх школ і дашкольных устаноў. За гады 9-й і 10-й пяцігодак за лік дзяржаўных цэнтралізаваных капіталаўкладанняў па тыпавых праектах пабудавана 13 сярэдніх і няпоўных сярэдніх школ на 5368 месцаў, за лік мясцовага бюджэту — 2 школы на 230 месцаў. У новыя вучэбныя карпусы перайшлі Чырвонабярэжская, Кабанаўская, Пірэвіцкая, Шчадрынская, Стрэшынская, Малевіцкая, Сцяпская, Кіраўская, Папаратнянская і Старарудняпская сярэдпія, Акцябрская і Прыбудская васьмігадовыя школы.

У 1960-я — 80-я гады школы раёна неаднаразова выходзілі пераможцамі: адзін раз ва ўсесаюзных, 4 — у рэспубліканскіх, 2 — у абласных спаборніцтвах. Гэта сведчанне добрай матэрыяльнай базы, усебаковай падрыхтоўкі школ да вучобы.

З сярэдзіны 1980-х гадоў паменшылася колькасць навучэнцаў, шэраг навучальных устаноў ніжэйшага ўзроўню быў закрыты. Пачатковыя школы і няпоўныя сярэднія рэарганізаваны або ў чатырохкласныя, ці сярэднія. У 1985/86 навучальным годзе ў раёне 21 сярэдняя, 12 няпоўных сярэдніх і 17 пачатковых школ. Дзейнічала 30 дзіцячых садкоў. Пірэвіцкая школа-інтэрнат рэарганізавана ў дапаможную няпоўную сярэднюю школу. Палепшыўся якасны састаў педагогаў, 80,3% з іх былі з вышэйшай адукацыяй.

Дзейнічалі 3 вучэбна-вытворчыя камбінаты (ВВК): Пірэвіцкі, Радушскі і Стрэшынскі. Усе навучэнцы 9—10 класаў сельскіх школ займаліся на базе ВВК па 9 спецыяльнасцях. У 1978—88 гг. было падрыхтавана 4526 спецыялістаў масавых прафесій, у т.л. вадзіцеляў аўтамабіляў — 987, трактарыстаў — 930, інкрустатараў саломкай — 135, гандлёвых работнікаў (малодшых прадаўцоў) — 523, аператараў машыннага даення — 358, повараў-кулінараў — 115, швей-матарыстак — 371, будаўнікоў (муляраў і муляраў-штукатураў) — 59, культасветработнікаў — 48. Вучні гарадскіх школ праходзілі вытворчую практыку на базе прамысловых прадпрыемстваў і ў гаспадарках чыгуначнага вузла.

У 1977 г. ў Жлобіне адкрыта сельскае прафесійнае вучылішча № 57 (пазней № 187), у 1992 г. на яго базе створана аграрна-тэхнічнае вучылішча (яго першым дырэктарам быў кандыдат педагагічных навук Андрэй Васілевіч Лук'яновіч, які потым узначаліў управленне народнай асветы Гомельскага аблвыканкома).

У верасні 1988 г. ў 16-м мікрараёне Жлобіна адкрыта гарадская дзіцячая школа мастацтваў для таленавітых дзяцей. У тым жа годзе рэдакцыя раённай газеты і друкарня (пазней на базе друкарні ўзнікла выдавецка-паліграфічнае прадпрыемства) пераехалі ў новы будынак. У 1993 г. ў Жлобіне пачала дзейнічаць студыя кабельнага тэлебачання «Нюанс». 4.5.1990 г. на беразе Дняпра створаны заапарк (другі ў рэспубліцы, пасля Гродзенскага). Асновай для яго паслужыла ка-





Куток заапарку ў Жлобіне.

лекцыя мясцовай і экзатычнай фауны, якую сабраў заўзяты аматар жывёл Пётр Кірылавіч Пацякоў. Цяпер у Жлобінскім дзяржаўным (з 1992) заалагічным парку налічваецца 80 відаў, 240 асобін жывёльнага свету.

1.9.1996 г. пачаліся заняткі ў Жлобінскім металургічным тэхнікуме, дзе рыхтуюцца кадры для БМЗ. З 1.9.1998 г. на яго базе пачаў дзейнічаць Жлобінскі філіял Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.В.Сухога па падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для Беларускага металургічнага завода і некаторых іншых прадпрыемстваў краіны.

З 15.2.1992 г. працуе Жлобінскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей. У ім сабрана больш 5 тыс. адзінак асноўнага фонду, ёсць каля 2 тыс. навуковага і дапаможнага, ён пастаянна папаўняецца новымі экспанатамі, у бліжэйшым будучым пераселіцца ў рэканструяваныя больш прасторныя залы былога дзіцячага садка. Тут праводзяцца выстаўкі жывапісу мясцовых мастакоў, дзіцячай школы-студыі іканапісу, работы падлеткавага клуба «Адзінства», гарадскога цэнтра дзіцяча-юнацкай творчасці «Факел». У сакавіку 1997 г. прайшла выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва жанчын-майстрых горада. Наведвальнікі музея змаглі пабачыць прыгожыя работы самабытнай мастачкі з Іспаніі Сакора Санчас Ролдан. Матэрыялы музея расказваюць таксама аб сувязях жлабінчан з жыхарамі гарадоў Мейдэн (Галандыя), Скаленга (Італія), Пелгржымаў (Чэхія) і інш.

З мая 1968 г. ў Жлобіне працуе філіял дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці (цяпер — занальны Дзяржаўны архіў у Жлобіне), з снежня — станцыя юных тэхнікаў.

Р.В.Дзмітрыеў.

Ахова здароўя. У 1957 г. раённая бальніца размясцілася ў спецыяльна пабудаваных для яе памяшканнях, якія склалі адзінае цэлае — бальнічны гарадок. Тут было 50 хірургічных ложкаў, 40 інфекцыйных, 5 гінекалагічных, 5 туберкулёзных. Па тым часе гэта матэрыяльная база ўвогуле задавальняла горад. На сяле функцыяніравалі 27 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, бальніца ў г.п. Стрэшын, урачэбныя ўчасткі ў вёсках Майскае, Пірэвічы, Чырвоны Бераг, Лукі, Дабрагошча, Шчадрын. Працавалі 26 дыпламаваных урачоў, больш 80 сярэдніх медыцынскіх работнікаў. Вялікі ўклад у аднаўленне і развіццё сістэмы аховы здароўя зрабіў галоўны ўрач Васіль Мікалаевіч Крукаў.

Далейшае развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы раённай аховы здароўя прыпадае на 1980-я гады. У сувязі з будаўніцтвам Беларускага металургічнага завода, раней узведзенай фабрыкі штучнага футра ў горадзе рэзка ўзрасла колькасць насельніцтва, якое мела патрэбу ў медыцынскім абслугоўванні. На тэрыторыі бальнічнага гарадка былі пабудаваны паліклініка, тэрапеўтычны і хірургічны карпусы, рэканструяваны старыя памяшканні. Набывалася новае абсталяванне, мэбля, шмат што іншае, патрэбнае для нармальнага функцыяніравання лячэбнай установы раённага рангу. У верасні 1998 г. стаматалагічная паліклініка пераведзена пад адзін дах бальнічнага гарадка.

Цяпер бальніца мае хірургічнае, уралагічнае, траўматалагічнае, гастраэнтаралагічнае, пульманалагічнае, аталарынгалагічнае, афтальмалагічнае, інфекцыйнае, кардыялагічнае, неўралагічнае аддзяленні, да 12 ложкаў пашырана аддзяленне анестэзіялогіі і рэанімацыі.

Да раней існаваўшых лячэбных устаноў — Стрэшынскай гарпасялковай, Дабра-

гошчанскай, Пірэвіцкай, Чырвонабярэжскай, Майскай, Шчадрынскай участковых бальніц (сельскія бальніцы былі адкрыты раней на базе ўрачэбных участкаў) дабавілася пабудаваная пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС Кіраўская сельская бальніца і 2 сельскія ўрачэбныя амбулаторыі ў вёсках Каротквічы, Папаратнае, Нівы, Радуша. У вёсках Беліца, Малевічы, Мормаль, Сцяпы пабудаваны ФАПы. Вялікія арганізатарскія здольнасці і настойлівасць у напрамку паляпшэння аховы здароўя праявіў галоўны ўрач Уладзімір Сцяпанавіч Варабей. Ён не лічыўся з часам, рызыкаваў здароўем, быў заўжды ў пошуку, рабіў усё, каб рос і пашыраў межы бальнічны гарадок, расла яго матэрыяльная база.

Жлобінскае тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне (створана ў 1991 г.) абслугоўвае 110 тыс. чалавек горада і раёна, у тым ліку больш 30 тыс. дзяцей і падлеткаў. Аб'яднанне ўключае цэнтральную бальніцу на 545 ложкаў, дзіцячую бальніцу на 110 ложкаў, радзільны дом на 100 ложкаў, міжраённы скурна-венералагічны дыспансер на 50 ложкаў, раённую і дзіцячую паліклінікі, наркалагічны і пульмана-фтызіятрычны дыспансеры, станцыю хуткай медыцынскай дапамогі, стаматалагічную паліклініку, гарпасялковую і 7 сельскіх участковых бальніц на 25 ложкаў кожная, 4 сельскія ўрачэбныя амбулаторыі і 29 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, на правах цэхавай службы медсанчасць Беларускага металургічнага завода.

Ва ўстановах аховы здароўя раёна працуюць 282 урачы, 19 стаматолагаў і 854 спецыялісты з сярэдняй медыцынскай адукацыяй.

Сярод працаўнікоў аб'яднання шмат добрых спецыялістаў. Яшчэ да вайны пачаў свой шлях у медыцыне Аляксандр Цярэнцьевіч Татарынаў. Тады быў добрым фельчарам. Потым партызаніў, быў на фронце. Пазней скончыў медыцынскі інстытут, быў хірургам у раённай бальніцы, накапіў практычны вопыт, абараніў кандыдацкую дысертацыю. Заслужаны ўрач рэспублікі А.Ц.Татарынаў узначальвае фізіятэрапеўтычнае аддзяленне, аддае калегам свой вопыт, дапамагае парадай. Добрых слоў і павагі заслугоўваюць загадчыкі аддзяленняў: вочнага — Вольга Аляксандраўна Дамашэўская, хірургічнага — Віктар Аркадзьевіч Мардзвінаў, кардыялагічнага — Людміла Мікалаеўна Анішчанка, галоўныя ўрачы ўчастковых бальніц: Стрэшынскай — Уладзімір Сямёнавіч Казлоў, Шчадрынскай — Валянцін Апанасавіч Дзеравянка, загадчыкі ФАПаў: Малевіцкага — Валянціна Апанасаўна Емяльянава, Кіцінскага — Ніна Паўлаўна Зыкун, Лукскага — Галіна Андрэеўна Мельнікава.

З агульнай колькасці пражываючых на Жлобіншчыне 37% складаюць асобы старэй за 50 год. Смяротнасць перавышае нараджальнасць. Дэмаграфічныя паказчыкі наступныя (па гадах на 1000 чалавек: нараджальнасць 1957 г. — 16,7, 1993 г. — 19,4, 1996 г. — 10,2; смяротнасць адпаведна 7,7; 12,6; 13,7.

Нягледзячы на існуючыя кадравыя, фінансавыя і іншыя цяжкасці, калектыў аб'яднання імкнецца ўкараняць новыя метады дыягностыкі і лячэння захворванняў. Штогод, па меры магчымасці, за лік цэнтралізаваных паставак і сродкаў БМЗ закупляецца навейшае медыцынскае абсталяванне, набываюцца інструмент, лекі, перавязачныя сродкі. Па выніках работы за 1997 г. Жлобінскае ТМА заняло 2-е месца сярод тэрытарыяльных медыцынскіх аб'яднанняў вобласці.

І.І.Кавалёў.

Чарнобыль

Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі 26 красавіка 1986 г. закранула і Жлобінскі раён. 53 населеныя пункты раёна (са 156) размешчаны на тэрыторыі са шчыльнасцю забруджвання 1—5 Кі на км^2. Дзве вёскі — Праскурні і Акцябр — маюць права на адсяленне. Забруджана 35,5% сельскагаспадарчых угоддзяў раёна. Практычна поўнасцю забруджаны Лугавірнянскае, Хальчанскае лясніцтвы, у меншай ступені Чырвонабярэжскае і Дворышчанскае. Стабілізацыя радыяцыйнага становішча ў раёне адбылася да 1990 г., калі практычна не мяняўся гама-фон на мясцовасці ў бок павелічэння.

С.Квачанюк.

«Новы дзень». 1998. 23 красавіка.

Дакументы сведчаць

З ПАСТАНОВЫ КАБІНЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 116 АД 19.2.1996 г.
ПЕРАЛІК ТЭРЫТОРЫЙ (НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ І ІНШЫХ АБ'ЕКТАЎ), ЯКІЯ АДНОСЯЦЦА ДА ЗОН РАДЫЕАКТЫЎНАГА ЗАБРУДЖВАННЯ

3.1. Населеныя пункты ў зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем, дзе шчыльнасць забруджвання глеб цэзіем-137 складае ад 1 да 5 Кі/кв. км, або стронцыем-90 — ад 0,15 да 0,5 Кі/кв. км, або плутоніем-238, -239, -240 — ад 0,01 да 0,02 Кі/кв. км:

г. Жлобін, вёскі Акцябрскага сельсавета — Горкі, Грабск, Затон; Кіраўскага — Кірава, Селівонаўка, Шапарня; Луцкага — Вярбічаў, Зялёная Даліна, Чырвоная Горка, Лукі; Майскага — Аляксандраўка, Антонаўка, Асінаўка, Асое, Бабоўка, Баршчоўка, Дзяніскавічы, Даліна, Лугавая Вірня, Майскае, Малыя Казловічы, Падлессе, Цупер, Чорная Вірня; Пірэвіцкага — Баравуха, Верны, Колас, Кругавец, Любоў, Новая Слабада, Пірэвічы, Рудзенка, Салтанаўка, Скепня, Сухі Востраў, Шчытнае; Салонскі — Вялікія Рагі, Саланое, Салонская Карма; Стараруднянскага — Асінавіца, Баранаўка, Глушыца, Завад, Калыбаўка, Савецкая, Старая Рудня, Хальч, Чацвярня; Шчадрынскага — Аляксандраўка.

3.4. Населеныя пункты ў зоне з правам на адсяленне, дзе шчыльнасць забруджвання глеб цэзіем-137 складае 5 Кі/кв. км, або стронцыем-90 — менш 0,5 Кі/кв. км, ці плутоніем-238, -239, -240 — менш 0,02 Кі/кв. км, а сярэднегадавая эфектыўная эквівалентная доза апрамянення чалавека можа перавысіць 1 МэВ: вёскі Акцябрскага сельсавета — Акцябр, Праскурні.

8.1. Аб'екты, на тэрыторыі якіх шчыльнасць забруджвання глебы цэзіем-137 складае ад 1 да 5 Кі/кв. км, адпавядаюць зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем.

8.1.1. Аб'екты аздараўленчага прызначэння «Вясёлка», «Пралеска», «БМЗ» на тэрыторыі Майскага сельсавета.

8.2.2. Аб'екты Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і Аб'яднаных Узброеных Сіл СНД.

Вайсковыя часці 33469, 26447, 14848, Аб'яднаны гарадскі ваенны камісарыят, 4100-ы БМУ.

«Рэспубліка». 1996. 17 красавіка.

Хроніка вялікага перасялення

Чарнобыльская бяда здарылася як гром з яснага неба. І ўсё ж асаблівая трывога спачатку не ўзнікла. У сусветнай практыцы падобных аналагаў не было, а таму аварыя ўспрымалася як радавы выпадак, не больш. Высокае начальства не спяшалася абнародаваць ісціну. Праўда, было паведамленне Савета Міністраў тагачаснага СССР. Але яно не абвастрыла становішча. Даходзілі чуткі, якія не ўносілі ў жыццё асаблівай трывогі. Вось чаму людзі дружна выйшлі на першамайскую дэманстрацыю, адпачывалі на адкрытым паветры. Тым больш, што надвор'е было сонечнае.

У 1986 г. я працаваў намеснікам старшыні раённага выканаўчага камітэта, чуў пра аварыю, але дакладна нічога не ведаў. Толькі пазней прыйшло ўсведамленне, што здарылася найвялікшае няшчасце, якое нічым нельга паправіць.

Тэлефанаграма аб'ёмам у цэлую старонку паступіла са штаба грамадзянскай абароны вобласці на імя старшыні райвыконкама, калі ліквідатары ўжо глушылі рэактар. Была тэрмінова праведзена нарада з кіраўнікамі прадпрыемстваў і гаспадарак раёна, на якой вялася размова аб сродках індывідуальнай абароны насельніцтва і нават аб прывядзенні ў гатоўнасць калектыўных сховішчаў на той выпадак, калі ў Чарнобылі адбудзецца выбух. Потым паступіла паведамленне, што рэактар удалося заглушыць.

ВІГДОРЧЫК Барыс Яфімавіч. Нарадзіўся ў 1897 г. Машыніст лакаматыўнага дэпо (1951). Памёр у 1957 г.

ГАРОХАЎ Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся 3.3.1906 г. Машыніст паравознага дэпо (1951). Памёр у 1969 г.

ГНУТАЎ Серафім Паўлавіч. Нарадзіўся 26.9.1908 г. Старшы электрамеханік Жлобінскай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі (1951). Памёр у 1969 г.

ГУЗАЎ Яфім Адамавіч.

ДАНЦЭВІЧ Уладзімір Мікалаевіч. Нарадзіўся 13.11.1929 г. Упраўляючы райсельгастэхнікі (1971). Памёр у 1995 г.

ДАРОНІН Іван Сямёнавіч. Нарадзіўся 10.6.1903 г. Начальнік чыгуначнай станцыі ў Жлобіне (1951). Двойчы ганаровы чыгуначнік (1940, 1945). Памёр у 1994 г.

ДЗЯРЫПАСКА Ніна Мітрафанаўна. Нарадзілася 23.12.1929 г. Звеннявая саўгаса «Мормаль» (1950).

ЗАБЕЛІН Яўген Міхайлавіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо. Памёр у 1988 г.

ЗАЙЦАЎ Павел Лявонавіч.

ЗЯНЬКОВІЧ Марк Мінавіч. Нарадзіўся 1.9.1903 г. Начальнік пасажырскага аддзела Жлобінскага аддзялення Беларускай чыгункі (1951). Памёр у 1990 г.

ІГНАТОВІЧ Іосіф Арцёмавіч. Нарадзіўся 10.11.1898 г. Начальнік раённай канторы сувязі (1954). Памёр у 1982 г.

КАЗЛОЎ Мікалай Яўгенавіч. Нарадзіўся 8.12.1908 г. Дырэктар саўгаса.

КАНАПЛЯ Аляксей Васілевіч. Нарадзіўся 24.12.1923 г. Брыгадзір саўгаса «Мор-

П.Е.Бушкевіч.

А.М.Гарохаў.

І.С.Даронін.

маль». Узнагароджаны таксама 3 сярэбранымі, 4 бронзавымі медалямі ВДНГ СССР (1966). Памёр у 1996 г.

КАРНЕЕЎ Павел Савельевіч.

КАРПЕНКА Міхаіл Мікітавіч.

КАЎПАЕЎ Мікалай Рыгоравіч. Нарадзіўся 20.2.1920 г. Старшыня калгаса «Іскра» (1966, 1971).

КІРЫЛЕНКА Зінаіда Сямёнаўна. Нарадзілася 22.3.1922 г. Птушніца саўгаса «Жлобін» (1973).

КРЫШНЁЎ Анатоль Сямёнавіч.

ЛАПІЦКІ Пётр Кузьміч.

МАЙСЯЙКОЎ Фёдар Паўлавіч. Нарадзіўся 23.5.1922 г. Машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо. Ганаровы чыгуначнік (1976).

МАКОЎСКІ Станіслаў Мацвеевіч. Інжынер лакаматыўнага дэпо па навучанні кадраў.

МАКСІМАЎ Іван Каленікавіч.

МАРШЫНА Надзея Мікалаеўна. Нарадзілася 28.10.1923 г. Брыгадзір паляводчай брыгады калгаса імя Кірава (1964).

МАСКАЛЕНКА Яўхім Пятровіч. Трактарыст калгаса «1 Мая» (1978).

МЕХАНІКАЎ Яўген Максімавіч. Нарадзіўся 10.2.1930 г. Трактарыст перасоўнай механізаванай калоны № 71 (1971).

МІХАЛЬЦОВА Надзея Іванаўна.

МОХАРАЎ Павел Дзмітрыевіч. Нарадзіўся 19.11.1897 г. Начальнік аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Жлобінскага аддзялення Беларускай чыгункі (1951). Памёр у 1980 г.

НОВІКАВА Ангеліна Рыгораўна. Нарадзілася 15.5.1927 г. Даярка калгаса імя Кірава (1964).

ПРАКАПОВІЧ Іван Іванавіч. Электрамеханік дыстанцыі сігналізацыі і сувязі (1951).

РАВІЧ Георгій Мікалаевіч. Нарадзіўся 23.3.1909 г. Старшыня калгаса імя Жданава. Памёр у 1980 г.

РАДЗЕВІЧ Пракоп Аляксеевіч. Брыгадзір комплекснай брыгады па рамонту паравозаў.

РОШЧЫН Генадзь Сямёнавіч.

САЛОДКІНА Вера Лаўрынаўна. Нарадзілася 22.11.1923 г. Загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення Жлобінскай цэнтральнай раённай бальніцы (1966).

САЧЫЎКА Ева Яфімаўна. Нарадзілася 26.3.1927 г. Даярка калгаса імя Жданава (1966).

САЎЧАНКА Мікалай Ільіч. Нарадзіўся ў 1925 г. Старшыня калгаса «1 Мая» (1971).

СНЫТКОЎ Мікалай Пятровіч. Нарадзіўся 12.9.1927 г. Звеннявы па вырошчванні бульбы калгаса імя Калініна (1977).

Ф.П.Майсяйкоў.

СОЛАПАЎ Іван Іосіфавіч. Нарадзіўся 7.6.1937 г. Трактарыст саўгаса «Луцкі» (1972).

СЦЕПАВЫ Іван Дзям'янавіч. Нарадзіўся 10.6.1928 г. Трактарыст калгаса «Бярэзіна» (1977).

ШАЙДАКОЎ Міхаіл Іванавіч. Механізатар саўгаса «Шлях да камунізму».

ШАЎЦОВА Сцефаніда Пракопаўна.

ШАХРАЙ Настасся Іванаўна. Нарадзілася 25.12.1902 г. Брыгадзір тэлеграфнага цэха раённай канторы сувязі (1954). Памерла ў 1972 г.

ШКРЭД Апанас Кірылавіч. Нарадзіўся 15.9.1909 г. Рабочы цагельнага завода.

ШУПІЛА Гаўрыіл Пятровіч.

Ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

КОСЦЕЎ Міхаіл Парфір'евіч. Дырэктар СШ № 6 Жлобіна.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

БАРАНОВІЧ Іван Мацвеевіч. Загадчык райана.

РУБАХІНА Нэлі Піліпаўна. Настаўніца пачатковых класаў СШ № 1 Жлобіна.

Ордэнам Дружбы народаў

БАДЗІЛОЎСКІ Уладзімір Пятровіч. Нарадзіўся 27.7.1927 г. Трактарыст калгаса «1 Мая» (1986). Памёр у 1986 г.

БАНЬКОЎСКІ Васіль Андрэевіч. Нарадзіўся 13.7.1930 г. Брыгадзір раённага аб'яднання «Сельгасхімія» (1981).

ЗАІЧКОЎ Іван Паўлавіч. Нарадзіўся 15.1.1951 г. Шафёр саўгаса «Пірэвіцкі» (1986).

КАЗЛОВА Ксенія Іосіфаўна. Настаўніца Стрэшынскай СШ.

КАМІНСКАЯ Валянціна Васілеўна. Нарадзілася 1.6.1941 г. Даярка калгаса імя Калініна (1988).

МІНЯНКОВА Марыя Іванаўна. Нарадзілася 17.6.1928 г. Даярка племсаўгаса імя Казлова (1980).

НОВІКАЎ Мікалай Паўлавіч. Нарадзіўся 22.10.1945 г. Фрэзероўшчык цэнтральных рамонтных майстэрань аб'яднання штучнага футра (1981).

САЛАМАТАВА Іраіда Георгіеўна. Нарадзілася 1.8.1928 г. Намеснік галоўнага ўрача цэнтральнай раённай бальніцы (1981).

ЧАЙКОЎСКАЯ Марыя Дзмітрыеўна. Нарадзілася 10.12.1938 г. Даярка калгаса імя Калініна (1986).

ШЫЛАКОЎ Павел Іванавіч. Нарадзіўся 18.9.1937 г. Трактарыст саўгаса «Пірэвіцкі» (1986).

Ордэнам «знак Пашаны»

БАЙКАЧОВА Тамара Пятроўна. Дырэктар СШ № 10 Жлобіна.

ІСАЕВА Валянціна Іванаўна. Настаўніца хіміі СШ № 9 Жлобіна.

Ордэнам Працоўнай славы 3-й Ступені

АНАНЧЫКАВА Тамара Генадзеўна. Настаўніца фізікі СШ № 5 Жлобіна.

Медалём «за Працоўную Доблесць»

БЕГУНОЎ Уладзімір Рыгоравіч. Дырэктар СШ № 2 Жлобіна.

ДОРАХАЎ Уладзімір Рыгоравіч. Настаўнік Салонскай СШ.

ПАКРОЎСКАЯ Тамара Ільінічна. Настаўніца Шчадрынскай СШ.

Узнагароджаныя значком «Выдатнік народнай асветы»

АРЛОЎ Васіль Іванавіч. Нарадзіўся 15.9.1923 г. Працаваў дырэктарам СШ № 5 Жлобіна. Узнагароджаны значком «Выдатнік народнай асветы СССР» (1978).

ГРЫЦОК Мікалай Ермалаевіч. Нарадзіўся 24.12.1929 г. Працаваў намеснікам старшыні райвыканкома. Узнагароджаны значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі» (1980).

КАЗЛОВА Аксіння Іосіфаўна. Нарадзілася ў 1934 г. ў в. Глушыца Жлобінскага раёна. У 1954 г. скончыла Рэчыцкае педагагічнае вучылішча. Працавала выхавацелем Целяханскага дзіцячага дома ў Брэсцкай вобласці, настаўніцай пачатковых класаў і выкладчыкам Скяпнянскай сярэдняй школы, загадчыцай Сухавостраўскай пачатковай школы. Узнагароджана ордэнам Дружбы народаў, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларусі, значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі». Дэлегат 7-га з'езда настаўнікаў Беларусі.

Р.А.Манкевіч.

МАНКЕВІЧ Рыгор Аляксандравіч. Нарадзіўся 8.3.1936 г. ў в. Сенажаткі Рагачоўскага раёна. Скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры. Працаваў настаўнікам Радушскай і Луцкай сярэдніх школ, намеснікам дырэктара дзіцячага і юнацкага клуба фізічнай падрыхтоўкі. Заслужаны настаўнік Беларусі (1972). Узнагароджаны значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі».

ПАЛТАРАН Павел Сямёнавіч. Нарадзіўся 25.12.1915 г. Арганізатар пазакласнай і пазашкольнай работы Стрэшынскай сярэдняй школы. Узнагароджаны значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі» (1969). Памёр у 1994 г.

ПРЫЩАЎ Пётр Рыгоравіч. Нарадзіўся 21.5.1933 г. Працаваў дырэктарам Плесавіцкаслабодкаўскай васьмігадовай школы. Узнагароджаны значкамі «Выдатнік народнай асветы Беларусі» (1968), «Выдатнік народнай асветы СССР» (1987).

САЎКОВА Святлана Аляксандраўна. Нарадзілася 26.8.1940 г. Працавала настаўніцай СШ № 11 Жлобіна. Узнагароджана значкамі «Выдатнік народнай асветы Беларусі» (1977), «Выдатнік народнай асветы СССР» (1982). Лаўрэат прэміі імя Н.К.Крупскай (1986).

ШАТОЎСКІ Анатоль Канстанцінавіч. Нарадзіўся 6.3.1926 г. Працаваў інспектарам раённага аддзела народнай асветы. Узнагароджаны значкамі «Выдатнік народнай асветы Беларусі» (1964), «Выдатнік народнай асветы СССР» (1975). Памёр у 1987 г.

Узнагароджаныя Знакам ганаровы Чыгуначнік

АКАЦЭВІЧ Васіль Аляксандравіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

В.А.Акацэвіч.

А.Р.Бекарэвіч.

У.К.Ерафееў.

В.К.Зялёнка.

М.І.Каралькоў.

М.П.Краўчанка.

БАБІЧ Сяргей Васілевіч. Маняўровы дыспетчар чыгуначнай станцыі ў Жлобіне.

БАНАДЫКАЎ Фёдар Мартынавіч. Аператар дыстанцыі пуці.

БЕКАРЭВІЧ Аляксей Рыгоравіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

БУДНІКАЎ Сцяпан Іванавіч. Нарадзіўся ў 1914 г. Машыніст лакаматыўнага дэпо. Двойчы ганаровы чыгуначнік. Памёр у 1990 г.

БЯРОЗКА Міхаіл Іванавіч. Прараб ПМС-117 у Жлобіне.

ВАЛАСОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч. Дарожны майстар ПМС-117 у Жлобіне.

ВАСІЛЬЕЎ Рыгор Арцёмавіч. Нарадзіўся 5.12.1885 г. ў Жлобіне. Працаваў слесарам на ст. Верхнеудзінск (цяпер г. Улан-Удэ). За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова быў арыштаваны царскім урадам. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Гомелі, працаваў начальнікам дрэваапрацоўчага завода. З 1919 г. начальнік, упаўнаважаны Заходняй чыгункі па забеспячэнні. З 1928 г. ва Упраўленні Туркспба, з 1930 г. ў Міністэрстве шляхоў зносін. Жыў у Маскве. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1958), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1968), медалямі. *А.Елісееў.*

ГАЕЎ Аляксей Рыгоравіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

ГАРАЎЦОЎ Уладзімір Вавілавіч. Слесар вагоннага дэпо.

ГРЫШКОЎ Мікалай Міхайлавіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

ЕРАФЕЕЎ Уладзімір Канстанцінавіч. Начальнік лакаматыўнага дэпо. Старшыня Жлобінскага гарвыканкома.

ЗАРЭЦКІ Уладзімір Рыгоравіч. Начальнік аднаўленчага поезда.

ЗЯЛЁНКА Віктар Канстанцінавіч. Брыгадзір лакаматыўнага дэпо.

КАРАЛЬКОЎ Мітрафан Ісакавіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

КІРБАЛЬ Мікалай Іванавіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

КЛІНЦОЎ Іван Андрэевіч. Брыгадзір дыстанцыі пуці.

КРАЎЧАНКА Мікалай Пракопавіч. Начальнік дыстанцыі сігналізацыі і сувязі.

ЛАСОЎСКІ Аляксандр Сцяпанавіч. Начальнік ПМС-117 у Жлобіне.

ЛУК'ЯНЕНКА Аляксандр Піліпавіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

МАЙСЯЙКОЎ Фёдар Паўлавіч. Машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1976).

МАНДРЫК Міхаіл Мікалаевіч. Брыгадзір дыстанцыі пуці.

НОВІКАЎ Мікалай Іванавіч. Брыгадзір дыстанцыі пуці.

ПЕРАГУДА Пётр Рыгоравіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

ПЯКАРСКІ Яўген Анатольевіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

А.П.Лук'яненка.

П.Р.Перагуда.

А.Я.Пякарскі.

М.Г.Сураднаў.

САЛАНЧУК Генадзь Пятровіч. Электрамеханік дыстанцыі сігналізацыі і сувязі.

СКРЫННІКАЎ Міхаіл Фёдаравіч. Слесар вагоннага дэпо.

СУРАДНАЎ Мікалай Георгіевіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

СЯРГЕЕЎ Іван Сяргеевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. Машыніст лакаматыўнага дэпо. Двойчы ганаровы чыгуначнік.

ТКАЧОЎ Валерый Васілевіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

ХРОМАЎ Павел Іларыёнавіч. Слесар вагоннага дэпо. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

ЦВЯРДОЎСКІ Яўген Іванавіч. Аглядчык вагонаў.

ЦІМОХАЎ Мікалай Антонавіч. Слесар вагоннага дэпо.

ЦЭЛІКАВЕЦ Мікалай Фёдаравіч. Машыніст лакаматыўнага дэпо.

ШАРНІКАЎ Іван Яфрэмавіч. Дарожны майстар дыстанцыі пуці.

ШАРЦ Пётр Антонавіч. Нарадзіўся ў 1913 г. Машыніст лакаматыўнага дэпо. Двойчы ганаровы чыгуначнік. Памёр у 1985 г.

І.С.Сяргееў.

Л.В.Арлоў.

ШАТАЎ Яўген Пятровіч. Саставіцель паяздоў станцыі Жлобін.

ШАЎЦОЎ Васіль Ільіч. Дзяжурны па станцыі Жлобін.

ШКОДА Мікалай Герасімавіч. Майстар дыстанцыі пуці.

ІМІ ГАНАРЫЦЦА ЖЛОБІНШЧЫНА

АРЛОЎ Леанід Васілевіч. Нарадзіўся 15.2.1952 г. ў Жлобіне. Кандыдат эканамічных навук (1983). У 1974 г. скончыў БДУ, дзе працаваў выкладчыкам кафедры палітэканоміі. З 1978 г. ў Мазырскім дзяржаўным інстытуце, з 1977 г. загадчык кафедры гісторыі і паліталогіі гэтага інстытута. Асноўныя навуковыя працы па праблемах удасканалення гаспадарчага механізму, фінансах, гісторыі Палескага рэгіёна. *Л.Лісоўскі.*

БАЖАНАЎ Мікалай Данілавіч. Нарадзіўся 2.5.1899 г. ў Жлобіне. Скончыў Кіеўскі інстытут народнай гаспадаркі. Працаваў інжынерам-эканамістам. Член Саюза пісьменнікаў СССР. Друкавацца пачаў у 1930-я гады. Цікавасць Мікалая Данілавіча да мастацтва, музыкі, асоб і творчасці славутых музыкантаў доўга не рэалізоўвалася ў буйныя творы. У 1962 г. ў выдавецтве «Маладая гвардыя» ў серыі «Жыццё выдатных лю-

дзей» выйшла яго кніга «Рахманінаў», 2-е выданне ў 1966 г., у 1971 г. пра рускага кампазітара С.І.Танеева. Жыў у г. Ромны Сумскай вобласці. Памёр 13.1.1985 г.

БАШЫЛАЎ Міхаіл Сяргеевіч. Нарадзіўся 3.1.1821 г. ў Жлобінскім раёне. Мастак. Скончыў Харкаўскі універсітэт (1844). У 1859 г. адкрыў вячэрнія рысавальныя класы пры Кіеўскім універсітэце. У 1866—70 гг. інспектар Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства. Пісаў партрэты, палотны на беларускія і ўкраінскія тэмы, ілюстраваў класічныя творы рускай (ілюстрацыі да камедыі А.Грыбаедава «Гора ад розуму», 1862) і ўкраінскай літаратур. Найбольш вядомыя партрэты: бацькі (1838), С.Бяленкі, украінскіх пісьменнікаў І.Катлярэўскага і Р.Квіткі-Аснаўяненкі (1840-я г.); жанравыя карціны: «Прыйшло пісьмо ад сына» (1854), «Наймічка» (1857), «Селянін у бядзе» (1866). Памёр 29.11.1870 г.

БІРУКОЎ Фёдар Раманавіч. Нарадзіўся ў в. Рэкта Жлобінскага раёна. З 1914 г. на Балтыйскім флоце, сувязіст, служыў на баявых караблях. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г., 1-й сусветнай, грамадзянскай войнаў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны працаваў на торфабрыкетным заводзе. *М.В.Шуканаў.*

М.Башылаў. Ілюстрацыя да камедыі А.Грыбаедава «Гора ад розуму». 1862.

Г.В.Говар.

М.М.Данілаў.

ГАСПАДАРОЎ Піліп Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1865 г. ў в. Забаб'е былой Старарудзянскай вобласці (цяпер Буда-Кашалёўскі р-н) Гомельскай вобласці. Беларускі і рускі казачнік. У 1905 г. за ўдзел у сялянскім выступленні на Магілёўшчыне сасланы пажыццёва ў Алонецкую губерню (в. Шуя). У 1907 г. пасяліўся ў Петразаводску, дзе працаваў кавалём на Аляксандраўскім заводзе. Казачны рэпертуар засвоіў у дзяцінстве ад аднавяскоўца, прыгоннага селяніна К.К.Шаўцова. У 1937 г. запісана ад яго 106 казак, прыказкі, загадкі. Традыцыйная для беларускага казачнага эпасу антыпамешчыцкая, антырэлігійная і антыклерыкальная накіраванасць характэрна і для казак П.П.Гаспадарова («Салдацкія сыны», «Пра дурнога Амелю», «Пра залатое яечка», «Поп і работнік», «Каваль і поп», «Праўда пра святога Феадосія» і інш.). Памёр 9.7.1938 г.

ГОВАР Генадзь Васілевіч. Нарадзіўся 23.3.1945 у Жлобіне. Беларускі графік і жывапісец. Бацькі Васіль Міхайлавіч і Вольга Якімаўна родам з в. Кароткавічы. Вучыўся ў Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту (1962—63), Мінскім мастацкім вучылішчы (1963—64). Скончыў Каўнаскі тэхнікум прыкладнога мастацтва (1970). Працаваў на Гомельскім камбінаце «Мастацтва». Удзельнік мастацкіх выставак з 1967 г. Асноўныя работы: «Цішыня», «Падводнае паляванне», «Па веснавой вадзе», «Паводка», «Гомельскі парк», «Рэчышча Сожа», «На Палессі ціха-ціха», «На Іпуці», «Беларускі паэт Міхась Башлакоў», «Рускі пісьменнік Юрый Фатнеў», «Бэз», «Возера Бе-

лае», цыкл графічных лістоў «Асэнсаванне часу» і інш. Творы знаходзяцца ў фондах Беларускага саюза мастакоў, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, Гомельскім абласным, Жлобінскім, Мозырскім, Калінкавіцкім і Тураўскім краязнаўчым музеях, а таксама ў прыватных калекцыях многіх краін свету. Многія работы падораны мастаком Жлобінскаму краязнаўчаму музею. Аўтар зборніка вершаў «Мае абпаленыя крылы» (1988).

ДАНІЛАЎ Мацвей Максімавіч. Нарадзіўся ў в. Старая Рудня Жлобінскага раёна. Доктар біялагічных навук, прафесар. Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Жыў і працаваў у Ленінградзе. Навуковыя працы па ветэрынарыі і мікрабіялогіі. Памёр на 62-м годзе жыцця. Пахаваны ў в. Старая Рудня.

А.П.Капусціп.

ДОБІН Рыгор Ізраілевіч. Нарадзіўся ў 1910 г. ў Жлобіне. Пісьменнік. Доўгі час жыў і працаваў у Мінску, пасля ў Маскве. Літаратурнае жыццё пачаў у 1920-я гады. Выдаў зборнікі «Каля млына» (1931), «Каля Амура» (1939). «На пчальніку» (1941), «Шляхі зямныя» (1983) і інш. У яго творах услаўляецца чалавек і зямное жыццё.

А.П. Капусціп.

ЖОЛТАК Валяр'яна Канстанцінаўна. Нарадзілася 13.12.1919 г. ў Жлобіне. Беларускі жывапісец. Скончыла Віцебскае мастацкае вучылішча (1939). Вучылася ў У.Хрусталёва, У.Ахрэмчыка. У 1939—51 гг. мастак-дэкаратар Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1946 г. Працавала ў станковым жывапісе, у жанрах карціны, партрэта, пейзажа, нацюрморта. Стыхія мастачкі — колер, яна яго адчувае тонка і востра. Палітра яе разнастайная і маляўнічая: ад магутных мажорных каляровых сугучнасцяў да тонкіх спалучэнняў паўтаноў. Тэме Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны творы «За дапамогай да партызан», «Вяртанне», «Вораг прайшоў», «Пасля блакады» і інш. Лірычныя вобразы прыроды стварыла ў карцінах «Разліў на Бярэзіне», «Красавік», «Вязынка», «Пачатак кастрычніка», «Апошні снег», «Вяча», «Зялёны май», «Восеньская сімфонія», «Бярозавыя карункі», «Полацк. Спаса-Ефрасіннеўская царква». Мір і спакой на зямлі жывуць у пейзажах і нацюрмортах «Сон-трава», «Званочкі лясныя», «Макі», «Бэз», «Белы нацюрморт», «Восеньскія кветкі», «Чырвоная рабіна», «Восеньскае лісце», «Нацюрморт з рабінай», «Бэзавы май», Сухія кветкі», «Акаліт», «Успаміны пра лета» і інш. Член Беларускага Саюза мастакоў з 1948 г. Яе творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску. Памерла 14.5.2000 г., пахавана ў Мінску. *Г.А.Фатыхава.*

Х.Жычка.

ЖУРАЎЛЁЎ Дзмітрый Мікалаевіч. Нарадзіўся 20.5.1915 г. ў Жлобіне. Беларускі музыказнавец, кантрабасіст. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1968). Вучыўся ў Беларускай кансерваторыі (1944—47). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1931 г. працаваў у Беларускім ансамблі народных інструментаў і сімфанічным аркестры Беларускага радыё, у 1937—41 і 1944—60 гг. у сімфанічным аркестры Беларускай філармоніі, з 1956 г. рэдактар, у 1964—70 гг. галоўны рэдактар музычнага вяшчання Беларускага радыё, у 1972—75 гг. у музычнай рэдакцыі выдавецтва «Беларусь». Аўтар даведнікаў «Кампазітары Савецкай Беларусі» (1966) і «Саюз кампазітараў БССР» (1978), біяграфічных нарысаў пра Л.Абеліёвіча, М.Аладава, Г.Вагнера, Дз.Лукаса, І.Любана, П.Падкавырава, Р.Пукста, Ю.Семяняку, А.Туранкова, Я.Цікоцкага, М.Чуркіна, творчых партрэтаў майстроў сцэны, у тым ліку Л.Александроўскай, З.Бабія, С.Данілюк, М.Дружыны, С.Друкер, М.Зюванава, В.Мальковай, В.Чарнабаева, больш за 300 музычных тэле- і радыёперадач. Памёр 1.3.1988 г.

ЖЫЧКА Хведар Дзмітрыевіч. Нарадзіўся 20.3.1927 г. ў пас. Марс Жлобінскага раёна. Беларускі пісьменнік. У 1944—51 гг. служыў у Савецкай Арміі. Працаваў у рэспубліканскіх газетах і часопісах. У 1959 г. скончыў завочна Літаратурны інстытут імя М.Горкага ў Маскве і з 1960 г. працаваў у выдавецтве «Беларусь». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Друкуецца з 1947 г. Першы

зборнік вершаў «Стой на вахце, сэрца» (1961). Паэзіі Жычкі ўласціва эмацыянальная стрыманасць, традыцыйныя вобразна-выяўленчыя сродкі. Цікавасць да станаўлення характару юнага героя з'яўляецца галоўным у творах для дзяцей (аповесць пра Айчынную вайну «Зброю бяруць сыны» і інш.). Перакладаў на беларускую мову творы А.Міцкевіча, І.Франка, Лесі Украінкі, Я.Райніса, М.Ціханава і інш. Выдаў кнігі: «Каштанавы «Масквіч» (1959), «Піфагоравы штаны» (1961), «Мы будзем жыць у вёсцы Сонечнай» (1963), «Росныя лілеі» (1965), «Паспелі суніцы» (1966), «Дзе растуць бяссмертнікі» (1967), «Настой» (1968), «Букет вяргіняў» (1970), «Мая вуліца» (1970). Жыве ў Мінску.

КАВЯЗІН Мікалай Аляксандравіч. Нарадзіўся 15.9.1898 г. ў Жлобіне. Беларускі рэжысёр, педагог, мастак, тэатральны дзеяч. Заслужаны артыст Беларусі (1949). У грамадзянскую вайну быў акцёрам 2-й вандроўнай трупы пры Галоўпалітасвеце. Потым працаваў выкладчыкам чарчэння і малявання ў школах Мінска. У 1931—37 гг. мастацкі кіраўнік створанага ім у Мінску Беларускага тэатра юнага гледача імя Крупскай. У 1939—41 гг. мастацкі кіраўнік Белдзяржэстрады, з 1944 г. — Палескага тэатра імя Я.Купалы (г. Мазыр), з 1945 г. — Бабруйскага абласнога драматычнага тэатра, з 1947 г.— Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра.

Пастаноўкі М.А.Кавязіна вызначаліся дакладнай формай, выразным раскрыццём ідэі твора. Рэжысёр і мастак спектакляў: «На штурм» Я.Маўра (1931), «Наш» М.Зныка (1932), «Шлях далёкі» М.Шастакова (1934), «Заложнікі» А.Кучара (1944), «Без віны вінаватыя» (1945) і «Праўда добра, а шчасце лепш» (1946) А.Астроўскага, «Сын» С.Паташова (1948), «На дне» М.Горкага (1950). Рэжысёр спектакляў: «Дружына» А.Бруштэйн (1935), «Мікола Гоман» В.Сташэўскага і «Ная» М.Зарэцкага (абодва 1936), «Дама-невідзімка» П.Кальдэрона (1947), «Ракавая спадчына» Л.Шэйніна (1949) і інш. Памёр 9.3.1950 г., пахаваны ў Гродна.

КАЗЯТНІКАЎ Пётр Іванавіч. Нарадзіўся 13.1.1882 г. ў в. Малыя Рагі Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, цяпер у Жлобінскм раёне. Кавалер 4-х Георгіеўскіх крыжоў. З сялян. У 1903 г. прызваны ў армію. Удзельнік руска-японскай вайны 1904—05 гг., за баявыя заслугі і ўдзел у Мукдэнскіх баях (1905) прысвоена званне малодшага унтэр-афіцэра. З 1907 г. на звыштэрміновай службе. У 1-ю сусветную вайну на Паўночна-Заходнім фронце, 6.5.1915 г. за адвагу ў баях уведзены ў афіцэры, у сакавіку 1917 г. прадстаўлены да чына штабс-капітана, камандаваў узводам, ротай. За асабістую мужнасць і гераізм у баях узнагароджаны Георгіеўскім крыжамі: 7.8.1914 г. — 4-й ступені, 25.9.1914 г. — 3-й ступені, 23.10.1914 г. — 2-й ступені, 26.10.1914 г. — 1-й ступені. Узнагароджаны таксама ордэнамі святой Ганны 4-й і 3-й ступеней, святога Станіслава 3-й ступені з мячамі і бантам. Памёр ад ран 5.10.1917 г.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1997. Т. 4. С.14.

КАПУСЦІН Аляксандр Пятровіч. Нарадзіўся 12.2.1924 г. ў в. Старая Рудня Жлобінскага раёна. Беларускі пісьменнік. У Вялікую Айчынную вайну ўзначальваў камсамольска-маладзёжную падпольную групу, потым быў камандзірам аддзялення партызанскага атрада імя Будзённага Гомельскага злучэння. З лістапада 1943 г. ў Чырвонай Арміі. У 1955 г. скончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут, у 1959 г. Вышэйшыя юрыдычныя курсы ў Маскве. Працаваў у органах юстыцыі, загадчыкам аддзела рэдакцыі газеты «Гомельская праўда», загадчыкам рэдакцыі навукі і культуры БелТА, намеснікам галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, член Саюза журналістаў Беларусі. Друкавацца пачаў з 1943 г. Першы зборнік прозы «Суд ідзе» (1959). У творах узнімаў маральна-этычную і прававую праблематыку сучаснасці: зборнікі аповесцей, апавяданняў, нарысаў «Суд вырашыў...» (1975), «Скажу праўду» (1979), «Быць чалавекам» (1981), «Дружба вывела да зорак» (1985), «На хвалях Нявы» (1992) і інш. Пісаў гумарэскі, нарысы і апавяданні, публіцыстычныя артыкулы. Перакладаў з рускай і польскай моў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й, 2-й ступе-

А.П.Капусцін. Мастак Г.Говар.

ней, медалём «За адвагу», Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі, значком «Выдатнік друку». Званне ганаровага грамадзяніна горада прысвоена 25.5.1983 г. Жыў у Мінску. Памёр 16.10.1996 г. У 1999 г. ў Жлобіне выдадзена кніга «Аляксандр Капусцін. Старонкі памяці».

КАПЧЫК Пятрусь Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1944 г. ў Жлобіне. Беларусі журналіст, публіцыст, педагог. Працаваў у кніжным гандлі, вучыўся ў БДУ на факультэце журналістыкі, потым у Махачкале ў мясцовым універсітэце на філалагічным факультэце. Працаваў у газеце «Кулябская правда» (Таджыкістан), з 1983 г. жыве ў г. Ізяслаў, Украіна, настаўнічае. Аўтар мастацкіх твораў (апавяданняў, гумарэсак) на беларускай мове. Выступае ў друку з публіцыстычнымі артыкуламі па праблемах развіцця беларускай культуры, мовы.

КАРАБАНАЎ Ігар Арсеньевіч. Нарадзіўся 22.6.1937 г. ў в. Мормаль Жлобінскага раёна. Беларускі журналіст, педагог. Кандыдат біялагічных навук, дацэнт. Узнагароджаны значком «Выдатнік народнай асветы БССР» (1982). У 1959 г. скончыў Гомельскі педінстытут. З 1966 г. працаваў у Гомельскім універсітэце, з 1975 г. — Гомельскім абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, з 1977 г. — Мазырскім педагагічным інстытуце (з 1990 загадчык кафедры).

І.А.Карабанаў — адзін з аўтараў кніг па працоўным навучанні для вучняў сярэдніх класаў «Технический труд, 4—6» (1984, 1985, 1986) і «Технический труд, 7—8» (1985, 1986). Напісаў адзін з двух асноўных раздзелаў «Апрацоўка драўніны». Пазней узначаліў аўтарскі калектыў па стварэнні другога пакалення навучальных дапаможнікаў «Працоўнае навучанне» для 5—7 класаў у гарадскім і сельскім варыянтах на рускай і беларускай мовах (9 кніг), дзе напісаў два раздзелы «Тэхналогія апрацоўкі драўніны» і «Рамонтныя работы ў быту», за што быў узнагароджаны сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1991). На базе названых дапаможнікаў пад кіраўніцтвам І.А.Карабанава былі выдадзены першыя ў Беларусі падручнікі па тэхнічнай працы «Трудовое обучение, 5—7» і «Працоўнае навучанне 5—7» (1992), «Працоўнае навучанне, 8—9» (1994). Пад рэдакцыяй І.А.Карабанава выдадзены «Справочник по трудовому обучению 5—7»(1992), «Справочник по трудовому обучению: Сельскохозяйственные работы» (1994), «Витамины и фитогормоны в жизни растений» (1997), падручнік «Технология обработки древесины, 5—9» (1995, 1997, 1999) і інш. Аўтар больш

Г.А.Карабанаў.

Л.В.Курціна.

за 130 навуковых прац, у т.л. 24 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, 4 манаграфій, 2 кніг для настаўнікаў, шэрагу метадычных рэкамендацый, артыкулаў. І.А.Карабанаў — аўтар зборніка паэзіі «Асабістае» (Віцебск, 1997). З'яўляецца замежным членам-супрацоўнікам навукова-метадычнага Цэнтра па працоўна-політэхнічнай адукацыі Рэспублікі Балгарыі (г. Благоеўград), членам навукова-метадычнага Савета краін СНГ па тэхналагічнай адукацыі (г. Бранск).

Л.Лісоўскі.

КІРЫЛЕНКА Валянцін Антонавіч. Нарадзіўся 25.12.1928 г. ў в. Кругавец Жлобінскага раёна. Беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У 1957 г. скончыў Львоўскі інстытут прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва. Вучыўся у Т.Паражняка, М.Бяляева. Удзельнік мастацкіх выставак з 1957 г. У 1957—95 гг. працаваў на Мінскім фарфоравым заводзе ў галіне прыкладнога мастацтва (фарфор). На аснове народных традыцый распрацоўваў для масавай вытворчасці ўзоры ваз, дэкаратыўных шклянак, гарлачоў, графінаў, чайных сервізаў і інш. Адзін з першых на Беларусі адрадзіў размалёўку солямі металаў. Асноўныя творы: дэкаратыўныя вазы «40 год БССР», «50 год Кастрычніцкай рэвалюцыі», «60 год СССР», вазы для кветак «Васількі», «Колас», «Ваўчок», «Кастрычнік», «Кветкі», «Народная», «Перамога», «Блакітная», «Усход» і інш., чайны сервіз «Блакітныя лісты», набор графінаў для лікёру і інш. Член Беларускага Саюза мастакоў з 1964 г. Яго творы экспанаваліся на ВДНГ у Маскве, Балгарыі, Чэхіі, Германіі, Канадзе. Памёр 3.7.1995 г. Пахаваны ў Мінску.

Г.А.Фатыхава.

КУРЦІНА Людміла Васілеўна. Нарадзілася ў 1941 г. ў Жлобіне. Друкуе вершы на старонках раённай газеты «Новы дзень».

І.Ц.Сасна.

А.Н.Сеўчанка.

МАРКАВЕЦ Аляксей Фаміч. Нарадзіўся на Жлобіншчыне. Кандыдат гістарычных навук. У Вялікую Айчынную вайну разам з маці знаходзіўся ў Азарыцкім лагеры смерці, маці там загінула. Пасля вайны выхоўваўся ў Нараўлянскім дзіцячым доме. Скончыў Львоўскае ваенна-палітычнае вучылішча. Працаваў у дывізіённай газеце.

МАРУШКЕВІЧ Мікалай Цімафеевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Саланое Жлобінскага раёна. Беларускі журналіст, публіцыст. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1968). Працаваў у Жлобінскай райгазеце, «Чырвонай змене», «Сельскай газеце» быў кіраўніком БелТА. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеней, 2 ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі. Памёр у 1994.

МІХАЙЛОЎСКІ Барыс Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1936 г. ў Жлобіне. У Вялікую Айчынную вайну быў вязнем нямецкіх канцлагераў. З 1965 г. жыве ў г. Варонеж. Член Саюза расійскіх пісьменнікаў «Воінская садружнасць». Аўтар кнігі вершаў «Поздние рассветы», сааўтар шматлікіх паэтычных зборнікаў. Перакладае на рускую мову творы беларускіх паэтаў М.Танка, А.Зарыцкага, Л.Дайнекі, К.Кірыенкі і інш. *М.В.Шуканаў.*

РАГАЎЦОЎ Васіль Іванавіч. Нарадзіўся ў 1952 г. ў г.п. Стрэшын Жлобінскага раёна. Беларускі паэт. Кандыдат філалагічных навук. Вершы друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Маладосць», «Роднае слова», «Першацвет», газетах «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена». У 1995 г. выдаў зборнік «Сутонне» (у серыі «Бібліятэка часопіса «Маладосць»). Аўтар кніг і артыкулаў па праблемах мовазнаўства. Жыве ў Магілёве, загадчык кафедры беларускай мовы пединстытута.

РАМАНЕНКА Аляксей Якаўлевіч. Нарадзіўся ў в.Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна. З 1915 г. ў арміі. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. З 1932 г. да выхаду на пенсію працаваў у райспажыўсаюзе ў Жлобіне. *У.В.Штапенка.*

САСНА Ірына Цітаўна. Нарадзілася ў 1938 г. ў в. Пірэвічы Жлобінскага раёна. У 1960 г. скончыла Гомельскі пединстытут. Працавала ў Пірэвіцкай сярэдняй школе. Друкуе вершы на старонках газеты «Новы дзень».

СЕЎЧАНКА Антон Нічыпаравіч. Нарадзіўся 22.2.1903 г. ў в. Дзяніскавічы Жлобінскага раёна. Беларускі фізік, акадэмік АН БССР (1953), доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар (1953). Герой Сацыялістычнай Працы (1971), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1967). У 1932 г. скончыў БДУ. У 1934—53 гг. старшы навуковы супрацоўнік, намеснік начальніка лабараторыі ў Дзяржаўным аптычным інстытуце ў Ленінградзе, з 1953 г. загадчык сектара фізікі і матэматыкі Фізіка-тэхнічнага інстытута АН БССР і адначасова загадчык кафедры фізічнай оптыкі БДУ. У 1955—57 гг. дырэктар Інстытута фізікі і матэматыкі АН БССР, адначасова ў 1955—70 гг. загадчык лабараторыі люмінесцэнцыі Інстытута фізікі АН БССР. У 1957—72 гг. рэктар БДУ, у 1972—78 гг. дырэктар навукова-даследчага інстытута, прыкладных фізічных праблем БДУ. У 1957—73 гг. член Прэзідыума АН БССР. Навуковыя працы па люмінесцэнцыі рэдкіх зямель, спектраскапіі ураніларых злучэнняў, спектраскапіі і фотахіміі парфірынаў і біялагічна актыўных злучэнняў. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1958—62 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1955—59 гг., 1963—75 гг.

Памёр А.Н.Сеўчанка 26.9.1978 г. Пахаваны ў Мінску на Усходніх могілках. У Мінску на доме, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка. Яго імя прысвоена навукова-даследчаму інстытуту прыкладных фізічных праблем БДУ.

СОДАЛЬ Уладзімір Ільіч. Нарадзіўся 13.9.1937 г. на Жлобіншчыне, в. Мормаль. Беларускі пісьменнік. Бацька загінуў на фронце ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля сканчэння Мормальскай школы працаваў загадчыкам клуба ў роднай вёсцы, быў сакратаром камсамольскай арганізацыі. У 1956—58 гг. жыў у Мурманску, працаваў на

заводзе токарам, электрыкам, землякопам. З 1958 г. студэнт Мінскага педагагічнага інстытута, з 1961 г. працаваў у Астрашыцкім сухотным санаторыі і вучыўся ў інстытуце. З 1967 г. на Беларускім тэлебачанні, рэдактар тэлечасопіса «Роднае слова». З 1990 г. ў часопісе «Мастацтва Беларусі», намеснік галоўнага рэдактара. У 1977 г. выйшла першая кніжка «Людзьмі звацца», потым «Пуцявінамі сейбіта» — пра Янку Купалу (выдала газета «Голас Радзімы»). Выдаў кнігу-альбом «Францішак Бенядзікт Багушэвіч» (1986), кнігі «Кушлянскі кут» (1990), «Сцежкамі Мацея Бурачка» (1991), «Жупранская старонка» (1991), «Тут бачу свой край» (1994), «Свіранскія крэскі» (1995). Укладальнік твораў Ф.Багушэвіча «Мая дудка» (1987), «Каму дудка паслушна» (1990), «Францішак Багушэвіч» (разам з Я.Янушкевічам; 1991), аўтар навучальных дыяфільмаў «Праўдашукальнік» (пра Ф.Багушэвіча), «Дудар беларускі» (1997, пра В.Дуніна-Марцінкевіча), «Кастусь Каліноўскі».

У.І.Содаль — адзін з буйнейшых даследчыкаў жыцця і творчасці Ф.Багушэвіча. Упершыню сабраў і прывёў ў пэўную сістэму звесткі пра ўсіх Багушэвічаў, іх суседзяў. Упершыню як след вывучаны ацалелыя аўтографы вершаў паэта. Вядомы беларускі даследчык Алесь Карлюкевіч лічыць У. Содаля «акадэмікам у беларускім літаратурным краязнаўстве», «Беларуская думка» № 12, 1998 г. Мусіць, невыпадкова ўзяў сабе за літаратурны псеўданім назву роднага мястэчка — Мормальскі, Уладзімір Мормальскі.

М.В.Шуканаў.

ТАМКОЎ Леў Мікалаевіч. Нарадзіўся 2.8.1937 г. ў Жлобіне. Беларускі архітэктар. Заслужаны архітэктар Беларусі (1976). Скончыў БПІ (1960). З 1969 г. галоўны архітэктар інстытута Гомельграмадзянпраект. Асноўныя работы ў Гомелі: праекты планіроўкі і забудовы мікрараёнаў і жылых раёнаў (№ 1, Фестывальны і інш., 1960—1970-я гады; адзін з аўтараў), рэстаран «Беларусь», аэравакзал (1969), Інстытут механікі металапалімерных сістэм АН БССР (1972), Дом палітасветы (1977, адзін з аўтараў), жылыя дамы па вул. Савецкай і Кожара (1979) і інш.; мемарыяльны комплекс на брацкіх магілах байцоў народнага апалчэння ў парку імя Луначарскага (1975, з У.Кузьменка, скульптарам Г.Гарбанёвым).

ФЕДАСЕЕНКА Уладзімір Канстанцінавіч. Нарадзіўся 22.4.1926 г. ў пас. Бор Жлобінскага раёна. Беларускі пісьменнік. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1941 падпольшчык, у 1942 г. партызан атрада «Смерць фашызму», з вясны 1943 г. камандзір дыверсійнай групы партызанскага атрада імя Жукава брыгады імя Панамарэнкі, што дзейнічалі ў Жлобінскім раёне. Скончыў Гомельскі рачны тэхнікум (1946), Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1950). Быў інструктарам Гомельскага абкома камсамола (1946—50), ЦК ЛКСМБ (1950—51). У 1951—67 гг. працаваў на розных пасадах у газеце «Піянер Беларусі», часопісе «Сельская гаспадарка Беларусі», «Настаўніцкай газеце», рэдактарам выдавецтва «Беларусь», у 1969—79 — старшым інспектарам Упраўлення кніжнага гандлю Дзяржкамітэта БССР па друку, загадчыкам аддзела газеты «Літаратура і мастацтва», старшым рэдактарам часопіса «Беларусь». Аўтар раманаў «Дубовая града» (1965), «Віхры на скрыжаваннях» (1970), «Пасля смерчу» (1975), «Мутныя росы» (1999). Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.



У.К.Федасеенка.

ЧАПКАСАВА Людміла Мікалаеўна. Нарадзілася ў г. Новакузнецк Кемераўскай вобласці. Жыве ў Жлобіне. Самадзейная мастачка. Па адукацыі інжынер. Піша з натуры ў асноўным алеем і часткова акварэллю. Асноўныя работы: «Мая Сібір», «Раніца на Міжземным моры», «Італьянскі пейзаж», «Альпійскае возера», «Сінявокая Беларусь», «На рацэ Бярэзіне».

ЦЫРКУНОЎ Аляксандр Іванавіч. Нарадзіўся 28.3.1948 г. ў в. Лясань Жлобінскага раёна. Беларускі жывапісец. У 1976 г. скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Вучыўся ў П.Крохалева. М.Данцыга, Б.Аракчэева, Х.Ліўшыца. У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1976 г. Працуе ў сю-

А.Цыркуноў. Міхал Клеафас Агінскі. 1995.

жэтна-тэматычнай карціне, жанрах партрэта, пейзажа, нацюрморта. Палотны Цыркунова вызначаюцца псіхалагізмам, сціпласцю і дакладнасцю жывапісных сродкаў, удалым вырашэннем тэмы выяўленча-пластычнымі сродкамі. Асаблівую ўвагу надае гістарычнай тэме сваёй Айчыны, гераічнаму і філасофскаму. Найбольш значныя: трыпціхі «Пад звяздою Палыні», «Лявоніха», «Свята», карціны «Самавызначэнне», «Гусляр», «Дудары», «Двое», «Бульба», «Спас-Ефрасіння», «Покліч», «На ростанях», «Памяці У.Караткевіча», «Плашчаніца», партрэты «Веткаўчанін Ф.Шкляраў», мастака Б.Звінагродскага, «Сустрэча сяброў (Я.Купала і Я.Колас)», «Цётка Насця», «Гасцінная Алеся», К.Чорнага, «Першадрукар — Ф.Скарына», «Міхаіл Клеафас Агінскі», «Паўстанец Сокал-Кутылоўскі», пейзажы «Краявід з месяцам», «Крыніца», «Пасля навальніцы», «Вострая брама», «Над неспакоем», нацюрморты «Кволыя кветкі», «Сланечнікі», «Спрадвечнае», «Белая мелодыя», «Перагуды вясны», «Гарачыя прылады» і інш. Член Беларускага Саюза мастакоў з 1983 г. Яго творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, фондах БСМ, Магілёўскім мастацкім музеі імя П.В.Масленікава.

Г.А.Фатыхава.

ЧАВУСКІ Міхась (Майсей) Моталевіч. Нарадзіўся 25.12.1904 г. ў в. Майскае Жлобінскага раёна. Беларускі пісьменнік. Вучыўся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі ў Ленінградзе (1934—37). Працоўную дзейнасць пачаў у 1917 г. наборшчыкам у друкарні ў Жлобіне. З 1924 г. рабочы ў адной з друкарняў Мінска. З 1926 г. ў Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у Белспажыўсаюзе. У 1935—37 гг. на партыйнай рабоце, потым загадчык аддзела ў рэдакцыях газет «Советская Белоруссия», «Звязда», рэдактар мінскай раённай газеты «Шлях сацыялізма», інструктар ЦК КП(б)Б. У 1938—41 гг. галоўны рэдактар БелТа. У Вялікую Айчынную вайну адказны рэдактар сатырычнага выдання ЦК КП(б)Б «Раздавім фашысцкую гадзіну», з 1943 г. рэдагаваў лістоўку-плакат Вілейскага падпольнага абкома КП(б)Б «Партызанскае слова». У 1944—47 гг. намеснік старшыні і галоўны рэдактар Камітэта радыёфікацыі і радыёвяшчання пры СМ БССР. У 1947—67 гг. працаваў у часопісе «Вожык» (у 1947—55 рэдактар). У 1964—70 гг. узначальваў Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР.

Друкавацца пачаў у 1940 г. Пісаў сатырычныя і гумарыстычныя апавяданні, фельетоны, гумарэскі. Аўтар зборнікаў апавяданняў, аднаактовак і сцэнак «Крытычны момант» (1954), «Індык на курорце» (1960), «Рука руку мые» (1964), «Чаму ж не смяяцца» (1969), «Стрэлены Вераб'ёў» (1976), дакументальнай аповесці «Фарбамі гневу» (1975). У творах высмейваў мяшчанства, кар'ерызм, двурушніцтва, бюракратызм, падхалімства. Памёр 1.7.1984 г. Пахаваны ў Мінску на Паўночных могілках.

ШАВЫРКІН Міхась Мікалаевіч. Нарадзіўся 15.9.1947 г. ў в. Дзяніскавічы Жлобінскага раёна. Беларускі журналіст, педагог. Узнагароджаны значком «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1996). Скончыў БДУ (1970), Мінскую ВПШ (1976). З 1965 г. працаваў у раённай газеце «Камуніст», з 1972 г. — навуковым, старшым навуковым рэдактарам выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя», з 1983 г. рэдактар аддзела часопіса «Народная асвета», з 1987 г. галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова». Член рады Саю-

М.М.Шавыркін.

Дз.П.Шаўцоў.

за фальклярыстаў Беларусі. Выступае ў друку па праблемах выхавання і навучання, па пытаннях тэралінгвістыкі. Актыўна прапагандуе беларускія песні і песні народаў Беларусі.

ШАЎЦОЎ Дзмітрый Пятровіч. Нарадзіўся ў 1897 г. ў Жлобіне. Удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай, савецка-польскай 1920 г. войнаў. З 1923 г. ў Чырвонай Арміі, з 1930 г. служыў на Чарнаморскім і Ціхаакіянскім флатах. З 1938 г. працаваў у Жлобінскім паравозным дэпо, намеснік начальніка, сакратар партарганізацыі. З 1961 г. на пенсіі. Памёр у лістападзе 1987 г. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі, медалямі.

Спартыўны гонар Жлобіншчыны

ШШУ Георгій Мірзавіч. Нарадзіўся ў 1907 г. ў Іране ў сям'і селяніна-асірыйца. Шахматыст. У гады 1-й сусветнай вайны ў Расіі, з канца 1930-х гадоў у Жлобіне. Непісьменны, авалодаў шахматным майстэрствам дзякуючы прыроднаму таленту. У 1947 г. стаў першым чэмпіёнам горада па шахматах. Гэта званне заваёўваў неаднаразова. Шмат зрабіў для развіцця шахмат не толькі ў Жлобіне, але і для ўсёй рэспублікі. Сярод яго вучняў былі вядомы шахматны кампазітар Яўген Дзвізаў, удзельнік розыгрышу чэмпіянату свету Аляксандр Загорскі, таленавітыя шахматныя майстры браты Сямён і Якаў Гельферы і іншыя.

М.В.Шуканаў.

КІРАЎ Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся 22.11.1957 г. ў г.п. Стрэшын Жлобінскага раёна. Беларускі спартсмен (лёгкая атлетыка). Скончыў Гомельскі універсітэт (1990). Бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў 1980 г. ў Маскве па бегу на 800 м, прызёр Кубка Еўропы, неаднаразовы прызёр чэмпіяната Еўропы, 6-разовы чэмпіён СССР, двухразовы пераможца Спартакіяды народаў СССР, экскардсмен міра ў эстафеце 4 × 800 м, па бегу на 800 м і 1500 м. Прызнаны лепшым спартсменам за 100 гадоў.

ЛАВЕЦКІ Уладзімір Мікалаевіч. Нарадзіўся 26.10.1951 г. ў Жлобіне. Беларускі спартсмен (лёгкая атлетыка). Скончыў Акадэмію фізічнага выхавання і спорту. Чэмпіён Еўропы (1970) сярод юніёраў, чэмпіён СССР (1972), сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў 1972 г. ў Мюнхене ў складзе зборнай каманды СССР па бегу 4 × 100 м і чацвёртае месца па бегу на 200 м, сярэбраны прызёр Універсіяды (1973).

РУДЗЯНКОЎ Васіль Васілевіч. Нарадзіўся 3.5.1931 г. ў Жлобіне. Беларускі спартсмен (лёгкая атлетыка, кіданне молата).

М.І.Кіраў.

У.М.Лавецкі.

В.В.Рудзянкоў.

Заслужаны майстар спорту СССР. Скончыў Акадэмію фізічнага выхавання і спорту. Чэмпіён Алімпійскіх гульняў 1960 г. ў Рыме, чэмпіён СССР (1959—61), рэкардсмен Еўропы, рэкардсмен СССР. Лепшы вынік — 68,95 м (1961). Памёр, пахаваны ў Жлобіне.

Ганаровыя грамадзяне Жлобіна

АРТАМОНАЎ Іван Андрэевіч. Нарадзіўся 15.3.1920 г. ў в. Снегіроўка Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці. У 1948 г. скончыў Рослаўскі чыгуначны тэхнікум, працаваў на ст. Калінкавічы брыгадзірам, колавым майстрам, старшым інжынерам. У 1967 г. скончыў завочна Беларускі інстытут чыгуначнага транспарту. У 1952—80 гг. начальнік вагоннага дэпо на Жлобінскім чыгуначным вузле, потым старшы аглядчык па захаванасці рухомага саставу. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларусі. Званне ганаровага грамадзяніна горада прысвоена ў 1998 г. Жыве ў Жлобіне.

І.К.Грыбаў.

М.П.Гуляеў.

ГРЫБАЎ Іван Карпавіч. Нарадзіўся 26.10.1906 г. ў Жлобіне. Скончыў школу фабрычна-заводскага навучання. Працаваў слесарам, памочнікам машыніста паравознага дэпо. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. У жніўні 1941 г. быў цяжка паранены і па інваліднасці дэмабілізаваны з арміі. З 1946 г. да выхаду на пенсію ў 1961 г. працаваў на Жлобінскім чыгуначным вузле. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна горада прысвоена 27.10.1998 г. Памёр 12.9.1990 г.

ГУЛЯЕЎ Міхаіл Паўлавіч. Нарадзіўся 18.2.1955 г. ў г. Орск Арэнбургскай вобласці. Працаваў падручным сталявара, памочнікам майстра, начальнікам змены сталеплавільнага цэха на Валгаградскім металургічным заводзе. У 1977 г. скончыў Маскоўскі інстытут сталі і сплаваў. Са студзеня 1984 г. майстар плаўкі сталі на Беларускім металургічным заводзе ў Жлобіне. Пасля ён узначаліў тут адну з асноўных вытворчасцей прадпрыемства — металургічную. Распрацаваў і ўкараніў прагрэсіўныя тэхналогіі выплаўкі 44 новых марак сталі. Упершыню ў краінах СНД была асвоена тэхналогія выплаўкі кордавай сталі на чыстым металаломе. Укараніў арганізацыйна-тэхнічныя мерапрыемствы па рэканструкцыі і мадэрнізацыі тэхналагічнага абсталявання металургічнай вытворчасці. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі. Званне ганаровага грамадзяніна горада прысвоена 29.6.2000 г. Жыве ў Жлобіне.

ЕЎДАЧКОЎ Сямён Рыгоравіч. Нарадзіўся 12.3.1906 г. ў в. Забалацце Рагачоўскага раёна. Працаваў у сельскай гаспадарцы, сакратаром Забалацкага сельсавета, загадчыкам хаты-чытальні і райземаддзелаў Рагачоўскага і Ельскага раёнаў, старшынёй калгаса ў Буда-Кашалёўскім раёне, узначальваў Кармянскі райвыканком. У Вялікую Айчынную вайну партызан. Пасля вайны працаваў старшынёй выканкома Жлобінскага райсавета і калгаса імя Фрунзе, быў загадчыкам гаспадаркі лясгаса. Званне ганаровага грамадзяніна горада прысвоена 24.6.1969 г.

КАРЫБСКІ Пётр Андрэевіч. Нарадзіўся 12.7.1923 г. ў Жлобіне. У 1941 г. баец Жлобінскага знішчальнага батальёна. Са жніўня 1941 г. на фронце. Закончыў вайну ў Берліне, быў камандзірам кулямётнай роты, прымаў удзел у штурме імперскай канцылярыі. У 1945—53 гг. у арміі, падпалкоўнік, начальнік штаба стралковага батальёна, потым працаваў слесарам у Жлобінскім вагонным дэпо, быў старшынёй калгаса «Беларускі камунар»

Ельскага раёна. З 1983 г. на пенсіі. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеней, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна горада прысвоена ў 1968 г. Жыве ў Жлобіне.

КОСЦЕЎ Міхаіл Парфір'евіч. Нарадзіўся 29.11.1923 г. ў Жлобіне. Заслужаны настаўнік БССР (1970). Працаваў у калгасе. Са снежня 1941 г. да мая 1942 г. курсант 2-га Растоўскага артылерыйскага вучылішча, потым удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. Пасля вайны сакратар Жлобінскага райкома камсамола, намеснік начальніка палітаддзела Жлобінскага аддзялення Беларускай чыгункі. З 1949 г. дырэктар Жлобінскай школы рабочай моладзі, з 1985 г. — сярэдняй школы № 6, дзе здолеў стварыць творчы калектыў педагогаў, асвоіў і ўкараніў у вучэбны працэс перадавыя педагагічныя тэхналогіі. Ён і сёння працягвае працаваць настаўнікам гісторыі ў школах Жлобіна. Многія з яго вучняў сталі высокакваліфікаванымі спецыялістамі ў розных галінах народнай гаспадаркі. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі, значком «Выдатнік народнай адукацыі». Званне ганаровага грамадзяніна горада прысвоена 29.6.2000 г. Жыве ў Жлобіне.

МАСІК Пётр Ісакавіч. Камандзір 4-га Жлобінскага матарызаванага пантонна-маставога палка, падпалкоўнік. Гл. артыкул у раздзеле «Ішла вайна народная».

ПІЧУГІН Фёдар Піліпавіч. Нарадзіўся 22.4.1891 г. Генерал-маёр. Гл. артыкул у раздзеле «Ішла вайна народная».

ХІЖНЯК Іван Лукіч. Нарадзіўся 2.4.1893 г. ў г. Ейск Краснадарскага краю ў сям'і рыбакоў-пераселенцаў. З 1941 г. выконваў абавязкі старшага воінскага начальніка Жлобінскага ўчастка, камандаваў 117-й стралковай дывізіяй 63-га стралковага корпуса 21-й арміі. Памёр у 1985 г. Гл. артыкул у раздзеле «Ішла вайна народная».

Кіраўніцтва раёна і горада

ПЕРШЫЯ САКРАТАРЫ ЖЛОБІНСКІХ РАЙКОМА І ГАРКОМА КПБ

Ю.М.Лехерзак (рэпрэсіраваны ў 1937); Навум Абрамавіч Касой (1937—1939); Майсей Давыдавіч Шапіра (1939—1941); Іоў Апанасавіч Крышнёў (1942—1944); Іван Цімафеевіч Зуевіч (1944—1947); Рыгор Максімавіч Вайцянкоў (1947); Банін Іван Іванавіч (1947—1949); Піліп Пятровіч Прахарэнка (1949—1953); Гаўрыіл Савельевіч Сімашчанка (1953—1960); Міхаіл Кандратавіч Кулагін (1960—1968); Мацвей Назаравіч Грабянчук (1958—1976); Васіль Ціханавіч Раманенка (1976—1985); Анатоль Аўрамавіч Зайцаў (1985—1989); Рыгор Фаміч Івончык (1989—1991).

СТАРШЫНІ ЖЛОБІНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

С.П.Люцько (рэпрэсіраваны ў 1937); Леанід Іванавіч Дзігірэўскі (да жніўня 1941); Васіль Ільіч Шаруда (1943—1945); Мікалай Аляксеевіч Трусноў (1945—1947); Сямён Рыгоравіч Еўдачкоў (1947—1950); Цімафей Іванавіч Галыгін (1950—1951); Макар Пракопавіч Аніпка (1951—1956); Фёдар Васілевіч Шчарбін (1957—1958); Кузьма Іосіфавіч Паплаўскі (1959—1961); Альберт Пятровіч Белавусаў (1962—1963); Рыгор Міхайлавіч Рабцаў (1963—1968); Фелікс Рыгоравіч Забродскі (1968—1973); Васіль Ціханавіч Раманенка (1973—1976); Мікалай Федаравіч Шэкаў (1976—1986); Анатоль Сцяпанавіч Філіпаў (1986—1991); Сяргей Мацвеевіч Котаў (1991—1999); Віктар Фёдаравіч Бяльковіч (з 1999).

СТАРШЫНІ ЖЛОБІНСКАГА ГАРВЫКАНКОМА

Васіль Лявонцьевіч Якуш (1963—1968); Вера Віктараўна Канаплёва (1968—1969); Мікалай Міхайлавіч Стукач (1969—1978); Леанід Іванавіч Коўшык (1978—1986); Пётр Іванавіч Вярэніч (1986—1987); Уладзімір Канстанцінавіч Ерафееў (з 1987).

Яны працавалі над кнігай «Памяць»

БЯЛЬКОВІЧ Віктар Фёдаравіч. Нарадзіўся 14.10.1955 г. ў г. Бабруйск Магілёўскай вобласці. Скончыў Рэчыцкі зоаветэрынарны тэхнікум (1975). Працаваў у саўгасе імя Казлова Жлобінскага раёна, з 1986 г. старшыня калгаса «Чырвоная зорка», з 1988 г. дырэктар саўгаса «Пірэвіцкі» Жлобінскага раёна, З 1998 г. старшыня Жлобінскага райвыканкома.

ГРЫЦОК Мікалай Ермалаевіч. Нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Гарошкаў Рэчыцкага раёна. У 1949 г. скончыў Заспенскую сярэднюю школу. У 1949—55 гг. служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў настаўнікам, дырэктарам Малевіцкай сярэдняй школы. У 1962 г. скончыў геаграфічны факультэт БДУ. У 1968—82 гг. намеснік старшыні Жлобінскага райвыканкома, з 1982 г. і да выхаду на пенсію старшыня Жлобінскага гарадскога камітэта народнага кантролю. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі, медалямі. Жыве ў Жлобіне.

ЕРАФЕЕЎ Уладзімір Канстанцінавіч. Нарадзіўся 12.6.1939 г. на хутары Жаданы Чорна-Вірнянскага сельсавета Жлобінскага раёна. Скончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (1963). Працаваў у лакаматыўным дэпо г. Брэст, з 1973 г. начальнік лакаматыўнага дэпо Жлобіна, з 1987 г. старшыня Жлобінскага гарвыканкома. Узнагароджаны знакам «Ганаровы чыгуначнік» (1996).

КАРЦАЎ Яўген Васілевіч. Нарадзіўся 25.8.1930 г. на хут. Крушыннікі Жлобінскага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў у 1948 г., потым вучыўся ў Мічурынскім авіяцыйным вучылішчы Тамбоўскай вобласці. У 1951—61 гг. дырэктар Жлобінскага раённага Дома культуры, на камсамольскай і партыйнай рабоце. З сакавіка 1961 г. да студзеня 1963 г. намеснік старшыні Жыткавіцкага райвыканкома, у 1963—67 гг. на партыйнай рабоце ў Жлобіне, у 1967—71 гг. намеснік старшыні Жлобінскага гарвыканкома. З 1971 па 1987 г. дырэктар Жлобінскай швейнай фабрыкі, з 1989 па 2000 г. дырэктар дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея ў Жлобіне. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларусі, медалямі. Жыве ў Жлобіне.

КАСЦЕЙКАЎ Віктар Аляксеевіч. Нарадзіўся 23.10.1963 г. ў в. Лукі Жлобінскага раёна. Скончыў БДУ. Працаваў настаўнікам Кароткавіцкай сярэдняй школы Жлобінскага раёна, затым на камсамольскай рабоце. З 1992 г. загадчык аддзела па справах моладзі, потым намеснік старшыні Жлобінскага гарвыканкома.

КІРЫЧЭНКА Павел Якаўлевіч. Нарадзіўся 14.1.1927 г. ў в. Кірава Жлобінскага раёна. У 1944—51 гг. служыў у Савецкай Арміі. З 1952 г. літаратурны супрацоўнік, загадчык розных аддзелаў раённай газеты «Шлях сацыялізму», пасля на партыйнай і дзяржаўнай рабоце. У 1973—87 гг. рэдактар Жлобінскай раённай газеты «Камуніст». Член Беларускага Саюза журналістаў. Узнагароджаны Ганаровымі Граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі, медалямі. Жыве ў Жлобіне.

В.Ф.Бяльковіч.



М.Е.Грыцок.

У.К.Ерафееў.

Я.В.Карцаў.

САМУЭЛЬ Софія Пятроўна. Нарадзілася 20.2.1941 г. ў в. Еськавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. Беларускі гісторык, кнігавыдавец. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1988). Скончыла БДУ (1966). З 1969 г. ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя»: загадчык рэдакцыі, у 1992—96 гг. намеснік галоўнага рэдактара. Адзін са складальнікаў метадычных указанняў і рэдактар энцыклапедычных выданняў, у т.л. «Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя» у 5 тамах [на беларускай (1978—81) і рускай (1979—82) мовах], «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» ў 5 тамах (1984—87), «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» ў 5 тамах (1983—86), «Археалогія і нумізматыка Беларусі» (1993), «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» ў 6 тамах, «Беларуская Энцыклапедыя» ў 18 тамах, энцыклапедычных даведнікаў «Янка Купала» (1986), «Францыск Скарына і яго час» (1988; на рус. мове 1990), «Беларусь» (1995). Прымала ўдзел у распрацоўцы метадычных прынцыпаў серыі «Памяць», складальнік кніг гэтай серыі «Рэспубліканская кніга Памяці» (1995), «Рэспубліканская кніга Памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў» (1999), «Нясвіжскі раён» (2000), «Жлобінскі раён» (2000), «Орша і Аршанскі раён» (кніга 1—2; 1999—2000; апошняя ў сааўтарстве). Адзін са складальнікаў, аўтараў і рэдактараў «Энцыклапедыі маладой сям'і» (8 выд.), даведніка «Культура харчавання» і інш. выданняў гэтай серыі. Аўтар артыкулаў па гісторыі Беларусі для энцыклапедычных выданняў. Дзяржаўная прэмія Беларусі 1990 г. за выданне «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (у 7 тамах, 8 кнігах).

Аўтар-складальнік кнігі «Беларусь. Факты» (Мн., 2000; на рус., ням., англ. мовах; спецыяльнае выданне для Сусветнай выстаўкі ў Гановеры).

В.А.Касцейкаў.

П.Я.Кірычэнка.



А.С.Шолак.

ШОЛАК Аляксей Сцяпанавіч. Нарадзіўся 4.9.1948 г. ў с. Хадаркоўцы Жыдачаўскага раёна Львоўскай вобласці. У 1971 г. скончыў Мазырскі педагагічны інстытут. З 1973 г. настаўнік, потым дырэктар Радушскай сярэдняй школы Жлобінскага раёна, з 1977 г. на партыйнай і дзяржаўнай рабоце, з 1996 г. намеснік старшыні Жлобінскага райвыканкома.

Маці-гераіні

ДАШКОЎСКАЯ Ніна Андрэеўна. Нарадзілася 2.2.1933 г. Жыве ў в. Кругі, хатняя гаспадыня. Званне прысвоена ў 1976 г.

НАВУМАВА Марыя Савельеўна. Нарадзілася 10.12.1931 г. Жыве ў в. Баршчоўка, хатняя гаспадыня. Званне прысвоена ў 1977 г.

СМАРЦЭЛАВА Раіса Данілаўна. Нарадзілася 14.3.1939 г. Жыве ў в. Чацвярня, хатняя гаспадыня. Званне прысвоена ў 1981 г.

ШУГАЛЕЕВА Валянціна Сяргееўна. Нарадзілася 24.7.1946 г. Жыве ў Жлобіне, працуе на доследным рамонтна-механічным заводзе. Званне прысвоена ў 1983 г.

Іх шляхі прайшлі праз Жлобіншчыну

АКОПАЎ Дзеражант Лявонавіч. Нарадзіўся 15.4.1940 г. ў г. Ташауз (Туркменістан). Скончыў Чалябінскі і Кузбаскі палітэхнічныя інстытуты па спецыяльнасці інжынер-металург і эканоміка вытворчасці. У 1982—85 гг. першы дырэктар Беларускага металургічнага камбіната ў Жлобіне, потым працаваў у вытворчым аб'яднанні «Крычаўцэментнашыфер». Памёр у 1995 г. *В.А.Кажаева.*

ВІТКА Васіль (сапр. К р ы с ь к о Цімох Васілевіч; 16.5.1911, в. Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобл. — 5.7.1996). Беларускі паэт. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1970). Скончыў Слуцкую прафтэхшколу (1928). У 1933—34 гг. працаваў у Жлобіне ў рэдакцыі газеты «Ударнік». Беларускі крытык і літаратуразнавец Святлана Марчанка ў кнізе «Васіль Вітка. Нарыс жыцця і творчасці» пісала, што ў час сваёй працы ў «... жлобінскай чыгуначнай газеце «Ударнік»... займаў аж некалькі пасад адразу. Сакратара (замяняючы Шынклера). Уласнага карэспандэнта. Карэктара. Экспедытара і самага галоўнага, хто круціў вялізнае цяжкае кола дапатопнай машыны, што друкавала газету... Разнастайнымі і клопатнымі былі яго абавязкі на асноўнай рабоце... Але паспяваў. Спраўляўся і ў дадатак «як чалавек дасведчаны ў мастацтве», ён быў упаўнаважаны далучаць да культуры і яе баявых мастацкіх задач усе мясцовыя таленты». *М.В.Шуканаў.*

ГАРТНЫ Цішка (народжаны Ж ы л у н о в і ч Зміцер Хведаравіч). Нарадзіўся 4.11.1887 г. ў г. Капыль Мінскай вобласці. Беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Будучы старшыня Часовага рэвалюцыйнага ўрада Савецкай Беларусі, пэўны час працаваў у Жлобіне. У адной з біяграфічных нататак пра пісьменніка чытаем: «... Вясною 1909 года гаспадар зачыніў майстэрню ў Капылі і Ц.Гартны ў пошуках работы абышоў многія гарады: працаваў у гарбарнях Вільні, Смаргоні, Мінска, Бабруйска, Палтавы, Магілёва, Жлобіна...» Вядомы беларускі пісьменнік, дзяржаўны і грамадскі дзеяч у той час быў карэспандэнтам першай беларускай ілюстраванай газеты «Наша Ніва». Ён і з Жлобіна пісаў у гэтую газету, і яго нататкі даюць нам пэўнае ўяўленне, як жыў горад улетку 1910 г., што ў ім рабілася.

Дз.Л.Акопаў.

Першая нататка Цішкі Гартнага пра Жлобін і з Жлобіна была змешчана ў 23—24 абагульненым нумары «Нашай Нівы» за 10(23) чэрвеня 1910 г. У ёй паведамлялася: «У нас стаіць страшэнная гарачыня (на вакзале градуснік паказвае 30°). Усё збожжа на полі затрымалася ў росце і сохне. Людзі бядуюць, бо баяцца неўраджаяў і голаду.» У гэтым жа нумары Цішка Гартны паведамляў і пра тое, што на горад насоўвалася страшная хвароба — халера. «Тутэйшая паліцыя ходзіць па мястэчку, — пісаў ён, — і прыказвае людзям ачышчаць гдзе што ёсць, каб перашкодзіць халеры, каторая завіхаецца недалёка ўжо ад Жлобіна...» З той пары амаль у кожным нумары «Нашай Нівы» змяшчаліся жлобінскія нататкі Жылуновіча. У дваццаць пятым нумары ён зноў б'е трывогу з нагоды той страшэннай хваробы, пра якую пісаў папярэдне: «4 чэрвеня з Кіеўскага параходу знялі хворую на халеру маладзіцу. Усё мястэчка перапужалася страшэннага госця. Па мястэчку расклеены губернатарскія абвесткі, каб усюды чысцілі бруд... Хто не паслухае — трыста рублёў штрафу або тры месяцы адседкі».

Вялікай бядой для колішняга Жлобіна былі і пажары. Гэта відаць з чэрвеньскай нататкі Цішкі Гартнага 1910 г.: «Кожнае лета наша мястэчка мае шмат шкоды ад пажараў. Летась згарэла ледзь не ўсё мястэчка, а цяпер зноў трапілася падрад некалькі пажараў: апошні пажар быў у нядзелю (6 чэрвеня)».

Пісьменніка цікавіла ў Жлобіне ўсё: і санітарны стан горада, і розныя здарэнні, і мова местачкоўцаў (гараджан). Абагульняючы свае назіранні пра мову жлобінцаў, Цішка Гартны пісаў: «Мова ў нашым мястэчку — беларуская з наваротам украінскім і яе тры-

маюцца ўсе, апрача некаторых «рызыкоўнейшых» маладых ды служачых на станцыі, яны ўжо сіляцца гаварыць па-расейску і ганьбяць родным» («Наша Ніва» 1(14) ліпеня 1910 г.).

З допісаў Цішкі Гартнага ў «Нашу Ніву» даведваемся і пра «бацькоў» горада. Вось як абмаляваў Жылуновіч аблічча дэпутата Дзяржаўнай Думы Сазановіча, які жыў у тую пару ў Жлобіне: «На заходнім краю нашага мястэчка каля Дняпра ляжыць пекны двор «пана прафэсара» і правага дэпутата Гас. Думы ад Магілёўскай губ. (ён жа і сакратар Гас. Думы) Сазановіча. Праз цэлыя тры гады жыцця Гас. Думы гэты прадстаўнік нашага беларускага краю ніводнага разу не сабраў нашых мяшчанаў і не сказаў ім ні слова аб рабоце ў Гас. Думе.

Праўда, ён не толькі не хоча гутарыць з «необразованнымі і гордымі мяшчанамі, каторыя не хочуць шапкі зняць перад сваім памешчыкам» (яго ўласныя словы), а нават і на вочы не паказваецца. Толькі і бачаць яго, калі ён каціць на тройцы на тутэйшы вакзал. Адзін раз уздумалі нашы мяшчане зайсці к пану Сазановічу папрасіць падмогі на пажарную дружыну. Пан Сазановіч сур'ёзна адказаў такімі вось словамі: «Мне ад пажарнай карысці няма, бо мая будоўля каменная і яна не згарыць» («Наша Ніва» 15(28) ліпеня).

З нататкі Цішкі Гартнага ў «Нашай Ніве» за 22(4) ліпеня маем звесткі пра гісторыю жлобінскага чыгуначнага маста. «У 1905 г. — пісаў Ц.Гартны, — збракавалі ў нас мост, што быў на чыгунцы, а на яго месцы збудавалі новы: на старым, збракаваным, палажылі дошчачкі і зрабілі пераход цераз р. Днепр. Тым часам прайшло пяць гадоў, дошкі пагнілі, і цяпер, каб прайсці, трэба дужа баяцца, што вось-вось дошка зламаецца і пакупаешся ў вадзе, а — крый божа — і патонеш. Новых дошчак ніхто не рупіцца палажыць. Ці трэба чакаць, каб раней хто загінуў, а пасля перамяняць ужо дошкі?»

З іншых нататак, допісаў Цішкі Гартнага ў «Нашу Ніву» даведваемся пра стан медыцыны ў горадзе. У 1910 г. тут быў усяго адзін доктар Ш., «вельмі добры доктар» — зазначае Гартны («Наша Ніва» 22 (4) ліпеня); пра жлобінскую паліцыю, пра яе «рупнасць»: «Кожную ноч, — пісаў Гартны, — стражнікі ў нашым мястэчку робяць «абход». Гэта дзеля таго, каб быў парадак, каб збавіць мястэчка ад злодзеяў, якіх у нас завялося пропасць... Бяда таму, хто гдзе спозніцца: стражнікі спыняюць, знімаюць цэлыя дапросы, што

Б.І.Зайцаў.

ўсякаму «незлодзею» прыкра» («Наша Ніва» 15 (28) ліпеня).

Праз Цішку Гартнага спазналі, што ў 1910 г. ў Жлобіне была ўведзена нумарацыя звозчыкам, што таргі ў Жлобіне ў тую пару адбываліся два разы на тыдзень: у сераду і нядзелю, з 12 да 5 гадзін вечара. Такі парадак працы быў і для крам: «Затое піўныя і шынкі адчынены днём і ноччу», — іранізуе Гартны з паліцыі. Цішка Гартны даў нам цэлую панараму гарадскога жыцця Жлобіна ў 1910 г. У яго допісах мы можам прачытаць яшчэ і пра начную, з 14 на 15 чэрвеня буру, якая пранеслася над горадам і нарабіла шмат шкоды, і пра летнюю навігацыю на Дняпры. Абяцаў ён прыслаць з Жлобіна і «свае думкі аб Бацькаўшчыне». Апошняя яго Жлобінская публікацыя была змешчана 2 верасня 1910 г. Але гэта ўжо быў верш, напісаны ім ў Жлобіне 17 красавіка. Называўся ён «Начныя чары», вобраз і настрой якога навеяны жлобінскай рэчаіснасцю. Неўзабаве Цішка Гартны пераехаў у Магілёў. У савецкі час зведаў рэпрэсіі. Памёр 11.4.1937 г. Пахаваны на ўскраіне Пячэрскага парку ў Магілёве. Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Капылі і інш.

У.І.Содаль.

ЗАЙЦАЎ Барыс Іванавіч. Нарадзіўся ў 1942 г. ў Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці. Скончыў Маскоўскае мастацкае вучылішча. Друкуецца на старонках газеты «Во славу Родины», супрацоўнічае з раённай газетай «Новы дзень».

КОХАН Яўхім Іванавіч. Нарадзіўся 3.2.1912 г. ў в. Навадворцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Беларускі паэт. Скончыў Маскоўскі гісторыка-архіўны інстытут (1969). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1932 г. працаваў у Жлобіне ў рэдакцыі газеты «Ударнік». Ва ўспамінах «Вобраз чысцейшай дабрыні», якія былі напісаны ў 1984 г. і

прысвечаны Хвядосу Шынклеру, пісаў: «У пачатку 1932 г. ў Жлобіне пачала выходзіць газета чыгуначнікаў «Ударнік»... Хвядос прапанаваў мне перайсці на працу да яго. Хаця ён лічыўся афіцыйна сакратаром «Ударніка», але фактычна вёў усю практычную работу як самы вопытны газетны спецыяліст у рэдакцыі. Мне ён даручыў аддзел чыгуначнага будаўніцтва. Так, мне давялося працаваць разам з ім у адной рэдакцыі, у адным пакоі пры штодзённым блізкім сутыкненні з вясны да кастрычніцкіх свят 1932 г., пакуль я не выехаў у Мінск...» Я.І.Кохан памёр у 1994 г.

М.В.Шуканаў.

КУРТАНІЧ Вольга Іванаўна (сапр. М е ш ч а р а к о в а). Нарадзілася 6.3.1963 г. ў г. Качканар Свярдлоўскай вобласці. Беларуская паэтэса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1968 г. сям'я пераехала ў Жлобін. У 1987 г. скончыла Гомельскі універсітэт. У час вучобы пачала пісаць вершы, якія змяшчаліся ва універсітэцкай шматтыражцы. З 1990 г. жыве ў Мінску, працуе на радыёстанцыі «Сталіца». Аўтар паэтычных зборнікаў «Птушыным шляхам» (1990) і «Начное сонца» (1994), сааўтар паэтычнага зборніка «Тутэйшыя» (1989).

ЛУД Павел Канстанцінавіч. Нарадзіўся ў 1951 г. ў в. Дрэбск Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Працуе машыністам магістральных цеплавозаў лакаматыўнага дэпо ў Жлобіне. Друкуецца на старонках раённай газеты «Новы дзень». Верш «Малітва» пакладзены на музыку акцёрам тэатра «Хрыстафор» Анатолем Длускім. Музыку на вершы П.К.Луда піша мясцовы самадзейны кампазітар Аляксандр Пілюга. Друкуецца ў рэспубліканскай перыёдыцы.

ЛУПСЯКОЎ Мікола (Мікалай) Радзівонавіч. Нарадзіўся 4.3.1919 г. ў Маскве. Беларускі пісьменнік. У 1921 г. яго бацькі вярнуліся на радзіму — у в. Папаратнае. У 1941 г. скончыў Мінскі педагагічны інстытут. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. У сакавіку 1943 г. ў баях пад Харкавам быў цяжка паранены і пасля лячэння дэмабілізаваны. Працаваў у газеце «Казахстанская праўда», рэдакцыях часопісаў «Беларусь» і «Бярозка».

Друкавацца пачаў у 1935 г. Аўтар зборнікаў прозы «Першая атака» (1946), «Мост» (1947), «Чырвоны Бераг» (1954), «На берагах Дняпра» (1966) і інш. Для дзяцей выдаў кніжкі «Разведчыкі», «Я помню». У сваіх творах стварыў псіхалагічна глыбокія і праўдзівыя чалавечыя характары, даў яркія малюнкі жыцця, людскога побыту. Памёр 12.2.1972 г., пахаваны ў Мінску на Чыжоўскіх могілках. Яго імем названа вуліца ў г.п. Стрэшын.

М.В.Шуканаў.



П.К.Луд.

М.С.Смірнова.

СМІРНОВА Марыя Сямёнаўна. Нарадзілася ў 1944 г. ў г. Пржэвальск (Кыргызстан). З 1951 г. жыве ў Жлобіне. Скончыла Гомельскі універсітэт. З 1964 г. супрацоўнічае з газетай «Новы дзень». У 1993 г. выйшаў яе першы зборнік вершаў «След на зямлі».

ШЫНКЛЕР Хвядос Сяргеевіч. Нарадзіўся 22.9.1903 г. ў г. Заслаўе Мінскага раёна. Беларускі пісьменнік. У 1931—35 гг. працаваў у Жлобіне ў рэдакцыі газеты «Ударнік». Беларускі пісьменнік Сяргей Грахоўскі ва ўспамінах «Як той явар» (1982) пісаў: «Неўзабаве ў Жлобіне пачала выдавацца газета палітаддзела чыгуначнага вузла. Не доўга думаючы, Хвядос Сяргеевіч паехаў на пасаду сакратара рэдакцыі новай газеты і звёз з сабою лепшых бабруйскіх паэтаў Цімоха Крысько і Яўхіма Кохана». У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Загінуў пад Сталінградам у кастрычніку 1942 г.

М.В.Шуканаў.

ЯЦУК Мацвей Сямёнавіч. Нарадзіўся ў 1911 г. Жыў і працаваў у Жлобіне. Па прафесіі будаўнік. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар паэтычных зборнікаў на рускай мове «Поющий камень» (1968), «Мои координаты» (1971). Памёр у 1987 г.

М.В.Шуканаў.

Наш боль — Афганістан

Вайна ў Афганістане не абмінула і Жлобіншчыну. Адтуль нашы землякі вярнуліся інвалідамі, а 13 з іх загінулі. Іх мужнасць і вернасць прысязе не сатрэцца ў памяці народнай.

БЛІНЦОЎ Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся 21.12.1963 г. ў в. Грушачка Жлобінскага раёна. У 1980 г. скончыў Луцкую сярэднюю школу, у 1981 г. Жлобінскае ПТВ № 143, у 1982 г. Жлобінскую школу ДТСААФ. 28.3.1982 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане, быў механікам-вадзіцелем, радавы. Загінуў 1.8.1982 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Грушачка. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БОНДАРАЎ Аляксандр Іванавіч. Нарадзіўся 9.8.1954 г. ў в. Чацвярня Жлобінскага раёна. Скончыў сярэднюю школу № 7 у Жлобіне. У лістападзе 1972 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. У 1976 г. скончыў Пушкінскае вышэйшае ваеннае інжынернае будаўнічае вучылішча. Служыў у Беларускай ваеннай акрузе, намеснік камандзіра роты, камандзір роты. 12.9.1983 г. накіраваны ў Афганістан. Капітан А.І.Бондараў загінуў 19.3.1984 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Каралёў Стан Мінскага раёна. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ВАЛАСОВІЧ Алег Міхайлавіч. Нарадзіўся 26.9.1967 г. ў г. Крычаў Магілёўскай вобл. У 1985 г. скончыў сярэднюю школу № 7 у Жлобіне. 20.4.1986 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. У кастрычніку 1986 г. накіраваны ў Афганістан, быў механікам-вадзіцелем, радавы. 26.12.1987 г. ў раёне 26-га кіламетра каля аэрадрома Герат разам з іншымі байцамі падраздзялення Алег знаходзіўся ў баявой ахове нафтаправода. У час мінамётнага абстрэлу блок-паста быў цяжка паранены і памёр. Пахаваны ў в. Лебядзёўка. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ЗІНКОВІЧ Пётр Анатольевіч. Нарадзіўся 10.12.1960 г. ў Жлобіне. У 1978 г. скончыў сярэднюю школу № 2 у Жлобіне. Працаваў слесарам ў райсельгастэхніцы. У 1979 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. З кастрычніка 1979 г. служыў у Афганістане, быў камандзірам аддзялення, малодшы сяржант. Загінуў 28.3.1981 г. У той дзень патрульна-аварыйная каманда несла баявое дзяжурства на трасе трубаправода. Аўтамашына «Урал-375», у якой знаходзіўся П.А.Зінковіч, папала ў засаду каля Ташкурганскай цясніны. Моцным агнём праціўніка машына была падбіта, П.А.Зінковіч загінуў. Пахаваны ў пас. Вірскі. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КАРАБАНАЎ Ігар Аркадзевіч. Нарадзіўся 28.7.1968 г. ў Жлобіне. У 1983 г. скончыў 8 класаў Жлобінскай сярэдняй школы № 1, у 1986 г. — ПТВ № 187. 29.10.1986 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. У красавіку 1987 г. накіраваны ў Афганістан, быў мінамётчыкам. 9.4.1988 г. ў час бою пры выкананні абходнага манеўра БМП, вадзіцелем якой быў яфрэйтар І.А.Карабанаў, падарвалася на міне. Цяжка параненага санітары медсанбата адправілі яго верталётам у шпіталь. Пры пераносе з верталёта ў машыну хуткай дапамогі Ігар памёр. Пахаваны ў Жлобіне. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КАСЦЯЙКОЎ Мікалай Яўгенавіч. Нарадзіўся 8.2.1967 г. ў в. Рэкта Жлобінскага раёна. У 1985 г. скончыў Луцкую сярэднюю школу. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Шлях да камунізму». 14.4.1986 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. З верасня 1986 г. служыў у Афганістане, быў механікам-вадзіцелем, радавы. 11.4.1987 г. на калону, у суправаджэнні якой удзельнічаў М.Я.Касцяйкоў, каля населенага пункта Дархейль напалі душманы. М.Я.Касцяйкоў заняў выгадную пазіцыю і меткім агнём сваёй гарматы знішчыў агнявую кропку праціўніка. Але пры змене пазіцыі атрымаў цяжкае асколачнае раненне. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Кабанаўка. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ЛУКОМСКІ Аляксандр Леанідавіч. Нарадзіўся 11.6.1962 г. ў Жлобіне. У 1977 г. скончыў 8 класаў Жлобінскай сярэдняй школы № 8, у 1980 г. — ПТВ № 187 Жлобіна. 22.10.1980 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл.

Са студзеня 1981 г. ў Афганістане, быў радыётэлефаністам. 24.5.1981 г. радавы А.Л.Лукомскі загінуў пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў Жлобіне. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

МІКУЛКА Павел Іванавіч. Нарадзіўся 14.7.1967 г. ў Жлобіне. У 1982 г. скончыў 8 класаў сярэдняй школы № 2 у Жлобіне, вучыўся ў Чырвонабярэжскім саўгасе-тэхнікуме. Працаваў у кар'еры фармовачных матэрыялаў, скончыў школу ДТСААФ. 11.5.1986 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане, быў механікам-вадзіцелем. 25.4.1987 г. радавы П.І.Мікулка загінуў пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў Жлобіне. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу». Яго імем названа вуліца ў Жлобіне.

НАВУМЕНКА Віктар Іванавіч. Нарадзіўся 25.9.1966 г. ў в. Каротковічы Жлобінскага раёна. У 1983 г. скончыў Кароткавіцкую сярэднюю школу, вучыўся ў Чырвонабярэжскім саўгасе-тэхнікуме. 27.10.1984 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў ў Афганістане, быў сапёрам. 23.9.1986 г. радавы В.І.Навуменка пры выкананні баявога задання быў цяжка паранены і памёр. Пахаваны ў в. Каротковічы. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

РЫБЧАНКА Сяргей Аляксандравіч. Нарадзіўся 2.2.1963 г. ў в. Рудня Жлобінскага раёна. У 1980 г. скончыў Кабанаўскую сярэднюю школу, у 1981 г. — Гомельскае ПТВ № 81. 30.3.1981 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане, быў наводчыкам гарматы. 17.9.1982 г. яфрэйтар С.А.Рыбчанка загінуў каля населенага пункта Сурубі, суправаджаючы калону з каштоўным грузам. Пахаваны ў в. Рудня. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За баявыя заслугі».

РЫМАРАЎ Генадзь Аляксеевіч. Нарадзіўся 24.7.1965 г. ў в. Старая Рудня Жлобінскага раёна. У 1982 г. скончыў Старарудняншую сярэднюю школу. Працаваў наладчыкам на Жлобінскай фабрыцы штучнага футра. 28.9.1983 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане, быў механікам-вадзіцелем. 13.3.1984 г. радавы Г.А.Рымараў загінуў у баі з душманамі. Пахаваны ў в. Старая Рудня. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

СЕМЯНЕЦ Аляксандр Іванавіч. Нарадзіўся 25.5.1963 г. ў в. Дворышча Жлобінскага раёна. У 1978 г. скончыў Дворышчанскую васьмігадовую школу. Працаваў у Гомелі. 29.3.1982 г. Гомельскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане, быў радыётэлефаністам. 11.1.1984 г. радавы А.І.Семянец загінуў пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Дворышча. За мужнасць і гераізм узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі.

СТАРАСТАЎ Мікалай Андрэевіч. Нарадзіўся 27.1.1968 г. ў в. Нівы Жлобінскага раёна. У 1985 г. скончыў Ніўскую сярэднюю школу. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Нівы». У 1986 г. вучыўся ў Жлобінскай аўташколе ДТСААФ. 14.4.1986 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане, быў механікам-вадзіцелем. 15.9.1987 г. пры выкананні баявога задання ў раёне населенага пункта Семіда БМП, дзе знаходзіўся радавы М.А.Старастаў, была абстраляна душманамі. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Нівы. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ФЛАРЫЗЯК Сяргей Казіміравіч. Нарадзіўся 20.3.1960 г. ў в. Старая Рудня Жлобінскага раёна. У 1977 г. скончыў Старарудняншую сярэднюю школу. Працаваў на рагачоўскім заводзе «Дыяпраектар», потым пераведзены ў Жлобін на прадпрыемства БелОМА. 12.9.1978 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане, быў радыётэлеграфістам. 2.5.1980 г. радавы С.К.Флярызяк быў цяжка паранены ў баі з душманамі і памёр. Пахаваны ў в. Старая Рудня. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ШАРАБУРКА Ігар Рыгоравіч. Нарадзіўся 28.8.1963 г. ў Жлобіне. У 1978 г. скончыў 8 класаў сярэдняй школы № 2 у Жлобіне, ПТВ № 78 у г. Гомель. Працаваў токарам на БелОМА імя Вавілава ў Жлобіне, 28.9.1982 г. Жлобінскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане, быў старшым механікам-вадзіцелем. 6.4.1984 г. радавы І.Р.Шарабурка загінуў пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў Жлобіне. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

З архітэктурнай мінуўшчыны

(гісторыка-архітэктурны нарыс Жлобінскага раёна)

Гісторыя краю ў архітэктурных комплексах і манументах пачынаецца з сярэдневяковага замка ў Жлобіне, які існаваў у 15—17 ст. на правым беразе Дняпра пры ўпадзенні ў яго ручая Чорначка. У 15—16 ст. ён з'яўляўся адной з абарончых рэзідэнцый князёў Хадкевічаў. У ліпені 1654 г. казакі ўкраінскага гетмана І.Н.Залатарэнкі ўзялі фартэцыю штурмам і спалілі «замок Злобин». Княжаская цытадэль складалася з уласна замка, які меў у плане авальную форму (60 × 50 м), і выцягнутага з поўначы на поўдзень падзамка памерам 130 × 60 м. Замкавы дзядзінец узвышаўся над прадмесцем на 1,5—2 м, а адносна самога прырэчнага паселішча — на 3—4 м. Замак быў акаймаваны земляным валам з драўлянымі сценамі-гароднямі, сярод якіх узвышаліся вежы-байніцы і вежа-брама.

Менш значнай феадальнай замкавай рэзідэнцыяй з'яўляўся Стрэшын, які па археалагічных даследаваннях узнік у 12 ст., а з 2-й палавіны 14 ст. па пісьмовых крыніцах належаў віленскаму капітулу. Драўляны замак быў размешчаны на гары пры злучэнні Дняпра з р. Стрэшанка. Яго чатырохвугольны ў плане дзядзінец быў абкружаны валам і ровам. Узведзеныя па грабяні вала сцены ўяўлялі канструкцыю з трох пастаўленых адна на другую клецей-гародняў, над якімі меўся чацвёрты ярус з больш вузкіх гародняў — баявых галерэй. Не ўсе гародні запаўняліся зямлёй і каменнем; у адной з іх знаходзіўся арсенал, у другой — «каплица перед тем была, а сейчас подданые речи свои ховают». Па вуглах сцен знаходзіліся 4 баявыя вежы, пятая вежа-брама злучала замак з гандлёвай плошчай. Брама мела мост-узвод, які падымаўся 2 ланцугамі. У інвентары адзначана, што «сторона замка к Днепру очень наклонилась» і што ў 1626 г. «как замок, так и вежы четыре, бланкованье и всходы» былі накрыты дахамі з драніцы. Злева ад праезда знаходзілася турма, над праездам зверху — вялізная святліца на 4 акны, у якую траплялі з дзяцінца па лесвіцы і ганку зрубнай канструкцыі. У трэцім ярусе над святліцай знаходзілася гаспадарчае памяшканне, над якім узвышалася баявая галерэя. Сцены і вежы «по самое бланкованье» (карниз) былі абмазаны знадворку глінай.

Замак уяўляў сабой невялікую феадальную сядзібу і не быў прызначаны для доўгатэрміновай абароны, маючы даволі сціплае ўзбраенне — 4 жалезныя гарматы, 10 гакаўніц і 50 мушкетаў. У цэнтры дзядзінца знаходзіўся склеп («пивница»), бакі забудовы займалі 3 жылыя дамы и свіран. Два жылыя дамы былі трохкамерныя. У адным з іх «большим» сенцамі злучаліся святліца і камора. Другі дом складаўся са злучаных сенямі святліцы і пакоя. Трэці дом, дзе жыў гараднічы, уяўляў сабой аднакамерную курную хату без сенцаў.

Сядзіба ўладара знаходзілася каля замка на беразе Дняпра, была рэканструявана ў 1625—26 гг. Складалася з двара і гаспадарчага комплекса. Двор з боку замка і мястэчка быў агароджаны замётам з сасновых бярвенняў у шулах, з боку Дняпра — дубовым астрогам, меў 2 брамы: уязную з боку паселішча і гаспадарчую, да Дняпра. Каля ўязной брамы сфарміравалася парадная частка двара, дзе адзін супраць другога стаялі 2 жылыя дамы. За імі ў накірунку да гаспадарчай брамы знаходзіўся дом упраўляючага, свіран, кухня, 2 зблакіраваныя ў агульны корпус стайні. Галоўны дом, пабудаваны ў 1625 г., меў асіметрычную кампазіцыю з мезанінам у верхняй частцы, накрытым драніцай. Яго планіроўка ўяўляла сабой варыянт развіцця двухкамернага жылля — з сяней, дзе была дошкамі агароджана гаспадарчая камора, траплялі ў святліцу на 4 акны ў алавяных пераплётах і дубовых рамах, абсталяваную 2 ліпавымі сталамі, лавамі, каля дзвярэй стаяла белая кафляная печ з комінам і шафа. Са святліцы 4 прыступкі вялі да алькежа на 3 акны ў алавяных пераплётах. Алькеж завяршаўся каркасным, абшытым дошкамі мезанінам, да якога з сяней вяла лесвіца; выкарыстоўваўся як летняе памяшканне, з вокан якога адкрываліся цудоўныя краявіды на навакольны ландшафт. Другі дом сваёй планіроўкай нагадваў першы, але з тым адрозненнем, што да святліцы далучаўся не алькеж, а камора, якая мела засекі для захоўвання збожжа. Гэты дом стаяў на падрубку,

быў накрыты драніцавым дахам, перад уваходам ў сені знаходзіўся агароджаны ганак з 3 лавамі. Дом упраўляючага складаўся з сеняў, хаты, святліцы, каморы і пякарні. У хаце былі 4 акны ў алавяных пераплётах і драўляных рамах, печ з комінам, ліпавы стол, лавы, крэсла, полкі. Святліца з'яўлялася спальняй, пад ёй знаходзіўся падклет («подизбица»), які выкарыстоўваўся для зімовага захоўвання прадуктаў харчавання. Кухня была двухкамернай. Тут знаходзіліся ачаг у сасновым зрубе, з глінабітным дымаходам. Свіран пабудаваны ў 1626 г. і ўяўляў сабой двухпавярховае збудаванне пад дранічным дахам, са знадворкавай галерэяй, з двух бакоў агароджанай дошкамі. На верхні паверх вяла адкрытая лесвіца. Тут знаходзіліся 4 «набитых глиной» засека. Пад свіранам быў склеп — сасновы зруб з «засовистым» акном і адасобленым уваходам.

Каля замка, як і ў Жлобіне, з часам сфарміраваўся неўмацаваны пасад. Паводле інвентара 1608 г. горад Стрэшын складаўся з 2 частак — горада («места») і прадмесця Слабада. У горадзе налічвалася 12,5 «службы», з якіх 10 складалі 56 двароў, 2 «службамі» валодалі святар і 2 пушкары, палову «службы» ўтрымлівала пані Тараземуская. Такім чынам, горад на гэты час складаўся не менш як з 60 сядзіб-двароў з невялікімі агародамі («домы, которые потрохи земли мают в службах»). Слабаду фарміравалі 46 сядзіб-двароў. Усё паселішча акрамя замка складалася з 106 сядзіб-двароў. Акрамя таго, па-за горадам жыхарам належаў 21 агародны ўчастак і 21 участак «ново вымерен». З грамадскіх збудаванняў акрамя замка інвентар называе карчму і 2 вадзяныя млыны, а інвентар 1628 г. — царкву са званіцай, касцёл, 2 клеці, крамы, пякарню, корчмы, млын над р. Стрэшанка і паромную пераправу цераз Дняпро. На жаль, інвентар не дае назвы вуліц, што не дазваляе меркаваць аб планіроўцы старажытнага горада на пачатак 17 ст.

Архітэктурна-культавая спадчына краю прадстаўлена цікавай па задуме, дасканалай у сваёй прасторнай пабудове Свята-Пакроўскай царквой у г.п. Стрэшын — помнікам архітэктуры класіцызму. Манументальны велічны храм пабудаваны ў 1807 г. ў цэнтры мястэчка (перакрыжаванне сучасных вуліц Леніна і Калініна). Верагодна, з'яўленне храма не абышлося без удзелу графа Астэрмана, якому мястэчка было падаравана імператрыцай Кацярынай II. Пасля доўгага заняпаду ў савецкі час храм быў адрэстаўрыраваны і ў 1989 г. перададзены вернікам. Будынак царквы мае цэнтрычную кампазіцыю з кампактным строга сіметрычным планам. У аснове прасторавай кампазіцыі — кубічны аб'ём са зрэзанымі вугламі, да якога далучаны 4 аднолькавыя паўкруглыя апсіды пад купальнымі пакрыццямі. Усходняя з іх адведзена пад алтар, 2 бакавыя з'яўляюцца прыдзеламі, франтальная — прытворам. Пірамідальна нарастаючая кампазіцыя завершана паўсферычным купалам. Такой жа формы барабаны вянчаюць вуглы будынка і фланкіруюць франтальныя трохвугольныя франтоны. Тры ўваходы ў храм вырашаны высокімі лесвічнымі ганкамі. Плоскасныя фасады крапаваны пілястрамі і арачнымі нішамі, у якіх размешчаны прамавугольныя вокны. Усе 4 фасады раўнацэнныя па архітэктурна-мастацкаму вобліку. У інтэр'еры аднолькавыя па канфігурацыі апсіда, прыдзелы і прытвор, перакрыты конхамі і адкрыты ў малітоўную залу арачнымі прасветамі, якія пераходзяць у ветразевае скляпенне залы. Пад будынкам зроблена крыпта, да якой вядуць 2-маршавыя лесвіцы, размешчаныя па баках галоўнага ўвахода.

Размешчаная ў цэнтры в. Пірэвічы Усесвяцкая царква — помнік архітэктуры неарускага стылю. Пабудавана ў 1902 г. з цэглы на сродкі памешчыка Раговіча. Храм вырашаны 4-часткавай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй: выцягнуты па папярочнай восі прытвор, прамавугольная трапезная, кубападобная малітоўная зала з бакавымі прыдзеламі, 3-апсідная алтарная частка. У агульнай кампазіцыі дамінуе асноўны аб'ём, накрыты пакатым 4-схільным дахам з цыліндрычным светлавым барабанам на васьмерыковым п'едэстале ў завяршэнні. Галоўны ўваход афармлены магутным 4-слуповым ганкам-рундуком з арачнымі праёмамі, бакавыя — размешчанымі пад вуглом ганкамі. Сцены прарэзаны арачнымі вокнамі. У дэкоры выкарыстаны формы старажытнарускага царкоўнага дойлідства: какошнікі, аркатурныя парапеты, каляровыя арнаментальныя шырынкі, разеткі і фрызы, вуглавыя «ўразныя» калонкі, гарадковыя фрызы. У мастацкім афармленні інтэр'ера выкарыстана каляровая арнаментальная кераміка, якая надае храму дывановую ўзорчатасць, ажурнасць і каларыстычную паліхромію. Малітоўная зала перакрыта сферычным купалам з ліхтаром, іншыя — цыліндрычнымі скляпеннямі. Цокальная частка сцен аблiцавана керамічнай пліткай.

Свята-Троіцкая царква ў Жлобіне.

У традыцыях царкоўнага дойлідства 19 ст. вырашана Свята-Троіцкая царква ў Жлобіне, асвечаная 23 лістапада 1995 г. Белакаменны храм мае 3-часткавую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, якую фарміруюць званіца, трапезная, кубападобная малітоўная зала і апсіда. Над званіцай і асноўным аб'ёмам узвышаюцца цыбулепадобныя купалы.

Найбольш раннімі але не захаваўшыміся творамі манументальнай храмавай архітэктуры на Жлобіншчыне з'яўляліся замкавая царква ў Стрэшыне і невялікі уніяцкі манастыр на 6 манахаў у мястэчку Казімірава, вядомы па дакументах 1800 г. Але звестак аб іх арганізацыі і архітэктуры не выяўлена. Архітэктурна-царкоўную спадчыну края маглі б пашырыць цэрквы ў вёсках Дабравольшчына і Лукі (праект быў створаны ў 1840 г.), якія не захаваліся. Каталіцкая канфесія мае ў Жлобіне капліцу.

На паўночнай ускраіне в. Чырвоны Бераг захаваўся адзіны ў раёне помнік палацава-паркавай архітэктуры 2-й палавіны 19 ст. У 1-й палавіне 19 ст. маёнтак належаў роду Багарошкіх, ад якіх яго адкупіў генерал-лейтэнант інжынерыі Міхаіл Сямёнавіч Гатоўскі (1820— каля 1900), жанаты на Мальвіне з роду Лапаў. Як пасаг маёнтак у 1897 г. трапіў да іх дачкі Марыі, якая ўзяла шлюб з Вінцэнтам Козел-Паклеўскім — уладальнікам значнай маёмасці на Урале, сынам вядомага прамыслоўцы і грамадскага дзеяча Альфонса Козел-Паклеўскага. Цяпер тут размяшчаецца Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Памешчыцкая рэзідэнцыя ўключала палац, флігель, гаспадарчы комплекс, парк з садам, абкружаныя цаглянай агароджай (вышыня 2,5 м) з брамай і бярозава-ліпавымі шпалерамі.

Палац пабудаваны ў 1890—93 гг. паводле праекта архітэктара Я.Шрэтара. Фінансаванне будаўніцтва ажыццяўлялася Віленскім прыватным камерцыйным банкам. Манументальны мураваны 2-павярховы будынак спалучае рысы неготыкі і французскага неарэнесансу. Ён мае асіметрычную Г-падобную ў плане кампазіцыю, заснаваную на спалучэнні асноўнага прамавугольнага ў плане аб'ёму і 1-павярховага тарцовага крыла. На вуглавой частцы палаца, выступае прамавугольны рызаліт, завершаны 2 шатрамі. Побач з ім на франтальных фасадах выступаюць 2 двухгранныя эркеры пад высокімі шатрамі з флюгерамі ў завяршэнні; па вуглах умацаваны контрфорсамі. Стракаты сілуэт будынку надае спалучэнне разнастайных дахаў над асобнымі аб'ёмамі: шатры вежаў, мансардавы «французскі» з заломам дах асноўнага аб'ёму, востравугольныя шчыпцы і слыхавыя вокны. Галоўны ўваход вылучаны манументальнай тэрасай-балконам на 2 масіўных пілонах, дэкарыраваны вадазлівамі ў выглядзе гатычных хімер (чыгуннае ліццё). Гарызантальны падзел фасадаў на 2 паверхні выразна падкрэслены арнаментальным «гатычным» фрызам і завяршальным карнізам. На фаса-

Чырвонабярэжскі замак.

дзе — розныя па велічыні прамавугольныя вокны ў шырокіх руставаных ліштвах. Каларыстычнае вырашэнне архітэктуры будынка заснавана на спалучэнні атынкаваных і пабеленых, выкананых з камяня-пясчаніка дэкаратыўных элементаў і архітэктурных абломаў з чырвоным фонам цаглянай муроўкі сцен, карычневых бляшаных дахаў і серабрыстых лускаватых шатроў.

Планіроўка палаца мела анфіладны характар з шэрагам залаў разнастайнай стылёвай трактоўкі. У гатычных формах эфектна трактаваны вестыбюль, вырашаны ў 2 узроўнях. Яго столь багата афармлена ляпным арнаментам і аперазана арнаментальным фрызам у выглядзе пераплеценых гатычных арачак. Уваходны партал у цэнтральную залу вырашаны гатычнай стральчатай аркай, фланкіраваны комінамі той жа мастацка-стылёвай трактоўкі. Правая ад вестыбюля зала аздоблена ў стылі неаракако. Яе столь упрыгожана авальным плафонам з картушамі па вуглах, ляпнымі ружамі і лаўровымі вянкамі, скрыпкамі, трыльяжнай сеткай, меандравым поясам. Па цэнтры плафона размешчана ляпная раслінная «віньетка» для люстры. Часткова збераглася керамічная падлога. Меліся залы, афармленыя ў «раманскім», «рэнесансным», «арабскім» стылях. Бальная зала мела рысы стылю Людовіка XVI. Будуар меў насценныя люстры ў стукавых рамах, а шэраг салонаў, сцены і сафіты пакрываў паліхромны роспіс. Акрамя стылёвай мэблі на мастацкую трактоўку палаца ўплывалі бронзавыя рэчы, выкананыя польскай фірмай Лапенскіх, венецыянскі крышталь, англійскі фаянс, французскі фарфор і багатая галерэя жывапісу ў асноўным 19 ст.: творы Стэфана Бакаловіча, Генрыка Семірадскага, Айвазоўскага, Кандраценкі, Лампі. Падобную палацу архітэктурна-стылёвую трактоўку набыў і двухпавярховы флігель.

Адначасова з палацам на плошчы каля 10 га быў разбіты «англійскі» парк пейзажна-рэгулярнага тыпу планіроўкі, высаджаны пладовы сад, за ім створаны фазанарый. Стваральнікам парка быў Францішак Шанер. Сетка сцежак і акружны прагулачны маршрут падзяляюць парк на некалькі зон: пладовы сад, пейзажны ландшафт заходняй часткі, курціны вакол палаца і па берагах маляўнічай рэчкі Добасны. На яе раскрываўся

краявід з невялікай мураванай альтанкай, узнятай на відавую пляцоўку. Перспектыву па цячэнню ракі завяршаў павільён-купальня. Яшчэ адна альтанка знаходзілася ў заходняй частцы парка, на скрыжаванні ахоўных шпалерных пасадак. З сада праз парк да ракі пракапаны канал з 3 масткамі. У стварэнні паркавых курцін пераважна выкарыстаны хваёвыя пароды дрэў: елка звычайная, лістоўніца еўрапейская, піхта сібірская; з лісцевых пород растуць ліпа, каштан конскі звычайны, дуб чырвоны і інш. Шмат экзотаў: елка чырвоная, хвоя веймутава, ліпа амерыканская, крымская і буйналіставая, клён серабрысты, бархат амурскі, арэх грэцкі, клён вастралісты Швэдлера. У падбіўцы дрэвавых курцін выкарыстаны дэкаратыўны кустарнік: бэз, чубушнік, спірэя і інш.

Да панскай рэзідэнцыі вядзе пад'язная алея, якая даходзіць да мураванай брамы, вырашанай у гатычных формах — стральчатая ўязная арка фланкіравана 8-граннымі вежачкамі. Брама асвятлялася вялізным ліхтаром. Гаспадарча-вытворчы комплекс створаны справа пры ўездзе і ўключае бровар, стайню, аранжарэйна-парніковую гаспадарку, аформленую пад замкавую вежу вадакачку. Мураваныя гаспадарчыя будынкі таксама вырашаны ў формах готыкі са ступеньчатымі контрфорсамі, стральчатымі вокнамі.

Невялікі прысядзібны парк захаваўся ў в. Забалоцце. Яго арганізацыя засноўвалася на спалучэнні алей і прагулачных сцежак, якія размяжоўваюць тэрыторыю на садовыя ўчасткі. У рэпрэзентацыйную зону ўключаны канал, які агінае штучны востраў, у эканамічную — бровар.

Сядзібна-паркавы ансамбль стылю класіцызму існаваў у в. Малевічы (не захаваўся).

Помнікам народна-этнаграфічнага драўлянага дойлідства з'яўляецца вятрак, які стаіць

Ветраны млын у в. Ляды.

на паўднёва-заходняй ускраіне в. Ляды. Пабудаваны ў канцы 19 ст. з дрэва млын шатровага тыпу з 2 жанравымі паставамі ўяўляе сабой 8-гранную ўсечаную піраміду каркаснай канструкцыі, якая стаіць на драўляным падрубе. Завершаны 8-гранным шатром, які паварочваецца вакол вертыкальнай восі. Асновай канструкцыі з'яўляецца магутны слуп — матавіла, на які насаджана кола-шасцярня, што прыводзіць у рух жарнавыя паставы (цяпер мае электрычны прывад).

А.М.Кулагін.

Матэрыяльная культура Жлобіншчыны

Грунтоўных даследчых прац па матэрыяльнай культуры Жлобіншчыны пакуль не напісана. У мясцовым краязнаўчым музеі захоўваецца 7800 экспанатаў, з іх 253 этнаграфічныя адзінкі і 74 па мастацтву. Але фонды не могуць сказаць столькі, колькі можна пабачыць на свае вочы з сучаснага культурнага жыцця галоўнага носьбіта этнасу — вёскі. Таму, каб вызначыць сучасны стан і традыцыі ў фальклоры праз народныя рамёствы, іншую атрыбутыку матэрыяльнай культуры, аўтару давялося разам з загадчыкам раённага аддзела культуры Артурам Шнэйдарам паехаць па вёсках. Мы наведалі наступныя вёскі: Шчадрын, Навозы, Радуша, Баршчоўка, Чарцёж, Чырвоны Бераг, Майскае, Абольцы, Васілевічы, Затон, Стрэшын. Экспромтам зробленае даследаванне народнай творчасці

дазваляе данесці нашчадкам звесткі пра тое, наколькі таленавіты, працавіты люд жыве ў наш час на Жлобіншчыне. Разруха пасля рэвалюцыі, перажытыя дзве вайны не змаглі заглушыць мастацкую творчасць народа.

Прыблізнае ўяўленне аб колькасным ліку носьбітаў матэрыяльнай і духоўнай культуры на сучаснай Жлобіншчыне дае распачатая ў 1990-я гг. ўстановамі культуры картатэка ўліку таленавітых людзей. Так, з картатэкі в. Радуша можна даведацца, што тут налічваецца 18 умельцаў: разьбяры, вышывальшчыцы, шаўцы, майстры лазапляцення, карункапляцення. Калі дадаць 8 музыкантаў і 18 спявачак, якія ўдзельнічаюць у фальклорным калектыве, а ў вольныя гадзіны вышываюць, вяжуць, то становіцца відавочным — вёска мае права ганарыцца сваімі талентамі. Але наша даследаванне паказала, што тут не ўсе таленты ўлічаны. У картатэцы ідзе фіксацыя тых умельцаў, якія прадстаўляюць свае рэчы на выставы, але ж ёсць катэгорыя майстроў, такіх як кавалі, печнікі, пекары і іншыя, якія застаюцца па-за ўвагай.

Картатэку ўліку вядуць не толькі дамы культуры, але і бібліятэкі, але тут таксама робіцца спроба фіксаваць майстроў рамёстваў і амаль не ўлічваюцца носьбіты духоўнай культуры, якія стаяць бліжэй да спецыфікі бібліятэчнай справы: самадзейныя паэты, казачнікі, танцоры, музыкі, лекары. Пачынаючы з 1980-х гг. у мясцовае мастацтва Жлобіншчыны была прыўнесена новая плынь праз народныя вырабы перасяленцаў з паўднёвых раёнаў рэспублікі. Квяцістыя вышыўкі Палесся павінны з цягам часу дадатна паўплываць на мясцовую народную творчасць. Але мы звярталі ўвагу толькі на традыцыйную культуру гэтага рэгіёна.

Сучаснае мастацтва Жлобіншчыны мае вельмі павучальны прыклад таго, як простае, непрыкметнае народнае рамяство можа ўзняцца на значную вяршыню майстэрства і перарасці ў промысел, дзякуючы апантанасці майстра і падтрымцы з боку мясцовай улады. Так, ля вытокаў Жлобінскай фабрыкі інструктацыі стаялі муж і жонка Дзегцярэнкі. Ім удалося адрадзіць пры дапамозе мастакоў-прафесіяналаў адзін з традыцыйных відаў народнай творчасці беларусаў — аплікацыю саломкай.

У пасляваенныя гады Вера Дзехцярэнка, каб атрымаць нейкі заробак, вырашыла ўпрыгожваць аплікацыяй шкатулкі, якія майстраваў муж. А пажылыя людзі ёй падказалі, што некалі клей варылі з вішнёвай смалы. Гэтая фабрыка зараз — візітная картка Жлобіншчыны. Яе вырабы знаходзілі не раз пакупніка за межамі Беларусі, прыцягвалі ўвагу наведвальнікаў прэстыжных міжнародных выстаў.

Ёсць на Жлобіншчыне вёскі, дзе жывуць стараверы. Тут людзі не гаваркія, насцярожаныя. Жывучы больш за 2 стагоддзі ў беларускамоўным асяроддзі, яны цудоўна здолелі захаваць акцэнт рускай мовы, сваю веру, звычаі, нават вёскі будавалі асобна: Баршчоўка, Змяёўка.

Нам удалося пабываць у вёсцы Чарцёж, якая ўваходзіць у рэгіён, дзе жывуць каталікі: Марусенькі, Дубравы, Сенажаткі, Антушы...

У раёне адметнымі рысамі вылучаліся фальклор і этнаграфія яўрэяў, якія жылі ў Жлобіне і па вёсках Казімірава, Стрэшын, Шчадрын, Лугавая Вірня, Пірэвічы, Салтанаўка, Чырвоны Бераг. Нават у назвах некаторых вёсак ёсць адбітак яўрэйскай мовы — Эрштэрмай, якую цяпер замянілі на Адраджэнне. Яўрэі працавалі шаўцамі, шорнікамі, кавалямі, займаліся дробным гандлем, рамізніцкім промыслам, агародніцтвам, рабілі сыры. Цікавы падзел наглядаўся ў родзе заняткаў нават сярод жанчын Жлобіншчыны. Так, беларускі займаліся ў асноўным ткацтвам, рускія стараверкі — вышыўкай, а яўрэйкі — вязаннем.

Мастацтва пачынаецца з таго, як аздоблена хата: франтоны, карнізы, ліштва акон, платы, а дапаўняецца кветнікамі пад вокнамі кожнага дома.

Хаты ў асноўным драўляныя, радзей з цэглы. На ўскрайку некаторых сучасных вёсак калгасы пабудавалі некалькі вуліц са стандартнымі, тыпавымі праектамі для сваіх прыезжых работнікаў ці перасяленцаў з Чарнобыля: Майскае, Чырвоны Бераг.

Большасць хат па вёсках глядзяць на вуліцу дзвюма, радзей трыма вокнамі, маюць адно ці два ў франтоне, але сустракаюцца вёскі, як, напрыклад Салонае, у якіх амаль усе хаты гасцінца зіхацяць ажно трыма вокнамі.

Сустракаюцца адзінкавыя хаты з вокнамі без ліштвы, замест яе, каб не заліваў дождж, прыбіта ўверсе пад нахілам дошчачка.

Хаты ў асноўным ашаляваныя, пафарбаваныя. У размалёўцы нельга ўбачыць стандарту, бо кожны гаспадар імкнецца размаляваць на свой густ: вылучаючы франтоны адным ці двума колерамі, карнізы можа расфарбаваць

і ў тры, а вось ліштва ўсюды аднолькавая — белая ў рэгіёне Майскае, Чырвоны Бераг, у зоне Стрэшына яна пафарбавана ў два колеры: сіне-жоўты, зялёна-жоўты, сіне-белы. Асабліва прыгожыя франтоны хат з геаметрычна ўкладзенай шалёўкай нам давялося пабачыць па вёсках, якія знаходзяцца пры дарозе ў напрамку Жлобін—Шчадрын. Вільчыкі і вуглы хат у гэтым рэгіёне не маюць мастацкага аздаблення.

Карнізы, ліштвы выразаны скразной разьбой у спалучэнні з аплікацыяй, узоры геаметрычныя або раслінныя. Гаспадар, калі меў здольнасці і час, імкнуўся рабіць аздабленне сам, іншыя заказвалі спецыяльным майстрам — столярам. Так, у в. Навозы стылёвыя рысы ліштвы многіх акон сведчаць, што іх рабіў у 1950-е гг. майстар з суседняй вёскі Пякалічы.

У вялікіх вёсках, некалі мястэчках, такіх, напрыклад, як Шчадрын, Чырвоны Бераг, архітэктура старых пабудоў нагадвае аб культуры нацыянальнай меншасці — яўрэяў. Яны будавалі свае хаты не перпендыкулярна вуліцы, як беларусы, а паралельна — з 2 ўваходамі: адзін з вуліцы, другі — з двара. Такі тып пабудовы быў абумоўлены родам заняткаў — гандлем, дзе адзін уваход служыў для пакупнікоў, другі — для сваіх патрэб.

Цікавую з'яву можна пабачыць у в. Радуша — хаты, упрыгожаныя звонку кветкамі, як у гаспадыні Валянціны Згурскай: зіхаціць шматкаляровымі букетамі на белым фоне, хто ні ідзе вуліцай, міжволі ўсміхаецца. Спачатку яна сама спрабавала размалёўваць, а потым дапамог Васіль Целяпень. Яго работы і на іншых хатах, і нават на платах па заказу гаспадароў намаляваў ён белых птушак і шматкаляровыя кветкі.

Ліштва акон новых дамоў Жлобіншчыны нагадвае — столяры ў пагоні за модай нібы распачалі спаборніцтва, імкнучыся больш складана, багата аздобіць акно, адыходзячы ад традыцыйнага тыпу дэкору. Так, калі раней у аздабленні акна галоўны акцэнт рабіўся наверсе, што імітавала нібы карону, а ўнізе выразалі некалькі някідкіх дэталяў узору, то цяпер пачалі выразаць узоры нават па баках ліштвы.

Хаты па вёсках абгароджаны платамі, у большасці драўлянымі, пафарбаванымі. Дошчачкі плоту фарбуюць у два—тры колеры, цікава падбіраючы рытмічны паўтор. У в. Шчадрын можна заўважыць высокія, пахілыя ад старасці брамы з узорамі, таксама пафарбаваныя ў пэўных месцах так, каб выдзеліць колерам нейкія дэталі. Адметны, добра захаваны пляцень у в. Затон узгадвае, як абгароджвалі свае сялібы нашыя продкі шмат стагоддзяў назад. Сплялі яго з розных па таўшчыні лазовых пруткоў, а галінкі размеркавалі так, што пляценне ўтварыла ўзор пэўнай фактуры.

Да новай пабудовы варта аднесці летнія кухні, якія даволі часта сустракаюцца ў сучасных вялікіх вёсках.

Вёска на Жлобіншчыне, так, як і па ўсёй рэспубліцы, пачала губляць свой эмацыянальны, узнёслы характар з канца 1920-х гг., калі пачалі нішчыць архітэктуру святыняў, разбураць пабудовы заможных гаспадароў, а таксама вялізныя гумны пры кожнай гаспадарцы.

Калі зойдзеш у вясковую хату, то бачыш — значны акцэнт у аздабленні інтэр'ера належыць куту, дзе знаходзяцца абразы. Па тым, як яны размеркаваны, можна беспамылкова вызначыць канфесійную прыналежнасць гаспадара. Так, у праваслаўных хрысціян абраз вісіць у куце, а абапал яго могуць знаходзіцца два меншага памеру, пакрытыя ручнікамі. Некаторыя гаспадыні ўпрыгожваюць іх серабрыстай паперай з выразанымі ўзорамі ці самаробнымі кветачкамі, якія размеркаваны на абразе пад шклом.

У каталікоў (вёскі Навозы, Чарцёж) абраз вісіць пры куце на сцяне, а калі два, то адзін на адной, а другі — на іншай, не маюць ніякага аздаблення: ні ручнікоў, ні кветак.

У стараверaў (вёска Баршчоўка) абраз адзін ці некалькі стаяць у куце на палічцы, якая пакрыта сурвэткай, тут прымацаваны свечкі, а кут таксама занавешаны гардзінай.

У некаторых хатах Стрэшына абраз знаходзіцца ў адным з куткоў кухні, за фіранкай, і ў гэтым адбіваюцца захады ідэалогіі ваяўнічага атэізму, які прымушаў вернікаў ісці на хітрыкі.

На падлозе ў вясковай хаце ляжаць ходнікі: шырокія прамысловага гатунку, самаробныя тканыя ў гарызантальныя паскі, сшытыя з кавалачкаў тканіны, або сплеценыя кручком — шыдэлкам з рыззя.

На ложках ляжаць велізарныя падушкі, пакрытыя бялюсенькімі сурвэткамі, або спецыяльныя накідкі з гардзіннага палатна. Ложкі засланы пакрываламі прамысловага гатунку, радзей — саматканымі посцілкамі.

Сціплае аздабленне абразоў у сучасных вёсках з'яўляецца адгалоскам традыцый

асобнага віду народнай творчасці — выразанак з паперы, ці выцінанак. Гісторыя выразанак бярэ пачатак з тых часоў, як беларусы навучыліся вырабляць паперу, таму мы не выпадкова шукалі на Жлобіншчыне вытокі і такога рамяства. Асартымент рэчаў з паперы ў народным побыце быў даволі разнастайны: фіранкі, сурвэткі, кветкі, стужкі, галаўныя ўборы, цацкі на ёлку, калядныя зоркі, абажуры. Такі від народнай творчасці сёння на Жлобіншчыне існуе, нягледзячы на тое, што даўно не выстрыгаюць фіранак. Ён паціху зіхаціць каляровай паперай у аздабленні абразоў па ўсіх вёсках, у тым ліку і ў Абольцах. Гэтае традыцыйнае рамяство не перарасло тут у промысел, як сталася з аплікацыяй саломкай, і не атрымала далейшага распаўсюджвання як асобны жанр народнага сучаснага мастацтва. Ручнікі на абразах, самаробныя посцілкі на ложках, ходнікі на падлозе сведчаць пра развіццё ткацтва. Некалі ткацтва з'яўлялася адным з самых распаўсюджаных рамёстваў. У Дзянісавічах, Кабанаўцы, Шчадрыне і цяпер жывуць умельцы, якія ў маладосці ткалі і нават такі занятак лічылі сваім адпачынкам пасля цяжкай працы ў полі. У в. Васілевічы прызнанымі аўтарытэтамі ткацтва лічаць Кацярыну Лябядзька, Валянціну Дзямбіцкую, Ксеню Рудзянок.

Самыя старыя з захаваўшыхся ручнікі вытканы тут у 2 ніты, палатняным перапляценнем і толькі некалькі тканых ці вышываных каляровых пасак упрыгожваюць іх канцы. Ручнікі і абрусы, што ткала ў маладосці стогадовая Фёкла Кавалёва з в. Майскае, вытканы «ў ёлачку».

Даўжыня ручнікоў Жлобіншчыны ад 180 да 300 см, шырыня — 45—48 см. Можна меркаваць, што да 19 ст. ткалі старадаўняй тэхнікай «брань», аб чым сведчаць ручнікі з в. Касакоўка з арнаментам, які мае назву «сонейка ўзыходзячае» і «сонейка заходзячае».

Недахоп лёну ў гэтай мясцовасці імкнуліся кампенсаваць за кошт ткацтва сеткавых абрусаў. Аснову пракідвалі ў бярдо праз пэўныя інтэрвалы і пры ткацтве атрымоўвалася сеткавае палатно. Выткаўшы пэўны адрэзак, бралі іголку з ніткай і перапляталі ёй ніці вутка і асновы ў пэўных месцах, з'ядноўваючы іх — рабілі мярэжку. Такія сеткавыя рэчы мелі не толькі прыгожы выгляд, але і моц, ніколі не гублялі свой першапачатковы выгляд. Калі абрусы былі вытканы нават у 2 ніты, то яны мелі таксама знак сваёй мастацкай вартасці — 2 палавінкі (бёрды былі вузкія) з'ядноўвалі нешырокай палоскай звязаных шыдэлкам карунак, а з чатырох бакоў прышывалі самаробныя кутасы ці таксама карункі. Варта нагадаць, што беларускія кабеты ніколі не засцілалі стол кавалкам палатна, а заўсёды рупіліся прыдаць рэчы закончаны самастойны выгляд, уносячы сюды элементы пэўнай эстэтычнай вартасці.

Посцілкі тут у асноўным чатырох- і шасцінітовыя, маюць у аснове льняныя ніці, а вуток — воўна. Пераборныя посцілкі ў в. Васілевічы называюць «накладанне», яны маюць чорны фон і шматкаляровы ўзор. Такой тэхнікай пачалі ткаць з канца 19 ст. ў панскіх маёнтках, а потым перанялі яе і вясковыя кабеты. У 1950—70 гг. квацістыя посцілкі лічыліся вельмі моднымі.

Некалі даводзілася майстрыхам вырабляць самастойна тканіну і для пашыву адзення, для сподняга — у аснове і вутку былі ніці льняныя, а для верхняга — аснова — лён, вуток — воўна. Таму, напрыклад, мужчынскія штаны з саматканага сукна ў Стрэшыне называліся «суконнікі».

Ткацтва Жлобіншчыны прыкметна ўступае па тэхналогіі, арнаменту, асартыменту ад такога ж рамяства, напрыклад, Міншчыны. І тут сказаўся не недахоп талентаў, а пастаянная занятасць жанчыны на рабоце ў калгасе ды праблема сыравіны. Са слоў жанчын в. Майскае, лён ужо ў канцы 1920-х г. не сеялі на сваіх сотках, яго мелі права ўзяць тыя, хто апрацаваў яго ў калгасе. А вось у в. Васілевічы аж да вайны кожны гаспадар сеяў лён, сушыў яго ў печы.

Выткаўшы палатно, майстрыхі вышывалі на ім ўзоры. Вышытыя рэчы па вёсках стракаюцца старыя і новыя, зробленыя ўручную і на машыне. Асартымент першых: ручнікі, абрусы, накідкі на падушкі, а другіх — фіранкі на вокны, накідкі на падушкі. Рэчы ручной вышыўкі заўсёды рыхтавалі майстрыцы кожная для сябе, а на машынную прымалі заказы, у тым ліку і ў в. Дворышча. У в. Чарцёж аднавяскоўцы лічаць самым лепшым майстрам гатавання і вязання Аляксандру Шацілу. А ў хаце Франі Давыдзенкі з в. Кіцін — сапраўдны маленькі музейчык: тут усе рэчы яна вышыла сваімі рукамі, хоць доўгія гады працавала свінаркай.

Самыя старыя з ацалелых вырабаў маюць узор са спалучэння чырвонага і чорнага колераў, а з 1950-х гг. стала моднай шматкаляровая гама. Тэхніка распаўсюджаных тут вышытых рэчаў: крыжык, гладзь, сцяжок, а ма-

шыннай — валік. Новая модная тэхніка вышыўкі стала распаўсюджвацца па вёсках Жлобіншчыны з 1980-х гг. — пачалі майстраваць дываны спецыяльнай іголкай, якая давала магчымасць атрымаць узор з неразрэзаных петляў. Такія дываны вышываюць, напрыклад, Валянціна Рогава з в. Касакоўка.

У большасці вышытыя ўзоры крыжыкам запазычаны з альбомаў, якія выпускалі ў пачатку 20 ст. фірмы «Брокар і К°», «Рале і К°», і нават з абгортачнай паперы тых часоў. Прадукцыя гэтых фірм прыўнесла ў беларускі нацыянальны арнамент чужыя элементы і матывы. Сярод вышытых узораў таксама можна ўбачыць малюнкі, якія прапаноўваў часопіс «Работніца і сялянка» ў 1950-х гг. У Жлобіне прызнанымі аўтарытэтамі вышыўкі лічаць настаўніцу Алену Ген і журналістку Людмілу Шадукаеву, першая любіць вышываць гладдзю, другая — крыжыкам.

Пры ўваходзе ў кожную вясковую хату на падворку, плоце ці ў сенцах можна заўважыць кошыкі, сплеценыя з лазы. Лазапляценне — адзін з старадаўніх відаў народнай творчасці, які ўзнік раней чым, нават, апрацоўка дрэва — так лічаць археолагі. Умовы гаспадарання прымушалі беларусаў ствараць рэчы сваімі рукамі, карыстаючыся мясцовай сыравінай, таму не магла застацца па-за ўвагай і лаза, карэнні, кара, ляшчына, маздра дрэў, з якіх плялі патрэбныя ў хатнім побыце рэчы. У наш час асартымент лазяпляцення па вёсках захаваўся адзін — плятуць кошыкі з лазы для бульбы, а займаюцца такім рамяством тут у асноўным старыя. Майстры такой катэгорыі ёсць у в. Баршчоўка — Хомка Падшывалаў, Цімафей Сяргееў; у в. Ляды называюць Уладзіміра Сергіенку, Уладзіміра Рамянка, а ў в. Мормаль — Віктара Шатава. У в. Папаратнае з лазы плятуць бондары Віктар Шарнік, Павел Герцаў, якія могуць на заказ змайстраваць любую рэч і нават лапці. Лапці ў экспазіцыі невялічкага пакойчыка — музея пры сельскай бібліятэцы в. Папаратнае глядзяцца сівой архаікай і выклікаюць усмешку ў дзяцей. А вось была б тут інфармацыя аб тэхніцы лазапляцення, вядомай у Беларусі: паслойнае, простае, радамі, квадратнае, вяровачкай, ажурнае, спіральнае, крыжападобнае, — і паказана, якія з іх характэрны для сваёй мясцовасці, да таго ж хоць раз у месяц каб сюды запрасілі старэнькага майстра на гадзіну-другую, каб ён паказаў, як плясці, тады б не ў аднаго дзіцяняці ўзнікла б жаданне самому спасцігнуць сакрэты рамяства. Сёння ёсць па вёсках адзінкі такіх умельцаў, як Віктар Лапіцкі ў в. Рэкта, Аляксей Карпаў у в. Навозы. Асартымент іх вырабаў даволі разнастайны: вазы, цукерніцы, рамкі, кошычкі і іншыя. Да канца 1950-х гг. у Шчадрыне дзейнічала арцель па вырабу рэчаў з лазы. Сыравіны для такога рамяства хапала — лаза расла па берагах рэк, на заліўных лугах. Арцель у свой час лічылася значнай з'явай у культурным жыцці раёна.

Мясцовую сыравіну — гліну людзі выкарыстоўвалі пры вырабе ганчарных рэчаў і глінянай дзіцячай цацкі. Багатыя залежы на правым беразе Дняпра садзейнічалі росквіту ганчарнага рамяства. Можна меркаваць, што такое майстэрства тут існавала спрадвеку. Пісьмовыя крыніцы нагадваюць, што ў 1600 г. ў Стрэшыне існавалі цэхі ганчароў, якія налічвалі адных толькі ганчароў 27 чалавек. Гэта сведчыць, што на ганчарныя вырабы меўся значны попыт.

У канцы 1920-х гг. на Жлобіншчыне працавала 12 майстроў, а ў 1930-я гг. — 2. Цяжкія ваенныя і пасляваенныя гады садзейнічалі адраджэнню гэтага рамяства. У Жлобіне і Стрэшыне былі створаны майстэрні ганчароў. Як успамінае вядомы беларускі пісьменнік, тэлежурналіст, ураджэнец в. Мормаль Уладзімір Содаль, у пасляваенныя гады ў Жлобіне на кірмашы ён бачыў мноства ганчарнага посуду, і яму запомнілася, як спявалі хорам збаны.

Апошнім таленавітым ганчаром ў Стрэшыне, які памёр у 1980-х гг., быў Андрэй Яненка. Сакрэты яго ўмельства пераняў Уладзімір Пакроўскі, які жыве ў в. Затон. Добра ведае традыцыі мясцовага ганчарства і Юзаф Марчэўскі.

У былых цэнтрах ганчарнага рамяства сёння працуюць толькі цагельныя заводы ў Стрэшыне, Змяёўцы і інш.

Не магла застацца па-за ўвагай умельцаў такая сыравіна, як дрэва, паколькі Беларусь спрадвеку славіцца лясамі. Разьба па дрэву заўсёды лічылася мужчынскім заняткам. З дрэва будавалі хаты, майстравалі мэблю, рэчы хатняга ўжытку, музычныя інструменты. На запыт аб мясцовых лепшых столярах жыхары в. Чырвоны Бераг назвалі Івана Жураўлёва, Уладзіміра Літвінку, у в. Чарцёж — Міхаіла Ліпніцкага. Мастацкі ўзровень прац столяраў в. Майскае Сямёна Кавалёва, Пятра Селіванава бачны ў аздабленні хат гэтай мясцовасці, а першы яшчэ размалёўваў прасніцы, ложкі, сані. Так, у в. Абольцы ляснік

Віктар Гаўрыленка адмысловы столяр і пячнік.

У наш час адна катэгорыя столяраў працуе ў калгасных і саўгасных майстэрнях. Тут іх творчыя захады стрымліваюцца нормамі дзяржстандарту. Нягледзячы на гэта, іх працы ў пэўным сэнсе маюць навуковую каштоўнасць, бо яны паўтараюць мясцовыя традыцыі. Другая катэгорыя ўмельцаў — настаўнікі працы, малявання, чарчэння агульнаадукацыйных школ, вучылішчаў, якія закончылі навучальныя ўстановы, дзе пазнаёміліся з апрацоўкай дрэва. Так, у школе в. Радуша ў свой час працавалі настаўнікі Міхаіл Паркалаў, Драздоў. Іх хаты адразу прыцягваюць увагу сваім аздабленнем. Уяўляе цікавасць творчасць Пятра Лісава са Жлобіна. Ён не толькі адмыслова аздобіў сваімі рукамі хату, але майструе на такарным станку скульптурную пластыку малых форм: фігуркі звяроў, падсвечнікі і інш. Адным з вядомых разьбяроў Жлобіншчыны, які ў сваёй творчасці імкнуўся спаборнічаць з прафесійнымі скульптарамі, быў Міхаіл Івінскі. Ён пачаў займацца разьбой яшчэ ў 1930-я гг. З партрэтнай работай «Варашылаў на манеўрах» прымаў удзел у дэкаднай выставе беларускага мастацтва ў Маскве ў 1940 г. У рэльефе ён выканаў некалькі тэматычных кампазіцый, сярод якіх «Разведка», «У абарону міру», «Рэйкавая вайна», «Наша артылерыя». У 1970-х гг. майстэрства разьбяра дасягнула значнага ўзроўню, яго работа «Партызан» знаходзіцца ў экспазіцыі Жлобінскага краязнаўчага музея.

За стагоддзі ўзнік асобны від народнага мастацтва — пісанкі, размаляваныя ўзорамі чырвоныя велікодныя яйкі. На Жлобіншчыне ўсюды, дзе мы былі, старыя людзі казалі аб крашанках, г.зн. яйках, пафарбаваных у лушпінні цыбулі, а ў в. Навозы кажуць «цыбульніку», у Майскім — «шалушкай», у Васілевічах — «шалупкамі». Лушпінне цыбулі на ноч замочвалі, а назаўтра ў ім варылі яйкі. Каб колер быў ярчэйшым, у в. Чырвоны Бераг сюды дадавалі расол ад кіслых буракоў.

На Жлобіншчыне была вядома такая тэхніка пісанак, як аплікацыя, калі лісточкі ад маладзенькай бярозкі, парэчак прыкладвалі да яйка, загортвалі ў марлю і варылі ў лушпінні цыбулі, на чырвоным яйку атрымоўваліся белыя ўзоры.

Такая народная творчасць, як пекарская пластыка мае непарыўную сувязь з вясельным абрадам, двума хрысціянскімі святамі — Дабравешчаннем (Звеставаннем) і Пяцідзесятніцай. Цеста з мукі — прыдатная сыравіна для выяўлення скульптурных здольнасцей жанчын. Беларускія майстрыцы імкнуліся спячы не толькі смачныя пірагі, булачкі, пернікі, але клапаціліся і аб іх аздабленні. Нават у такім жанры народнай творчасці магчыма прасачыць, як даюць аб сабе знаць мясцовыя традыцыі, дзе пэўны тып аздаблення паўтараецца толькі ў адной або некалькіх суседніх вёсках. Свае адметныя рысы мае пекарская пластыка і па вёсках Жлобіншчыны. Напрыклад, у рэгіёне Чырвонага Берага рабілі некалі для дзяцей булачкі ў выглядзе птушачкі, якія называлі «сарокамі». Майстравалі іх так: раскатвалі цеста ў круглы пасак даўжынёй 6—8 см. Адзін канец прыўзнімалі і ляпілі галоўку з дзюбкай, другі — таксама прыўзнімалі, загіналі ў адваротны бок, потым наразалі нажніцамі, што імітавала хвост птушкі. Вясельныя караваі таксама ўпрыгожвалі птушачкамі такой жа формы, толькі спярша па краі размяркоўвалі круглыя шарыкі і «садзілі» на іх сарок. Да Дабравешчання і Пяцідзесятніцы пяклі пернікі, булачкі, якія таксама мелі выяву птушачак.

Народная кулінарыя — таксама сур'ёзны аб'ект у справе навуковага даследавання культуры. Майстэрства прыгатавання ежы — кухня — з'яўляецца адным з элементаў матэрыяльнай культуры. Пры даследаванні пытанняў народнай кулінарыі яна цікавая ў першую чаргу як тыповая з'ява, што знаходзіцца ў цесным узаемадзеянні з іншымі элементамі культуры, напрыклад, з мастацтвам: пісанкі, пекарская пластыка. Народная кухня гэтага рэгіёна дазваляе прасачыць, як многія характэрныя асаблівасці ежы ўстойліва захоўваюцца нават тысячагоддзямі, маючы цесную сувязь з рэлігіяй. Цікава было пачуць па вёсках Жлобіншчыны пра 3 розныя рэцэпты прыгатавання ежы, названай адным і тым жа тэрмінам — клёцкі. Першы рэцэпт — дзерлі бульбу, адцэджвалі, дадавалі мукі ці крухмалу, качалі ў далонях невялікія галушкі і кідалі варыць у кіпячонае малако. Другі — у сярэдзіну галушак, толькі большага памеру, закладвалі мясны фарш і варылі ці тушылі. У вёсках Чыровны Бераг, Майскае іх называюць яшчэ «калдунамі». Трэцяя — пяклі тоненькія блінчыкі з крухмалу, наразалі і варылі ў малацэ, такую ежу ў в. Чарцёж таксама называлі клёцкамі.

Да складаной стравы патрэбна аднесці мачанку. Адны рыхтавалі так: варылі свіное мяса, рэбры, костачкі, каўбасу і ў такі навар да-

баўлялі некалькі лыжак мукі, потым прыправы: цыбулю, кмен. Мачалі бульбянымі бліна-мі — дранікамі. Для мучных бліноў рэцэпт мачанкі быў іншы: сушаны сыр разбівалі на кавалачкі, дадавалі смятаны, масла і тушылі ў печы. Яўрэі рабілі мачанку з курынага ці трусінага мяса.

У святочныя дні, у тым ліку і нядзелю, гатавалі ежу не такую, як на кожны дзень. Напрыклад, раніцой кожнага дня маглі для мужчын хутка спячы снеданне з падсмажанага сала, куды ўбівалі некалькі яек. На абед у святочныя дні з яек рыхтавалі яешню: разбівалі іх дзесятак ці два, залівалі свежым малаком, дадавалі масла, цукар, соль і пяклі ў печы пасля таго, як пагараць усе дровы. Тут у яешню не дадавалі мукі, як, напрыклад, у Смаргонскім раёне.

У большасці дзеці елі малочнае і тое, што і дарослыя, але для іх рыхтавалі і спецыяльную страву. Так, напрыклад, адзін са значных прысмакаў у в. Пякалічы рыхтавалі наступным чынам. Варылі каліну, цёрлі, адцэджвалі, жмых выкідвалі. Асобна варылі нарэзаны кавалкамі гарбуз, адцэджвалі, таўклі і дадавалі калінавы сок. Усё перамешвалі, салілі, сыпалі, калі меўся цукар, клалі масла і ставілі ў печ тушыць.

Усюды па рэспубліцы варылі абабраную бульбу, таўклі, запраўлялі падсмажаным салам з цыбуляй ці маслам і свежым малаком. Гэтую страву на Жлобіншчыне называюць «топчанка».

За доўгія стагоддзі беларусы паназапасілі значны вопыт народнай медыцыны. Карысталіся нашы продкі травамі, выкарыстоўвалі для гэтай мэты і агародніну, хлеб, сала, ягады, самастойна рыхтавалі мазі. За час паездкі па вёсках Жлобіншчыны давялося пачуць ад людзей сталага ўзросту рэцэпты лекаў у вёсках Чырвонабярэжская Слабодка, Чарцёж, Чырвоны Бераг, г.п. Стрэшын. Народная медыцына Жлобіншчыны, так як і наогул усёй Беларусі амаль недаследавана.

Па вёсках Жлобіншчыны некалі мелася катэгорыя ўмельцаў, якія самі майстравалі музычныя інструменты з дрэва, кары, рогу, саломы, пер'я, гліны, скуры. Нам не ўдалося сустрэць майстра такой катэгорыі, але памяць пра іх захавалася сярод аднавяскоўцаў. У большасці самі майстры былі і музыкантамі. Так, у в. Селішча балалайкі майстраваў яшчэ пасля вайны Андрэй Сіманенка, а ў Майскім у 1930-я гг. вырабляў гармонікі, балалайкі столяр Фёдар Кавалёў. Яшчэ да вайны рэдка можна было сустрэць вёску, дзе не жыло б сваіх музыкаў. Так, у в. Навозы на працягу 1940—80-х гг. жылі музыканты Ян Казлоўскі (іграў на скрыпцы), Юзік Каліноўскі (на баяне, а яго бацька на гармоніку), Павел Некрашэвіч і Андрэй Шчыгельскі (на гармоніку). Кожны з музыкаў меў яшчэ барабан. У вёсцы Чарцёж прыпамінаюць свайго музыку Лявона Ліпніцкага, а ў Чырвонабярэжскай Слабодцы іграў на гармоніку і меў бубен Міхаіл Руткоўскі, у в. Зломнае — Барыс Сасноўскі, у Чырвоным Беразе — Майсей Кісялёў. У Стрэшыне пасля вайны жылі музыкі Гаўрыла Шыхаў і Аляксандр Рагаўцоў, сёння тут 7 гарманістаў, столькі ж баяністаў, адзін балалаечнік, жыве тут самадзейны кампазітар Валерый Міхальцоў. У 1960-х гг. меўся духавы аркестр. Гісторыя музычнай культуры Стрэшына чакае сваіх даследчыкаў, адсюль выйшлі многія музыканты, настаўнікі спеваў. Ілля Сімановіч з Чырвонага Берага іграе на гармоніку, піша вершы, малюе карціны алеем на рэлігійную тэматыку, якія можна пабачыць у храмах Стрэшына і в. Побалава Рагачоўскага раёна.

Адзін з яскравых здабыткаў нацыянальнай культуры — народны касцюм. Некалі кожная жанчына павінна была не толькі ўмець выткаць палатно, але і пашыць бялізну для сябе, мужа, дзяцей. Прастата крою рабіла гэтую задачу пасільнай нават для самых няздатных да такога рамяства. Верхняе адзенне звычайна неслі шыць майстрам: шаўцам, краўцам. Існуе магчымасць узнавіць касцюм Жлобіншчыны на працягу апошніх 100 гадоў па здымках, якія ёсць у кожнай хаце. Асобныя дэталі шляхетнага касцюма захаваліся ў в. Навозы.

Іншы бок мастацкай творчасці на Жлобіншчыне раскрываюць печнікі. Цудоўны атрымаўся б альбом, калі б музей дадумаўся сфатаграфаваць печы, печкі, пліты ў вёсках і мястэчках, тым больш, што сам час падганяе парупіцца такое зрабіць — газ прыйшоў і ў сельскую мясцовасць, старыя формы печы разбураюцца. У пабудове такіх рэчаў адлюстроўваюцца мясцовыя традыцыі, адчуваецца стыль работы кожнага майстра, яго вынаходства. Па вёсках бачна — адной формы печы стаяць у кухні з цэглы, іншай — у зале часам з кафлі. Мастацтва тут дае аб сабе знаць у суразмернасці, прапарцыянальнасці асобных дэталяў да цэлага памеру формы печы.

Умельству кавалёў некалі вучыліся не менш года. Усе кавалі цяпер працуюць на

прадпрыемствах ці ў калгасе, дзе іх сфера дзейнасці зводзіцца да рамонту і вырабу дэталяў для сельскагаспадарчых машын, але можна быць упэўненым: многія з іх так, як і іх продкі, змаглі б змайстраваць і плуг, і жырандоль. Вядомыя кавалі Аляксей Пазняк з в. Забродзе, Іван Дашкоўскі з Чырвонага Берага.

Сёння ў кожнай вёсцы можна налічыць не менш дзесятка кабет, якія вяжуць. Прызнаным аўтарытэтам па вязанні з'яўляюцца Ядвіга Новікава і Аляксандра Пазнякова з в. Чырвоны Бераг, Марфа Аляксеева з в. Баршчоўка. У в. Радуша вядомы майстры Галіна Малашанка, Наташа Горцава, Раіса Кардаш.

Пасля такога кароткага агляду работы носьбітаў матэрыяльнай культуры Жлобіншчыны зразумела, што таленты ў раёне не перавяліся, ён можа па праву ганарыцца перад усім светам творчым патэнцыялам сваіх людзей і эстэтычным узроўнем мясцовай культуры. Жыццё падказвае — наспеў час неадкладна парупіцца занатаваць беларускі фальклор кожнай вёскі, невялікага гарадка.

М.П.Жабінская.

Мова Жлобінскага раёна

Народная мова Жлобінскага раёна — беларуская. Народныя гаворкі на тэрыторыі Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці маюць свае адрозненні ад беларускай літаратурнай мовы, з якой яны вельмі блізкія. Моўныя мясцовыя адрозненні абумоўлены гісторыяй краю, яго геаграфічным становішчам.

Паводле «Этнографической карты белорусского племени» (1903) акадэміка Я.Ф.Карскага, жлобінскія гаворкі ў міжрэчы Бярэзіны і Дняпра характарызаваліся **ўмераным аканнем і вымаўленнем цвёрдага гуку** *р*. На «Диалектологической карте русского языка в Европе» (1914, складзена Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй) яны адносіліся да **паўднёва-заходняга дыялектнага масіву**. Беларускі лексікограф І.І.Насовіч і вядомы этнограф, фалькларыст Е.Р.Раманаў лічылі беларускія гаворкі спачатку адзіным масівам, які адчуў уплывы суседніх моў з усіх бакоў. На поўдні І.І.Насовіч (1850) вылучаў зону ўплыву ўкраінскай мовы ў Беліцкім павеце (сучасны Гомельскі раён). Е.Р.Раманаў вылучае абшар гаворак ад Нёмана і ад Прыпяці да Дзвіны і на захад ад Сажа на аснове сямі фанетычных, марфалагічных і лексічных асаблівасцей як цэнтральныя (1918). Сюды ўваходзіць і абшар Жлобіншчыны. Значны працэнт наяўнасці ўкраінізмаў у Жлобіне ён тлумачыць наяўнасцю воднага шляху па Дняпры.

Мясцовыя гаворкі Жлобінскага раёна паводле групоўкі дыялектаў (1969) на тэрыторыі Беларусі адносяцца даследчыкамі да паўднёвай групы гаворак, той яе пагранічнай часткі, якая цалкам увахо-

дзіць у склад сярэднебеларускіх гаворак. Апошнія займаюць сярэдняе становішча паміж паўночна-ўсходнім дыялектам і паўднёва-заходнім. Адзначаецца тут і паралельнае ўжыванне асаблівасцей слоў паўднёва-заходняга дыялекту і паўночна-ўсходняга. Пашырэнне моўных з'яў, назваў прадметаў, з'яў у жлобінскіх гаворках з'яўляецца пагранічным, ускраінай паўднёва-заходняга ці паўночна-ўсходняга дыялекту. Радзей адзначаюцца мясцовыя рысы, мясцовыя назвы, якія пашыраны толькі на тэрыторыі Жлобіншчыны. Часта словы ці моўныя асаблівасці маюць толькі ўсходняе пашырэнне ў складзе сярэднебеларускіх гаворак.

Фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, часткова лексічныя асаблівасці і наогул уся моўная сістэма Жлобінскага раёна вывучалася пасля Вялікай Айчыннай вайны. Усё гэта адлюстравана ў матэрыялах і картах «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963), у якім даецца мова шасці населеных пунктаў: Радуша, Навікі, Кароткавічы, Чорная Вірня, Праскурні, Шыхаў. Мова в. Шыхаў вывучалася ў 1970 г. па праграме «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа», рукапіс якога захоўваецца ў Інстытуце мовазнаўства НАНБ. У выніку 20-гадовага (з 1971) вывучэння слоў (назваў) на тэрыторыі Беларусі сабрана вялікая колькасць слоў па 56 тэматычных групах, складзены «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак у пяці тамах» (т. 1—2, 1993, 1994; т. 3—5, 1996—98). Абследаваны гаворкі двух населеных пунктаў — вёсак Шыхаў, Кароткавічы. У ат-

ласе больш за 25 000 слоўнікавых адзінак, 1801 карта, дзе паказана пашырэнне слоўназваў. Матэрыялам для выдання атласа з'явіліся каля 4000 найменняў прадметаў, прыкмет, працэсаў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Па кожным найменні або паняцці складзена асобная карта ўжывання, пашырэння слоў.

***

Тэмп мовы ў людзей Жлобінскага раёна павольны, вельмі выразны, скарагаворкі няма. Усе галосныя вымаўляюцца як падвоеныя тыпу *маладáя — маадладдадйад*. У гаворках Жлобінскага раёна, як і ў беларускай літаратурнай мове, старажытныя галосныя *о*, *а* не пад націскам, у першым складзе перад націскам *а* заўсёды пасля цвёрдых зычных вымаўляюцца як *а* (*вадá*, *смалá*, *самá*, *казáць*). Ва ўсіх іншых складах перад націскам і пасля націску ненаціскныя галосныя *о*, *а* супадаюць у вельмі выразным гуку *а* незалежна ад якасці націскнога галоснага і суседніх зычных. Напрыклад: першы склад перад націскам — *насíць*, *бяры́*, *кадýшка*, *вазóк*; другі склад перад націскам — *садавíк*, *малацíць*, *кажаны́*, *саладýха*, *чарапóк*; далейшыя склады перад націскам — *напапарабíлі*, *напалавалачы́лі* (дабра); абсалютны пачатак слова — *агарóд*, *агóнь*, *агадáць*, *агінáць*, *ачужáцца*; паслянаціскны неканцавы адкрыты склад — *мíлая*, *чáшачка*; канцавы і неканцавы закрыты склад — *мáмачка*, *я́блыкаў*, *вéдаць*, *гóрад*. Такое вымаўленне *а* без змены галосных у розных становішчах (у залежнасці ад націску, перад ім і пасля яго) называецца н е д ы с і м і л я т ы ў н а е п о ў н а е (м о ц н а е) а к а н н е.

Для гаворак Жлобінскага раёна характэрна моцнае яканне. Пасля мяккіх зычных вымаўляецца гук *'а(я)* ва ўсіх пазіцыях на месцы старажытных *е* і *а* і незалежна ад націскнога галоснага: першы склад перад націскам — *вяснá*, *бядá*, *бягóм*, *сядзéць*, *спяліць*, *мякíна*, *сянны́*, *пярýн*; другі склад перад націскам — *вяснавы́*, *спялавáты*, *вясялýн*, *ляснікóў*, *вясялéнькі*; трэці склад перад націскам — *зялянкавáты*, *вярацянóк*, *сямянніковы*; абсалютны пачатак слова — *ягадзíнка*, *якрáз*, *ясянёвы*; паслянаціскны неканцавы адкрыты склад — *вóзяра*, *сёлята*; канцавы і неканцавы закрыты склад — *вóсень*, *хлóпец*, *вíшням*; канцавы адкрыты склад у назоўным і вінавальным склоне адзіночнага ліку назоўнікаў ніякага роду з мяккай асновай — *камéння*, *вéцця*.

Аднак пры моцным яканні па жаданні гаворачага адзначаецца часам вымаўленне ў гэтых становішчах гуку *е*, як у масіве паўднёва-заходняга дыялекту, напрыклад: *веснá*, *верацянóк*, *зеленавáты*, *вóсень*, *хлóпец*. У прыстаўцы *пера-* вымаўляецца гук *е* і скарочаны варыянт гуку *ь*: *перамы́ць*, *пераня́ць*, *пьерапёлка*, *пьраня́ць*, *пьрайéхаць*. У канцовым адкрытым складзе ў канчатку меснага склону адзіночнага ліку, напрыклад у в. Радуша, паралельна адзначаецца вымаўленне *е* (у *хáце*, у *лéсе*) ці як у вёсках Чорная Вірня, Шыхаў — *і* (*у хáці*, *у лéсі*). Вымаўленне з *і* пашырана па ўсёй Беларусі, а вымаўленне з *е* найбольш канцэнтруецца ў паўднёва-заходнім дыялекце. У в. Шыхаў адзначаецца я к а н н е д ы с і м і л я т ы ў н а е б е л а р у с к а г а т ы п у (жыздрынскае), калі перад націскным *а* на месцы старажытнага *е*, *ѣ* вымаўляецца *і* (*німá*, *вíснá*, *nimá*, *зíмля*). Перад іншымі націскнымі галоснымі вымаўляецца *'а(я)* (*сядзéць*, *вядзí*, *нясí*, *нясý*, *бярóм*, *бяры́*). Такое вымаўленне, відаць, абумоўлена пагранічным становішчам гаворкі.

Гаворкі Жлобінскага раёна, як у масіве сяроднебеларускіх гаворак, маюць свае мясцовыя асаблівасці. Напрыклад, на месцы старажытнага *у* вымаўляецца *ы*: *сыбóта* (вёскі Кароткавічы, Навікі, Праскурні, Радуша, Чорная Вірня, Шыхаў).

Можна адзначыць вымаўленне гуку *у* на месцы старажытнага *ы* ў форме дзеяслова *былá* (была — вёскі Чорная Вірня, Шыхаў). Спалучэнні з санорнымі патрабуюць ва ўсіх жлобінскіх гаворках з'яўлення ў пачатку слова прыстаўнога і тыпу *іржаны́*, *ільняны́*. Па жаданні пачатковы галосны можа не вымаўляцца (*льняны́*). У міжрэччы Бярэзіны і Дняпра, каля Шыхава, на левым беразе Бярэзіны, у суседняй в. Горваль Рэчыцкага раёна, паралельна з агульнабеларускім вымаўленнем *даў*, *казáў* ужываецца форма *доў*, *прóўда*, *казóў*, *узёў*. Паводле даследавання Н.Т.Вайтовіч (в. Лучын Рагачоўскага раёна) і іншых назіранняў такое вымаўленне адзначаецца і ў традыцыйных гаворках Слаўгарадчыны (Пасожжа): *тráўка — тróўка*, *кляў — клёў*. Відаць, гэта рэшткі агульнабеларускай старажытнай рысы. На правабярэжжы Бярэзіны і Дняпра, а таксама па Прыпяці да р. Случ і на захад ад Убраці пераход *е* ў *ё* не адзначаецца. Вельмі пашыранае вымаўленне слова *бёрда* на паўночным усходзе

рэспублікі ў жлобінскіх гаворках (вёскі Праскурні і Шыхаў) мае паралельнае ўжыванне формы і без ё (*бе́рда*). Дзве формы — *бе́рда* і *бёрда* — суцэльным масівам пашыраны ў басейне Прыпяці. Літаратурная форма слова *далёка* пашырана ў жлобінскіх гаворках, але ўжо на правабярэжжы Бярэзіны (і ніжэй Дняпра) вымаўляецца амаль толькі *далёка*. І зноў жа ў басейне Прыпяці пануе форма *далёка* паралельна з *дале́ка*.

У словах **лес**, **хлеб**, **на назе́** не адзначана наяўнасць закрытых галосных на месцы старажытнага яця (ѣ) пад націскам. З паўднёвага захаду да Жлобіншчыны падыходзіць пашырэнне закрытых галосных (звужанае вымаўленне *е*, на слых з і̯-падобным прыступам) — *лёс*, *хлёб*, *на назе̂*. Басейн Прыпяці з вымаўленнем «закрытых» (*кёнь*, *дём*) блізка падыходзіць да Бярэзіны і Дняпра. У гаворках Жлобінскага раёна пашырана агульнабеларуская форма дзеясловаў з націскной галоснай пасля шыпячых у інфінітыве і формах прошлага часу тыпу *маўча́ць*. На паўночным усходзе адзначаецца масіў з паралельным ужываннем формаў з націскным галосным *э* тыпу *маўчэ́ць*. Як і ў большасці беларускіх гаворак, пашырана вымаўленне займеннікаў *мы*, *вы*. Аднак ужо на правабярэжжы Бярэзіны і Дняпра, у басейне Пцічы, Случы, ніжняй Прыпяці адзначаюцца паралельныя формы *му*, *ву*. Побач з агульнапашыраным словам *быў* адзначаецца вымаўленне *буў*. На месцы старажытнага *ы* пасля губных зычных у канчатках назоўнікаў мужчынскага роду назоўнага склону множнага ліку вымаўляецца толькі *ы*: *пагрябы*, *хлявы*. Вельмі блізка да Бярэзіны пашырана вымаўленне *у* замест *ы*: *пагрябу́*, *хляву́*.

Характэрнай асаблівасцю для Жлобіншчыны з'яўляецца вымаўленне цвёрдага *р*. Праз вёскі Праскурні і Шыхаў Жлобінскага раёна і Сведскае Рэчыцкага раёна праходзіць размыты пояс вымаўлення *р* цвёрдага і *р'* мяккага. Цягнецца ён з Брэстчыны, пераважна з правабярэжжа Прыпяці, на ўсходзе Магілёўшчыны і Віцебшчыны.

Гук *ф* у запазычаных словах замяняецца гукам *х*, *п*, спалучэннем *кв*, *хв* і інш. Пашырана, напрыклад, вымаўленне слова *квасо́ля* (*фасо́ль*). На ўсходзе да Дняпра падступае ўжо паўночна-ўсходні масіў пашырэння формы *квасо́ль*.

Адрозніваюцца таксама глухія і звонкія ў канцы слова: *хлеб*, *нож*, *луг*, але: *кот*, *наш*, *мох*. На паўночным захадзе ад Жлобіншчыны — на Бабруйшчыне і ў бліжэйшай в. Дворышчы Светлагорскага раёна паралельна адзначаецца вымаўленне глухіх-звонкіх у канцы слова: *хлеп*, *нош*, *плух*, *кот*, *мох*. Ёсць выпадкі, калі звонкія зычныя не адрозніваюцца ў сярэдзіне слова: *каска*, *загатка*, *кошка*, *шапка* (в. Праскурні).

Перад націскнымі *о*, *у* ўжываецца зычны *в* (*во́зера*, *ву́ха*). Як і ва ўсіх гаворках Беларусі на Жлобіншчыне ва ўказальных займенніках *гэ́ты*, *гэ́ны* пануе прыстаўны зычны *г*(γ). Паралельна з *гэ́ты*, *гэ́ны* пашырана вымаўленне займеннікаў *э́ты*, *э́ны*.

З'яўленне зычнага ёта *j*(*й*) пасля спрадвечных мяккіх губных *б*, *п*, *в* ушчыльную падыходзіць да правага берага р. Бярэзіна: *п'яць*, *в'я́не*, *жэрэб'я́* (*пйаць*, *вйа́не*, *жэрэбйа́*). У гаворках Жлобінскага раёна, як у літаратурнай мове і ў большасці беларускіх гаворак, такое з'яўленне зычнага ёта *j*(*й*) перад *а* не адзначаецца.

Для Жлобіншчыны характэрна наяўнасць мяккіх *ць* ці *дзь* у пазіцыі перад старажытным *е*, *і*, *ѣ* (*цень*, *дзень*, *ці́ха*; *дзед*, *це́ста*).

У гаворках раёна мае месца спалучэнне *шн* у словах тыпу *мало́шны*. У правабярэжжы Бярэзіны больш частым, нават пануючым з'яўляецца спалучэнне *чн* тыпу *мало́чны*. Такое ж становішча і са спалучэннем *шн* у вымаўленні слова *рушні́к*. На паўднёвым захадзе пашырана форма *ручні́к*.

Граматыка. Марфалагічныя асаблівасці. Назоўнік. На Жлобіншчыне, як і ў гаворках паўночнага ўсходу левабярэжжа Дняпра, побач з агульнабеларускім націскным канчаткам *-ы* ў месным склоне адзіночнага ліку неадушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду з зацвярдзелай асновай маюць найбольшае пашырэнне (*на канцы́*, *на ключы́*). Вельмі пашыраны канчатак *-у* тыпу *на канцу́*, *на ключу́*. Радзей ужываецца *-э* тыпу *на канцэ́*, *на ключэ́*. Такі ж малюнак у неадушаўлёных назоўніках мужчынскага роду з мяккай асновай: *на пні* (пануе), *на пню* (як і на р. Сож), *на пне*.

Ненаціскны канчатак меснага склону адзіночнага ліку адушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду з цвёрдай асновай мае канчатак *-у*: *аб сы́ну* (пануе) і менш пашыраны канчатак *-е*: *аб сы́не*.

Ненаціскны канчатак творнага склону адзіночнага ліку назоўніка *гусь* мае форму (пануючую) *гу́ссю*. На правабярэжжы Бярэзіны, як і ў паўднёва-заходнім дыялекце, пашыраны формы *гусёю*,

гу́сяй, *гу́сяю*. Такое ж пашырэнне мае форма адзіночнага ліку назоўніка *мыш*: *мы́шшу*. На захадзе ад Бярэзіны пашыраны як паралельныя формы *мышо́ю*.

У назоўным склоне адзіночнага ліку назоўнікі, якія азначаюць маладых істот, маюць форму паўднёва-заходняга дыялекту *цяля́*, *парася́*. Тут жа назіраецца паралельнае ўжыванне, напластаванне паўночна-ўсходняй формы: *цялёнак*, *парасёнак*, а таксама *дзіцёнак* на пануючае пашырэнне формаў тыпу *дзіця́*.

Для творнага склону характэрна форма назвы маладых істот паўночна-ўсходняга дыялекту: *цялёнкам*, *парасёнкам*, якая паралельная да пануючай Маладзечанскай—Мінскай—Бабруйскай формы *цялём*, *парасём*. Да правабярэжжа Бярэзіны прымыкае «тураўская» зона пашырэння формы тыпу *цяля́м*.

У месным склоне паралельна ўжываюцца формы паўночна-ўсходняга дыялекту: *аб цялёнку* і паўднёва-заходняга дыялекту: *аб цяля́ці*.

На Жлобіншчыне мае пашырэнне слова *ма́тка* паўночна-ўсходняга дыялекту; форма *ма́ці*, якая цяпер пануе ў паўднёва-заходнім дыялекце, таксама паралельна адзначаецца, як больш старажытная, на тэрыторыі міжрэчча Бярэзіны і Дняпра.

Множны лік. У назоўным склоне пануе агульнабеларускі націскны канчатак *-ы* ў назоўнікаў мужчынскага роду з цвёрдай асновай (*стваль*, *дубы́*, *лагі́*). Падыходзіць пашырэнне з паўночнага захаду да Жлобіншчыны (в. Здудзічы Светлагорскага раёна) формаў тыпу *сталы́*, *дубы́*.

Пасля мяккіх і зацвярдзелых зычных канчатак *-і*, *-ы* (*кавалі́*, *нажы́*). З захаду да Бярэзіны наступае Нёманска-Прыпяцка-Бярэзінскі масіў, дзе паралельна ўжываюцца агульнабеларускія формы на *-е*, *-э*: *кавале́*, *нажэ́*.

Пашырана форма *бало́та*, але на правабярэжжы Бярэзіны больш часта адзначаюцца формы назоўнага склону множнага ліку *бало́та*, *балата́*.

З асновай на *к* у назоўным склоне множнага ліку ўжываецца агульнабеларускі ненаціскны канчатак *-і*: *дзеўкі*, *хусткі*. Да Бярэзіны з захаду падыходзіць масіў канчатка (паралельны) ужо пад націскам: *дзяўкі́*, *хусткі́*.

У родным склоне множнага ліку назоўнікі жаночага роду з цвёрдай асновай маюць дзве формы, як і на астатняй тэрыторыі Беларусі (*хат*, *сцен* і *ха́таў*, *сце́наў*).

У давальным склоне множнага ліку адзначаны толькі назоўнікі мужчынскага роду з цвёрдай і зацвярдзелай асновай з націскным канчаткам *-ам*: *дубам́*, *лугам́*, *нажам́* і няма раней пашыранага канчатка давальнага склону *-ом*: *дубо́м*, *луго́м*, *нажо́м*, якія больш сустракаюцца на паўднёвым захадзе рэспублікі.

Пры пануючым агульнабеларускім двухскладовым канчатку творнага склону множнага ліку назоўнікаў *-мі* (*за дама́мі*) на Жлобіншчыне адзначаны канчатак *-амы* (*за дама́мы*).

У месным склоне множнага ліку назоўнікі мужчынскага роду з асноў на цвёрды і зацвярдзелы зычны маюць агульнабеларускі канчатак *-ах* (*у ляса́х*, *на нажа́х*) і рэдка адзначаны націскны канчатак *-ох*, які тут быў пашыраны раней: у *лясо́х*, *на нажо́х*.

У месным склоне множнага ліку адзначаны таксама агульнабеларускі канчатак *-ях* (*аб людзя́х*, *у грудзя́х*) і форма з націскам на першым складзе (*аб лю́дзях*, *у гру́дзях*).

У гаворках Жлобінскага раёна пашырана ўтварэнне мужчынскага роду *я́блык*, як і ў Мінска-Гродзенска-Полацка-Віцебска-Бабруйскім кліне, а таксама пашырана ўтварэнне назоўніка ніякага роду *я́блыка*, якое пашырана ў Гродзенска-Бабруйска-Магілёўска-Віцебскім поясе. Тут адзначаецца *маё́ брыва́*, *маё́ брыво́*, як у паўднёва-заходнім дыялекце, а таксама *маё́ брывіна́*, *маё́ броў*, як у паўночна-заходнім дыялекце.

Прыметнік. Гаворкі Жлобіншчыны маюць націскны канчатак *-ы* мужчынскага роду тыпу *малады́* і ненаціскны — *но́вы*.

У прыметніках жаночага роду пад націскам канчатак *-ая* (*маладая́*) і не пад націскам таксама *-ая* (*но́вая*), як і ў літаратурнай мове. Толькі ў асобных населеных пунктах адзначаецца сцягнутая кароткая форма *маладá*, *но́ва* і *но́вая*.

Прыметнікі ніякага роду маюць пад націскам агульнабеларускі канчатак *-ое* (*маладо́е*) і не пад націскам агульнабеларускі канчатак *-ае* (*но́вае*).

У месным склоне пад націскам пашыраны агульнабеларускі і літаратурны канчатак *-ым* (*аб малады́м*) і паўднёва-беларускага (Гродна—Мінск—Рагачоў—Крычаў) абшару *-ом* (*аб маладо́м*).

Большасць склонавых формаў прыметнікаў у гаворках Жлобінскага раёна такія ж, як у беларускай літаратурнай мове. У міжрэччы Бярэзіны і Дняпра знаходзяць пашырэнне «дрыгавіцкія» формы адноснага мясцовага прыметніка ад слова *карова* — *каровяча*, *карóўяча* (в. Праскурні Жлобінскага раёна і Горваль Рэчыцкага раёна). Прыметнік *карóўя мáсла* трэба лічыць запазычаным з усходу.

Пашыраны агульнабеларускія і літаратурныя формы адносных прыметнікаў *свіны́*, *гусі́ны*, *курыны́*.

Займеннік. Той. Найбольш з усходу, на левабярэжжы Дняпра (ад в. Майсееўка Светлагорскага раёна) паралельна ўжываюцца формы *той* і *тэй*.

Усе. На тэрыторыі Жлобіншчыны праходзіць размыты пояс (палеска-віцебска-магілёўскі) пашырэння формы назоўнага склону множнага ліку азначальнага займенніка *увесь* (в. Чэрнін Светлагорскага раёна, в. Навікі Жлобінскага раёна) — *усі́*. Недалёка на захадзе і поўдні адзначаецца форма *усе́* з закрытым *е́*. Пануючай з'яўляецца агульнабеларуская і літаратурная форма *усе́*.

Наш. Ваш. Пашыраны аднаскладовы канчатак займеннікаў *наш*, *ваш*, *на́ша*, *ва́ша* (*хáта*), але з правабярэжжа Бярэзіны і з поўначы ўшчыльную набліжаны масіў з наяўнасцю двухскладовых канчаткаў: *на́шая хáта*, *ва́шая хáта*. Пры пашыраным агульнабеларускім займеннику *гэ́ты* ўжываюцца формы займеннікаў *йі́хні*, *йі́хны*.

Лічэбнік. У р о д н ы м і давальным склонах лічэбнік *два* мае літаратурныя і агульнабеларускія формы *двух*, *двум*, а таксама паўднёвую (Гродна—Мінск—Магілёў) — *двох*, *двом*. Такое пашырэнне апошніх формаў схематычна супадае з тэрыторыяй рассялення дрыгавічоў, і толькі Пасожжа не ахоплена дрыгавічамі.

У творным склоне ва ўсіх жлобінскіх гаворках, як і ў літаратурнай мове, пануе форма *двумá*. Толькі на поўначы, у міжрэччы Бярэзіны і Дняпра (в. Дварэц Рагачоўскага раёна, в. Плёсы Бабруйскага раёна) і на левабярэжжы Дняпра (в. Забаб'е Буда-Кашалёўскага раёна) ужо больш пашырана, паралельна з формай *двумá* — *двумя́*.

Форма ж творнага склону *трымá* лічэбніка *тры*, якая характэрна для літаратурнай мовы і большасці беларускіх гаворак, не адзначана на Жлобіншчыне, у міжрэччы Бярэзіны і Дняпра. Тут пашыраны паўночнаўсходні дыялект — *трымя́*, *трымі́* і нават *тремá*.

Дзеяслоў. Форма 3-й асобы адзіночнага ліку дзеяслова I спражэння з націскам на канчатку ў гаворках Жлобіншчыны пануе без- *ць*. На левабярэжжы Дняпра адзначана паралельная форма з *-ць* паўночна-ўсходняга дыялекту: *ідзе́ць*, *бярэ́ць*.

З націскам на аснове без канчатка *-ць* 3-й асобы адзіночнага ліку пашыраны дзеясловы I спражэння тыпу *кáжа*, *мéле*, *грэ́бе*. Адзначаюцца толькі паралельныя адзінкавыя формы з *-ць*: *коліць* (в. Праскурні Жлобінскага раёна), *не можыць* (в. Горваль Рэчыцкага раёна).

У 1-й асобе множнага ліку цяперашняга часу дзеясловаў I спражэння застаецца цвёрды зычны асновы і націскны галосны тыпу *ідóм*, *кладóм*, *нясóм*. Тэрыторыя пашырэння такога вымаўлення (Слаўгарад—Магілёў—Мінск—Баранавічы—Пінск) гістарычна адпавядае тэрыторыі былой Тураўскай зямлі. Гэта асаблівасць паўднёва-заходняга дыялекту і часткова пагранічча на поўдні сярэднебеларускіх гаворак. У ненаціскным канчатку пашыраны канчатак *-ям* (*мéлям*, *знáям*), а таксама *-ем*: *мéлем*, *знаéм*.

У 2-й асобе множнага ліку ў жлобінскіх гаворках існуе націскны галосны паўднёва-заходняга дыялекту тыпу *несяцё*, *ідзяцё*, і толькі ў в. Радуша Жлобінскага раёна, в. Дварэц Рагачоўскага раёна і на левабярэжжы Дняпра — націскны канчатак тыпу *нясіцё*, *ідзіцё*, які характэрны для паўночна-ўсходняга дыялекту.

У 3-й асобе адзіночнага ліку дзеяслова II спражэння з націскам на аснове характэрны агульнабеларускі канчатак *-іць*: *ён нóсіць*, *хóдзіць* і паралельна сярэднебеларуская форма без *-ць*: *нóся*, *хóдзя* (в. Навікі Жлобінскага раёна).

1-я асоба множнага ліку цяперашняга часу дзеясловаў II спражэння мае націскны канчатак *-ім* (*сядзі́м*). 2-я асоба — націскны канчатак *-іцé* (*сядзіцé*), толькі на левабярэжжы Дняпра пашырана паўночна-ўсходняя форма з канчаткам *-ицё* (*сідзіцё*).

У 3-й асобе множнага ліку пануе ненаціскны канчатак *-яць* (*хóдзяць*); толькі за Дняпром, на ўсходзе знаходзіцца масіў з канчаткам *-юць* (*нóсюць*).

Жлобінскія гаворкі знаходзяцца ў масіве, дзе ў парадыгме заднеязычных *г*, *к*, *х* чаргуецца з *ж* толькі ў 2-й асобе множнага ліку тыпу *стрыгу́*, *стрыжэ́ш*, *стрыгóм*, *стрыгу́ць*.

Гэта зона схематычна накладваецца на тэрыторыю былой Тураўскай зямлі.

Пры агульнабеларускай форме 3-й асобы множнага ліку нетэматычнага дзеяслова *е́сці — ядзу́ць* у басейне Бярэзіны фіксуецца пашыраная форма *ядзя́ць*.

На Жлобіншчыне пануе агульнабеларуская форма 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу дзеясловаў I спражэння тыпу *ідзі́ця, нясі́ця*. Тут адзначаецца таксама пашырэнне з-за Дняпра формы інфінітыва тыпу *несць* і паралельнае ўжыванне формы тыпу *не́сці*, а таксама больш пашыранай формы з націскам на канчатку *нясці́*, якая найбольш часта ўжываецца на захадзе, поўначы і поўдні ад Мінска.

Формы дзеясловаў з асновай на *г* і на *к* прыпяцкай канцэнтрацыі тыпу *берагці́, пе́кці* маюць суцэльнае пашырэнне і знаходзяцца на самым пагранічча з вельмі густа пашыранымі формамі на поўначы тыпу *берагчы́, пячы́* і інш.

Дзеепрыметнік. У гаворках Жлобінскага раёна ад дзеясловаў *замкну́ць, замыка́ць* утвараецца дзеепрыметнік *замкну́ты*. У зоне ад Лані, да Дняпра і Бярэзіны побач з формай *замкну́ты* пашырана форма *замы́каны*. Гэта тэрыторыя схематычна супадае з тэрыторыяй Тураўскай зямлі (13 ст.). Зрэдку адзначаецца ўтварэнне *замкнёны*.

Дзеепрыслоўе. Ужываецца агульнабеларуская і літаратурная форма дзеепрыслоўяў цяперашняга часу ад дзеясловаў II спражэння тыпу *хо́дзячы, но́сячы*.

Словаўтварэнне і націск

Характэрны толькі агульнабеларускія формы з націскам на аснове: *ве́рба, ву́гал, ву́галь, зага́дка, засе́к, ро́шчына, ары́хі*. Агульнабеларускае месца націску на канчатку — *жнівó, нагу́* (В. скл. адз. л. ж. р.), *малы́*.

З паўночна-ўсходняга масіву пашыраны формы тыпу *таўсты́, ма́лы, прасты́, вясёла, хало́дна, прыхаджу́*.

Сінтаксічныя асаблівасці

Пашырана агульнабеларуская і літаратурная форма назоўнікаў ніякага роду ў спалучэнні з лічэбнікамі *два, дзве, тры, чатыры вакны́*. І толькі на захадзе, за Бярэзінай, на былой тэрыторыі рассялення дрыгавічоў апрача папярэдняга спалучэння вельмі часта ўжываюцца паралельныя спалучэнні тыпу *два* (*дзве, тры, чатыры*) *вакне* і *два* (*дзве, тры, чатыры*) *вакна́*, як *балата́* і інш.

Ёсць таксама формы жаночага роду *дзве* (*тры, чатыры*) *хаце*. Такое ж спалучэнне дзеясловаў з формамі вінавальнага склону множнага ліку адушаўлёных назоўнікаў жаночага роду, якія абазначаюць жывёл, пры агульнабеларускіх і літаратурных формах *падаі́ла карóў*.

Уся Жлобіншчына ўваходзіць у масіў заходне-паўднёвага пашырэння спалучэння *вучы́ цца за до́хтара* і з'яўляецца пагранічнай тэрыторыяй з такім жа густым пашырэннем на паўночным усходзе спалучэння *вучы́цца на до́хтара*.

Тут жа сутыкаецца агульнабеларускае спалучэнне прыназоўніка *па* з вінавальным склонам назоўніка тыпу *па ба́цьку* са спалучэннем з адушаўлёнымі назоўнікамі ў творным склоне, які мае пашырэнне на паўночным усходзе, — *за ба́цькам*.

Такое ж пашырэнне мае спалучэнне *ісці́ за вадо́й* пры агульнабеларускім пашырэнні выразу *ісці́ па ваду́*.

Паводле «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963) на Жлобіншчыне пашыраны наступныя назвы:

Адры́на. Тое, што *пуня*. *Азыро́д*. Прыстасаванне ў выглядзе лесвіцы для сушэння снапоў, вікі, гароху і канюшыны (у межах дрыгавіцкага рассялення, фіксуецца да Дняпра). *Ба́ба*. Саха ў студні з жураўлём (в. Навікі Жлобінскага раёна). *Вязёнкі*. Шарсцяныя рукавіцы з адным пальцам. *Гарбу́знік* і *гарбузо́ўнік*. Сцяблы і лісце гарбузоў. *Гурко́ўнік*. Сцяблы і лісце агуркоў. Тое, што *агурэ́чнік*. *Карто́фля*. Слова *бульба* стала ўжывацца ў 18 ст. пры нямецкім пасрэдніцтве (на правабярэжжы Бярэзіны і на ўсёй тэрыторыі рассялення дрыгавічоў). *Квако́ха*. Курыца з куранятамі і *квактуха*. *Лемяша́* (у плузе), *сашні́к* (басейн Прыпяці). *Ца́мра, цэ́мра*. Зруб у студні (вёскі Навікі, Радуша Жлобінскага раёна). *Цёсь-цёсь*. Падзыванне кароў.

У «Лексічным атласе беларускіх народных гаворак у пяці тамах» (1993—98) таксама адлюстроўваецца пагранічча паўночна-ўсходніх і паўднёва-заходніх беларускіх гавораў на Жлобіншчыне.

Паўночна-ўсходні дыялект і прымыкаючыя да яго гаворкі Жлобінскага раёна як пагранічныя з паўднёва-заходнім дыялектам. *Табу́н* у значэнні 'табун коней' — *чарада́*; *ра́бая — рабая́*; *скаба́ка, заскабіць — стрэ́мка, застраміць*; *селязе́нь — качар*; *кнігаўка — кніга*; *вуці́нае пе́р'е — качы́нае пе́р'е*; *дуплё — дупле́*; *цяпло́* (касцёр, вогнішча) — *агóнь*; *васілёк* (кветка); *валóшка* —

валóшка; *макрыца* (трава) — *макрэ́ц*; *сурáвéжка* — *сырáéжка*; *скалíць* (разведваць — пра пчол) — *скаляваць*; *прарасло́* (насенне) — *пахрасцíлася*; *зніцéлі* ці *зніцелі* (зрабіліся тонкімі, квольмі) — *сцяклí* (буракі ў траве); *хрáпка* (сарцавіна качана) — *хрáпа*; *лапáтка*, *лапáтачка* (ручная веялка, якая мае форму шуфліка) — *вéялка*; *зярнó* (адно зерне) — *зéрне*; *катóк* (у возе) — *кóла*; *вóжкі* — *лéйцы*; *грыбáты* (з тоўстымі губамі); *барадáўкі* (цвёрдая нарасць на скуры чалавека) — *барóдаўкі*; *братавáя* (братава жонка) — *брацíха*; *сярэ́дні сын* — *серадэ́льшы*; *зáсек* — *засéк*; *шы́бка* (аконнае шкло) — *шы́ба*; *вóсеньскі* — *асéнні*; *закáп(а)ваць* — *закóп(а)ваць*.

Паўночна-заходні дыялект і прымыкаючыя да яго гаворкі Жлобінскага раёна як пагранічныя з паўночна-ўсходнім дыялектам. *Стáда авéчак* — *табýн авéчак*; *грабýць грáды* — *дзярýць грáды*; *рахмáная кýрыца* — *ручнáя*, *рукáстая кýрыца*; *пýдкая кýрыца* — *дзíкая кýрыца*; *гусянí* — *гусёнак*, *гусянёнак*; *хвóя* — *саснá*; *ялóвец* — *ялéнец*; *крапівá* — *крапíва*; *канапéлькі* — *мядýлькі*; *жы́жка* — *жыгýчка*; *ваўчкí* — *сабáчкі*; *асакá* — *сакá*; *краснагалóвік* — *падасíнавік маслю́к* — *казёл*; *адлéга* — *адлíга*; *гýра* (снегу) — *сугрóб*, *хýра*; *хрáпа* (мёрзлая зямля) — *грýда*; *разóра* — *баразнá*; *вяно́к цыбýлі* — *пляцёнка*; *сенажáць* (сенакосныя ўгоддзі) — *луг*; *пацярýха* — *патрýха*; *стаўпéц* (у граблях) — *брусóк*; *ручка* (дзяржанне ў лапаце) — *цаўё*; *цýглі*, *цýглі* (у аброці) — *груздзíлы*, *грýздзіла*; *лупáты* — *вірлавóкі*; *манá* — *брахня́*; *шлакатáць*, *слакатáць* — *шчыкатáць*; *серадóльная* — *сярэ́дняя*; *глёўкі* (хлеб) — *ацéслівы*; *скварóк сáла* — *шквáрка*.

Гаворкі Жлобінскага раёна, якія паводле пашырэння ўжывання некаторых слоў адносяцца да сярэднебеларускіх. *Адóнак* (стагавішча), *дабрáк*, *дóбрык*, *дóбры грыб* (баравік), *ікóл* (у свіней), *калóчанка* (трасянка), *капанíчыць* (мачыць бульбу), *сёлетак* (веснавое цяля), *скалля́* (пчолы-разведчыкі) і інш.

І.Я.Яшкін.

Жлобінскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей

МАЛЫЯ КАЗЛОВІЧЫ, пасёлак у Майскім сельсавеце, у калгасе «Ленінец». На 2000 г. 22 двары, 33 жыхары. Магазін.

МАЛЫЯ РАГІ, вёска ў Салонскім сельсавеце. У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 11 двароў, 89 жыхароў. У 1910 г. 12 двароў, 127 жыхароў. На 2000 г. 18 двароў, 34 жыхары.

МАРУСЕНЬКА, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у саўгасе-тэхнікуме. У 1897 г. аколіца Лукаўскай воласці, 24 двары, 126 жыхароў. У 1910 г. 18 двароў, 115 жыхароў. На 2000 г. 32 двары, 55 жыхароў.

МОРМАЛЬ, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Уперад». Чыгуначная станцыя. Назва, магчыма, ад нямецкага слова мормаль — балотца. У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 101 двор, 821 жыхар; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 2 ветракі, кузня, піцейны дом. У 1907 г. 130 двароў, 989 жыхароў, народнае вучылішча (60 вучняў). У 1910 г. 128 двароў, 1023 жыхары. На 2000 г. 215 двароў, 476 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа-сад, клуб, бібліятэка, кінаўстаноўка, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, сталовая. У цэнтры вёскі брацкая магіла 427 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1952 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. За 1,5 км на ПдЗ ад вёскі ў 1979 г. ўстаноўлены знак — камень на месцы подзвігу М.П.Жуйкова і П.М.Мазіліна. Каля школы помнік — воінам-вызваліцелям М.П.Жуйкову і П.М.Мазіліну. Устаноўлены ў чэрвені 1984 г.; на бетоннай сцяне выявы агнявой кропкі і галоў двух байцоў, пліта з надпісам: «Лейтэнант Жуйкоў Мікалай Пятровіч і старшы сяржант Мазілін Піліп Мікалаевіч у баі за в. Мормаль 1 сакавіка 1944 г. грудзьмі закрылі амбразуру варожага дзота. Вечны ваш подзвіг — у сэрцы пакаленняў».

НАВІКІ, вёска ў Малевіцкім сельсавеце, у саўгасе імя В.І.Казлова. У 1897 г. вёска Лукаўскай воласці, 39 двароў, 203 жыхары, збожжазапасны магазін, вятрак. У 1910 г. 46 двароў, 208 жыхароў. На 2000 г. 30 двароў, 64 жыхары.

НАВОЗЫ, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Варашылава. У 1897 г. засценак Сцепскай воласці, 31 двор, 176 жыхароў. У 1909 г. 40 двароў, 230 жыхароў. На 2000 г. 18 двароў, 28 жыхароў.

НІВЫ, вёска ў Салонскім сельсавеце, цэнтр саўгаса-камбіната «Нівы». Чыгуначны раз'езд. У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 62 двары, 297 жыхароў, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, вятрак. У 1907 г. 80 двароў, 355 жыхароў. У 1910 г. 81 двор, 701 жыхар. На 2000 г. 312 двароў, 812 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, урачэбны ўчастак, сярэдняя школа-сад, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысло-

вых і тавараў паўсядзённага попыту, сталовая. Брацкая магіла 2 байцоў 63-га стралковага корпуса, якія загінулі ў жніўні 1941 г. У 1977 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

НІЖНЯЯ АЛБА, вёска ў Верхне-Албянскім сельсавеце, у калгасе «Праўда». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 72 двары, 556 жыхароў, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 3 ветракі, піцейны дом. У 1910 г. 94 двары, 694 жыхары. На 2000 г. 92 двары, 183 жыхары. Магазін.

НОВАВІНАГРАДАЎ, вёска ў Навамаркавіцкім сельсавеце, у калгасе «Бярэзіна». На 2000 г. 18 двароў, 42 жыхары. Магазін.

НОВАЯ КАМЕНКА, вёска ў Стрэшынскім пасялковым Савеце, у калгасе «1-е Мая». На 2000 г. 6 двароў, 8 жыхароў.

НОВАЯ КАРМА, вёска ў Папаратнянскім сельсавеце, у калгасе «Іскра». У 1897 г. пасёлак Якіма-Слабадской воласці, 12 двароў, 193 жыхары. На 2000 г. 40 двароў, 76 жыхароў. Магазін. У цэнтры вёскі помнік на ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Пастаўлены ў 1967 г.

НОВАЯ МАР'ЕЎКА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе «Прагрэс». На 2000 г. 17 двароў, 12 жыхароў.

НОВАЯ СЛАБАДА, вёска ў Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». На 2000 г. 18 двароў, 13 жыхароў.

НОВЫЯ ЛУКІ, вёска ў Лукскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Лукскі». На 2000 г. 260 двароў, 693 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, пачатковая школа, Дом культуры, сельская бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, сталовая. У цэнтры вёскі помнік на ўшанаванне памяці жыхароў вёсак Беліца, Зялёная Даліна, Лебядзёўка, Грушачка, Лукі, Новыя Лукі, пасёлкаў Вярбічаў, Грушачка, Лукскі, Чырвоная Горка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Устаноўлены ў 1982 г., уяўляе мемарыяльную сцяну, на якую занесены прозвішчы загінуўшых.

НОВЫЯ МАРКАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Бярэзіна». На 2000 г. 155 двароў, 493 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, магазіны харчовых і тавараў паўсядзённага попыту, сталовая. Каля будынка сельвыканкома брацкая магіла 225 савецкіх воінаў і 6 партызан, якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. і ў час партызанскага руху. У 1955 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. За 1,5 км на ПнЗ ад вёскі на тэрыторыі былой Каменскай МТС помнік ахвярам фашызму. У верасні 1941 г. гітлераўцы і паліцэйскія па-зверску знішчылі 12 мірных жыхароў в. Таўстыкі і актывістаў калгаса «Звязда». На ўшанаванне іх памяці ў 1983 г. збудавана жалезабетонная сцяна з выявай чалавечых постацей і прозвішчамі закатаваных.

НЯСОЕЎ БАРОК, пасёлак у Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі».

ПАДЛЕССЕ, вёска ў Майскім сельсавеце, у саўгасе «Бабоўскі».

ПАДХВАЁВА, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Уперад». У 1909 г. вёска Якіма-Слабадской воласці, 34 двары, 189 жыхароў. На 2000 г. 3 двары, 3 жыхары.

ПАПАРАТНАЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 93 двары, 738 жыхароў; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 3 ветракі, кузня, піцейны дом. У 1910 г. 105 двароў, 781 жыхар. На 2000 г. 361 двор, 893 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, сталовая. Каля Дома культуры брацкая магіла 1294 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1954 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. У цэнтры вёскі помнік на ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Пастаўлены ў 1967 г.

ПІРЭВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Пірэвіцкі». У 1886 г. вёска Старарудняншкай воласці, 93 двары, 570 жыхароў; бровар, вадзяны млын. На 2000 г. 486 двароў, 1252 жыхары. Спіртзавод, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аптэка, участковая бальніца, сярэдняя школа, дапаможная школа-інтэрнат, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, царква (пабудавана ў 1902 г. з цэглы). У цэнтры вёскі брацкая магіла 185 савецкіх воінаў і 6 партызан, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1955 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура

воіна. Помнік на ўшанаванне памяці жыхароў вёскі Верны, Колас, Кругавец, Новая Слабада, Пірэвічы, Рудзенка, Салтанаўка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Пастаўлены ў 1976 г., уяўляе трохгранны абеліск, на гранях якога — прозвішчы загінуўшых.

ПІРЭВІЧЫ, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Уперад». На 2000 г. 2 двары, 3 жыхары.

ПІЦЕРАЎКА (да 1962 г. Гурская), вёска ў Кіраўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. На 2000 г. 1 двор, 1 жыхар.

ПЛЕСАВІЦКАЯ СЛАБОДКА, вёска ў Кароткавіцкім сельсавеце, у калгасе «Радзіма». У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 35 двароў, 259 жыхароў. На 2000 г. 116 двароў, 324 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая школа, клуб, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазін. У цэнтры вёскі ў 1979 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці жыхароў вёсак Буда, Забалацце, Плесавічы і Плесавіцкая Слабодка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ПЛЕСАВІЧЫ, вёска ў Кароткавіцкім сельсавеце, у калгасе «Радзіма». Назва, магчыма, ад тэрміна плёс — участак ракі, вадаём з роўным дном. У 1886 г. сяло Сцепскай воласці, 28 двароў, 250 жыхароў, царква. У 1897 г. 66 двароў, 390 жыхароў; царква, царкоўна-прыходская школа, збожжазапасны магазін. У 1909 г. 63 двары, 469 жыхароў. На 2000 г. 61 двор, 115 жыхароў. Магазін.

ПРАСКУРНІ, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, цэнтр калгаса «50 год БССР». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 134 двары, 947 жыхароў; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 2 ветракі, кузня. У 1907 г. 152 двары, 1060 жыхароў. У 1910 г. 145 двароў, 1078 жыхароў. На 2000 г. 226 двароў, 569 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, 2 магазіны, сталовая. Каля будынка Дома культуры і праўлення калгаса ў 1969 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці жыхароў вёсак Затон і Праскурні, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ПРЫБУДАК, вёска ў Навамаркавіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Звязда». У 1897 г. пасёлак Якіма-Слабадской воласці, 26 двароў, 193 жыхары. У 1909 г. 65 двароў, 283 жыхары. На 2000 г. 139 двароў, 392 жыхары. Магазін. У цэнтры вёскі брацкая магіла 51 савецкага воіна, якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1966 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ПЯКАЛІЧЫ, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Варашылава. У 1886 г. сяло Сцепскай воласці, 22 двары, 225 жыхароў, царква. У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 55 двароў, 412 жыхароў, капліца, збожжазапасны магазін. У 1909 г. ў вёсцы 67 двароў; маёнтак, 1 двор, 71 жыхар. На 2000 г. 52 двары, 89 жыхароў. Магазін.

РАДУЦІН, вёска ў Стрэшынскім пасялковым Савеце, у калгасе «1-е Мая». На 2000 г. 16 двароў, 25 жыхароў.

РАДУША, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Калініна. У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 121 двор, 867 жыхароў; збожжазапасны магазін, заезны двор. У 1909 г. 137 двароў, 1068 жыхароў. На 2000 г. 347 двароў, 805 жыхароў. Аддзя-

Дом культуры ў в. Пірэвічы.

ленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, урачэбны ўчастак, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, 2 магазіны, сталовая. У цэнтры вёскі брацкая магіла 7 савецкіх воінаў і 8 партызан, якія загінулі ў ліпені 1941 г., чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху, 27 чырвонаармейцаў заставы, якія ў 1919 г. загінулі ў баі з палякамі каля г.п. Парычы. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. Побач з брацкай магілай савецкіх воінаў магіла актывіста В.І.Каваленкі, які загінуў 8.3.1924 г. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск. Каля Дома культуры ў 1967 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці жыхароў вёсак Баршчоўка, Змяёўка, Кругі, Лобск, Радуша, Святое, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

РУБЕЖ, пасёлак у Малевіцкім сельсавеце, у саўгасе імя Казлова. На 2000 г. 7 двароў, 13 жыхароў.

РУДЗЕНКА, вёска ў Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». У 1897 г. вёска Старарудняскай воласці, 25 двароў, 233 жыхары, вятрак. У 1910 г. 36 двароў, 171 жыхар. На 2000 г. 67 двароў, 116 жыхароў. Магазін. За 1 км на Пд ад вёскі пры скрыжаванні дарог Жлобін—Гомель, Скепня—Салтанаўка месца гібелі Л.Р.Пятроўскага. Загінуў 17.8.1941 г., у 1944 г. перапахаваны ў брацкай магіле ў в. Старая Рудня. У 1979 г. на месцы гібелі замест абеліска (1945 г.) устаноўлена сцяна з надпісам-прысвячэннем.

РУДНЯ, вёска ў Навамаркавіцкім сельсавеце, у калгасе «Звязда». У 1907 г. 87 двароў, 472 жыхары, царкоўна-прыходская школа (40 вучняў). У 1910 г. вёска Лукаўскай воласці, 110 двароў, 770 жыхароў. На 2000 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

РЭКТА, вёска ў Лукскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Рэкцянскі». Назва, магчыма, ад латышскага слова рыектыс — арэх. На 2000 г. 290 двароў, 797 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, пачатковая школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны тавараў паўсядзённага попыту і нарыхтоўчы, сталовая. У цэнтры вёскі брацкая магіла 97 савецкіх воінаў, якія загінулі ў ліпені—жніўні 1941 г., чэрвені 1944 г. пры абароне і вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. На будынку школы ў 1976 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка ўраджэнцу в. Грачухі, Герою Савецкага Саюза П.А.Странакову, які вызначыўся восенню 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра.

САВЕЦКАЯ (да 30.7.1964 г. Амерыка), вёска ў Старарудняскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. На 2000 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

САЛАНОЕ, вёска, цэнтр сельсавета і птушкафабрыкі. Назва, магчыма, ад літоўскага слова сала — востраў ці старажытнарускага салус — ручай. У 1886 г. сяло Стрэшынскай воласці, 88 двароў, 436 жыхароў, царква, народнае вучылішча, збожжазапасны магазін, крухмальны завод, вятрак, 2 вадзяныя млыны, сукнавальня, крама, піцейны дом. У 1907 г. 134 двары, 911 жыхароў, у 1910 г. 166 двароў, 1203 жыхары. На 2000 г. 480 двароў, 1468 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа-сад, клуб, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых, харчовых і тавараў паўсядзённага попыту, сталовая, царква. У цэнтры вёскі ў 1976 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці жыхароў вёсак Вялікія Рагі, Малыя Рагі, Саланое, Салонская Карма, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

САЛОНСКАЯ КАРМА, вёска ў Салонскім сельсавеце, у складзе птушкафабрыкі. На 2000 г. 8 двароў, 14 жыхароў. Магазін.

САЛОЦІН, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе «Прагрэс». У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 55 двароў, 370 жыхароў. У 1909 г. 359 жыхароў. На 2000 г. 58 двароў, 93 жыхары. Магазін.

САЛТАНАЎКА, вёска ў Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». Чыгуначная станцыя. У 1897 г. вёска Старарудняскай воласці, 22 двары, 151 жыхар, збожжазапасны магазін; чыгуначная станцыя, 1 двор, 48 жыхароў. У 1910 г. 21 двор, 169 жыхароў. На 2000 г. 176 двароў, 318 жыхароў. Магазін. Каля чыгуначнай станцыі брацкая магіла 27 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — абеліск і скульптура воіна.

СВЯТОЕ, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. На 2000 г. 18 двароў, 30 жыхароў.

СЕЛІВОНАЎКА, вёска ў Кіраўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. У 1907 г. 50 двароў, 429 жыхароў, царкоўна-прыходская школа (45 вучняў). На 2000 г. 30 двароў, 47 жыхароў. Магазін.

СЕЛІШЧЫ, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе «Прагрэс». У 1897 г. вёска

Гандлёвы цэнтр у в. Старая Рудня.

Дом культуры ў в. Старая Рудня.

Сцепскай воласці, 43 двары, 304 жыхары, збожжазапасны магазін. На 2000 г. 20 двароў, 31 жыхар.

СЕЛЬНАЕ, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Мормаль». На 2000 г. 43 двары, 76 жыхароў.

СКАРЫНА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Варашылава. На 2000 г. 25 двароў, 40 жыхароў. Магазін.

СКЕПНЯ, вёска ў Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». У 1886 г. сяло Стараруднянскай воласці, 94 двары, 501 жыхар, царква. У 1897 г. 170 двароў, 1233 жыхары, царква, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 3 ветракі, 2 кузні, алейня, піцейны дом. У 1907 г. 187 двароў, 1402 жыхары, народнае вучылішча (55 вучняў). У 1910 г. 155 двароў, 1212 жыхароў. На 2000 г. 294 двары, 606 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, сталовая, швейны цэх. Брацкая магіла 59 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў снежні 1943 г. пры вызваленні раёна і ў час партызанскага руху. Сярод пахаваных лётчык, Герой Савецкага Саюза І.А.Лазенка. У цэнтры вёскі помнік на ўшанаванне памяці жыхароў вёсак Баравуха, Нясоеў Барок, Скепня, Сухі востраў, Шчытнае, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Сцяна з імёнамі загінуўшых узведзена ў 1987 г.

СТАРАЯ РУДНЯ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Кірава. Чыгуначны раз'езд. У 1886 г. сяло, 71 двор, 436 жыхароў. Валасное праўленне, царква, школа. У 1897 г. 138

Жылыя дамы для жыхароў Чарнобыльскай зоны ў в. Старая Рудня.

двароў, 924 жыхары, царква, народнае вучылішча, валасное праўленне, збожжазапасны магазін, 4 ветракі, кузня, алейня, крама, пiцейны дом. У 1907 г. 162 двары, 1116 жыхароў, народнае вучылішча (104 вучні). У 1910 г. 125 двароў, 970 жыхароў. На 2000 г. 426 двароў, 952 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сельскі Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, магазіны прамысловых і харчовых тавараў. У цэнтры вёскі брацкая магіла 129 савецкіх воінаў, якія загінулі і памерлі ад ран у жніўні 1941 г., снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры абароне і вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных камандзір 63-га стралковага корпуса генерал-лейтэнант Л.Р.Пятроўскі. У 1958 г. на магіле пастаўлены бюст Л.Р.Пятроўскага.

СТАРЫНА, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Мормаль». У 1897 г. пасёлак Стрэшынскай воласці, 20 двароў, 195 жыхароў. На 2000 г. 19 двароў, 22 жыхары.

СТРЭШЫН, гарадскі пасёлак (з 1938), цэнтр гарпасялковага Савета і калгаса «1-е Мая». Размешчаны на правым беразе Дняпра. Паводле археалагічных звестак, паселішча на месцы Стрэшына ўзнікла ў 12 ст. Гэта быў невялікі феадальны замак, абкружаны валам шырынёй 10—12 м і ровам. У пісьмовых крыніцах упамінаецца з 2-й палавіны 14 ст. З 1399 г. ў складзе Вялікага княства Літоўскага. У 16—17 ст. знаходзіўся на паграніччы Рэчы Паспалітай і Рускай дзяржавы. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расійскай імперыі, цэнтр воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, мястэчка, уладанне графа Остэрмана. У канцы 19 ст. 184 двары, каля 2 тыс. жыхароў, якія займаліся лясным промыслам і дробным гандлем, пачатковая школа. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 1919 г. ў складзе Гомельскай губерні РСФСР, у 1924—27 гг. і 1939—55 гг. цэнтр раёна Бабруйскай акругі, потым Гомельскай вобласці. У 1927—39 гг. і з 1956 у Жлобінскім раёне. Са жніўня 1941 г. да 29.11.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 2,8 тыс. жыхароў, якія жылі ў Стрэшыне ў 1939 г., пасля вайны засталося ўсяго 860 чалавек. Паступова пасёлак быў адноўлены і значна вырас. На 1.1.2000 г. 624 двары, 1424 жыхары. Цагельны завод, камбінат бытавога абслугоўвання, лясніцтва, участак камунальнай гаспадаркі. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, бальніца, Цэнтр сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі, аптэка, рознічна-гандлёвае прадпрыемства, 7 магазінаў, сталовая, пажарная часць. У цэнтры гарадскога пасёлка брацкая магіла 623 савецкіх воінаў і 540 байцоў знішчальнага батальёна, помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, магіла А.І.Аляшкевіча, старшыні Стрэшынскага райвыканкома, актыўнага ўдзельніка партызанскага руху і аднаўлення народнай гаспадаркі. Помнік архітэктуры класіцызму — Пакроўская царква (пабудавана з цэглы ў 1807).

СУХІ ВОСТРАЎ, пасёлак у Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». На 2000 г. 3 двары, 4 жыхары.

СЦЯПЫ, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Прагрэс». У 1897 г. сяло, 42 двары, 169 жыхароў, царква, народнае вучылішча, валасное праўленне, збожжазапасны магазін, заезны двор. На 2000 г. 152 двары, 428 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, 2 магазіны. Каля школы ў 1974 г. ўстаноўлены помнік на ўшанаванне памяці вяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у т.л. і земляка Героя Савецкага Саюза С.П.Анішчанкі.

СЫЦІН, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Леніна. На 2000 г. 18 двароў, 23 жыхары.

СЯЛІБА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Варашылава. На 2000 г. 12 двароў, 20 жыхароў.

ТАЎСТЫКІ, вёска ў Навамаркавіцкім сельсавеце, у калгасе «Звязда». У 1897 г. вёска Якіма-Слабадской воласці, 41 двор, 197 жыхароў. У 1909 г. 73 двары, 338 жыхароў. На 2000 г. 25 двароў, 31 жыхар, магазін. На грамадзянскіх могілках брацкая магіла 61 савецкага воіна і партызан, якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

УСПОЛІШЧЫ, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе «Прагрэс». На 2000 г. 11 двароў, 15 жыхароў.

ХАЛЬЧ, пасёлак і чыгуначная станцыя ў Старароднянскім сельсавеце. У 1910 г. хутар Старароднянскай воласці, 6 двароў, 40 жыхароў. На 2000 г. 126 двароў, 600 жыхароў. Аддзяленне сувязі, псіханеўралагічны інтэрнат, пачатковая школа, кінаўстаноўка, магазін, лясніцтва, цэх па перапрацоўцы драўніны.

ЦУПЕР, вёска ў Майскім сельсавеце, у калгасе «Ленінец». У 1897 г. вёска Гарадзецкай воласці, 58 двароў, 339 жыхароў, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, вятрак, 2 кузні. У 1907 г. 63 двары, 436 жыхароў, школа пісьменнасці. У 1910 г. 65 двароў, 467 жыхароў. На 2000 г. 23 двары, 39 жыхароў. Магазін. На паўднёвай ускраіне вёскі, каля грамадзянскіх могілак у 1967 г. ўстаноўлены помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. За 0,4 км на захад ад вёскі сімвалічная магіла на ўшанаванне памяці 70 аднавяскоўцаў, якіх летам 1943 г. загубілі нямецка-фашысцкія карнікі, а іх падвор'і спалілі. Пасля вайны гэта частка вёскі не адрадзілася.

ЧАРЦЁЖ, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у саўгасе «Чырвонабярэжскі». У 1897 г. аколіца Лукаўскай воласці, 111 двароў, 615 жыхароў, піцейны дом. У 1910 г. 83 двары, 508 жыхароў. На 2000 г. 66 двароў, 95 жыхароў. Клуб, магазін.

ЧАЦВЯРНЯ, вёска ў Старароднянскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У 1897 г. вёска Старароднянскай воласці, 90 двароў, 692 жыхары, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 2 ветракі. У 1907 г. сяло Старароднянскай воласці, 126 двароў, 911 жыхароў, царкоўна-прыходская школа (55 вучняў). У 1910 г. 106 двароў, 867 жыхароў. На 2000 г. 109 двароў, 199 жыхароў. Аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая школа, клуб, бібліятэка, магазін. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі брацкая магіла 334 савецкіх воінаў, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. За 4 км на захад ад вёскі, на левым беразе Дняпра месца гібелі В.А.Назаранкі, які загінуў у паветраным баі ў канцы 1943 г. У 1981 г. на месцы яго гібелі пастаўлены абеліск.

ЧОРНАЯ ВІРНЯ, вёска ў Майскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У 1897 г. вёска Старароднянскай воласці, 118 двароў, 763 жыхары, 2 збожжазапасныя магазіны, 2 ветракі, кузня, піцейны дом. У 1910 г. 111 двароў, 829 жыхароў. На 2000 г. 53 двары, 112 жыхароў. Магазін.

ЧЫРВОНАБЯРЭЖСКАЯ СЛАБОДКА, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у саўгасе «Чырвонабярэжскі». У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 2 двары, 21 жыхар. На 2000 г. 39 двароў, 83 жыхары. Магазін.

ЧЫРВОНАЯ ГОРКА, пасёлак у Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Лукскі». На 2000 г. 3 двары, 5 жыхароў.

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у саўгасе-тэхнікуме. На 2000 г. 18 двароў, 34 жыхары. На грамадзянскіх могілках брацкая магіла 6 савецкіх воінаў, якія загінулі ў жніўні 1941 г. і чэрвені 1944 г. пры абароне і вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1947 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

ЧЫРВОНЫ БЕРАГ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Чырвонабярэжскі». Чыгуначная станцыя. У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 55 двароў, 362 жыхары, збожжазапасны магазін; маёнтак, 3 двары, 81 жыхар. На 2000 г. 798 гаспадарак, 2644 жыхары, у т.л. 490 навучэнцаў тэхнікума. Крухмала-патачны завод, аддзяленне сувязі, аўтаматычная

тэлефонная станцыя, аптэка, участковая бальніца, сельскагаспадарчы тэхнікум, сярэдняя школа-сад, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, сталовая, швейны і цэх безалкагольных напіткаў раённага спажывецкага таварыства, лясніцтва, базісны пітомнік лясной гаспадаркі. На тэрыторыі сельскагаспадарчага тэхнікума магіла капітана Чырвонай Арміі Л.В.Ісаева, які загінуў 25.6.1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск. У 1967 г. на ўшанаванне памяці вяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, пастаўлена стэла з барэльефнай выявай жанчыны ў жалобе. Захавалася сядзіба канца 19 ст. і парк — помнік садова-паркавага мастацтва.

ШАПАРНЯ, вёска ў Кіраўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. Назва, магчыма, ад слова шапарня (шафарня) — канторка, каса, дзе плацілі, заробак плытагонам і лесарубам. На 2000 г. 34 двары, 50 жыхароў. Магазін. У цэнтры вёскі брацкая магіла 33 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ці памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1955 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

ШЧАДРЫН, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Варашылава. У 1886 г. слабада Сцепскай воласці, 5 яўрэйскіх малітоўных дамоў, школа, 3 крамы. У 1897 г. сяліба яўрэяў-земляробаў, 429 двароў, 4022 жыхары, 8 яўрэйскіх малітоўных дамоў, 71 крама, аптэка, цагельны завод, заезны двор. У 1909 г. сяліба, 620 двароў, 5600 жыхароў. На 2000 г. 315 двароў, 839 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная станцыя, аптэка, участковая бальніца, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазін. У цэнтры вёскі брацкая магіла 45 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. і ў час партызанскага руху пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1954 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. За 0,4 км на ПдУ ад вёскі магіла ахвяр фашызму. 8.3.1942 г. гітлераўскія карнікі расстралялі каля тысячы чалавек яўрэйскага насельніцтва. Тут пахаваны таксама савецкія актывісты, мірныя жыхары, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ШЧЫТНАЕ, вёска ў Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». На 2000 г. 14 двароў, 21 жыхар.

ШЫХАЎ, вёска ў Верхне-Албянскім сельсавеце, у калгасе «Праўда». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 108 двароў, 775 жыхароў, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 2 ветракі, піцейны дом. У 1910 г. 117 двароў, 956 жыхароў. На 2000 г. 164 двары, 288 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, Дом культуры, бібліятэка, магазін.

ЯШЧЫЦКІ, пасёлак (з 21.1.1969 г.) і чыгуначная станцыя ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Мормаль». На 2000 г. 14 двароў, 28 жыхароў. Магазін.

ЯШЧЫЦЫ, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Мормаль». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 46 двароў, 358 жыхароў, вятрак. У 1910 г. 53 двары, 401 жыхар. На 2000 г. 52 двары, 89 жыхароў. Магазін.

ЭРД, пасёлак у Шчадрынскім сельсавеце. На 2000 г. 4 двары, 5 жыхароў.

П.Я.Кірычэнка, А.Л.Кіштымаў, С.П.Самуэль.

Асноўныя скарачэнні, прынятыя ў кнізе

А — армія
ааўтб (оавтб) — асобны аўтатранспартны батальён
аб (об) — агнямётная батарэя
абб (осб) — асобны будаўнічы батальён
абр — артылерыйская брыгада
абс (обс) — асобны батальён сувязі
авб — авіяцыйны батальён
авд — авіяцыйная дывізія
авп — авіяцыйны полк
авпдд — авіяцыйны полк далёкага дзеяння
ад — артылерыйская дывізія
адда. — аддзяленне
адэб (одэб) — асобны дарожна-эксплуатацыйны батальён
азкр (озпр) — асобная зенітна-кулямётная рота
азсп (озсп) — асобны запасны стралковы полк
аэптд (оипд) — асобная знішчальная процітанкавая дывізія
азэчп (озэжп) — асобны запасны эксплуатацыйна-чыгуначны полк
акулб (опулб) — асобны кулямётны батальён
алб (олб) — асобны лыжны батальён

амб (омб) — асобны матарызаваны батальён
амбр (омбр) — асобная марская брыгада
амінбр (оминбр) — асобная мінамётная брыгада
амсб (омсб) — асобны мотастралковы батальён
ап — артылерыйскі полк
апс (опс) — асобны полк сувязі
арачс (орвжс) — асобная рота аднаўлення чыгуначнай сувязі
арб (орб) — асобны разведвальны батальён
арр (орр) — асобная разведвальная рота
арс (орс) — асобная рота сувязі
артмінп — артылерыйска-мінамётны полк
арш (орш) — асобны разведвальны штаб
асад (осад) — асобны самаходна-артылерыйскі дывізіён
асанавп (осанавп) — асобны санітарны авіяцыйны полк
асапб (осапб) — асобны сапёрны батальён
асб (осб) — асобны стралковы батальён
асбр (осбр) — асобная стралковая брыгада
асбрмп (осбрмп) — асобная стралковая брыгада марской пяхоты
атб (отб) — асобны танкавы батальён
атбр (отбр) — асобная танкавая брыгада
аўтб (автб) — аўтатранспартны батальён
ачбр (ожбр) — асобная чыгуначная брыгада
ашр (ошр) — асобная штрафная рота
аэ — авіяцыйная эскадрылля
баа (бао) — батальён аэрадромнага абслугоўвання
бавд — бамбардзіровачная авіяцыйная дывізія
бавп — бамбардзіровачны авіяцыйны полк
бавпдд — бамбардзіровачны авіяцыйны полк далёкага дзеяння
БФ — Беларускі фронт
в. — вёска
ваяв. — ваяводства
вобл. — вобласць
воп. — вопіс
ВПС (ВВС) — ваенна-паветраныя сілы
г. — горад, год (пры лічбе)
габ — гаўбічны артылерыйскі батальён
гап — гаўбічны артылерыйскі полк
гв. — гвардзейскі
г.п. — гарадскі пасёлак
забр — знішчальная артылерыйская брыгада
завп (иавп) — знішчальны авіяцыйны полк
зап (иап) — знішчальны артылерыйскі полк
зенад — зенітна-артылерыйская дывізія
зенап — зенітна-артылерыйскі полк
зптад (иптад) — знішчальны процітанкавы артылерыйскі дывізіён
зптап (иптап) — знішчальны процітанкавы артылерыйскі полк
зсп — запасны стралковы полк
ісапб — інжынерна-сапёрны батальён
ісапбр — інжынерна-сапёрная брыгада
кап. — капітан
кбр — кавалерыйская брыгада
кд — кавалерыйская дывізія
кк — кавалерыйскі корпус
кп — кавалерыйскі полк
лейт. — лейтэнант
мал. — малодшы
мап — механізаваны артылерыйскі полк
мба — матарызаваны батальён аўтаматчыкаў
мбр — механізаваная брыгада
мд — механізаваная дывізія
медсанб — медыка-санітарны батальён
мібр — мотаінжынерная брыгада
мсп — механізаваны стралковы полк
мінб — мінамётная батарэя
мінбр — мінамётная брыгада
мінп — мінамётны полк
мк — механізаваны корпус
мсб — мотастралковы батальён
мсбр — мотастралковая брыгада
мсд — мотастралковая дывізія
мсп — мотастралковы полк
мяст. — мястэчка
н. — нарадзіўся
пам. — памочнік
панбр — пантонная брыгада
пас. — пасёлак
ПА (ВА) — паветраная армія
ПВА (ПВО) — процівапаветраная абарона
пдд (вдд) — паветрана-дэсантная дывізія
пдп (вдп) — паветрана-дэсантны полк
пп — пяхотны полк
п/п — палявая пошта
пс — полк сувязі
рад. — радавы
РГК — рэзерв Галоўнакамандуючага
рр — разведвальная рота
рсп — рэзервны стралковы полк
сабр — самаходная артылерыйская брыгада
сап — самаходны артылерыйскі полк
сб — стралковы батальён
сбр — стралковая брыгада
сд — стралковая дывізія
ск — стралковы корпус
сп — стралковы полк
ст. — старшы; стагоддзе, стагоддзі
старш. — старшына
сяржс. — сяржант
тб — танкавы батальён
тбавп — транспартна-бамбардзіровачны авіяцыйны полк
тбр — танкавая брыгада
тбразенбат — танкавая брыгада асобнай зенітнай батарэі
тк — танкавы корпус
тп — танкавы полк
тпп — танкавы полк прарыву
уаб (уос) — упраўленне абароннага будаўніцтва
ур — умацаваны раён
цбавп (тбавп) — цяжкі бамбардзіровачны авіяцыйны полк
цмінбр (тминбр) — цяжкая мінамётная брыгада
чбр (жбр) — чыгуначная брыгада
ЧБФ (КБФ) — Чырванасцяжны Балтыйскі флот
ЧФ — Чарнаморскі флот
шавп — штурмавы авіяцыйны полк
шб — штрафны батальён
шісапб — штурмавы інжынерна-сапёрны батальён
шсапбр — штурмавая сапёрная брыгада
яфр. — яфрэйтар.

ЗМЕСТ

Да чытача 17

Жлобінскі раён 18

Населеныя пункты Жлобінскага раёна 19

Населеныя пункты, якія не існуюць (19)

Зямля нашых продкаў 21

Прырода Жлобінскага раёна (21). Археалагічнае даследаванне Жлобіншчыны (22). На дрыгавіцка-радзіміцкім сумежжы ў 9—13 стагоддзях (26). Помнікі археалогіі (28). Манетныя скарбы, знойдзеныя на тэрыторыі Жлобінскага раёна (34).

У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай 35

Дакументы сведчаць (36). Жлобінскія гарматы 18 ст. (38).

У складзе Расійскай імперыі 38

Жлобінскі чыгуначны вузел (42). Асвета (45). Ахова здароўя (46). Рэлігійнае жыццё (47). Сацыяльна-эканамічнае жыццё ў пачатку 20 ст. (47). Дакументы сведчаць (50). Барацьба за новую ўладу і жыццё (59). Дакументы сведчаць (62).

На крутым павароце гісторыі 64

Час барацьбы і выпрабаванняў (64). Дакументы сведчаць (72).Удзельнікі рэвалюцыйных падзей і грамадзянскай вайны на Жлобіншчыне (73). Камісар Смольнага (77). Браняпоезд ішоў з баямі (78). Першы Жлобінскі рэвалюцыйны полк (80). Пайшлі добраахвотнікамі (81). У баях на Дняпры (81). Гаспадарчае будаўніцтва ў 1920-я — 30-я гады (82). Эканамічная характарыстыка Жлобінскага раёна за 1931—32 гг. (87). За газетным радком (89). Спіс калгасаў па стану на 1.1.1941 г. (90). Як ствараліся сялянскія арцелі (93). Кааператыўныя таварыствы ў в. Лісі Лог (Лукскі сельсавет) (93). Дакументы сведчаць (93). З гісторыі калгаса «Прагрэс» (94). Аб'ядноўваліся дзеля лепшай долі (95). Славіўся «Рассвет» людзьмі і багаццем (95). Па новай дарозе (99). З гісторыі Чырвонабярэжскага сельгастэхнікума (100). Першыя трактарысты Жлобінскай МТС (102). Дакументы сведчаць (102). Вернутыя імёны (102). Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг. (109).

Ішла вайна народная 112

Хроніка падзей (112). Войскі, якія прымалі ўдзел у абароне Жлобіна і раёна ў ліпені—жніўні 1941 г. (112). Так пачыналася вайна (112). Рагачоўска-Жлобінская аперацыя 1941 г. (контрудар на Рагачоўска-Жлобінскім напрамку) (113). Контрудар на Дняпры (114). Дакументы сведчаць (121). Жлобінскі знішчальны батальён (122). Стрэшынскія атрад народнага апалчэння і знішчальны батальён (125). 183-і медыка-санітарны батальён (127). Талісман генерала (129). Ратуючы жыццё камандзіра (130). Боепрыпасы дайшлі па прызначэнню (132). Яны абаранялі Радзіму (134). Байцы знішчальнага батальёна, сфарміраванага Жлобінскім РК КП(б)Б 27.6.1941 г. (137). Акупацыйны рэжым (139). Звесткі аб знішчэнні пабудоў і насельніцтва раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны (143). Вываз на фашысцкую катаргу (145). Вырашэнне «яўрэйскага пытання» (146). Дакументы сведчаць (147). Бязвінныя ахвяры (155). Ніхто не прагаварыўся (156). Фашысцкія зверствы (156). Пакуль жыву — помню (157). Буду памятаць (157). Сваімі вачыма (158). Зямны паклон на ўсё жыццё (160). З Асвенцімскім нумарам, пад чужым прозвішчам (161). Іх спалілі жывымі (161). Памяць стукае ў сэрца (162). У тыле ворага (163). Партызанскі рух (171). Партыйныя органы (176). Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Жлобінскага і былога Стрэшынскага раёнаў у 1941—44 гг. (178). Дакументы сведчаць (180). Дзяўчаты-падпольшчыцы (184). Па загаду сэрца (185). Подзвіг электрыка (185). Смерць і ўваскрэсенне партызана Ячына (186). Вызваленне (187). Хроніка вызвалення населеных пунктаў Жлобіншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (187). Войскі, якія прымалі ўдзел у вызваленні Жлобіна і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (187). Жлобінскія вайсковыя злучэнні і часць (188). Пачатак вызвалення (188). Рагачоўска-Жлобінская аперацыя 1944 года (189). Бабруйская аперацыя 1944 года (189). Вызваленне Жлобіна (190). Дакументы сведчаць (191). 194-я стралковая дывізія (192). 115-ы ўмацаваны раён (193). 33-і асобны франтавы штрафны батальён на Жлобіншчыне (194). 102-я Далёкаўсходняя стралковая дывізія (195). Не давалі ворагу перадыху (196). Бой за Гарадок (197). Вызваленне Старой Рудні (198). На левым флангу (199). Гарнізон чатырох гвардзейцаў (200). Падзеі тых дзён (200). Радкі пра вызваліцеляў (201). Героі Савецкага Саюза і поўны кавалер ордэна Славы (205). Удзельнікі Парада Перамогі, які адбыўся ў Маскве 24 чэрвеня 1945 г. (208). Яны прайшлі дарогамі вайны (210). Лейтэнанты з Селівонаўкі (249).

Ваенна-медыцынскія ўстановы, якія размяшчаліся на тэрыторыі Жлобінскага раёна ў час Вялікай Айчыннай вайны (250).

Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні Жлобінскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі 253

Воіны-землякі, якія загінулі і прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў 1941—45 гг. 448

Загінуўшыя ўдзельнікі падполля, партызаны, асобы, якія садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю, члены іх сем'яў, жыхары партызанскіх зон, што падверглісяфашысцкаму тэрору . . 619

Мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору 638

Пад мірным небам 655

Раны вайны (655). Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі (656). Аднаўленне чыгуначнага вузла (659). Жытло ў руінах (661). Раёнка паведамляла (662). У мірнай працы (663). Чарнобыль (673). Дакументы сведчаць (674). Хроніка вялікага перасялення (674). З разуменнем доўгу (676). Заглядваючы ў дзень заўтрашні (677). Беларускі металургічны завод (678). Адкрытае акцыянернае таварыства «БелФА» (680). Жлобінская фабрыка мастацкай інкрустацыі (680). Пірэвіцкі завод (680). Жлобінская метэаралагічная станцыя (681). Лукаўская сярэдняя школа (681). Майская сярэдняя школа (682). Жлобінскае аграрна-тэхнічнае вышэйшае прафесійнае вучылішча (682). Раённая газета (683).

Вызначыліся працай 684

Героі Сацыялістычнай Працы (684). Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі (685). Заслужаныя работнікі Беларусі (685). Ардэнаносцы (689).

Імі ганарыцца Жлобіншчына 693

Спартыўны гонар Жлобіншчыны (701). Ганаровыя грамадзяне Жлобіна (702). Кіраўніцтва раёна і горада (703). Яны працавалі над кнігай «Памяць» (704). Маці-гераіні (705). Іх шляхі прайшлі праз Жлобіншчыну (706). Наш боль — Афганістан (709).

З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны 711

З архітэктурнай мінуўшчыны (711). Матэрыяльная культура Жлобіншчыны (715). Мова Жлобінскага раёна (722). Жлобінскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей (728). Музей народнай славы Чырвонабярэжскага саўгаса-тэхнікума (729). Народныя калектывы Жлобіна (729).

З гісторыі населеных пунктаў Жлобіншчыны 730

Асноўныя скарачэнні, прынятыя ў кнізе 748

СУПРАЦОЎНІКІ РЭДАКЦЫЙ І СЛУЖБАЎ ВЫДАВЕЦТВА, ЯКІЯ ПРАЦАВАЛІ НАД КНІГАЙ

Група картаграфіі: В.Ф.Надзененка, Г.Р.Шыкунова.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў: У.М.Жук, В.У.Мінько.

Рэдакцыя навуковага і літаратурнага кантролю:
І.П.Хаўратовіч (заг. рэдакцыі), А.А.Федасеева.

Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый:
Г.М.Бажанкоў (заг. рэдакцыі), А.П.Дрыбас, С.А.Жукавень, І.У.Каваленка, В.У.Харчанка.

У кнізе выкарыстаны здымкі са Жлобінскага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея, архіва БелЭн, асабістых архіваў, а таксама А.М. Кулагіна, В.У.Харчанкі.

У ЗБОРЫ І ПАДРЫХТОЎЦЫ МАТЭРЫЯЛАЎ ДЛЯ КНІГІ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ:

Л.І.Авяр'янава, А.П.Александровіч, Б.К.Андрушкевіч, І.А.Андрэенка, К.М.Бакач, Б.Е.Гельфанд, В.С.Гердт, Г.П.Грынькова, М.Е.Грыцок, Р.В.Дзмітрыеў, А.С.Елісееў, М.К.Елісееў, У.С.Емяльяненка, У.К.Ерафееў, Я.Ю.Зэлікман, У.М.Іванчыкаў, В.А.Кажаева, М.Ю.Казлоў, Г.С.Казлова, М.П.Казлова, А.П.Капусцін, Я.В.Карцаў, В.А.Касцейкаў, П.А.Карыбскі, П.Я.Кірычэнка, С.М.Котаў, Н.І.Лобан, В.П.Лютынскі, А.А.Лявоненка, А.М.Пусташыла, У.Я.Румянцаў, М.М.Стукач, С.І.Сухоцкі, В.П.Сяліцкі, У.С.Філіпаў, А.С.Фларызяк, А.С.Шолак, М.В.Шуканаў, П.П.Шутаў, А.Ц.Шэйкін.

П 15 **Памяць:** Гіст.-дакум. хроніка Жлобіна і Жлобінскага раёна /Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 2000. — 752 с.: іл.

ISBN 985-11-0186-9

Кніга — гісторыка-дакументальная хроніка, у якой на падставе архіўных даных, замалёвак, артыкулаў, успамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей расказваецца пра гісторыю Жлобіна і Жлобіншчыны, яе знакамітых людзей, герояў ратнай і працоўнай славы. Асаблівая ўвага ўдзелена падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца спісы воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі Жлобіна і Жлобінскага раёна, воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў, мірных жыхароў, якія аддалі жыццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ці сталі ахвярамі фашысцкага тэрору. Змешчаны таксама спіс жыхароў Жлобіна і Жлобінскага раёна, якія былі беспадстаўна рэпрэсіраваны і рэабілітаваны. Кніга багата ілюстравана. Для масавага чытача.

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Жлобіна і Жлобінскага раёна

Мастацкія рэдактары:
У.М. Жук,
В.У. Мінько.

Тэхнічныя рэдактары:
М.І. Грыневіч,
Н.М. Шэвель.

Карэктары:
Ж.С. Берасневіч,
Н.У. Бохан,
Л.А. Варабей,
В.М. Лапцева,
В.М. Чудакова.

Машынапісныя работы:
Г.Л. Анісімава.

Падрыхтоўка арыгінала-макета:
С.А. Макаёнак
(загадчык рэдакцыі камп'ютэрнай падрыхтоўкі рукапісаў);

інжынер
І.М. Кузьмянкова;

кампьютэрны набор:
Р.У. Дзявочка,
Н.М. Зубкевіч,
Дз.Г. Лабунец,
Н.У. Мітраховіч,
Н.А. Стасевіч.

ISBN 985-11-0186-9

9 789851 101869

Падпісана да друку з арыгінала-макета 23.10.2000. Фармат 70×100 1/16. Гарнітура Кудрашэўская. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 61,1. Ум. фарб.-адб. 72,8. Ул.-выд. арк. 89,61. Тыраж 2000 экз. Заказ 1288.

Падатковая льгота — Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 007-98; ч. 1: 22.11.20.600

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 10 ад 31.12.97. Рэспубліка Беларусь. 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 15а.

Надрукавана з арыгінала-макета на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа». 220600, Мінск, вул. Чырвоная, 23.